# Сусветная гісторыя

**10**

## СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАНЦА XVIII ст.



## ЕЎРОПА ў 1648 г.



Маштаб 1:16 000 000




## Населеныя пункты

**Парыж** Сталіцы дзяржаў

Берлін Сталіцы дзяржаў, якія ўваходзілі ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі, цэнтры залежных тэрыторый

Арлеан Іншыя населеныя пункты

## Граніцы пасля Вестфальскага міру 1648 г.

Свяшчэннай Рымскай імперыі

дзяржаў

дзяржаў, якія ўваходзілі ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі, саюзных дзяржаў, залежных тэрыторый

Уладанні

аўстрыйскіх Габсбургаў

іспанскіх Габсбургаў

Тэрыторыі дробных германскіх дзяржаў

Лічбамі пазначаны:

1 Курляндскае і Земгальскае герцагства (васал Рэчы Паспалітай)
2 герцагства Прусія (васал Каралеўства Польскага)
3 Злучаныя правінцыі
4 курфюрства Саксонія
5 герцагства Сілезія
6 маркграфства Маравія
7 Швейцарскі саюз
8 герцагства Савоя
9 Міланскае герцагства
10 Рэспубліка Венецыя
11 Андора
12 Рэспубліка Генуя
13 Вялікае герцагства Таскана
14 Рэспубліка Сан-Марына
15 Папская дзяржава
16 Рэспубліка Дуброўнік

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ
## СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАНЦА XVIII ст.

**Вучэбны дапаможнік**
**для 10 класа**
**ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі**
**з беларускай мовай навучання**
**(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)**

Пад рэдакцыяй кандыдата гістарычных навук
дацэнта А. А. Прохарава

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2020

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 94(100)"…/17"(075.3)
ББК 63.3я72
С90

А ў т а р ы:
*А. А. Прохараў* — § 1, 2, 5—6, 13, 16—18, 27—28;
*С. А. Кудраўцава* — «Як працаваць з вучэбным дапаможнікам»,
§ 2, 3, 4, 15, метадычны апарат;
*Г. Э. Давідоўская* — § 1, 5—7, метадычны апарат;
*Л. А. Козік* — § 13—15, 29; *А. А. Тарканеўскі* — § 8—12;
*Н. У. Кошалева* — § 19—26, 30—32

Пераклад з рускай мовы *Т. М. Шахмуць*

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (кандыдат гістарычных навук дацэнт *А. С. Міксюк*);
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 3 г. Бабруйска» *І. В. Лазаковіч*;
загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар *В. А. Фядосік*;
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 56 г. Мінска» *П. М. Гламбоцкі*

**Электронны дадатак для павышанага ўзроўню размешчаны на рэсурсе profil.adu.by**

**Сусветная** гісторыя са старажытных часоў да канца XVIII ст. : навуч. дапам.
С90 для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Прохараў [і інш.] ; пад рэд. А. А. Прохарава. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. — 288 с. : іл.

ISBN 978-985-553-612-4.

**УДК 94(100)"…/17"(075.3)**
**ББК 63.3я72**

**ISBN 978-985-553-612-4**

© Шахмуць Т. М., пераклад на беларускую мову, 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2019

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Як працаваць з вучэбным дапаможнікам

Паважаныя дзесяцікласнікі! У гэтым годзе вас зноў чакае сустрэча з гісторыяй ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII ст. Вы можаце задаць пытанне: навошта зноў вывучаць тое, што ўжо было пройдзена? З асноўнымі гістарычнымі падзеямі вы сапраўды знаёмыя. А цяпер вам трэба сістэматызаваць і абагульніць веды, сфарміраваць цэласную карціну гістарычнага мінулага. На працягу гісторыі чалавецтва грамадства развівалася ад простых формаў арганізацыі да больш складаных, і кожная стадыя гістарычнага працэсу мела сваю логіку. Вам трэба навучыцца разумець, як з мноства фактаў і з'яў у кожным перыядзе фарміраваліся заканамернасці гістарычнага развіцця. У гэтым вам будзе падтрымкай вучэбны дапаможнік, які вы трымаеце ў руках.

Любы з вас можа выбудаваць сваю індывідуальную адукацыйную траекторыю. Кожны параграф вучэбнага дапаможніка прысвечаны адной тэме і змяшчае матэрыялы базавага (агульнаадукацыйнага) узроўню. Матэрыял, прызначаны для тых, хто вывучае гісторыю на павышаным узроўні, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе, аб магчымасці пераходу да яго сведчыць спецыяльны знак. Пры жаданні тыя з вас, хто вывучае сусветную гісторыю на базавым узроўні, могуць працаваць з матэрыяламі павышанага ўзроўню. У гэтым вам будзе садзейнічаць вучэбны дапаможнік, які вы трымаеце ў руках.

Дапаможнік складаецца з уводзін і трох раздзелаў, прысвечаных гісторыі цывілізацый Старажытнага свету, Сярэднявечча, першага перыяду Новага часу (XVI—XVIII стст.). У пачатку кожнага раздзела неабходна азнаёміцца з храналагічнай табліцай, каб сістэматызаваць уяўленне пра тэму. Кожны параграф пачынаецца пастаноўкай праблемы, якую вы павінны вырашыць у працэсе вывучэння тэмы, і пытаннямі, якія дазваляюць актуалізаваць неабходныя веды. Калі для таго, каб на іх адказаць, вам неабходна скарыстацца вучэбнымі дапаможнікамі па гісторыі для 5—9 класаў, памятайце, што іх можна знайсці ў школьнай бібліятэцы або выкарыстаць электронныя версіі, размешчаныя на нацыянальным адукацыйным партале (http://www.e-padruchnik.adu.by). Кожны раздзел завяршаецца абагульненнем, заданні якога дадуць магчымасць падвесці вынікі па перыядах.

Матэрыял вучэбнага дапаможніка прадстаўлены тэкстам, схемамі, табліцамі, картамі. Ілюстрацыйны матэрыял арганічна дапаўняе тэкст і дае магчымасць сфарміраваць найбольш поўнае ўяўленне пра гістарычную рэальнасць. Кожная з формаў падачы інфармацыі з'яўляецца неабходнай для вырашэння тых ці іншых вучэбных задач. Тэкст параграфаў змяшчае фрагменты гістарычных крыніц, апісанне гістарычных фактаў, розныя пункты гледжання вучоных. Усё гэта дазволіць вам зразумець неадназначнасць вывучаемых працэсаў і з'яў, у ходзе дыскусіі вызначыць сваю пазіцыю па праблеме.

Ілюстрацыі, пададзеныя ў пачатку параграфаў, прызначаны для актуалізацыі ведаў, атрыманых у 5—7 класах. Уважліва разгледзьце іх і раскажыце, з якімі гіста-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рычнымі падзеямі, з'явамі або працэсамі яны звязаны. Успомніце ўсё, што вы ведаеце пра гэтыя падзеі.

Даты, паняцці, азначэнні якіх неабходна ведаць, назвы твораў мастацтва і літаратуры, якія трэба запомніць, у тэксце выдзелены ***тлустым курсівам***. *Светлым курсівам* выдзелены важныя паняцці, даты значных падзей і прозвішчы гістарычных асоб, жыццё і дзейнасць якіх патрабуюць асэнсавання.

Слоўнік і памяткі размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе (http://profil.adu.by).

Як грамадзянам нашай краіны, кожнаму з вас неабходна засвоіць пэўны набор ведаў (звестак пра падзеі, паняцці, імёны, назвы), усталяваць і зразумець сувязі паміж з'явамі, дзякуючы чаму сфарміруецца агульная карціна гістарычнага развіцця Беларусі і свету. Для тых жа, каму важныя глыбокія веды па гісторыі і больш дэталёвае разуменне гістарычнай карціны свету, прадугледжаны пытанні і заданні, накіраваныя на пошук гістарычнай інфармацыі, яе аналіз, правядзенне гістарычнага даследавання. Выконваць іх неабходна па рэкамендацыі настаўніка або па ўласнай ініцыятыве. Некаторыя заданні ў дапаможніку маюць творчы характар, асаблівае месца сярод іх займае напісанне эсэ.

Для тых, хто вывучае гісторыю на павышаным узроўні, створаны электронны дадатак, размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (http: //www.profil.adu.by). Тыя пытанні, якія неабходна вывучаць на павышаным узроўні, пазначаны спецыяльным знакам-сімвалам і маюць QR-код. У гэтым выпадку трэба звяртацца да электроннага дадатку, для азнаямлення з матэрыяламі якога можна выкарыстоўваць гасцявы доступ.

Умоўныя абазначэнні вучэбнага дапаможніка дазваляюць лёгка арыентавацца ў вучэбным, дадатковым, дакументальным матэрыяле.

Фармулёўка праблемы ўрока

Успамінаем раней вывучанае

Вытрымкі з арыгіналаў гістарычных дакументаў

N.B. Важныя, цікавыя падзеі, даты, прыклады, на якія трэба звярнуць увагу*

Пункт гледжання на гістарычныя падзеі іх непасрэдных удзельнікаў і гісторыкаў-даследчыкаў

Заданні, якія патрабуюць прыцягнення дадатковых крыніц інфармацыі і рэсурсаў сеткі інтэрнэт

* Абрэвіятура *N.B.* (лац. *nota bene* — заўваж добра) выкарыстоўвалася ў сярэднявечных рукапісах для прыцягнення ўвагі, яна паказвае на асаблівую важнасць таго, што ёю пазначана.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Заданні, звязаныя з картай. Для іх выканання акрамя гістарычных карт можна выкарыстоўваць геаінфармацыйныя сэрвісы (напрыклад, Google Maps, Tour Builder, MyHistro, StoryMapJS, Historypin і інш.)

Творчыя заданні

Заданні, якія патрабуюць выкарыстання інфармацыі музеяў, у тым ліку віртуальных

Пытанні і заданні для замацавання вывучанага матэрыялу

Прыкладныя тэмы гістарычных праектаў і даследаванняў

Спасылкі на матэрыялы для вывучэння на павышаным узроўні

У добры шлях!

*Аўтары*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




# § 1. Уводзіны

*Якое значэнне мае вывучэнне гісторыі для развіцця грамадства?*



*Што вывучае гісторыя? На якія перыяды падзяляецца сусветная гісторыя? Што такое гістарычная крыніца? Якія існуюць віды гістарычных крыніц?* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас)

**Сэнс і прызначэнне гісторыі як навукі.** Вы ўжо ведаеце, што гісторыя — гэта навука пра мінулае чалавечага грамадства, якая імкнецца зразумець прычынна-выніковыя сувязі ў працэсе яго развіцця. Гісторыя — комплексная дысцыпліна, якая вывучае паслядоўнасць падзей з пункту гледжання палітыкі, дзяржаўнага ўладкавання, эканомікі, сацыяльных адносін, рэлігіі, культуры, ваеннай справы і многіх іншых аспектаў.

Слова «гісторыя» прыйшло са старажытнагрэчаскай мовы, дзе абазначала расказ пра мінулыя падзеі, апавяданне пра тое, што спазнана, даследавана. «Бацькам гісторыі» называюць старажытнагрэчаскага пісьменніка Герадота, які напісаў вялікі твор пра вайну грэкаў з персамі. Ён назваў сваю кнігу «Гісторыя». Музай — апякункай гісторыі грэкі прызналі Кліа, якая, як лічылася, праслаўляе людзей. У Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме вывучэнне гістарычных твораў было важнай часткай выхавання грамадзяніна. Ведаючы гісторыю сваіх продкаў і адчуваючы гонар за яе, грамадзянін павінен быў свядома абараняць сваю Радзіму.

Каб зрабіць гісторыю не проста наборам займальных апавяданняў, неабходна было структураваць звесткі ў адпаведнасці з логікай развіцця гістарычнага працэсу. У Антычнасці пачалі адлічваць гады ад заснавання горада Рыма. Для рымлян сэнс гісторыі быў у росце палітычнай магутнасці іх дзяржавы. Гісторыя пачала выбудоўвацца ў адпаведнасці з храналогіяй. Наступны крок зрабілі хрысціянскія аўтары, якія за пачатак летазлічэння прынялі нараджэнне Хрыста. Для хрысціян такі спосаб


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

сімвалізаваў удасканаленне чалавецтва перад Госпадам. Мы дагэтуль лічым гады ад Нараджэння Хрыстова, якое цяпер называем пачаткам нашай эры.

У Сярэднія вякі ў Заходняй Еўропе асноўным відам гістарычных сачыненняў сталі хронікі і летапісы, у якіх увага галоўным чынам надавалася апісанню гісторыі кіруючых дынастый. Такую ж ролю адыгрывалі гістарычныя тэксты ў многіх старажытных і сярэднявечных цывілізацыях.

Даследчыкі еўрапейскага Адраджэння паспрабавалі рацыянальна падысці да вывучэння гісторыі ўсяго чалавецтва. Вядомы англійскі вучоны XVII ст. Фрэнсіс Бэкан распрацаваў асноўныя прынцыпы навуковага пазнання праз рацыянальны аналіз фактаў. Аднак пра гісторыю ён гаварыў толькі як пра «веды аб прадметах, месца якіх вызначана ў прасторы і часе», а крыніцай ведаў у яго ўяўленні выступала памяць.

У хуткім часе неапалітанец Джамбатыста Віка стварыў новую філасофію гісторыі: чалавецтва паслядоўна развіваецца ад варварства да цывілізацыі. На яго думку, гэтае развіццё ідзе па спіралі, перыяды ўздыму змяняюцца перыядамі заняпаду, але кожны новы віток заўсёды адбываецца на больш высокім узроўні, чым папярэдні.

Гісторыкі канца XIX — пачатку XX ст. выпрацавалі стройную канцэпцыю гісторыі як галіны навуковых ведаў: яна даступная пазнанню, мае свае ўласныя законы развіцця, асновай гістарычнага пазнання з'яўляюцца факты, гісторыя выступае асновай для разумення эвалюцыі грамадства, яна можа служыць для стварэння мадэляў далейшага развіцця краін. У гэты час былі распрацаваныя прынцыпы аб'ектыўнага вывучэння гісторыі.

Аднак вывучэнне гістарычных заканамернасцяў з'яўляецца вельмі складаным. Матэрыял даследавання прадстаўлены ў велізарным аб'ёме. Акрамя таго, гісторыю пішуць жывыя людзі са сваімі поглядамі і ацэнкамі, якім іншым разам цяжка заставацца бесстароннімі адносна падзей.

У наш час гістарычная навука развіваецца дзякуючы намаганням не толькі асобных вучоных, але і цэлых інстытутаў. Вядучым цэнтрам даследаванняў у нашай краіне з'яўляецца Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Вывучаць гісторыю можна на гістарычных факультэтах беларускіх ВНУ, у тым ліку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску, дзе прадстаўлены ўсе кірункі гістарычных даследаванняў.



Эмблема Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

*Растлумачце сімвалічны сэнс элементаў эмблемы.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Роля сусветнай гісторыі як галіны гістарычнай навукі. Перыядызацыя гісторыі.** Кожны народ і кожная краіна прайшлі непаўторны шлях і зрабілі ўнёсак у скарбніцу сусветнай цывілізацыі. Таму вельмі важна ведаць не толькі мінулае сваёй дзяржавы, але і найважнейшыя дасягненні іншых народаў і цывілізацый, уяўляць агульную карціну сусветнага гістарычнага развіцця. Іначай кажучы, трэба ведаць гісторыю свайго народа ў кантэксце гісторыі чалавецтва. У сувязі з гэтым выдзяляюць сусветную гісторыю і гісторыі асобных дзяржаў. Сусветная гісторыя як галіна ведаў вывучае развіццё чалавецтва ад першабытнасці да сучаснасці, аналізуе з'явы прагрэсу і рэгрэсу, даследуе спецыфіку развіцця краін і народаў свету.

*Успомніце храналагічныя рамкі кожнага перыяду сусветнай гісторыі.*

У адпаведнасці з логікай развіцця гістарычнага працэсу гісторыя падзяляецца на пэўныя перыяды, асноўны змест якіх вызначаюць важнейшыя з'явы, што адбываліся ў ходзе эвалюцыі чалавецтва.

Гістарычная навука мае свой тэрміналагічны апарат, што складаецца з паняццяў, з дапамогай якіх апісваюцца гістарычныя працэсы. Асноўныя з іх: ***гістарычны факт*** — падзея або факт, якія адбыліся; ***гістарычны час*** — рух ад адной грамадскай падзеі да іншай, пры якой у кожнага факта ёсць дакладнае месца ў часе; ***гістарычная прастора*** — тэрытарыяльныя рамкі, у якіх лакалізуецца гістарычны факт або з'ява.

§ 1, п. 2–1

§ 1, п. 2–2

Рэканструкцыя падзей грунтуецца на ***гістарычных крыніцах*** — захаваных сведчаннях мінулага, якія змяшчаюць інфармацыю пра падзеі і дзейнасць людзей. Вылучаюць некалькі тыпаў гістарычных крыніц (гл. схему).




Тыпалогія гістарычных крыніц

*Прывядзіце прыклады гістарычных крыніц кожнага тыпу. Пры неабходнасці выкарыстайце інфармацыю з сеткі інтэрнэт.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы.** Сярод падыходаў да вывучэння гісторыі можна вылучыць два асноўныя — фармацыйны і цывілізацыйны.

***Фармацыйны падыход*** разглядае паслядоўныя этапы ў развіцці чалавецтва — ***фармацыі***. Фактычна гэта тлумачэнне лінейнага развіцця гісторыі чалавецтва этап за этапам, або, у дадзеным выпадку, фармацыя за фармацыяй. Змену фармацый, на думку прыхільнікаў такога падыходу, вызначае змена сацыяльна-эканамічных адносін, якія залежаць ад канкрэтнага спосабу вытворчасці. Вылучаюць фармацыі, якія паслядоўна змяняюць адна адну: першабытнаабшчынную, рабаўладальніцкую, феадальную, капіталістычную. У аснову фармацыйнага падыходу было пакладзена вучэнне нямецкага філосафа К. Маркса, які гаварыў пра станаўленне камуністычнай фармацыі пасля капіталізму. Недахопам фармацыйнага падыходу можна лічыць тое, што многія працэсы культурнага, духоўнага жыцця разглядаюцца спрошчана, не вылучаюцца прычыны нераўнамернага і своеасаблівага развіцця асобных народаў, мала ўвагі надаецца ролі асобы ў гісторыі.

***Цывілізацыйны падыход*** дае магчымасць зірнуць на гісторыю праз яго базавае паняцце — ***цывілізацыю*** (ад лац. *civilis* — грамадзянскі, дзяржаўны). «Цывілізацыя» — шматзначны тэрмін, яго можна разумець па-рознаму:

- як узровень развіцця ўсяго чалавецтва, які проціпастаўляецца варварству (у гэтым значэнні цывілізацыя — сінонім культурнага развіцця);
- як самастойнае грамадства (або буйна́я дзяржава), што характарызуецца сукупнасцю палітычных, дзяржаўных, рэлігійных, эканамічных, культурных і сацыяльных традыцый, маралі, каштоўнасцяў і светапогляду (такія цывілізацыі называюць *лакальнымі*).

Цывілізацыйны падыход прадугледжвае вывучэнне лакальных цывілізацый ва ўсёй сукупнасці іх істотных рыс. Розныя вучоныя налічваюць розную колькасць лакальных цывілізацый, традыцыйна іх прынята выдзяляць некалькі дзясяткаў. Лакальныя цывілізацыі займалі і займаюць вялікія культурныя рэгіёны з некалькімі дзяржавамі. Важную ролю ў фарміраванні цывілізацый адыгралі рэлігіі (такія як хрысціянства, іслам і інш.).

*Выдзеліце асноўныя прыкметы лакальных цывілізацый.*

Цывілізацыйны падыход засяроджваецца на вывучэнні спецыфікі лакальных цывілізацый, падкрэсліваючы разнастайнасць формаў гістарычнага працэсу. Гэта своеасаблівая шматколерная карціна, дзе ўсе элементы дапаўняюць адзін аднаго. Разам з тым вывучэнне цывілізацый таксама не дае нам вычарпальнага адказу на пытанне аб заканамернасцях развіцця ўсяго чалавечага грамадства. Таму многія гісторыкі лічаць, што цывілізацыйны і фармацыйны падыходы не ўзаемавыключаюць, а хутчэй дапаўняюць адно аднаго.

З якіх пазіцый ні вялося б вывучэнне гісторыі, трэба заўсёды памятаць, што яно павінна быць накіравана на пазнанне ісціны ў развіцці грамадства, з'яўляцца


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

аб’ектыўным незалежна ад поглядаў даследчыка, якому варта з павагай ставіцца да ўсіх народаў і іх культур. Гэтых прынцыпаў трэба прытрымлівацца ў далейшым працэсе вывучэння гісторыі чалавецтва.

*Сэнс і прызначэнне гісторыі разумеліся ў розны час і ў розных грамадствах па-рознаму. Вербальныя і невербальныя тэксты гістарычнага характару разглядаліся часам як павучальныя патрыятычныя расказы пра жыццё продкаў, а калі-нікалі як проста забаўляльнае чытво. Сучасная гістарычная навука ўсебакова вывучае мінулае чалавецтва, імкнучыся зразумець агульнае і адметнае ў развіцці народаў усяго свету.*

§ 1, п. 3–1

1. Прасачыце эвалюцыю паняцця «гісторыя». Сфармулюйце сучаснае азначэнне гісторыі як галіны навуковых ведаў.
2. Складзіце ментальную карту або схему «Асноўныя паняцці гістарычнай навукі».
3. Якія цэнтры гістарычных даследаванняў існуюць у вашай вобласці або горадзе? Высветліце, якія гістарычныя даследаванні яны праводзяць і якія працы былі імі выдадзены.
4. Падрыхтуйце з прыцягненнем дадатковых крыніц паведамленне ў фармаце артыкула для Вікіпедыі аб адным з вядомых беларускіх гісторыкаў.
5. Напішыце эсэ «Значэнне гісторыі ў жыцці чалавека».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Раздзел I

# ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

***Вы навучыцеся:***

*• арыентавацца ў сучасным свеце, разумеючы, як узніклі і развіваліся старажытныя сусветныя цывілізацыі, спадкаемцамі якіх з'яўляюцца многія краіны, народы, рэлігіі сучаснага свету;*

*• аналізаваць працэс фарміравання культурных і рэлігійных традыцый народаў і дзяржаў у старажытнасці, разумець прычыны сучасных супярэчнасцяў культур і рэлігій у гістарычнай перспектыве.*

**Пра што расказаў сучаснаму чалавеку наскальны жывапіс?**
**Індыя — радзіма найвялікшых эпічных твораў.**
**Унікальнасць цывілізацыі Кітая.**
**Ці быў Сусветны патоп?**
**Вобраз дракона ў кітайскай міфалогіі.**
**Уплыў Вялікай грэчаскай каланізацыі на эканоміку і культуру гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я.**
**Дзяржаўны лад Персідскай дзяржавы і Рымскай рэспублікі: параўнальны аналіз.**
**Афінскі поліс і Рымская рэспубліка: агульнае і асаблівае ў дзяржаўным уладкаванні.**
**Эпоха Аляксандра Македонскага: сутыкненне Захаду і Усходу.**
**Фарміраванне Афінскай дэмакратыі: аблічча эпохі.**
**Багі Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.**
**Гісторыя Старажытнага свету ў асобах.**
**Віртуальнае падарожжа па стаянках старажытнага чалавека.**
**Займальны каляндар для вучняў 5-га класа па гісторыі Старажытнага свету.**
**Каталог «Знакамітыя збудаванні старажытнасці».**


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Храналогія першабытнасці і Старажытнага свету**

| | |
|---|---|
| Каля 2,5 млн гадоў таму | З'яўленне першых людзей ва Усходняй Афрыцы |
| Каля 300 тыс. гадоў таму | З'яўленне чалавека сучаснага віду ва Усходняй Афрыцы |
| Каля 45–40 тыс. гадоў таму | Рассяленне чалавека разумнага (краманьёнца) у Еўропе |
| Каля 25 тыс. гадоў таму | Першыя стаянкі чалавека на тэрыторыі Беларусі |
| 12–4 тыс. гадоў таму | Адступленне апошняга ледавіка з тэрыторыі Еўропы |
| Каля 10 тыс. гадоў таму | Пачатак «неалітычнай рэвалюцыі» ў рэгіёне «ўрадлівага паўмесяца» Блізкага Усходу |
| Канец IV тыс. да н. э. | Стварэнне першых шумерскіх гарадоў і ўзнікненне дзяржаў |
| Каля 3000 г. да н. э. | Аб'яднанне Егіпта ў адзіную дзяржаву |
| Сярэдзіна III тыс. да н. э. | Узнікненне Індскай цывілізацыі |
| 2316–2137 гг. да н. э. | Існаванне Акадскай дзяржавы |
| Мяжа III–II тыс. да н. э. | Пачатак развіцця Крыцкай цывілізацыі |
| 1793–1750 гг. да н. э. | Кіраванне цара Хамурапі, узвышэнне Вавілона |
| Каля 1755–1752 гг. да н. э. | Прыняцце законаў царом Хамурапі |
| 1270 г. да н. э. | Заключэнне дагавора паміж егіпцянамі і хетамі аб падзеле Блізкага Усходу (1-ы тэкст міжнароднага дагавора, што дайшоў да нас) |
| Каля 1240 г. да н. э. | Траянская вайна |
| Пачатак II тыс. да н. э. | Узнікненне першых дзяржаў у Кітаі |
| 753 г. да н. э. | Заснаванне Рыма |
| 669–627 гг. да н. э. | Стварэнне велізарнай бібліятэкі пісьмовых твораў у Месапатаміі ў час кіравання асірыйскага цара Ашурбанапала |
| 550–330 гг. да н. э. | Існаванне Персідскай імперыі |
| 509 г. да н. э. | Усталяванне Рымскай рэспублікі |
| 500–449 гг. да н. э. | Грэка-персідскія войны |
| 447–438 гг. да н. э. | Будаўніцтва Парфянона ў Афінах |
| 443–429 гг. да н. э. | Росквіт афінскай дэмакратыі пры Перыкле |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| 334–324 гг. да н. э. | Паходы Аляксандра Македонскага |
| 317–180 гг. да н. э. | Існаванне імперыі Маур’яў |
| 221–210 гг. да н. э. | Кіраванне імператара Цынь Шыхуандзі, стварэнне імперыі ў Кітаі |
| 206 г. да н. э. — 220 г. н. э. | Кіраванне дынастыі Хань у Кітаі |
| 58–50 гг. да н. э. | Заваяванне Галіі Цэзарам |
| 27–14 гг. да н. э. | Кіраванне першага рымскага імператара Актавіяна Аўгуста |
| 30–33 гг. | Пропаведзь Ісуса Хрыста ў Іўдзеі |
| 72–80 гг. | Будаўніцтва Калізея |
| 313 г. | Прызнанне хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй у Рымскай імперыі |
| 395 г. | Падзел Рымскай імперыі на Заходнюю і Усходнюю |
| 476 г. | Падзенне Заходняй Рымскай імперыі |

**Першабытнае грамадства (ад 2,5 млн гадоў таму)**

**Антрапасацыягенез**

- выкарыстанне прылад працы;
- станаўленне вытворчай гаспадаркі

**Сацыягенез**

праабшчына → радавая абшчына

**Культура**

| матэрыяльная | духоўная |
|---|---|
| • жыллё;<br>• адзенне;<br>• бытавое начынне;<br>• жывапіс;<br>• скульптура | • анімізм;<br>• міфы;<br>• абрады;<br>• магія |

**Цывілізацыі Старажытнага свету (ад 4 тыс. гадоў да н. э.)**

**Эканоміка**

- стварэнне высокапрадукцыйнага земляробства;
- з’яўленне рамяства, гандлю, гарадоў;
- расслаенне грамадства;
- з’яўленне эксплуатацыі;
- узнікненне гарадоў;
- узнікненне дзяржаў

**Культура**

- пісьменства, літаратура;
- мастацтва;
- навука;
- палітычныя паняцці;
- каляндар

| Рэлігія | Грамадскія відовішчы |
|---|---|
| • політэізм;<br>• монатэізм;<br>• храмы | • тэатр;<br>• цырк (іпадром);<br>• Алімпійскія гульні |

Выкарыстоўваючы схему і ўзгадаўшы вывучанае раней, ахарактарызуйце перыяд гісторыі з найстаражытнейшых часоў да з’яўлення першых імперый. Падрыхтуйце візітную картку гэтага гістарычнага перыяду ў любой зручнай для вас форме.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 2. Першабытная гісторыя чалавецтва



*Ці можна перыяд першабытнага грамадства лічыць перыядам прагрэсу чалавецтва?*

*На якія перыяды падзяляецца гісторыя Старажытнага свету? Чым радавая абшчына адрознівалася ад суседскай? Што такое культура? Якую ролю адыгрывалі міфы ў старажытным грамадстве? Якія навуковыя і рэлігійныя дыскусіі вядуцца па праблеме паходжання чалавека і грамадства?* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас; біялогія, 7 клас; грамадазнаўства, 9 клас)

**Перыядызацыя гісторыі першабытнага грамадства.** Найстаражытнейшы перыяд чалавечай гісторыі (перадгісторыі) — ад з'яўлення першых людзей да ўзнікнення першых цывілізацый — атрымаў назву ***гісторыя першабытнага грамадства***. Гэта самы працяглы перыяд гісторыі чалавецтва, які ахоплівае некалькі мільёнаў гадоў.

Нашы веды пра гісторыю гэтага перыяду грунтуюцца не на пісьмовых крыніцах, а толькі на звестках археалогіі. Таму даводзіцца рэканструяваць карціну свету старажытных людзей: пра што яны думалі, як уяўлялі сабе навакольную рэчаіснасць. Гэта галоўная цяжкасць у вывучэнні першабытнасці. Таксама складаным уяўляецца пытанне аб рассяленні невялікіх радавых абшчын на вялізнай тэрыторыі. Людзі рэдка вялі аселае жыццё, часта перамяшчаліся, таму археолагам вельмі цяжка знайсці матэрыяльныя сведчанні іх жыцця. Найчасцей вучоныя знаходзяць фрагменты шкілетаў людзей, але за сотні тысяч або нават мільёны гадоў яны захаваліся дрэнна. Таму складана стварыць цэласную карціну эвалюцыі чалавека на аснове гэтых фрагментарных знаходак. Аднак на сённяшні дзень сабраны значны матэрыял, які дае магчымасць пабудаваць схему развіцця чалавека і скласці перыядызацыю першабытнага грамадства.

Існуе шэраг сістэм перыядызацыі першабытнай гісторыі: геалагічная, археалагічная, антрапалагічная і інш. *Геалагічная перыядызацыя* грунтуецца на паслядоўнай змене эпох развіцця самой Зямлі. Яна не можа даць нам адказы на пытанні аб развіцці чалавека. *Антрапалагічная перыядызацыя* адзначае этапы змянення фізічнага выгляду чалавека па знойдзеных касцявых парэштках. Найбольш распрацаванай з'яўляецца *археалагічная перыядызацыя*, заснаваная на вывучэнні зробленых чалавекам прылад працы і выкарыстаных для гэтага матэрыялаў.

**Каменны век** → **Бронзавы век** → **Жалезны век**

Тры вякі першабытнасці


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Каменны век** | **Палеаліт** (старажытны каменны век) | **ранні**, або ніжні | 2,5 млн — 300 тыс. гадоў таму |
| | | **сярэдні**, або мусцье | 300–35 тыс. гадоў таму |
| | | **позні**, або верхні | 35–8 тыс. гадоў таму |
| | **Мезаліт** (сярэдні каменны век) | | 8–7 тыс. гадоў да н. э. |
| | **Неаліт** (новы каменны век) | | 7–3,5 тыс. гадоў да н. э. |
| **Бронзавы век** | | | 3,5 тыс. гадоў да н. э. — XII ст. да н. э. |
| **Ранні жалезны век** | | | XII–IV стст. да н. э. |

Археалагічная перыядызацыя гісторыі першабытнасці

**Праблема паходжання чалавека.** Здавалася б, пытанне «Калі пачынаецца чалавечая гісторыя?» мае просты адказ: «З таго моманту, калі з'явіліся людзі». Але тады ўзнікае неабходнасць адказаць на пытанне аб тым, як з'явіліся людзі, што можа дапамагчы ў вызначэнні часу іх з'яўлення. Гэта вельмі складаныя праблемы.

На сённяшні дзень існуюць розныя версіі паходжання чалавека на Зямлі. Гэта навуковыя, багаслоўскія і іншыя тэорыі. Можна пачуць нават пра паходжанне людзей ад іншапланецян, хоць гэтаму няма доказаў.

**Некаторыя тэорыі паходжання чалавека**

| Назва | Сутнасць |
|---|---|
| Эвалюцыйная тэорыя (паводле Чарльза Дарвіна) | Чалавек паходзіць ад чалавекападобных малпаў, ён з'явіўся ў ходзе біялагічнай эвалюцыі шляхам натуральнага адбору і пад уплывам навакольнага асяроддзя. Гэтую тэорыю сучасная навука даказвае археалагічнымі і генетычнымі даследаваннямі. |
| Вучэнне пра боскае стварэнне (паводле дактрыны хрысціянства, выкладзенай у Бібліі) | Усёмагутны і ўсюдыісны Бог стварыў першых людзей — мужчыну і жанчыну — Адама і Еву. Біблія сцвярджае, што Адам быў створаны з гліны па падабенстве Божым. Ева была зроблена з рабрыны Адама. Для жыцця ім быў дадзены Эдэм — шчаслівае месца, дзе людзі не мелі патрэбы ні ў чым і былі бессмяротныя. За грэх непаслушэнства Богу людзі былі выгнаны з Эдэма, у знак пакарання стаўшы смяротнымі. Нашчадкі Адама і Евы засялілі ўсю Зямлю. |
| | Практычна ва ўсіх рэлігіях ёсць міфы, у якіх апісваецца або як людзі былі створаны багамі, або як жывёлы ператварыліся ў людзей. Гэта разнавіднасці тэорыі боскага стварэння ў іншых рэлігіях. |

Як сведчыць навука, чалавек з'явіўся не ў адзін момант, а фарміраваўся ў выніку працяглай біялагічнай эвалюцыі. За некалькі мільёнаў гадоў нашы продкі ў барацьбе за існаванне набылі рысы, якія аддалілі іх ад жывёл і зрабілі людзьмі:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прарадзіма чалавека.
Рассяленне сучаснага чалавека

абстрактнае мысленне і маўленне, здольнасць да вырабу і выкарыстання прылад працы, устойлівыя правілы аказання ўзаемадапамогі ў калектыве і г. д. Дакладную дату з'яўлення чалавека прывесці немагчыма, паколькі гэта быў эвалюцыйны працэс, які расцягнуўся на мільёны гадоў.

Эвалюцыя ішла па двух кірунках, якія мы называем антрапагенезам і сацыягенезам, гэта значыць біялагічным і сацыяльным развіццём.

Пераходным ад малпы да чалавека відам лічацца *аўстралапітэкі*, якія шырока рассяліліся ў Афрыцы каля 4 млн гадоў таму. Яны ўжо маглі хадзіць на дзвюх нагах, што стала асновай прамахаджэння, а таксама, магчыма, выраблялі найпрымітыўнейшыя прылады працы для здабывання ежы.

Большасць вучоных на аснове археалагічных звестак вылучаюць некалькі стадый развіцця ўласна чалавека.

Першым прадстаўніком чалавечага роду лічыцца *чалавек умелы* (лац. *Homo habilis*). Ён жыў ва Усходняй Афрыцы 2,5—2 млн гадоў таму і вырабляў першыя найпрасцейшыя каменныя прылады. У яго ўжо быў больш развіты, чым у аўстралапітэка, мозг, але знешне ён быў падобны да свайго продка — напрыклад, яго вага ўсё яшчэ не перасягала 50 кг.

*Чалавек прамаходзячы* (лац. *Homo erectus*) з'явіўся каля 1,8 млн гадоў таму ў Афрыцы і рассяліўся ў Азіі і часткі Еўропы. Ён ужо актыўна выкарыстоўваў агонь, масай цела і аб'ёмам мозгу быў блізкі да сучаснага чалавека, хоць знешне яшчэ моцна адрозніваўся ад яго.

*Неандэрталец* (лац. *Homo neanderthalensis*) жыў 400—40 тыс. гадоў таму ў Еўразіі. Менавіта неандэртальцы дзякуючы сваёй шматлікасці пакінулі значную колькасць археалагічных знаходак, якія сведчаць пра дастатковую развітасць іх культуры. Яшчэ нядаўна неандэртальца лічылі прамым продкам сучаснага чалавека, але цяпер вучоныя ўпэўнена сцвярджаюць, што ён уяўляў сабой тупіковую галіну эвалюцыі.

*Краманьёнец* быў вынікам развіцця віду *чалавек разумны* (лац. *Homo sapiens*), які ўзнік раней, і ўжо адпавядаў *чалавеку сучаснага тыпу* (лац. *Homo sapiens sapiens*). Каля 40 тыс. гадоў таму краманьёнцы з'явіліся ў Еўропе і выцеснілі неандэртальцаў. За некалькі дзясяткаў тысяч гадоў імі была заселена ўся Зямля. Так пачалася гісторыя сучаснага чалавека.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 2, п. 2–1

**Антрапагенез.** ***Антрапагенез*** — гэта біялагічная эвалюцыя чалавека, змяненне яго знешняга выгляду і развіццё мозгу. Працэс антрапагенезу ідзе вельмі маруднымі тэмпамі на працягу дзясяткаў тысяч, а можа і мільёнаў гадоў. Асновай антрапагенезу з’яўляецца біялагічная эвалюцыя, якая пануе ва ўсёй прыродзе.

Уплыў на змяненне фізічнай будовы чалавечага цела аказалі некалькі важных фактараў. Чалавека ад малпы адрознівае *прамахаджэнне*. Фарміраванне ўмення вырабляць і выкарыстоўваць *прылады працы* значна паўплывала на змяненне будовы цела чалавека. Напрыклад, для вырабу прылад працы ён павінен быў мець значна больш развітую кісць рукі, чым у малпаў, ужо не кажучы пра іншых жывёл. Магчымасць выкарыстоўваць рукі дало менавіта прамахаджэнне.

Значную ролю ў змяненні будовы цела адыграў *рацыён харчавання* людзей. Калі продкі чалавека жылі ў лясах Усходняй Афрыкі, аснову іх рацыёну складала раслінная ежа, як і ў малпаў: плады, ягады, карэнне, лісце і г. д. Рассяленне і перасяленне ў саванны паўплывала на змяненне харчавання: у рацыён дадалося мяса. Расліннай ежы не хапала, і людзі пачалі паляваць на дробных жывёл або даядаць здабычу буйны́х драпежнікаў. Выкарыстанне агню дало магчымасць спажываць больш мяса, гатаваць рыбу і іншыя прадукты. Мясная ежа пасадзейнічала павелічэнню аб’ёму цела чалавека. Разнастайнасць, багацце ежы і яе гатаванне на агні спрыялі росту аб’ёму мозгу, а таксама павелічэнню працягласці жыцця чалавека. Мясны рацыён набыў асаблівае значэнне ў час надыходу ледавіка, калі чалавек жыў у зоне рассялення статкаў буйны́х жывёл. Менавіта ў гэты перыяд цела чалавека дасягнула сучасных прапорцый, набыло цяперашні аб’ём. У які б рэгіён свету ні трапляў у выніку рассялення чалавек, ён выкарыстоўваў любыя мясцовыя крыніцы ежы, а пры неабходнасці і кардынальна мяняў свой рацыён. Гэта адна з найважнейшых асаблівасцяў адаптацыі чалавека, якая вылучыла яго з жывёльнага свету.

Рассяліўшыся па розных рэгіёнах, чалавек сутыкнуўся з кліматычнымі адрозненнямі. Больш за тое, клімат час ад часу змяняўся, як гэта здаралася ў ледавіковыя перыяды. Навакольнае асяроддзе вымушала людзей прыстасоўвацца да розных умоў жыцця (ад трапічных джунгляў да палярных ільдоў) пры рэзкіх змяненнях клімату на ўсёй планеце. Многія віды жывёл у гэтых умовах выміралі, але чалавек заўсёды адаптаваўся. Напрыклад, ён пачаў ствараць адзенне і жыллё, каб выжыць у неспрыяльных умовах. Ад першабытнасці да сучаснасці чалавек працягвае выкарыстоўваць магчымасці адаптацыі. Менавіта гэтае ўменне зрабіла чалавека чалавекам.

Адным з вынікаў прыстасавання да навакольнага асяроддзя стаў падзел людзей на ***расы***: еўрапеоідную, негроідную і мангалоідную.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Сацыягенез.** ***Сацыягенез*** — гэта гістарычны працэс станаўлення чалавечай асобы і міжасобасных узаемаадносін, а таксама фарміравання ўласна чалавечага грамадства з сістэмай сацыяльных адносін. Шмат у чым вывучэнне сацыягенезу з'яўляецца яшчэ больш складанай задачай, чым даследаванне антрапагенезу. Фізічнае развіццё чалавека наглядна дэманструе археалогія, а для інтэрпрэтацыі сацыяльнага развіцця вучоны павінен зразумець самі ўмовы жыцця.

Чалавек ніколі не жыў паасобку, развіваючы свае навыкі грамадскага жыцця ў супольнасці. Аднак першапачаткова ён арганізоўваў сваё сацыяльнае жыццё, беручы прыклад з жывёл, таму старажытны чалавечы калектыў мае назву ***чалавечы статак***, або ***праабшчына***. Унутры такой супольнасці цяжка ўсведамлялася нават роднасць, базавае паняцце для ўсёй далейшай гісторыі чалавека.

Развіццё маўлення істотна паўплывала на сацыягенез. Маўленне стала асновай сацыяльнай камунікацыі, дало магчымасць абмеркавання праблем, што ўзнікалі. Мова як форма калектыўнай памяці стала сховішчам чалавечага вопыту і спосабам яго перадачы новым пакаленням. Калі ў мове мелася слова, то было вядома, што яно азначае, і гэта можна было растлумачыць дзіцяці. Мы дагэтуль пазнаём свет, засвойваючы і разумеючы новыя для нас словы.

Маўленне садзейнічала і антрапагенезу. Дзякуючы яму сфарміраваліся некаторыя спецыфічныя зоны мозгу, а таксама змянілася будова гартані для вымаўлення гукаў. Мова спрыяла станаўленню абстрактнага мыслення, да назваў канкрэтных аб'ектаў і дзеянняў пастунова дабаўляліся абстрактныя паняцці, напрыклад такія, як «добра» і «дрэнна». Развіццё мовы, мыслення і чалавечага мозгу заўсёды было цесна ўзаемазвязана.

Паспяховаму выкананню агульных задач і праз гэта цеснаму кантакту садзейнічалі многія формы сумеснай актыўнасці, напрыклад, выраб і выкарыстанне прылад працы. На той момант здабыванне ежы (перш за ўсё паляванне і рыбалоўства) магло быць выключна калектыўным. Прыгатаванне ежы таксама часта было сумесным. Складана пераацаніць значэнне выкарыстання агню ў гэтым працэсе. Вогнішча трэба было падтрымліваць агульнымі намаганнямі. Агонь абараняў ад дзікіх звяроў і холаду.

Усведамленне роднасці і з'яўленне маральных законаў зрабілі ўзаемадзеянне ўнутры чалавечых супольнасцяў больш канструктыўным.

Такім чынам, усе формы чалавечай дзейнасці, накіраванай на адаптацыю і выжыванне, садзейнічалі развіццю сацыяльнага жыцця. У выніку з'яднанне людзей адбылося на аснове ўсведамлення сваяцкіх адносін і выканання агульных задач. На месца чалавечага статку прыйшла ***радавая абшчына***, або ***род*** — калектыў, што грунтаваўся на ўсведамленні сваяцкіх сувязяў і складаўся са сваякоў. Радавая абшчына займалася калектыўнай працай, здабываннем ежы і яе спажываннем.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Усведамленне прынцыпаў сваяцкасці прывяло да ўзнікнення экзагаміі — з'явілася забарона браць шлюб паміж членамі аднаго роду. Некалькі родаў утваралі ***племя***. Так было лягчэй выжыць, а іншым часам і супраціўляцца варожым абшчынам.

Людзі ўсё меней качавалі і імкнуліся да больш-менш аселага жыцця. Першапачаткова месцамі стаянак былі пячоры. Вялікую ролю ў згуртаванні абшчыны адыгрывалі здабыванне ежы і далейшае яе размеркаванне паміж усімі членамі роду. Такая форма сацыяльнай арганізацыі патрабавала фарміравання *калектывізму*. Станавіўся больш выразным падзел абавязкаў паміж мужчынам і жанчынай, але пры гэтым уся іх дзейнасць была скіраваная на тое, каб прыносіць карысць абшчыне, падпарадкоўвалася інтарэсам усяго калектыву. Самым страшным пакараннем было выгнанне, таму што чалавек не меў магчымасці выжыць самастойна.

Адным з важнейшых агульных заняткаў было паляванне на буйны́х статкавых жывёл, якое магло весціся толькі сіламі ўсяго калектыву. Паляванне аказала значны ўплыў на фарміраванне сацыяльнага жыцця першабытных чалавечых супольнасцяў.

*Успомніце, якія формы палявання былі характэрныя для першабытнасці, і апішыце іх.*

**З'яўленне рэлігіі і мастацтва.** Вельмі складана вызначыць час з'яўлення ў першабытнага чалавека абстрактных ідэй, у тым ліку рэлігійных уяўленняў. У гэтым вучоным дапамагаюць археалагічныя знаходкі, у якіх адлюстраваліся першабытныя вераванні.

§ 2–1, п. 6

Першыя сведчанні існавання ***рэлігіі*** адносяцца да 300 тыс. гадоў таму. У неандэртальцаў многія рэлігійныя ідэі ўжо дасягнулі даволі высокага ўзроўню развіцця. Напрыклад, быў вельмі пашыраны абрад пахавання памерлых. Абрады сведчаць пра ўзнікненне ўяўлення пра душу і, магчыма, пра яе адраджэнне ў будучых пакаленнях. Таксама неандэртальцам была вядомая «паляўнічая магія» — рэлігійныя абрады дзеля забеспячэння ўдалага палявання.

Рэлігія як з'ява духоўнага жыцця грамадства ўзнікла ў выніку дзеяння многіх фактараў. У старажытнасці чалавек не мог растлумачыць з'явы навакольнага свету. Нейкія з іх яго здзіўлялі, іншыя палохалі, трэція радавалі. Ён спрабаваў іх асэнсаваць, але многае не паддавалася тлумачэнню. Напрыклад, не так проста было нават зразумець, як нараджаюцца новыя людзі. А што адбываецца з чалавекам, калі ён памірае? У руху планет чалавек бачыў пастаяннае паўтарэнне, але хто гэта арганізаваў? Імкнучыся растлумачыць тое, што адбываецца ў свеце, чалавек лічыў, што жыццё створана вышэйшымі сіламі. Пры гэтым ён не мог паўплываць на навакольнае

*Якімі, з пункту гледжання вучоных, былі прычыны ўзнікнення старажытных рэлігій? Назавіце не менш за тры прычыны.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

асяроддзе, паколькі яго магчымасці былі вельмі абмежаваныя. Чалавек цалкам разумеў сваю залежнасць ад прыроды: ад жорсткіх ураганаў, засухі, змены клімату і г. д. Гэта вымушала пакланяцца звышнатуральным сілам і шанаваць іх.

Першай формай рэлігійных вераванняў быў ***анімізм*** — вера ў існаванне духу, душы ў кожнай жывой істоце, у кожнай рэчы, з'яве прыроды і г. д. Людзі верылі, што *духі* могуць уплываць на іх жыццё, таму з імі неабходна было «падтрымліваць добрыя адносіны» праз выкананне абрадаў. А ў самім чалавеку, паводле старажытных вераванняў, існавала *душа*. Бо ён не мог зразумець, што адбываецца ў час яго сну або як працуе яго фантазія.

*Прывядзіце прыклады ўяўленняў анімізму, якія дагэтуль існуюць у культуры беларусаў.*




Раннія формы рэлігіі



Формы анімізму

*Вызначце, якую форму анімізму адлюстроўвае кожная з ілюстрацый.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Рэлігія з’яўлялася важным фактарам сацыяльнай кансалідацыі. Абрады людзі праводзілі сумесна, лічачы, што толькі іх сумесныя дзеянні могуць паўплываць на духаў. Менавіта рэлігія патрабавала захавання маральных нормаў унутры калектыву.

У краманьёнцаў пачало зараджацца ***мастацтва***, у тым ліку ўзнікла развітое выяўленчае мастацтва, якое вызначалася вельмі рэалістычнымі формамі. Чалавек перш за ўсё адлюстроўваў жывёл, з якімі пастаянна сутыкаўся на паляванні: бізонаў, аленяў, коней, мамантаў, дзікоў і інш. Вядома больш за 70 старажытных пячор, дзе былі знойдзены малюнкі. Самымі знакамітымі з’яўляюцца роспісы ў пячорах Францыі і Іспаніі, напрыклад, у пячоры Трох братоў у Францыі, пячоры Альтаміра ў Іспаніі.



Наскальны малюнак. Пячора Шаве, Францыя. Позні палеаліт

*Прапануйце некалькі варыянтаў тлумачэння гэтага малюнка.*

Сцены і столь пячор спрэс пакрытыя малюнкамі. У іх было цёмна. Лічыцца, што пры святле факелаў тут праводзілі рэлігійныя абрады, а некаторыя выявы мелі магічнае значэнне.

У каменным веку зарадзіўся яшчэ адзін від выяўленчага мастацтва — скульптура малых формаў. З каменю, косці, дрэва выраблялі розныя статуэткі. Археолагі знаходзяць шмат фігурак жывёл і птушак на месцах стаянак старажытнага чалавека і ў пахаваннях. Нярэдка на прыладах працы, упрыгажэннях з косці або дрэва надрапваліся выявы звяроў. З’явіўся прымітыўны арнамент. Такім чынам, чалавек не проста вырабляў прылады працы, але і аздабляў іх. Значыць, у яго сфарміраваўся мастацкі густ, дзякуючы якому ён імкнуўся эстэтычна афармляць рэчы, што выкарыстоўваў. Краманьёнец пачаў ставіцца ўважліва і да сваёй знешнасці. Мужчыны і жанчыны насілі розныя ўпрыгажэнні, расфарбоўвалі целы, дэкаравалі адзенне.

Асаблівае месца ў мастацтве краманьёнца займаюць жаночыя статуэткі. Папулярнасцю карысталася выява першага бажаства ў гісторыі чалавецтва — багіні-маці, якая, як лічылася, дае ўрадлівасць, спараджае ўсіх жывых істот.



Палеалітычная статуэтка багіні-маці

Узнікненне мастацтва сведчыла пра фарміраванне ў чалавека абстрактнага мыслення, а як вынік, творчасці ў самых розных формах. Першабытныя мастакі былі заснавальнікамі многіх відаў выяўленчага мастацтва: жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўнага мастацтва.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 2–1




«Урадлівы паўмесяц» Блізкага Усходу



Прылады працы каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў

*Якія з прылад працы старажытных людзей выкарыстоўваюць дагэтуль?*

**«Неалітычная рэвалюцыя».** Каля 10 тыс. гадоў таму на Блізкім Усходзе і ў Месапатаміі пачаўся пераход ад ***прысвойвальнай гаспадаркі*** (палявання, рыбалоўства і збіральніцтва) да ***вытворчай гаспадаркі*** (земляробства і жывёлагадоўлі). Гэтыя змены былі настолькі глабальныя для жыцця чалавецтва, што сучасныя вучоныя назвалі гэты працэс ***«неалітычнай рэвалюцыяй»***.

Калі чалавек вёў прысвойвальную гаспадарку, ён не мог уплываць на аднаўленне прыродных рэсурсаў. Такім чынам, усё залежала ад прыроды, а чалавек толькі выкарыстоўваў тое, што ўжо існавала. Вядома ж, у яго заўсёды прысутнічала імкненне гарантавана забяспечыць сябе ежай.

У спрыяльным клімаце «ўрадлівага паўмесяца» Блізкага Усходу і Месапатаміі (утварае дугу ад Егіпта да Міжрэчча і гор Ірана цераз Палесціну і Сірыю) удалося арганізаваць вытворчую гаспадарку. Вырошчванне розных культур было больш працаёмкай справай, чым збіральніцтва, аднак земляробства стабільна забяспечвала ўраджай. Калі, вядома, не адбываліся прыродныя катаклізмы, напрыклад, засухі або праліўныя дажджы. Жывёлагадоўля гарантавала запасы мяса.

Практычна ўсе віды сучасных культурных раслін былі акультураны менавіта ў перыяд «неалітычнай рэвалюцыі». На тэрыторыі «ўрадлівага паўмесяца» сталі вырошчваць пшаніцу, ячмень, садовыя культуры; разводзілі коз, авечак, свіней, буйную рагатую жывёлу.

У час «неалітычнай рэвалюцыі» з'явіліся і першыя рамёствы. Вырошч-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Наступствы «неалітычнай рэвалюцыі»

ванне лёну дало магчымасць вырабляць лёгкае і зручнае адзенне. Выкарыстанне глінянага посуду дазваляла захоўваць запасы ежы і гатаваць разнастайныя стравы.

Пераход да земляробства садзейнічаў фарміраванню *аселага ладу жыцця*. З'явіліся вялікія паселішчы з пастаянным жыллём, сховішчамі для сельскагаспадарчых прадуктаў, будынінамі для ўтрымання жывёлы. Квітнеючыя паселішчы земляробаў прыцягвалі ахвотных жыць тут з іншых родаў. На змену радавым абшчынам прыйшлі ***суседскія абшчыны***. Яны складаліся з вялікіх *патрыярхальных сем'яў* на чале са старэйшынам роду — патрыярхам, побач з якім жылі сем'і яго сыноў. Такое ўладкаванне грамадства давала магчымасць найбольш эфектыўна весці вытворчую гаспадарку.

*Першабытнасць з'яўляецца самым працяглым перыядам у гісторыі чалавецтва. У гэты час адбылася эвалюцыя фізічнага цела чалавека (антрапагенез) і ўзніклі асноўныя формы сацыяльнага ўзаемадзеяння ў чалавечым калектыве (сацыягенез). У ходзе «неалітычнай рэвалюцыі» з'явіліся два тыпы вытворчай гаспадаркі: земляробства і жывёлагадоўля. Узнікненне мастацтва і рэлігіі стала паказчыкам усё большага ўскладнення ўяўленняў аб навакольным свеце і імкнення яго адлюстраваць.*

**1.** Якія віды гістарычных крыніц могуць быць выкарыстаны для вывучэння першабытнага грамадства?
**2.** Чаму існуюць розныя пункты гледжання на паходжанне чалавека?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Які крытэрый пакладзены ў аснову археалагічнай перыядызацыі? Якія яшчэ віды перыядызацыі вы ведаеце?
4. Складзіце ў сшытку табліцу «Асноўныя стадыі развіцця чалавека», выкарыстоўваючы вучэбны матэрыял. Зрабіце выснову пра тое, як змянялася жыццё людзей на розных этапах.
5. Вызначце асноўныя адрозненні чалавека ад жывёл.
6. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі (у тым ліку карты), запоўніце ў сшытку табліцу, упісаўшы ў яе назвы найбольш вядомых стаянак старажытных людзей (не менш чым трох), у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі.

| Аўстралапітэк | Чалавек умелы | Чалавек прамаходзячы | Неандэрталец | Краманьёнец |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

7. Сфармулюйце азначэнне паняцця «неалітычная рэвалюцыя». Растлумачце, чаму гэты працэс называюць рэвалюцыяй і чаму неалітычнай. Ахарактарызуйце наступствы «неалітычнай рэвалюцыі», выкарыстоўваючы схему на с. 23. Што добрага і што дрэннага прынесла грамадству «неалітычная рэвалюцыя»?
8. Вызначце і растлумачце заканамернасці з'яўлення: а) рэлігіі, б) вытворчай гаспадаркі.
9. Падрыхтуйце віртуальнае падарожжа па стаянках старажытнага чалавека ў любым зручным для вас фармаце.

## § 3. Эканоміка і палітычная карта Старажытнага Усходу



*Якія змены адбыліся ў чалавечым грамадстве пры ўзнікненні дзяржаўнасці?*

*Што такое цывілізацыя? Дзе ўзнікла вытворчая гаспадарка і сталі складвацца першыя цывілізацыі? Якія агульныя рысы цывілізацый Старажытнага Усходу вы памятаеце?* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас)

**Прыродныя ўмовы і развіццё арашальнага земляробства.** Паняцце «Старажытны Усход» адносіцца да вялікай геаграфічнай зоны, якая ўключае такія краіны, як Старажытны Егіпет, Старажытная Месапатамія, Старажытны Кітай, Старажытная Індыя. Тут склаліся спрыяльныя ўмовы для з'яўлення першых дзяржаўных утварэнняў, найперш аптымальнае экалагічнае асяроддзе для развіцця высокапрадук-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Цэнтры зараджэння найстаражытнейшых цывілізацый Старажытнага Усходу

цыйнага арашальнага земляробства ва ўрадлівых далінах буйны́х рэк: Ніла, Тыгра і Еўфрата, Інда і Ганга, Хуанхэ і Янцзы.

Старажытны Усход — калыска ўсёй чалавечай цывілізацыі, найстаражытнейшыя ачагі якой склаліся ў IV тысячагоддзі да н. э. незалежна адзін ад аднаго ў Егіпце і Месапатаміі. У сярэдзіне III тысячагоддзя да н. э. аформілася старажытнаіндыйская цывілізацыя, а ў сярэдзіне II тысячагоддзя да н. э. — старажытнакітайская.

Гэтыя цывілізацыі складваліся ва ўмовах субтрапічнага клімату з гарачым сухім летам і мяккай зімой. Прыродныя ўмовы ў далінах вялікіх рэк першапачаткова былі не самымі спрыяльнымі: глеба была багністая, па берагах частараслі густыя непраходныя лясы, моцныя разлівы неслі небяспеку паселішчам. Аднак можна казаць і пра мноства пераваг: рэкі маглі забяспечваць людзей вялікай колькасцю рыбы, у прыбярэжных лясах вялася дзічына, а галоўнае, землі былі прыдатныя для земляробства. Рэкі актыўна садзейнічалі апрацоўцы глебы, даючы пастаянную і неабмежаваную крыніцу вады для арашэння і прыносячы ў час разліваў урадлівы глей. Але неабходна было пабудаваць дамбы, арашальныя каналы, сажалкі, якія ўтрымлівалі б ваду пасля разліваў, каб атрымліваць вялікія ўраджаі нават пры выкарыстанні першапачаткова прымітыўных прылад апрацоўкі зямлі.

У выніку менавіта на аснове ***арашальнага земляробства*** ўзнікла высокапрадукцыйная сельская гаспадарка старажытных цывілізацый. Стваральная праца дала магчымасць выкарыстоўваць навакольнае асяроддзе для паляпшэння ўмоў жыцця. Уменне ставіць навакольнае асяроддзе сабе на службу з’яўляецца вельмі важнай асаблівасцю чалавека і дагэтуль садзейнічае яго пастаяннаму развіццю.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прыродныя ўмовы Месапатаміі былі спачатку не вельмі спрыяльныя для пражывання. Здароўю насельніцтва шкодзілі выпарэнні шматлікіх балот. Будаўнічага каменю тут не было, таму асноўным матэрыялам для ўзвядзення розных збудаванняў служылі чарот і гліна. Таксама ў рэгіёне было недастаткова карысных выкапняў, асабліва металаў.

Герадот адзначаў, што ўрадлівая глеба Егіпта была створана наносамі і адкладамі глею пасля разліваў ракі Ніл. Добра абводненая імі егіпецкая зямля ўтварыла гіганцкі аазіс, заціснуты між неабсяжных пустынь Паўночна-Усходняй Афрыкі. Адрэзаны ад суседніх краін на захадзе і на ўсходзе скалістымі гарамі і цяжкапраходнымі пустынямі, а на поўдні — парогамі Ніла, Егіпет першапачаткова быў амаль ізаляваны ад астатняга свету. Гэтым шмат у чым тлумачыцца адметнасць егіпецкай культуры. Земляробства там было магчымае толькі дзякуючы разлівам Ніла, таму што ў гарачым клімаце ўраджай поўнасцю залежаў ад вільгаці і наносаў урадлівага рачнога глею. Егіпцяне заўсёды супрацьпастаўлялі сваю прыдатную для раслінаводства зямлю пустынным і дзікім суседнім тэрыторыям. Сваю краіну яны вобразна называлі «чорнай зямлёй» (Та-Кемет), а пустыні вакол — «чырвонай зямлёй».

Усходняе Міжземнамор’е ўяўляла сабой вузкую ўрадлівую прыморскую паласу. З усходу размяшчаліся горныя і паўпустынныя раёны з рэдкімі аазісамі. Земляробства тут квітнела яшчэ з часоў «неалітычнай рэвалюцыі». У рэгіёне не было буйны́х рэк, таму тут не ўзнікала неабходнасці ствараць адзіную сетку ірыгацыйных сістэм. Усходняе Міжземнамор’е ніколі не было тэрыторыяй адзінага дзяржаўнага ўтварэння. Народы гэтага рэгіёна ў старажытнасці размаўлялі на мовах семіцкай групы (арабская, іўрыт, асірыйская і інш.), яны адрозніваліся па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. У той час тут праходзілі і перасякаліся гандлёвыя шляхі, што вялі з Егіпта да Міжрэчча, г. зн. у зоны найважнейшых дзяржаў старажытнасці.

Вялізны паўвостраў Індастан, размешчаны ў Паўднёвай Азіі, быў амаль адрэзаны ад свету: на поўначы — гарамі, на поўдні — акіянам, на ўсходзе — джунглямі. Ён дзяліўся на дзве часткі: паўднёвую — пласкагор’е Дэкан і паўночную — раўніну з урадлівымі далінамі паміж рэкамі Інд і Ганг.

Кітай у старажытнасці быў ізаляваны ў геаграфічных адносінах ад астатняга свету і практычна не меў кантактаў з іншымі краінамі на захадзе аж да апошніх стагоддзяў эпохі старажытнасці.

Розныя рэгіёны Старажытнага Усходу аб’ядноўвала тое, што дзякуючы ўрадлівасці глебы ў басейнах рэк пры наладжанай сістэме ірыгацыі і меліярацыі там можна было развіць высокапрадукцыйную сельскую гаспадарку. Менавіта таму на гэтых тэрыторыях і зарадзіліся першыя цывілізацыі, якія атрымалі вобразную назву «цывілізацыі вялікіх рэк».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Асноўныя гаспадарчыя заняткі.** Яшчэ ў перыяд «неалітычнай рэвалюцыі» ў рэгіёне «ўрадлівага паўмесяца» было асвоена вырошчванне збожжавых (пшаніцы і ячменю), а таксама вінаграду, капусты, салаты, морквы, цыбулі і іншых культур. Былі прыручаны козы і авечкі, буйна́я рагатая жывёла. Земляробы і жывёлаводы сталі па-рознаму весці гаспадарку, а ў хуткім часе пачалі абменьвацца прадуктамі сваёй працы. Земляробства ў далінах рэк садзейнічала пераходу да аселага ладу жыцця.

У Старажытнай Месапатаміі акрамя збожжа вырошчвалі фінікавыя пальмы, інжыр, вінаград, слівы, яблыні, абрыкосы, гарох, боб, салату, капусту, лён і іншыя садовыя і агародныя культуры. Ужо ў IV—III тысячагоддзях да н. э. у іх быў наладжаны абмен прадуктамі з жывёлаводамі — жыхарамі перадгор'яў Іранскага плато, якія пастаўлялі мяса. Усё гэта рабіла рацыён месапатамцаў вельмі багатым. Таксама жывёлаводы забяспечвалі іх воўнай і скурай.

Аснову харчавання егіпцян складалі збожжавыя культуры. У Старажытным Егіпце актыўна развівалася і садоўніцтва: вырошчвалі фінікі, інжыр, гранаты, персікі, вінаград, цыбулю, часнок, радыску і інш. Егіпцяне распрацавалі рэцэпты дражджавога хлеба. Жывёлагадоўля таксама адыгрывала ў гаспадарцы Старажытнага Егіпта заўважную ролю. Егіпцяне разводзілі буйну́ю рагатую жывёлу, свіней, авечак і коз, такім чынам забяспечваючы сябе мясам. Свойская птушка (гусі, качкі) і галубы таксама рабілі больш разнастайным мясны рацыён.

Насельніцтва Старажытнай Індыі атрымлівала ўсё неабходнае для жыцця, займаючыся перш за ўсё сельскай гаспадаркай. Вырошчваліся пераважна мясцовыя культуры (напрыклад, мясцовая разнавіднасць пшаніцы). Вялікія плошчы адводзіліся пад рыс. Тут былі вядомыя лімоны і апельсіны, фасоля, агуркі і баклажаны. У Індыі ўпершыню пачалі вырошчваць цукровы трыснёг і бавоўну.

Асновай рацыёну жыхароў далін вялікіх рэк Хуанхэ і Янцзы сталі рыс і проса. Хоць і тут культывавалі шмат садовых і агародных раслін: хурму, фасолю, розныя гатункі капусты, чай і інш.

На розных тэрыторыях вырошчвалі мясцовыя расліны. Рэгіёны, дзе актыўна ішло акультурванне раслін, атрымалі назву *ачагоў паходжання культурных раслін*. У далейшым узаемадзеянне розных цывілізацый прывяло да перайманне і распаўсюджвання сельскагаспадарчых культур. Гэта зрабіла яшчэ больш разнастайным рацыён чалавецтва.



Сцэны працы. Роспіс з грабніцы старажытнаегіпецкага мастака Сенеджэма. Пачатак XII ст. да н. э.

*Якія гаспадарчыя заняткі паказаны на роспісе?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Заліўныя землі вялікіх рэк далі небывалыя ўраджаі. Небяспека голаду была прадухілена, пачалі стварацца грамадскія запасы прадуктаў харчавання. У раёнах арашальнага высокаразвітога земляробства адбыўся рэзкі рост насельніцтва. Цяпер не ўвесь чалавечы калектыў павінен быў займацца здабычай харчавання, што дало магчымасць асвойваць новыя кірункі дзейнасці. Узнік ***грамадскі падзел працы***. З'явіліся прафесійныя рамеснікі. Ганчары, кавалі, ткачы і іншыя рамеснікі цяпер займаліся толькі сваёй работай, а вырабы яны маглі абменьваць на прадукты харчавання.

*Складзіце схему (ментальную карту, гекс), якая структуруе веды пра гаспадарчыя заняткі народаў старажытнаўсходніх цывілізацый.*

**Сацыяльная структура грамадства. Гарады-дзяржавы Старажытнага Усходу.** Імклівы рост насельніцтва вёў не толькі да змен у працоўнай дзейнасці. Узнікла ***сацыяльная структура***: людзі пачалі адрозніваццa па становішчы ў грамадстве і па ступені багацця. Сфарміраваліся групы, прадстаўнікі якіх выконвалі новыя важныя функцыі. Так, прафесійныя воіны цяпер абараняли насельніцтва ад нападаў суседніх плямёнаў. Улікам прадуктовых запасаў займаліся спецыяльна падрыхтаваныя адукаваныя людзі — пісцы. Пакланенне багам ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам шматлікіх жрацоў. Структура грамадства значна ўскладнілася.

Падзел працы з вылучэннем рамяства і гандлю, павелічэнне колькасці не занятага ў сельскай гаспадарцы насельніцтва, змены ў сацыяльнай структуры грамадства прывялі да з'яўлення вялікіх паселішчаў. Яны сталі рамеснымі і гандлёвымі цэнтрамі. Для абароны ад ворагаў вакол іх пачалі ставіць абарончыя сцены. Паселішчы станавіліся цэнтрамі кіравання ўсёй вялікай акругай. Тут узводзілі храмы і іншыя грамадскія будынкі. Так з буйны́х паселішчаў сфарміраваліся гарады. Іх узнікненне было прынцыпова новай з'явай у развіцці чалавецтва і значным крокам на шляху да ўтварэння дзяржавы. Першай стадыяй фарміравання дзяржаўных аб'яднанняў сталі ***гарады-дзяржавы*** (вялікія гарады з земляробчай акругай, якая іх карміла).

Першыя гарады ў гісторыі чалавецтва ўзніклі на мяжы IV—III тысячагоддзяў да н. э. у паўднёвай частцы Месапатаміі, у далінах ніжняга цячэння Тыгра і Еўфрата. Іх заснавальнікамі былі шумеры. Шумерскія гарады, сярод якіх найбольш вядомыя Ур, Урук, Лагаш, Кіш, будаваліся вакол храмавых комплексаў. Першыя ўмацаваныя гарады ўражвалі ўяўленне людзей. Горад стаў цэнтрам назапашвання грамадскіх багаццяў. Шумеры дасягнулі поспеху ў многіх рамёствах. Яны актыўна гандлявалі, у тым ліку каб прывозіць металы, якіх не было на іх радзіме. Гарады-дзяржавы шумераў пастаянна ваявалі, імкнуліся павялічыць тэрыторыю, умацаваць сваю палітычную ўладу ў рэгіёне. Найбольш магутныя з іх захоплівалі суседзяў, утвараючы вялікія, але нетрывалыя дзяржаўныя аб'яднанні.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

N.B.

Рэшткі зікурата (культавай пабудовы), што захаваліся ва Уры, даюць уяўленне пра памеры і характар выдатных збудаванняў у шумерскіх гарадах. Зікурат складаўся з трох узнятых адна над адной вежаў, якія ўтваралі тэрасы, злучаныя лесвіцамі. Вежы былі рознага колеру: ніжняя — чорная, абмазаная бітумам, сярэдняя — чырвоная, колеру абпаленай цэглы, верхняя — белая. Над апошняй вежай узвышалася «жыллё бога» — надбудова з глазураванай цэглы, дзе праходзілі рытуальныя цырымоніі і вяліся астранамічныя назіранні. Зікураты будаваліся ва ўсіх месапатамскіх гарадах.



Ва ўрадлівай даліне Ніла, дзе для асушэння балот і абслугоўвання сістэм арашэння патрабаваліся вялікія намаганні, умовы для ўзнікнення і развіцця гарадоў склаліся амаль у той жа час, што і ў Месапатаміі.

У Старажытным Егіпце першыя гарады-дзяржавы (номы) узнікалі гэтак жа, як у Месапатаміі, — вакол храмаў. Іх правіцелі часта паходзілі з асяроддзя жрацоў. Аднак на берагах Ніла барацьба паміж номамі была значна больш інтэнсіўнай. Але вельмі хутка ўвесь Егіпет быў аб’яднаны пад уладай фараонаў. Гэта садзейнічала стварэнню адзінай агульнадзяржаўнай ірыгацыйнай сістэмы. Самыя знакамітыя старажытнаегіпецкія гарады — Мемфіс, Фівы, Ахетатон — былі маляўніча спланаваны: з геаметрычна правільнай сеткай вуліц і выразнымі гарадскімі цэнтрамі, якія ўключалі палацавыя і храмавыя комплексы.



Руіны старажытнага Мемфіса

Будаўніцтва гарадоў у Егіпце і Месапатаміі запатрабавала развіцця архітэктурных навыкаў. Тут упершыню ў гісторыі чалавецтва былі вырашаны галоўныя мастацкія праблемы: архітэктурных прапорцый, манументальнасці, надання велічы грамадскім будынкам, урэшце, стварэння ансамбляў (якія ўключалі ў сябе творы архітэктуры, скульптуры і жывапісу). Як «цуды свету» дагэтуль успрымаюць «вісячыя сады» ў Вавілоне (пра якія засталіся толькі ўспаміны) і старажытнаегіпецкія піраміды. Захаваліся рэшткі старажытных храмаў, якія ўражваюць сваёй веліччу пры максімальнай лаканічнасці архітэктурных формаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Каменная пячатка, знойдзеная ў Харапе.
III тыс. да н. э.

*Вызначце, у якой сучаснай дзяржаве знаходзяцца гарады Махенджа-Дара і Харапа. Падбярыце 5 цікавых фактаў пра Махенджа-Дара і раскажыце аднакласнікам.*

У час археалагічных раскопак былі адкрыты галоўныя гарады Індскай цывілізацыі, якія адносяцца да сярэдзіны III тысячагоддзя да н. э. Яны ўзніклі ў даліне ракі Інд у Паўночна-Заходняй Індыі. Гарады мелі правільную планіроўку: у іх знаходзіліся цытадэль і жылыя раёны, падзеленыя вуліцамі на кварталы. Буйнейшымі цэнтрамі старажытнаіндскай дзяржавы былі гарады Махенджа-Дара і Харапа. Там былі сістэма водазабеспячэння і каналізацыя. Людзі жылі ў адна-, двух- і трохпавярховых дамах. Знаходкі сведчаць пра складаную сістэму грамадскіх адносін. Было развіта рамяство, гандлёвыя сувязі злучалі раён басейна Інда з Шумерам, з Сярэдняй Азіяй, з усім паўвостравам Індастан. Аднак невядома, ці была Індская цывілізацыя адзінай дзяржавай, ці кангламератам (аб'яднаннем) гарадоў-дзяржаў.

У Кітаі найстаражытнейшыя гарады з'явіліся ў даліне Хуанхэ ў пачатку II тысячагоддзя да н. э. На берагах гэтай ракі і яе прытокаў узніклі сталіцы першых дзяржаўных утварэнняў, якія пастаянна ваявалі і перыядычна аб'ядноўваліся пад уладай мацнейшага. Яны былі заснаваны ў зоне арашальнага земляробства адносна блізка адзін ад аднаго, каб была магчымасць кантраляваць сельскую гаспадарку на прылеглых тэрыторыях.

**Стварэнне аб'яднаных дзяржаў і імперый.** З развіццём цывілізацый узмацняліся дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі земляробчых раёнаў. Гарады-дзяржавы паступова ўваходзілі ў склад аб'яднаных дзяржаў, а затым і магутных імперый.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **XXXI–XXVIII стст. да н. э.** Ранняе царства, аб'яднанне Егіпта | **XXVIII–XXI стст. да н. э.** Старажытнае царства | **XXI — сярэдзіна XVI ст. да н. э.** Сярэдняе царства | **Пачатак XVII — сярэдзіна XVI ст. да н. э.** Напад гіксосаў | **Сярэдзіна XVI–VI ст. да н. э.** Новае царства | **525–332 гг. да н. э.** Егіпет пад уладай Персідскай імперыі |

Перыядызацыя гісторыі Старажытнага Егіпта


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Егіпет быў аб'яднаны каля 3000 г. да н. э. Гэтаму шмат у чым садзейнічала неабходнасць арганізацыі адзінага цэнтра, які б каардынаваў працу сістэмы арашальнага земляробства. У Егіпце змяняліся дынастыі; здаралася, што краіну заваёўвалі іншаземныя захопнікі. Аднак на працягу ўсёй старажытнай гісторыі ён працягваў існаваць як адзіная дзяржава. У моманты росквіту фараоны кантралявалі і суседнія краіны. Так, Тутмас III захапіў практычна ўвесь Блізкі Усход і дайшоў з арміяй да Еўфрата.



Старажытны Егіпет у XV ст. да н. э.

Цар Саргон — правіцель невялікага горада Акада — у 2316 г. да н. э. пачаў барацьбу за падпарадкаванне шумерскіх гарадоў. Яму ўдалося заваяваць не толькі шумераў, але і ўсю тэрыторыю Месапатаміі. У выніку ўзнікла першая імперыя, якая кантралявала ўсю даліну Тыгра і Еўфрата і суседнія землі. У далейшым панаванне пераходзіла да розных палітычных цэнтраў. Асабліва доўга яго ўдалося захоўваць Вавілону, які стаў найбуйнейшым горадам усяго Блізкага Усходу, цэнтрам гандлю і культуры. Правіцель Вавілона Хамурапі прыняў звод законаў, які меў на мэце стабілізаваць жыццё дзяржавы і быў пакладзены ў аснову заканадаўства ўсяго Блізкага Усходу.

У сярэдзіне VI ст. да н. э. літаральна за 20 гадоў Персідская імперыя на чале з царом Кірам II падпарадкавала тэрыторыі ўсіх блізкаўсходніх цывілізацый.



Дзяржавы Старажытнай Месапатаміі (*а* — Акадская дзяржава пры Саргоне ў XXIII ст. да н. э.; *б* — Асірыя ў VII ст. да н. э.; *в* — Навававілонскае царства ў VI ст. да н. э.)

*Падрыхтуйце артыкул «10 цікавых фактаў пра Вавілон» для дзіцячага часопіса.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Канец IV тыс. да н. э.** Узнікненне гарадоў-дзяржаў у шумераў | **671 г. да н. э.** Заваяванне асірыйцамі Егіпта | **626–539 гг. да н. э.** Навававілонскае царства | **II в. да н. э.** Заваяванне Месапатаміі Парфіяй |
| **2316–2200 гг. да н. э.** Кіраванне Акадскай дынастыі | **689 г. да н. э.** Разбурэнне Вавілона асірыйцамі | **612 г. да н. э.** Падзенне Ніневіі | **300 г. да н. э.** Заснаванне дзяржавы Селеўкідаў |
| **2111–2003 гг. да н. э.** III дынастыя Ура | **XV в. да н. э.** Узнікненне Асірыйскага царства | **605 г. да н. э.** Канец Асірыйскага царства | **331 г. да н. э.** Заваяванне Вавілона Аляксандрам Македонскім |
| **1894–1595 гг. да н. э.** Старававілонскае царства | **1596 г. да н. э.** Узяцце хетамі Вавілона | **597, 587 г. да н. э.** Захопы вавіланянамі Іерусаліма | **539 г. да н. э.** Узяцце персамі Вавілона, гібель Навававілонскага царства |

Перыядызацыя гісторыі Старажытнай Месапатаміі

*Назавіце ключавыя падзеі, якія паўплывалі на ход гістарычнага развіцця Старажытнай Месапатаміі. Растлумачце, чаму вы выбралі менавіта гэтыя падзеі.*

Персы былі ваяўнічым качавым народам, які жыў на поўнач ад Месапатаміі. Яны здолелі стварыць стройную сістэму кіравання скоранымі землямі. Упершыню ў гісторыі з'явілася імперыя, якая выйшла за рамкі адной цывілізацыі.




Дзяржава Маур'яў пры Ашоку ў III ст. да н. э.




Персідская дзяржава ў канцы VI ст. да н. э.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У 317 г. да н. э. даліны рэк Інд і Ганг, а таксама практычна ўся тэрыторыя Індыі былі аб’яднаны імперыяй дынастыі Маур’яў. Найбольшай магутнасці гэтая дзяржава дасягнула пры імператары Ашоку, які актыўна пашыраў будызм не толькі ў самой Індыі, але і за яе межамі.

Старажытны Кітай быў аб’яднаны імператарам Цынь Шыхуандзі ў 221 г. да н. э. Гэты правіцель стварыў дзяржаву, якая пачала пашыраць свае межы ў далінах рэк Хуанхэ і Янцзы. Горад Сяньян, сталіца дзяржавы Цынь, у часы праўлення Цынь Шыхуандзі налічваў каля 1 млн жыхароў. У той жа час дзеля абароны ад нападаў качэўнікаў пачалі будаваць Вялікую Кітайскую сцяну ўздоўж усёй паўночнай мяжы дзяржавы. У хуткім часе Вялікі шаўковы шлях злучыў Кітай з іншымі старажытнымі цывілізацыямі.



Імперыя Цынь у момант найбольшага тэрытарыяльнага пашырэння ў канцы III ст. да н. э.

| XVII–XI стст. да н. э. | XI–VIII стст. да н. э. | VII–III стст. да н. э. | 221–206 стст. да н. э. | 206 г. да н. э. – 220 г. |
|---|---|---|---|---|
| Перыяд дзяржавы Шан-Інь | Перыяд адзінай дзяржавы Чжоу | Распад Чжоу, перыяд «змагання царстваў» | Кіраванне дынастыі Цынь | Кіраванне дынастыі Хань |

Перыядызацыя гісторыі Старажытнага Кітая

*Складзіце сінхранічную табліцу развіцця старажытнаўсходніх дзяржаў, выкарыстоўваючы стужкі часу ў параграфе і храналагічную табліцу ў пачатку раздзела.*

Такім чынам, на змену лакальным гарадам-дзяржавам прыйшлі магутныя імперыі, якія распаўсюджвалі сваю ўладу на ўсю тэрыторыю першых земляробчых цывілізацый.

**Ачаговы характар развіцця старажытнаўсходніх цывілізацый.** Цывілізацыі Старажытнага Усходу, якія склаліся ў басейнах рэк (Ніла, Тыгра і Еўфрата, Інда і Ганга, Хуанхэ і Янцзы), былі аддзелены адна ад адной вялікімі адлегласцямі і таму амаль не мелі сувязяў паміж сабой.

*Як вы разумееце словазлучэнне «ачаговы характар развіцця» ў назве пункта?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гэтая ізаляванасць адыгрывала супярэчлівую ролю ў іх лёсах: цяжкапераадольныя прыродныя бар'еры (горы, пустыні, бязводныя стэпы, моры) абаранялі басейны рэк — калыскі гэтых цывілізацый — ад нападу звонку, але яны ж, абмяжоўваючы знешнія сувязі, часам запавольвалі развіццё грамадскіх адносін. Ізаляванасць і кансерватыўнасць развіцця старажытнаўсходніх цывілізацый садзейнічалі захаванню нязменных традыцый, непадзельнаму панаванню рэлігій у ідэйным жыцці, панаванню ўсталяваных канонаў у архітэктуры і мастацтве.

Узнікнуўшы незалежна адна ад адной, цывілізацыі Старажытнага Усходу істотна адрозніваліся. Толькі паступова яны знаходзілі шляхі ўзаемадзеяння і наладжвалі кантакты, спачатку гандлёвыя і палітычныя, затым культурныя.

Аднак асноўныя гаспадарчыя, земляробчыя традыцыі, арганізацыя грамадства разгляданых цывілізацый мелі вельмі шмат агульнага. Менавіта таму мы можам вывучаць іх у адзінстве. Арашальнае земляробства было асновай гаспадаркі. Яно вызваліла ад пастаяннай неабходнасці здабываць пракорм і стварыла умовы для фарміравання новага грамадства, якому ўласцівая сацыяльная дыферэнцыяцыя. Рост колькасці насельніцтва і, як вынік, павелічэнне працоўных рэсурсаў стварылі перадумовы для ўзнікнення адзіных дзяржаў, на чале якіх стаяў правіцель з неабмежаванай уладай.

*Дзяржаўнасць Старажытнага Усходу прайшла ў сваім развіцці некалькі этапаў: першапачаткова з'явіліся племянныя аб'яднанні, у якіх сфарміраваліся гарадскія паселішчы; з развіццём палітычнай ролі гарадоў узніклі гарады-дзяржавы; у розных формах ішлі аб'яднаўчыя працэсы, вынікам якіх стала фарміраванне вялізных імперый.*

1. Растлумачце, як прыродныя ўмовы ўплывалі на рассяленне, гаспадарку, арганізацыю і лад жыцця людзей.
2. Якую ролю ў станаўленні і развіцці кожнай са старажытнаўсходніх цывілізацый адыгрывалі прыродныя ўмовы і геаграфічнае становішча? Што было агульным? У чым былі адрозненні? Выкарыстайце картаграфічны матэрыял. Адказ адлюструйце ў сшытку ў выглядзе табліцы. Крытэрыі для параўнання вызначце самастойна. Складзіце стужку часу, якая ілюструе ўзнікненне старажытных цывілізацый.
3. Вызначце і растлумачце заканамернасці з'яўлення падзелу працы і сацыяльнай дыферэнцыяцыі.
4. Чаму пра гарады, якія ўзніклі на мяжы IV–III тысячагоддзяў да н. э., гавораць як пра прынцыпова новую з'яву ў гісторыі?
5. Параўнайце цывілізацыі Старажытнага Усходу, адзначыўшы агульныя і адрозныя рысы ў іх гаспадарчай дзейнасці.
6. Якім чынам адбывалася стварэнне аб'яднаных дзяржаў Старажытнага Усходу? Чаму яны ўзнікалі ў раёнах першых земляробчых цывілізацый?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, у тым ліку рэсурсы сеткі інтэрнэт, падбярыце фатаграфіі, ілюстрацыі, якія сведчаць аб тым, што старажытнаегіпецкія дойліды ўслаўлялі ў сваіх творах неабмежаваную ўладу цара, які абагаўляўся. Прадстаўце вынік работы ў выглядзе каталога (прэзентацыі, буклета) або фотавыставы з кароткім апісаннем архітэктурных помнікаў.

# § 4. Грамадства і дзяржава ў краінах Старажытнага Усходу

*Чаму менавіта форма ўсходняй дэспатыі была прынятая як форма кіравання пры складанні новых дзяржаўных утварэнняў?*



*Дзе і калі зарадзіліся старажытныя цывілізацыі? Пералічыце ўсе найбуйнейшыя цывілізацыі, якія існавалі ў I тысячагоддзі да н.э., і пакажыце іх на карце. Якую ролю ў жыцці старажытных цывілізацый адыгрывала геаграфічнае размяшчэнне? Якой была сацыяльная стратыфікацыя ў старажытнаўсходнім грамадстве?* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас)

**Усходняя дэспатыя.** У ходзе станаўлення імперый у раёнах старажытнаўсходніх цывілізацый склалася своеасаблівая форма дзяржаўнага праўлення — ***усходняя дэспатыя***, пры якой на чале краіны стаяў правіцель з неабмежаванай уладай. Правіцель лічыўся ўласнікам усёй зямлі ў краіне. Усякае яго рашэнне было вышэйшае за любыя законы або традыцыі. Улада ў дзяржаве перадавалася ў спадчыну. Больш за тое, сама ўлада лічылася атрыманай ад багоў, а асоба правіцеля абагаўлялася. У выніку існаваў развіты культ правіцеля, яму пакланяліся.

Чаму ж ва ўсіх дзяржавах Старажытнага Усходу ўсталявалася такая форма праўлення, пры якой насельніцтва не мела ніякіх правоў і беспярэчна падпарадкоўвалася спадчыннаму правіцелю? Перш за ўсё трэба памятаць, што высокапрадукцыйнае ірыгацыйнае земляробства старажытнаўсходніх цывілізацый патрабавала зладжанай арганізацыі працы абшчын земляробаў. Падпарадкаваныя правіцелю чыноўнікі і пісцы каардынавалі і кантралявалі сельскагаспадарчыя работы, уключаючы збор ураджаю, які ў далейшым рознымі спосабамі пераразмяркоўваўся паміж усім насельніцтвам. Паступова земляробы зазнавалі ўсё большую эксплуатацыю, каб дзяржава магла атрымліваць большыя ўраджаі.

Правіцелю даводзілася абараняць насельніцтва ад нападаў. Ён камандаваў арміяй, якая адбівала напады і ўварванні суседніх народаў або захоплівала новыя


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

тэрыторыі. Адначасова армія была гатовая падавіць і выступленні народа супраць правіцеля.

Правіцель праз шматлікіх чыноўнікаў поўнасцю кантраляваў жыццё ўсяго насельніцтва, мог умешвацца нават у справы асобных сем'яў. Людзі плацілі вялікія падаткі дзяржаве, іх колькасць і велічыню правіцель рэгуляваў па сваім жаданні. Часта праводзіліся маштабныя будаўнічыя работы, што забяспечвалі занятасць насельніцтва, колькасць якога расла хуткімі тэмпамі. Такім чынам, у руках правіцеля была сканцэнтраваная адміністрацыйная, ваенная, судовая, падатковая, гаспадарчая ўлада. Грамадства практычна не магло ўплываць на яго палітыку. У розных цывілізацыях усходняя дэспатыя мела пэўныя асаблівасці, але прынцыпы формы праўлення былі адзіныя.

Моцная дэспатычная, аднаасобная ўлада правіцеля пры існаванні разгалінаванага апарату чыноўнікаў забяспечвала ў перыяд фарміравання дзяржавы стабільнасць жыцця грамадства, садзейнічала аб'яднанню інтарэсаў розных сацыяльных груп, прадухіляла ўзнікненне адкрытых сацыяльных канфліктаў. А гэта, у сваю чаргу, было перадумовай стабільнасці самой усходняй дэспатыі як формы праўлення ў дзяржаве.




Асноўныя рысы ўсходніх дэспатый

*Якое азначэнне паняццю «ўсходняя дэспатыя» вы далі б для слоўніка гістарычных тэрмінаў? Параўнайце яго з азначэннем, прыведзеным у слоўніку вучэбнага дапаможніка.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

N.B.

У Егіпце фараона шанавалі як бога. Егіпцяне лічылі, што ён кіруе разлівамі Ніла. Жрацы вылічвалі дату пачатку разліву, і за некалькі дзён да яе фараон выходзіў са свайго палаца на бераг ракі, кідаў у яе папірус з загадам. Разліў Ніла ўспрымалі як доказ боскай сілы імператарскай волі. Статуі фараона адлюстроўвалі ідэальнага чалавека, а па велічыні яны былі роўныя са статуямі багоў і ў дзясяткі разоў перасягалі статуі людзей. Імя фараона нельга было вымаўляць услых.

Правіцелі Старажытнай Месапатаміі гаварылі пра сябе як пра «цароў чатырох бакоў свету». Лічылася, што багі спрыяюць ім і перадаюць сваю сілу і мудрасць. Напрыклад, цар Хамурапі сцвярджаў, што ён атрымаў законы ад бога Шамаша.

Законы Старажытнай Індыі апісваюць цара як магутную існасць, якая спалучала ў сабе часцінкі розных багоў. «І ён, падобна як сонца, пячэ вочы і сэрца, і ніхто на зямлі не можа нават глядзець на яго».

У Кітаі імператара шанавалі як Сына Неба — вярхоўнага бажаства.

**Сацыяльныя адносіны панавання-падпарадкавання.** Старажытнаўсходняе грамадства было іерархічным і падзялялася на саслоўі, прыналежнасць да якіх была спадчыннай. У аснове саслоўнага падзелу знаходзіўся грамадскі падзел працы: саслоўі адрозніваліся менавіта па іх гаспадарчай або дзяржаўнай дзейнасці. Кожнае з іх мела свае абавязкі, правы і прывілеі, гэта значыць адрознівалася ад іншых сацыяльным становішчам. Чалавек у адпаведнасці з прыналежнасцю да саслоўя займаў строга вызначанае месца ў сацыяльнай іерархіі. Паступова яна ўскладнялася, станавілася ўсё больш дыферэнцыраванай і разгалінаванай.

Структуру грамадства старажытнаўсходніх цывілізацый можна адлюстраваць у выглядзе іерархічнай «сацыяльнай піраміды». На вяршыні іерархіі стаяў правіцель, якога абагаўлялі, які валодаў усёй паўнатой улады і лічыўся ўласнікам зямлі.

Высокае становішча займала радавая і ваенная *арыстакратыя* (знаць), а таксама жрацы. Арыстакратыя фарміравалася са сваякоў правіцеля, буйны́х землеўладальнікаў з розных раёнаў краіны і, вядома, вярхоўных военачальнікаў. Паступова яе прадстаўнікі пачалі займаць высокія дзяржаўныя пасады і ўплываць на кіраванне краінай праз выкананне абавязкаў. Паспяховыя заваёўніцкія войны прыносілі арыстакратыі новыя землі і багацце.

Важную ролю ў грамадстве адыгрывалі шматлікія *чыноўнікі*, якія выконвалі функцыю кіравання дзяржавай, — адсюль іх высокі сацыяльны статус. Яны складалі адукаваную частку грамадства. Чыноўнікі адказвалі за арганізацыю сельскагаспадарчых работ і будаўніцтва, сачылі за станам каналаў, спаганялі падаткі з насельніцтва, набіралі воінаў для паходаў, чынілі суд і г. д. Пасада чыноўніка


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

давала ўстойлівае сацыяльнае становішча, уладу над людзьмі, матэрыяльны дабрабыт або нават багацце, аднак усе гэтыя перавагі чалавек атрымліваў толькі на час службы. Сярод чыноўнікаў найбольш нізкі статус мелі пісцы, абавязкам якіх была фіксацыя аб'ёму выкананых работ, ураджаю, падаткаў, даўгоў і проста важных падзей.

Для жрацоў і дзяржаўных чыноўнікаў былі вельмі важныя пісьменнасць, а таксама веды ў пэўных галінах (медыцыне, матэматыцы, геаметрыі, астраноміі і г. д.). Мэтай навучання ў старажытнаўсходнім грамадстве было асваенне прафесіі, якую дзеці павінны былі атрымаць у спадчыну ад бацькі. «Глядзі, няма іншай пасады, акрамя пасады пісца, дзе чалавек заўсёды начальнік», — гаворыць адно са старажытнаегіпецкіх павучанняў. У Кітаі са старажытнасці існавалі спецыяльныя экзамены для чыноўнікаў. Павышэнне чыну або пасады адбывалася толькі ў выпадку паспяховай здачы экзамену, які прымалі вышэйшыя чыноўнікі.

*Купцы, воіны, рамеснікі* і *гандляры* карысталіся цэлым шэрагам прывілей. Купцы прывозілі здалёк тавары, якіх не было ў краіне, таму іх часта падтрымлівала дзяржава. Да таго ж яны нярэдка выступалі і як разведчыкі. Важнай для грамадства групай былі воіны. Багацце першых земляробчых цывілізацый спакушала суседзяў на напады і рабаванні. Менавіта воіны абаранялі краіну або ўдзельнічалі ў заваёўніцкіх войнах, якія прыносілі багатую здабычу. Таму воіны жылі шмат у чым за кошт дзяржавы.



Структура старажытнаўсходняга грамадства

Даволі шматлікім было саслоўе рамеснікаў, якія ў асноўным жылі ў гарадах. Яны выраблялі многія важныя рэчы: прылады працы і зброю, адзенне і посуд, упрыгажэнні, будавалі жыллё. На працягу некалькіх тысяч гадоў менавіта рамеснікі стваралі найбольш значныя для грамадства тавары. Правіцелі былі зацікаўлены ў прыцягненні ў краіну рамеснікаў рэдкіх спецыялізацый. Гандляры актыўна перавозілі тавары рамеснікаў, земляробаў і жывёлаводаў паміж блізка размешчанымі раёнамі.

Асноўную частку грамадства складалі *свабодныя земляробы*, якія аб'ядноўваліся ў абшчыны. Дабрабыт краін Старажытнага Усходу залежаў менавіта ад іх, таму абшчыны мелі нямала правоў. Земляробы апрацоўвалі зямлю, якая звычайна перадавалася ім у бестэрміновае карыстанне. Дзяржаве было важна атрымліваць частку


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ўраджаю, каб можна было забяспечваць прадуктамі адміністрацыйны апарат і армію. Абшчыны былі закрытыя і ўсе свае пытанні вырашалі самастойна. Заможныя «вярхі» адказвалі перад чыноўнікамі за выплату падаткаў і выкананне павіннасцяў. Усе члены абшчыны былі звязаны кругавой парукай, што азначала ўзаемадапамогу, але адначасова і адказнасць за ўчыненыя кім-небудзь злачынствы. Чалавек мог заўсёды разлічваць на дапамогу абшчыны, але разам з тым павінен быў асабістыя інтарэсы падпарадкоўваць грамадскім, сваё меркаванне ўзгадняць з меркаваннем старэйшых сваякоў, суседзяў-абшчыннікаў, жыць па ўсталяваных традыцыях. Традыцыя і кругавая парука забяспечвалі стабільнасць жыцця такіх калектываў у старажытнасці.

Трагедыяй для земляроба было пазбаўленне падтрымкі абшчыны, якое адбывалася, калі ён станавіўся даўжніком або апынаўся ізгоем. Гэта сведчыла аб узнікненні маёмаснага расслаення. Выгнаны па розных прычынах з абшчыны земляроб траціў свой надзел, а значыць, крыніцы існавання. Такія людзі рабіліся залежнымі: цяпер яны маглі працаваць на землях правіцеля, арыстакратыі або храмаў. Уладальнік зямлі мог распараджацца не толькі іх працай, але і імі самімі, яны ўжо не мелі права сысці з зямлі свайго ўладальніка.

Саслоўны іерархічны падзел грамадства ў краінах Старажытнага Усходу быў арганізаваны па-рознаму. У Егіпце дзяржава амаль поўнасцю кантралявала грамадскае жыццё, асобныя групы насельніцтва доўгі час практычна не мелі правоў. Затое егіпцянін мог павысіць свой статус, напрыклад, у маладосці асвоіўшы пісьмо і стаўшы пісцом. У Месапатаміі правы розных груп насельніцтва былі абаронены законамі. У Індыі склалася вельмі трывалая сістэма варнаў, а затым кастаў, так што чалавек ні пры якіх абставінах не мог змяніць сваю прыналежнасць да касты, у якой нарадзіўся. У Кітаі грамадства таксама было строга іерархічнае, але людзі маглі за пэўныя заслугі павысіць свой статус, пераходзячы ў больш высокі ранг.

Самае нізкае становішча ў старажытнаўсходнім грамадстве займалі рабы — несвабоднае насельніцтва, якое складалася з палонных або даўжнікоў. У ходзе пасляховых заваёўніцкіх войнаў часта захоплівалі вялікую колькасць палонных. Адпусціць іх было немагчыма, паколькі яны працягвалі б супраціўляцца. Выкарыстоўваць у сябе ў краіне было складана: яны часцей за ўсё не маглі выконваць кваліфікаваную, адказную работу.




Структура старажытнаегіпецкага грамадства


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Крыніцы рабства на Старажытным Усходзе**

- Ваенны палон
- Пірацтва і разбой
- Злачынства
- Самапродаж
- Нараджэнне ў рабстве

У шэрагу краін існавала даўгавое рабства, калі людзей ператваралі ў рабоў за даўгі. Яно не абавязкова было пажыццёвым: адпрацаваўшы свой доўг, учарашні нявольнік зноў станавіўся свабодным чалавекам. У Кітаі свабодных людзей нярэдка аддавалі ў рабства за злачынствы перад дзяржаўнай уладай. Дзеці, народжаныя рабынямі, таксама станавіліся рабамі.

У старажытных цывілізацыях Усходу рабства было прыкметнай з'явай, аднак праца рабоў не была пануючай формай працы і не адыгрывала вызначальнай ролі ў грамадскім жыцці. Хутчэй яна выконвала дапаможную функцыю адносна работы земляробаў і рамеснікаў. Рабоў выкарыстоўвалі ў якасці слуг у палацах і храмах, на падсобных работах у рамястве і гандлі, для выканання самай цяжкай або небяспечнай работы, напрыклад, у рудніках або каменяломнях. Яны былі ўласнасцю свайго гаспадара, які распараджаўся не толькі іх працай, але і іх жыццём. За самы нязначны ўчынак іх маглі жорстка пакараць. Аднак існавала і хатняе рабства, калі рабы жылі ў складзе вялікай патрыярхальнай сям'і, дзе яны выконвалі работу па гаспадарцы.

**Сістэма дзяржаўнага кіравання.** Сістэма дзяржаўнага кіравання адыгрывала вызначальную ролю ва ўмовах, калі сацыяльныя структуры толькі складваліся. Эканамічнай асновай функцыянавання грамадства пры ўсходняй дэспатыі была дзяржаўная ўласнасць на зямлю. З аднаго боку, дзяржава на чале з правіцелем, якога абагаўлялі, была гарантам нармальнага функцыянавання грамадства і арганізацыі работ, з іншага — менавіта дзяржава пачала выступаць як інструмент эксплуатацыі часткі насельніцтва. А гэта выклікала супраціўленне і канфлікты.

Грамадства бачыла ў правіцелі захавальніка традыцый і парадку, якія звязваліся са спрыяннем багоў. Традыцыі павінны былі заставацца нязменнымі, а правіцель меў права судзіць за іх парушэнне. Такім чынам, яго постаць была звязана з ідэяй грамадскага дабрабыту і справядлівасці. Менавіта таму грамадства гатовае было падпарадкоўвацца правіцелю і яго чыноўнікам.

Часцей за ўсё правіцелі старажытнаўсходніх дэспатый уводзілі дзве пасады, на якія людзей назначалі асабіста: кіраўніка арміі (военачальніка) і кіраўніка адміністрацыйнага апарату.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Военачальнікі арганізоўвалі і кантралявалі армію, што вызначала іх вялікі ўплыў на палітыку правіцеляў. Кіраўнік дзяржаўнага апарату (канцылярыі) кіраваў усімі справамі ў краіне. Асобныя ведамствы фарміраваліся пастунова. Сярод іх можна вылучыць ведамствы, якія займаліся ўлікам ураджаю і дзяржаўных запасаў, зборам падаткаў, грамадскімі работамі (у краінах Старажытнага Усходу насельніцтва было абавязана не толькі плаціць падаткі дзяржаве, але і выконваць дзяржаўныя павіннасці — грамадскія работы, да якіх адносіліся будаўніцтва ірыгацыйных каналаў і дзяржаўных сховішчаў, палацаў, крэпасцяў і храмаў, пракладанне дарог і вытворчасць важных рамесных вырабаў, узвядзенне раскошных грабніц правіцеляў).

Выразных межаў паміж ведамствамі і іх паўнамоцтвамі ў старажытнасці яшчэ не існавала. Таму чыноўнікаў было шмат: яны павінны былі ўсё арганізоўваць і сачыць за тым, што адбывалася ў дзяржаве, а таксама выконваць любыя даручэнні правіцеля. Ніводнае мерапрыемства не адбывалася без іх удзелу.

Увесь бюракратычны апарат быў выбудаваны ў адпаведнасці са строгай і выразнай іерархіяй, звязанай з існаваннем пасад высокіх і нізкіх рангаў. Чыноўнікі кожнага з рангаў адрозніваліся па сваім сацыяльным становішчы, для іх было прадугледжана спецыяльнае адзенне, а іншым разам нават ежа.

**Адметныя рысы старажытных грамадстваў, якія ўзніклі на Усходзе:**

- усходняя дэспатыя як форма ўладкавання дзяржавы;
- абсалютная (дэспатычная) улада правіцеля;
- абагаўленне ўлады спадчыннага правіцеля;
- панаванне дзяржаўнай уласнасці, перш за ўсё на зямлю;
- усеўладдзе дзяржаўнага апарату і прывілеяванае становішча чыноўнікаў;
- іерархічная структура грамадства, якое складаецца з саслоўяў;
- арганізацыя гаспадарчага жыцця дзяржаўным апаратам, жорсткая эксплуатацыя насельніцтва.

На ўсім працягу гісторыі Старажытнага Усходу дэспатыя як форма дзяржаўнага кіравання лічылася традыцыйнай, асвячонай рэлігіяй і адзіна магчымай. Часам адбываліся разбуральныя народныя паўстанні або ўварванні іншаземных народаў. Але форма кіравання пры гэтым заўсёды захоўвалася. Напрыклад, паўстанні ў Старажытным Кітаі і Старажытным Егіпце неаднаразова прыводзілі да звяржэння кіроўных дынастый, але ў выніку правадыры паўстанцаў станавіліся новымі правіцелямі, а іх паплечнікі — новымі арыстакратамі, займаючы высокія пасады


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ў дзяржаўным апараце. Тое ж адбывалася, калі тэрыторыю земляробчай цывілізацыі захоплівалі. Заваёўнікі стваралі новую дынастыю, якая арганізоўвалася паводле традыцыйнага прынцыпу, захопнікі паступова змешваліся з мясцовым насельніцтвам.

§ 4–1

*Формай дзяржаўнага ўладкавання краін Старажытнага Усходу стала ўсходняя дэспатыя. Грамадства было арганізавана па прынцыпе іерархіі саслоўяў. Абагаўлёны і ўсеўладны правіцель і яго бюракратычны апарат арганізоўвалі ўсё гаспадарчае і сацыяльнае жыццё. Адначасова правіцель быў гарантам стабільнасці існавання грамадства. Імкненне да атрымання ўсё больш высокіх ураджаяў вяло да неабходнасці ствараць вялікія ірыгацыйныя сістэмы, што прыводзіла да падпарадкавання і жорсткай эксплуатацыі часткі насельніцтва. Буйнейшыя збудаванні старажытнаўсходніх дэспатый маглі быць створаны пры слабым тэхнічным аснашчэнні толькі праз выкарыстанне вельмі напружанай працы нявольнікаў.*

**1.** Якія асноўныя функцыі выконваў апарат дзяржаўнай улады ў краінах Старажытнага Усходу?
**2.** Якое значэнне мела тое, што правіцель лічыўся ўласнікам усёй зямлі? У якім становішчы адносна яго знаходзіліся ўсе астатнія слаі насельніцтва?
**3.** Прывядзіце прыклады, якія сведчылі аб абагаўленні правіцеляў у старажытнасці. Чым была абумоўлена гэтая з'ява?
**4.** Растлумачце, якое значэнне мела для чалавека ў старажытных грамадствах прыналежнасць да пэўнага саслоўя. Прывядзіце прыклады.
**5.** Назавіце асаблівасці сацыяльнай структуры старажытнаўсходніх дзяржаў. У чым было падабенства і адрозненні ў сацыяльнай структуры розных краін?
**6.** Растлумачце прычыны з'яўлення дзяржаў з усходняй дэспатыяй, выкарыстоўваючы вучэбны матэрыял і схему.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 5. Старажытная Грэцыя



*Чым развіццё антычнай цывілізацыі адрознівалася ад развіцця старажытнаўсходніх цывілізацый?*

*Якім чынам прыродныя і геаграфічныя асаблівасці паўплывалі на развіццё антычных дзяржаў? Успомніце паняцці «поліс», «Вялікая грэчаская каланізацыя», «элінізм».* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас)

**Ля вытокаў старажытнагрэчаскай цывілізацыі.** ***Антычнасць*** (ад лац. *antiquus* — старажытны) — гісторыя і культура старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай цывілізацыі, якая стала асновай развіцця цывілізацыі Еўропы. Перыяд Антычнасці пачаўся ў VIII ст. да н. э. з фарміравання грэчаскіх полісаў, а завяршыўся ў V ст. н. э. падзеннем Заходняй Рымскай імперыі.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Мяжа III—II тыс. да н. э. — XII ст. да н. э.** Крыта-мікенская Грэцыя | **XI–IX стст. да н. э.** «Гамераўская Грэцыя» | **VIII–VI стст. да н. э.** Архаічны перыяд | **V–IV стст. да н. э.** Класічны перыяд | **Канец IV — I ст. да н. э.** Элліністычны перыяд |

Перыядызацыя гісторыі Старажытнай Грэцыі

*Растлумачце назву кожнага з перыядаў гісторыі Старажытнай Грэцыі.*

Першыя дзяржаўныя ўтварэнні ўзніклі на востраве Крыт і на поўдні мацерыковай часткі Грэцыі. Па сваёй палітычнай і сацыяльнай структуры яны былі падобныя на дэспатыі цывілізацый Усходу.

На востраве Крыт на мяжы III–II тысячагоддзяў да н. э. пачала развівацца самастойная цывілізацыя. Яе цэнтрам стаў горад Кнос. Згодна з грэчаскімі міфамі, Кносам кіраваў магутны цар Мінас, які здолеў усталяваць кантроль над Эгейскім морам і яго архіпелагам. Крыцяне наладзілі гандлёвыя сувязі з Егіптам, Фінікіяй, Сіцыліяй. Крыцкія паселішчы з'явіліся на астравах Эгейскага мора і ў Малой Азіі.

У сярэдзіне XV ст. да н. э. адбылася катастрофа — моцнае вывяржэнне вулкана на в. Фера (Сантарын) выклікала землятрус, цунамі і выкід попелу, якія абрынуліся на Крыт. Паселішчы прыйшлі ў заняпад або былі цалкам разбураны. Каля 1450 г. да н. э. востраў захапілі і разрабавалі грэкі-ахейцы, якія ўварваліся з мацерыка. Развітая цывілізацыя загінула, Крыт ператварыўся ва ўскраіну грэчаскага свету.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Цэнтрамі дзяржаў ахейцаў таксама былі палацы, але з магутнымі ўмацаваннямі. Адным з наймацнейшых у грэкаў-ахейцаў быў горад Мікены на паўвостраве Пелапанэс. Адсюль і назва цывілізацыі — мікенская.

Палітычнае кіраванне Мікенаў таксама нагадвала ўсходнюю дэспатыю. У цэнтры Мікенаў знаходзіўся добра ўмацаваны палац-акропаль, які ўзвышаўся над паселішчам. Ён быў цэнтрам кіравання і ўлады, адначасова там ішла гаспадарчая дзейнасць, якую арганізоўваў правіцель. Пра багацце правіцеляў Мікенаў сведчаць іх пахаванні: на твар нябожчыку ўкладвалі залатую маску, якая паўтарала яго рысы, у магілу клалі вялікую колькасць прадметаў раскошы, у тым ліку з золата.

**N.B.**

Цары ахейцаў варагавалі паміж сабой, але аб’ядноўваліся для рабаўніцкіх нападаў. Каля 1240 г. да н. э. адбыўся буйнейшы з нападаў на чале з царом Мікенаў Агамемнанам. Ахейцы напалі на Трою — багаты гандлёвы горад на паўночным узбярэжжы Малой Азіі.

Старажытнагрэчаскі паэт Гамер, які жыў, як мяркуецца, у VIII ст. да н. э., праславіў Траянскую вайну ў паэмах «Іліяда» і «Адысея». Доўгі час лічылася, што паэмы заснаваны толькі на міфах. Але ў XIX ст. нямецкі гандляр і археолаг Генрых Шліман адшукаў легендарную Трою на ўзгорку Гісарлык (Турцыя) і Мікены на паўвостраве Пелапанэс. Яго раскопкі даказалі гістарычнасць Траянскай вайны.

У канцы XIII — пачатку XII ст. да н. э. з поўначы Балканаў прыйшлі новыя заваёўнікі — грэкі-дарыйцы, мікенская цывілізацыя загінула. У дарыйцаў у той час яшчэ не было дзяржаўнасці. Яны не мелі пісьменства, таму перыяд з XI па IX ст. да н. э. называюць «цёмным» у гісторыі Грэцыі, паколькі не існуе пісьмовых крыніц для яго вывучэння.

**Прыродныя ўмовы. Асноўныя гаспадарчыя заняткі насельніцтва.** Геаграфічныя ўмовы Старажытнай Грэцыі вельмі моцна адрозніваліся ад умоў, у якіх развіваліся цывілізацыі Старажытнага Усходу. Тут не было вялікіх урадлівых рачных далін, дзе можна весці высокапрадукцыйнае земляробства. Наадварот, уся тэрыторыя падзялялася гарамі на невялікія ўчасткі, а мора вакол налічвала мноства астравоў (каля 2 тыс.). Горы займалі $^4/_5$ усёй тэрыторыі, прычым астравы таксама былі гарыстыя. Таму не ўся Грэцыя была прыдатнай для пражывання.

Геаграфічныя ўмовы ўплывалі як на метады вядзення гаспадаркі, так і на рассяленне грэкаў. Насельніцтва канцэнтравалася на зручных участках марскога ўзбярэжжа, у адасобленых горных далінах, на асобных астравах. Астатняя частка тэрыторыі была маланаселенай. Такое становішча з самага пачатку не садзейнічала стварэнню адзінай дзяржавы.

Нярэдка здаралася, што насельніцтва нейкага раёна Грэцыі хутка расло, і неўзабаве аказвалася, што немагчыма пракарміць усіх. Тады частка людзей сядала на караблі, каб адплыць на незанятую зямлю. Гэты працэс, у выніку якога грэкі засялілі ўзбярэжжа Міжземнага і Чорнага мораў, атрымаў назву ***«Вялікая грэчаская***


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Вялікая грэчаская каланізацыя (VIII–VI стст. да н. э.)

***каланізацыя»***. Горад-поліс, з якога грэкі адправіліся ў дарогу, — метраполія — засноўваў гарады-калоніі, што захоўвалі сувязь з ім. Але, нягледзячы на ўсе намаганні па рассяленні, пагроза перанаселенасці заўсёды была праблемай для Старажытнай Грэцыі.

Эканоміка Грэцыі мела пераважна натуральны характар, самымі распаўсюджанымі заняткамі былі жывёлагадоўля і земляробства. Прычым апошняе ўяўляла сабой нялёгкую справу з-за малой плошчы ўрадлівых зямель і камяністасці глебы. Хлеба заўсёды не хапала, толькі пазней яго пачалі прывозіць з грэчаскіх калоній або з Егіпта. Затое непатрабавальныя аліўкавыя дрэвы і вінаградная лаза давалі багата пладоў, якія складалі аснову рацыёну. Прадукты жывёлагадоўлі (развядзенне авечак і коз) адыгрывалі найважнейшую ролю ў харчаванні грэкаў. Самай распаўсюджанай ежай былі казінае малако, сыр і аліўкі. Важным дадаткам у рацыёне была рыба. Вырашчаны лён выкарыстоўвалі для вытворчасці тканін.

Грэцыя была багатая на карысныя выкапні: у вялікай колькасці здабываліся гліна, мармур, металы (жалеза, медзь, серабро, свінец). Грэкі хутка асвоілі апрацоўку жалеза і актыўна прымянялі яго ва ўсіх сферах жыцця. Яны былі бясстрашнымі і ўмелымі мараплаўцамі. Многія рэсурсы, у якіх яны мелі патрэбу, грэкі атрымлівалі дзякуючы развітому гандлю, прывозячы неабходнае нават з вельмі аддаленых тэрыторый. У рэгіёне Міжземнамор'я пачала складвацца сетка гандлёва-эканамічных сувязяў. Рамяство і гандаль былі важнымі складнікамі эканамічнага росквіту.

**Антычны поліс. Правы грамадзян.** Форма дзяржаўнага кіравання кшталту ўсходняй дэспатыі не замацавалася ў Грэцыі. Грэчаскія дзяржавы, якія нядаўна зарадзіліся, выбралі іншы шлях сацыяльна-палітычнага развіцця. У Старажытнай Грэцыі склалася ўнікальная полісная структура грамадства. ***Поліс*** у палітычных адносінах быў формай дзяржавы, гэта быў горад-дзяржава. Гарады-дзяржавы існавалі і на Старажытным Усходзе. Аднак сацыяльная аснова грэчаскага поліса была зусім іншай. Жыхарамі поліса былі ***грамадзяне***, якія не толькі мелі абавязкі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

перад ім, але і карысталіся правамі. Калі ва ўсходняй дэспатыі на першы план выступала панаванне правіцеля над насельніцтвам, то ў Грэцыі грамадзянскія правы давалі магчымасць насельніцтву ўплываць на ўладу.

Скачок у павелічэнні прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі быў зроблены ў Грэцыі за кошт выкарыстання больш дасканалых жалезных прылад працы, а не за кошт развіцця ірыгацыйнай сістэмы. Адбылося аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі, а рамеснікі і гандляры ў старажытнасці заўсёды складалі большасць гарадскога насельніцтва. Менавіта ў горадзе пражывала асноўная частка жыхароў поліса.

Станаўленне полісаў-дзяржаў пачалося ў VIII ст. да н. э. Паступова ўся тэрыторыя Грэцыі апынулася падзеленай паміж полісамі. Буйнейшымі былі Афіны, Спарта (Лакедэмон), Фівы, Карынф, Мілет і інш. Яны то ваявалі паміж сабой, то аб'ядноўваліся супраць агульнага ворага, то знаходзілі новых саюзнікаў. Насельніцтва ўсіх грэчаскіх полісаў адчувала культурную еднасць. Гэтаму садзейнічала агульнасць мовы, традыцый і рэлігіі. Грэкі пакланяліся адным і тым жа багам у шанаваных усімі храмах, напрыклад, у храме Апалона ў Дэльфах, храме Зеўса ў Алімпіі. На час рэлігійных свят (напрыклад, Алімпійскіх гульняў) ва ўсёй Грэцыі ўсталёўваўся мір.

Поліс — гэта не проста горад-дзяржава, гэта калектыў свабодных раўнапраўных грамадзян-мужчын, якія жылі ў ім і мелі зямельныя надзелы. Толькі грамадзяне валодалі зямлёй у полісе, і толькі іх выбіралі ў органы ўлады. У грамадскім жыцці поліса ўдзельнічаў кожны дарослы мужчына, які меў правы грамадзяніна. Жыццё рэгулявалася законамі. Абавязкам грамадзян была служба ў апалчэнні ў перыяды войнаў, кожны грамадзянін быў воінам і пастаянна займаўся фізічнай і ваеннай падрыхтоўкай. Страта грамадзянства або выгнанне былі самым страшным пакараннем для грэка, поўнай ганьбай.

У Афінах юнакі станавіліся грамадзянамі ў 18 гадоў. Яны давалі клятву: «Я не зганьбую свяшчэнную зброю і не пакіну таварыша ў бітве, буду абараняць і адзін і з многімі ўсё святое і запаветнае, не зменшу сілы і славы Айчыны, але павялічу іх; буду разумна падпарадкоўвацца існуючаму ўраду і законам, устаноўленым і тым, што маюць быць прынятыя; а калі хто будзе старацца знішчыць законы або не падпарадкоўвацца ім, я не дапушчу гэтага і буду змагацца з гэтым супраць яго і адзін і з усімі; буду таксама шанаваць айчынныя святыні. І хай будуць у гэтым мне сведкамі багі».

*Абапіраючыся на тэкст клятвы, назавіце асноўныя каштоўнасці жыхароў поліса.*

Акрамя грамадзян у полісе жылі свабодныя жыхары, не надзеленыя правамі грамадзяніна (напрыклад, перасяленцы з іншых тэрыторый), і рабы. Поліс не дапускаў удзелу ў дзяржаўным кіраванні жанчын, свабодных іншаземцаў і рабоў. У Грэцыі шырока выкарыстоўвалася рабская праца ў сельскай гаспадарцы, рамес-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ных майстэрнях, на караблях, у капальнях, у дамах грамадзян. Рабамі ў полісах былі іншаземцы, законы забаранялі ператвараць грамадзян свайго поліса ў рабоў за даўгі. Яны знаходзіліся ў поўнай уладзе свайго гаспадара. Гаспадар мог прымусіць раба займацца тым ці іншым рамяством, мог яго прадаць. З'яўляючыся абсалютна бяспраўным, раб не меў сваёй маёмасці, законнай сям'і, лічыўся «гаваркой прыладай». У Грэцыі дзейнічала некалькі вялікіх нявольніцкіх рынкаў. Але ўсё ж праца рабоў ніколі не была асновай старажытнагрэчаскай эканомікі. Нярэдкія былі выпадкі, калі пасля многіх гадоў працы рабоў адпускалі на волю.

**Дзяржаўны лад старажытнагрэчаскіх полісаў.** Кожны з грэчаскіх полісаў меў свае законы, уладкаванне, органы кіравання. Самыя моцныя з іх — Спарта і Афіны — уяўлялі сабой два тыпы поліснага ўладкавання, якія мелі істотныя адрозненні. На ўсім працягу старажытнагрэчаскай гісторыі Афіны і Спарта заставаліся галоўнымі сапернікамі ў барацьбе за першынство ў Грэцыі.

*N.B.*

Нельга сказаць, што насельніцтва полісаў было сацыяльна роўным. Там здаўна была свая арыстакратыя, якая валодала большай колькасцю зямлі і мела большы палітычны ўплыў дзякуючы свайму багаццю. Супраць улады радавой арыстакратыі выступаў дэмас — народ. Часта барацьба арыстакратыі і дэмасу прымала ў полісе жорсткія формы. Калі ў полісе перамогу атрымліваў дэмас, усталёўвалася ***дэмакратыя*** — «улада народа». Іншым часам у гэтай барацьбе пры падтрымцы дэмасу ўладу захопліваў адзін чалавек — тыран, такое кіраванне грэкі называлі тыраніяй. Але ў некаторых полісах арыстакратыі ўдавалася адстаяць сваю ўладу, тады фарміравалася арыстакратычнае або алігархічнае кіраванне.

У ***Афінах*** дэмакратычнае кіраванне ўсталявалася не адразу. Афінскія грамадзяне дзяліліся на *эўпатрыдаў* (радавая знаць) і *дэмас* (просты народ: земляробы і рамеснікі). Грамадзянскіх правоў не мелі *метэкі* (перасяленцы з іншых полісаў), а таксама рабы.

У старажытнасці Афінамі кіравалі 9 *архонтаў* (начальнікаў), якіх выбіралі на год з ліку эўпатрыдаў. Пасля выканання абавязкаў архонты ўваходзілі ў *арэапаг* — раду старэйшын. У старажытныя часы кіраванне полісам непадзельна належала арыстакратыі.

Бязлітасная барацьба афінскага дэмасу супраць панавання знаці ішла з VII ст. да н. э. Яна з'яднала як бяднейшых сялян, так і багатых рамеснікаў, купцоў. Бясконцая варожасць магла загубіць поліс. У гэтых умовах у 594 г. да н. э. архонтам быў выбраны Салон, які атрымаў надзвычайныя паўнамоцтвы для прымірэння інтарэсаў варожых бакоў.

З рэформаў Салона пачаліся дэмакратычныя пераўтварэнні. Былі адменены даўгавыя абавязацельствы, забаранялася ператвараць афінскіх грамадзян у рабоў за даўгі, былі выкуплены прададзеныя ў рабства афіняне. Таксама ўводзіўся *маёмасны цэнз* (лац. *census* — вопіс, перапіс, ацэнка): у залежнасці ад памеру маёмасці


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*У інтарэсах якіх груп грамадзян была праведзена кожная з рэформаў Салона? Чым інтарэсам адпавядала ўвядзенне маёмаснага цэнзу?*

грамадзян падзялілі на 4 разрады, прыналежнасць да якіх давала права займаць пэўныя пасады. Падзел на разрады грунтаваўся на багацці, што спыніла панаванне спадчыннай арыстакратыі ў Афінах.

Найвышэйшага росквіту афінская дэмакратыя дасягнула пры Перыкле, які стаў самым уплывовым палітыкам у Афінах, а з 443 г. да н. э. 13 разоў запар выбіраўся стратэгам. З'яўляючыся выдатным прамоўцам, ён умеў пераконваць народны сход у мэтазгоднасці прапанаваных ім законаў. У Афінах ажыццявілі падзел улады на тры галіны: заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Народны сход — эклесія — быў вышэйшым заканадаўчым органам, там галасаваннем грамадзян прымаліся законы. Любы грамадзянін мог паставіць на абмеркаванне якое-небудзь пытанне або выступіць з законапраектам. На народным сходзе праходзілі штогадовыя выбары службовых асоб (выканаўчая ўлада). У якасці суддзяў выбіраліся 6 тыс. грамадзян, яны складалі калегію суддзяў — *геліэю*.

Перыкл хацеў, каб як мага больш грамадзян было ўключана ў розныя органы кіравання. Раней толькі заможныя афіняне маглі сабе дазволіць удзельнічаць у кіраванні, паколькі для гэтага трэба было на год кінуць гаспадарку і заняцца толькі выкананнем новых абавязкаў. Для таго каб прыцягнуць бедных грамадзян да ўдзелу ў кіраванні полісам, для іх была ўведзена плата за выкананне гэтых абавязкаў.

Пры Перыкле Афіны сталі адным з самых магутных полісаў Элады. Ні ў адным полісе дэмас не меў столькі правоў. Там была створана квітнеючая рамесная вытворчасць.




Афінскі поліс V–IV стст. да н. э.

*Абапіраючыся на схему, ахарактарызуйце афінскі поліс.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***Спарта*** (Лакедэмон) — самы вялікі грэчаскі поліс, які існаваў з XI ст. да н. э. у Паўднёвым Пелапанэсе. Насельніцтва Спарты складалася са спартыятаў (роўных паміж сабой грамадзян поліса), *перыэкаў* (свабодных жыхароў навакольных паселішчаў, якія не мелі грамадзянскіх правоў) і *ілотаў* (скоранага насельніцтва). Найвышэйшым заканадаўчым органам Спарты быў народны сход *(апела)*. Сход не абмяркоўваў праекты рашэнняў, а толькі адабраў або адхіляў іх. Рыхтаваліся рашэнні для народнага сходу *герусіяй* — саветам з выбраных пажыццёва *геронтаў* (спартыятаў, не маладзейшых за 60 гадоў). У герусію акрамя 28 геронтаў уваходзілі і два *архагеты* («цары»), якіх з дзяцінства рыхтавалі для камандавання войскам Спарты. У мірны час архагеты выконвалі функцыі жрацоў. За выкананнем законаў сачылі 5 *эфораў* (наглядальнікаў), якія штогод выбіраліся народным сходам. Такім чынам, Спартай фактычна кіравала невялікая група людзей. Такая форма кіравання называлася *алігархіяй* (ад грэч. *oligos* — нямногія).

Аснову эканомікі Спарты складала сельская гаспадарка, а рамяство і гандаль былі развіты слаба. Уся зямля поліса была падзелена па колькасці грамадзян на аднолькавыя ўчасткі, якімі карысталіся спартыяты, але прадаць або перадаць іх у спадчыну яны не маглі. Зямлю апрацоўвалі ілоты. Зямля і ілоты — галоўнае ў спартанскай эканоміцы — з’яўляліся ўласнасцю поліса. Адзіным заняткам, вартым грамадзяніна-спартыята, лічылася ваенная справа, да ўсяго астатняга ставіліся з пагардай. З ранняга дзяцінства спартыятаў рыхтавалі да вайны, часта вельмі жорсткімі метадамі. Большую частку жыцця яны праводзілі ў паходах, у мірны час шмат увагі ўдзялялі ваенным практыкаванням. Спартанская армія з цяжкаўзброеных *гаплітаў* лічылася лепшай у Грэцыі.

Спарта давала прыклад ваеннай арганізацыі поліса, доўга застаючыся наймацнейшым полісам Грэцыі. Але к сярэдзіне V ст. да н. э. першынство перайшло да Афін.

**Класічны перыяд. Крызіс паліснай сістэмы.** Грэцыя ў V—IV стст. да н. э. перажывала перыяд свайго росквіту, які атрымаў назву класічнага. Пачатак яму паклалі працяглыя, вельмі цяжкія для грэкаў войны з Персідскай дзяржавай. Персідская дзяржава, у якой кіравала дынастыя Ахеменідаў, падпарадкавала сваёй уладзе вялізныя тэрыторыі ад Малой Азіі да Індыі. Цары Дарый I, а затым яго сын Ксеркс хацелі пакарыць і грэкаў. Многія полісы, у тым ліку Афіны і Спарта, уступілі ў барацьбу з Персіяй. У выніку працяглых войнаў грэкі атрымалі перамогу. Паміж персамі і грэкамі быў заключаны мірны дагавор, які замацоўваў перамогу Грэцыі. Для грэкаў слаўныя перамогі ў войнах з персамі сталі прадметам незвычайнага гонару і садзейнічалі росту патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці. Даволі нешматлікая армія грамадзян у барацьбе за свабоду і ідэалы сваіх полісаў паспяхова процістаяла наймагутнейшай арміі Персідскай імперыі і разграміла яе. Гэта стала адлюстраваннем важнага сацыяльнага працэсу — у гісторыі з’явілася новая форма дзяржаўнага кіравання, якая паказала сваю стойкасць у сутыкненні з самай моцнай дэспатыяй Блізкага Усходу.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| **594 г. да н. э.** Рэформы Салона ў Афінах | **500–449 гг. да н. э.** Грэка-персідскія войны | **443–429 гг. да н. э.** Дзейнасць Перыкла ў Афінах | **431–404 гг. да н. э.** Пелапанэская вайна | **338 г. да н. э.** Афіны падпарадкаваныя Македоніяй |
|---|---|---|---|---|

Найважнейшыя падзеі ў гісторыі Афін

Аднак у хуткім часе пачалася барацьба саміх полісаў за гегемонію ў Грэцыі. Саперніцтва паміж дэмакратычнымі Афінамі і алігархічнай Спартай вылілася ў працяглую Пелапанэскую вайну, у якой удзельнічалі сотні грэчаскіх полісаў, аб'яднаных у два саюзы — Афінскі і Пелапанэскі. Пасля цяжкага паражэння ў гэтай вайне Афіны страцілі сваё вядучае палітычнае становішча ў Грэцыі. Пелапанэская вайна падарвала матэрыяльныя сілы грэчаскіх полісаў, аслабіла і Афінскую дзяржаву, і Пелапанэскі саюз.

Вайна выклікала крызіс самога ўладкавання полісаў. Ваенныя дзеянні прывялі да рэзкага збяднення большасці грамадзян. Яны страцілі зямлю, права карыстання якой вызначала іх правы грамадзянства і неабходнасць служыць у апалчэнні. Полісы ўжо не маглі дапамагчы збяднелым землеўладальнікам, да таго ж колькасць насельніцтва расла, для ўсіх зямлі ўжо не хапала. Багатыя людзі скуплялі зямлю, а ісці ў апалчэнне не хацелі. Гэта падарвала асновы існавання поліснага ваеннага апалчэння, на змену якому прыйшлі атрады наёмных прафесійных воінаў. Жыхары полісаў, якія не з'яўляліся грамадзянамі, разбагацелі, займаючыся рамяством, гандлем, ліхвярствам. Становішча чалавека ў грамадстве стала вызначацца хутчэй яго багаццем, чым проста наяўнасцю грамадзянскіх правоў. Полісныя каштоўнасці пахіснуліся.

**Паходы Аляксандра Македонскага і ўзнікненне новых дзяржаў.** Аслабленая шматгадовай вайной паміж полісамі, Грэцыя стала лёгкай здабычай паўночнага суседа — Македоніі. У сваім грамадскім і культурным развіцці Македонія значна адставала ад Грэцыі: там слаба развіваліся гарады, рамяство, марская справа. Узмацненне гэтай краіны пачалося пры цары Філіпе II (359—336 гг. да н. э.), які быў таленавітым палкаводцам, энергічным рэфарматарам і дасведчаным палітыкам. Ён правёў серыю рэформаў, з якіх найбольш вядомай з'яўляецца ваенная рэформа, што зрабіла армію Македоніі магутнай.

У 338 г. да н. э. Македонія падпарадкавала практычна ўсю Грэцыю. Але цяпер Філіпу II трэба было яе аб'яднаць, што не ўдавалася яшчэ нікому. Ён заклікаў элінаў аб'ядноўвацца і нанесці ўдар магутнай Персіі. Ідэя агульнай вайны павінна была з'яднаць грэкаў і македанян. Аднак Філіп у хуткім часе быў забіты.

Пераемнікам Філіпа II стаў яго сын Аляксандр, які быў гатовы рэалізаваць планы бацькі. У 334 г. да н. э. ён пачаў паход супраць Персідскай імперыі. За 10 гадоў былі заваяваны вялізныя тэрыторыі ад Егіпта да Індыі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сілай зброі Аляксандр стварыў велізарную дзяржаву, у якую ўвайшло мноства народаў з рознымі старажытнымі культурамі, рэлігіямі, ладам жыцця. Традыцыі ўсходняй дэспатыі перапляліся з ідэаламі полісной дэмакратыі, а культура даўнейшых цывілізацый Старажытнага Усходу — з грэчаскімі рацыянальнымі ідэямі. Зліццё культур паўплывала і на Аляксандра Македонскага: усё часцей ён паводзіў сябе як усходні ўладар, патрабаваў усеагульнага пакланення, пры яго двары ўсталяваўся ўсходні цырыманіял, пачалося абагаўленне Аляксандра.




Імперыя Аляксандра Македонскага

Перыяд узаемадзеяння культур атрымаў назву ***«элінізм»*** і стаў важным этапам у развіцці народаў Усходняга Міжземнамор'я і Пярэдняй Азіі. Пасля смерці Аляксандра Македонскага склалася каля дзясятка вялікіх і малых дзяржаў, якія гісторыкі аб'ядналі паняццем «элiнiстычныя».

**431–404 гг. да н. э.**
Пелапанэская вайна

**334–324 гг. да н. э.**
Паходы Аляксандра Македонскага

**323–30 гг. да н. э.**
Элінiстычныя дзяржавы

Перадумовы з'яўлення элінiстычных дзяржаў

*Вызначце, чаму менавіта гэтыя падзеі сталі перадумовамі з'яўлення першых элінiстычных дзяржаў.*

Формай палітычнага ладу элінiстычных дзяржаў была манархія, у якой спалучаліся традыцыйныя для Старажытнага Усходу дэспатычныя формы дзяржаўнай арганізацыі і кіравання з элементамі грэчаскага (полiснага) уладкавання і грамадска-палітычнага жыцця. Пануючы слой насельніцтва ў іх складалі грэка-македонскія заваёўнікі, а таксама мясцовая знаць, якая прыняла грэчаскую культуру. У гарадах грэчаскае насельніцтва збіралася на народныя сходы, але разам з тым грэчаскія цары абагаўляліся на ўсходні лад, мелі тытулы старажытнаўсходніх уладароў.

Элінiстычныя царствы праіснавалі амаль тры стагоддзі.

*Узнікненне ачагоў цывілізацыі ў Еўропе пачалося ў рэгіёне Міжземнамор'я, які меў сувязі з цывілізацыямі Блізкага Усходу, спачатку гэта адбылося ў Грэцыі, а затым — у Старажытным Рыме. Гісторыю гэтых краін мы вызначаем як гісторыю*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*міжземнаморскай антычнай цывілізацыі, а гэты перыяд — як Антычнасць. Грэчаскія гарады-дзяржавы — полісы — фарміраваліся як супольнасці раўнапраўных грамадзян, кожны з якіх меў свае правы і абавязкі. У старажытнагрэчаскіх полісах (найперш у Афінах) зарадзілася дэмакратыя як форма дзяржаўнага кіравання. Стварэнне імперыі Аляксандра Македонскага стала апагеем развіцця старажытнагрэчаскай цывілізацыі. Эліністычныя дзяржавы, якія ўзніклі, садзейнічалі шырокаму распаўсюджванню грэчаскіх духоўных каштоўнасцяў і культуры.*

1. Як геаграфічныя і прыродныя ўмовы паўплывалі на асаблівасці старажытнагрэчаскай цывілізацыі?
2. Успомніце (або знайдзіце з дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі) старажытнагрэчаскія міфы, звязаныя з востравам Крыт. Якія гістарычныя падзеі знаходзяцца ў іх аснове?
3. Сфармулюйце прычыны і наступствы Вялікай грэчаскай каланізацыі.
4. Растлумачце, у якіх гістарычных умовах з'явіліся паняцці «поліс», «грамадзянін», «дэмакратыя».
5. Пра якія якасці грамадзяніна антычнага поліса піша рымскі паэт Плаўт (ІІ ст. да н. э.): «Бо доблесць і мужнасць — вышэй за ўсё: сям'ю, свабоду, маёмасць, жыццё, Айчыны дабро сцеражэ і ратуе яна»? Чаму менавіта гэтыя якасці найбольш шанаваліся ў антычным полісе?
6. Складзіце схему «Спартанскі поліс». Параўнайце кіраванне ў Афінах і Спарце.
7. Напішыце эсэ «Асноўныя адрозненні арыстакратычнай і дэмакратычнай формаў кіравання».

# § 6. Старажытны Рым



*Якія прычыны садзейнічалі ўзвышэнню Рымскай дзяржавы?*

*Якія асаблівасці дзяржаўнага кіравання і сацыяльных адносін у старажытнаўсходніх дзяржавах і ў Старажытнай Грэцыі вы можаце назваць? Успомніце азначэнні паняццяў «антычнасць», «элінізм», «грамадзянская вайна», «рэспубліка», «манархія».* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас)

**Прыродныя ўмовы і занятκі насельніцтва Апенінскага паўвострава.** На Апенінскім паўвостраве ўмовы для вядзення гаспадаркі былі нашмат больш спрыяльнымі, чым на Балканскім. З поўначы яго абаранялі ад халодных вятроў Альпійскія горы, таму клімат тут быў мяккі з цёплымі зімамі. Цэнтральныя раёны паўвострава займалі горы. На іх схілах можна было вырошчваць вінаград і пасвіць жывёлу. Горы часам блізка падыходзілі да мора, утвараючы даліны. У Італіі было шмат раўнін, прыдатных для земляробства. Там у значнай колькасці вяліся дзікія жывёлы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Рэкі паўвострава былі невялікімі, але затое іх было шмат, урадлівыя даліны заўсёды дазвалялі вырошчваць пшаніцу, вінаград, алівы, весці садовую гаспадарку. З даўніх часоў на тэрыторыі сучаснай Італіі культывавалі многія пладовыя дрэвы, завезеныя з усяго Міжземнамор'я: яблыні, грушы, персікі, чарэшні, гранаты, інжыр, слівы і інш. Напрыклад, вырошчвалі ўжо 32 гатункі яблыкаў. Такімі ж разнастайнымі былі агародныя культуры, асабліва любілі жыхары гэтых зямель капусту. Яе ў вялікай колькасці заквашвалі на зіму. Мноства сакавітых траў у далінах вызначыла тое, што асноўным заняткам насельніцтва стала развядзенне буйной рагатай жывёлы. Таксама традыцыйна разводзілі коз, авечак, свіней.

Развіццё сельскай гаспадаркі ў Рыме дасягнула высокага ўзроўню. Выкарыстоўваліся шматлікія прылады працы, механізмы. Шмат увагі ўдзялялася розным спосабам вядзення гаспадаркі, пра гэта рымляне пісалі спецыяльныя трактаты.

Спрыяльныя прыродныя ўмовы садзейнічалі разнастайнасці рацыёну старажытных рымлян, што пазітыўна ўплывала на працягласць жыцця. Аснову харчавання складалі не толькі прадукты земляробчай гаспадаркі, як гэта было ў некаторых старажытнаўсходніх цывілізацыях. У рацыён уваходзілі мяса розных дзікіх і свойскіх жывёл, дзікай і свойскай птушкі, рачная і марская рыба, сыр. Самым папулярным быў суп з буракоў і капусты, які мы назвалі б баршчом.

У Альпійскіх і Апенінскіх гарах здабывалі жалезную руду, волава, медзь, серу, мармур. У вусці ракі Тыбр знаходзіліся вялікія запасы солі і гліны. Карысныя выкапні давалі магчымасць развіваць розныя рамёствы, гандляваць многімі матэрыяламі.

**Кіраванне цароў у Рыме.** На Апенінскім паўвостраве пражывала вялікая колькасць плямёнаў, якія размаўлялі на розных мовах і мелі розныя звычаі. Гэта кардынальна адрознівала сітуацыю ў Італіі ад той, якая склалася ў Старажытнай Грэцыі, дзе насельніцтва полісаў было роднасным з пункту гледжання мовы і культуры.

Старажытны Рым узнік з некалькіх паселішчаў, у якіх пражывалі розныя плямёны, як невялікі горад-дзяржава ў Цэнтральнай Італіі. Датай яго заснавання лічыцца 753 г. да н. э. Яе вызначыў старажытнарымскі вучоны Варон у I ст. да н. э. Аднак археолагі знайшлі сляды старажытнага паселішча лацінаў на ўзгорку Палацін, якія адносяцца яшчэ да X ст. да н. э.

| | | |
|---|---|---|
| **Сярэдзіна VIII ст. — канец VI ст. да н. э.**<br>Царскі Рым | **VI ст. — канец I ст. да н. э.**<br>Рымская рэспубліка | **I ст. да н. э. — V ст.**<br>Рымская імперыя |

Перыядызацыя гісторыі Старажытнага Рыма

*Як вы думаеце, які крытэрый пакладзены ў аснову перыядызацыі гісторыі Старажытнага Рыма?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Скульптура ваўчыцы ў Палаца дэі Кансерватары, г. Рым, Італія

*Якая легенда звязана з Капіталійскай ваўчыцай?*

Рым царскага перыяду быў яшчэ прымітыўным грамадствам, яго інстытуты фарміраваліся на падставе інстытутаў радавога грамадства (племянны правадыр, рада родаплемянной знаці, народны сход з мужчын, аб'яднаных агульнай родаплемяннай прыналежнасцю), якое знаходзілася на стадыі разбурэння. Але ў рымскім грамадстве ўжо не было радавой роўнасці. Родаплемянной знаці *(патрыцыям)* належалі ўлада і багацці, галоўным з якіх была зямля. Простыя ж людзі *(плебеі)* не маглі стаць сенатарамі або царамі і мелі правa толькі на невялікія надзелы зямлі. За неаддадзеныя даўгі іх маглі ператварыць у рабоў. Толькі патрыцыі ўдзельнічалі ў народных сходах.

Цары ў Рыме выбіраліся на народным сходзе, рашэнні якога зацвярджаў сенат (рада старэйшын). Цар быў военачальнікам, вярхоўным жрацом і суддзёй. Найважнейшыя рашэнні ён прымаў сумесна з сенатам.

Рым з самага пачатку сваёй гісторыі вызначаўся вялікай агрэсіўнасцю ў адносінах да суседзяў. Рымляне пастаянна вялі захопніцкія войны, вайсковая доблесць была для іх адной з найвышэйшых каштоўнасцяў.

Шосты рымскі цар Сервій Тулій правёў важныя рэформы, у выніку якіх правы рымлян вызначаліся ўжо не столькі знатнасцю паходжання, колькі памерам маёмасці. Гэта быў важны крок у фарміраванні рымскага грамадства — *цывітас*. У народных сходах з гэтага часу ўдзельнічалі і патрыцыі, і плебеі. У залежнасці ад памеру багацця рымляне былі падзелены на 5 разрадаў, а шосты разрад склалі незаможныя — пралетарыі (іх так называлі таму, што ў час цэнзу гэтыя беднякі не маглі прад'явіць ніякага багацця, акрамя ўласных нашчадкаў — «пролес»). Кожны з разрадаў выстаўляў пэўную колькасць атрадаў воінаў — *цэнтурый* (сотень). Самы багаты першы разрад адпраўляў на вайну больш цэнтурый, чым усе астатнія разрады, разам узятыя (воіны ўзбройваліся за ўласныя сродкі).

**N.B.**

Рашэнні народных сходаў прымаліся па галасах цэнтурый. Кожная цэнтурыя мела адзін голас. Рымскі прынцып прадугледжваў падлік галасоў па падраздзяленнях, а не па агульнай колькасці тых, хто галасаваў. І калі цэнтурыі першага разраду (а іх было больш, чым усіх астатніх) галасавалі салідарна, то далей галасы ўжо не падлічваліся. Разбагацелыя плебеі, якія трапілі ў першы разрад, маглі сур'ёзна ўплываць на прыняцце важных дзяржаўных рашэнняў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У 509 г. да н. э. рымляне паўсталі супраць самаўпраўства цара Тарквінія Ганарыстага і выгналі яго. Царская ўлада ў Рыме была ліквідаваная. Як і старажытнагрэчаскія полісы, Рым не пайшоў па шляху старажытнаўсходніх манархій-дэспатый, у ім умацавалася супольнасць грамадзян, а формай дзяржавы стала рэспубліка.

**Рымская рэспубліка.** ***Рэспубліка*** *— «Res publica Populi Romani»*, або «грамадская справа рымскага народа» — такую назву атрымала дзяржава рымлян. Форму дзяржаўнага кіравання, пры якой грамадзяне валодаюць наборам найважнейшых палітычных правоў і выбіраюць органы кіравання дзяржавай, на ўзор Рыма называюць рэспублікай дагэтуль.

Вышэйшым дзяржаўным і заканадаўчым органам Рыма быў народны сход. На народных сходах выбіраліся службовыя асобы, якія ажыццяўлялі выканаўчую і судовую ўладу *(магістраты)*. Аднак сходы не мелі заканадаўчай ініцыятывы, праекты законаў прапаноўваліся не прысутнымі грамадзянамі, а магістратамі і сенатам.

Вышэйшымі магістратамі Рыма былі *консулы*. Гэта была пасада калегіяльная (два консулы) і кароткатэрміновая (консулы выбіраліся на адзін год). Консулы былі галоўнакамандуючымі рымскай арміяй, якая ўяўляла сабой апалчэнне грамадзян-воінаў, склікалі народныя сходы, прапаноўвалі законы. На народных сходах выбіраліся таксама прэтары (у веданні якіх былі судовыя справы), квестары (скарбнікі), цэнзары (якія праводзілі цэнзы) і іншыя магістраты.

Надзвычайнай магістратурай была пасада *дыктатара*. Дыктатар звычайна назначаўся сенатам у выпадку ўзнікнення вялікай небяспекі для Рыма. Ён атрымліваў усю паўнату ўлады. Яго паўнамоцтвы абмяжоўваліся паўгадавым тэрмінам, на працягу якога ён павінен быў ліквідаваць небяспеку, што навісла над Рымам, каб затым пайсці з пасады.

Асаблівая роля ў палітычным ладзе Рымскай рэспублікі належала сенату. Ён фарміраваўся з былых магістратаў (тых, у каго скончыўся тэрмін паўнамоцтваў). Гэты орган ператварыўся ў Рыме фактычна ва ўрад, які забяспечваў пастаянства і пераемнасць унутранай і знешняй палітыкі. Сенат таксама кантраляваў дзяржаўную казну.

**N.B.**

Знакамітая рымская формула *S.P.Q.R.* (*«Senatus Populus que Romanus»*, або «Сенат і грамадзяне Рыма») упрыгожвала найважнейшыя дзяржаўныя збудаванні. Яна адлюстроўвала ідэю ўлады перыяду Рымскай рэспублікі, стаўшы відочнай выявай прынцыпу народаўладдзя.

У першыя два стагоддзі існавання Рымскай рэспублікі ў ёй разгарнулася барацьба паміж плебеямі і патрыцыямі. Плебеі патрабавалі роўных з патрыцыямі правоў на завяваныя землі, адмены даўгоў і даўгавога рабства, права выбірацца магістратамі (паколькі консулы і іншыя магістраты выбіраліся толькі з патрыцыяў і толькі з іх фарміраваўся сенат).


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Рымская рэспубліка

*З апорай на схему ахарактарызуйце сістэму кіравання Рымскай рэспублікай. Адсутную інфармацыю знайдзіце ў дадатковых крыніцах.*

Гэтая барацьба была не такая вострая і крывавая, як у Старажытнай Грэцыі (Рым не ведаў і тыраніі), але яна аказалася доўгай. На працягу V–IV стст. да н. э. плебеі дабіліся выканання сваіх галоўных патрабаванняў. Была заснавана і асаблівая магістратура *народнага трыбуна* (абаронцы плебеяў). Адсутнасць вострых формаў барацьбы ўнутры рымскага грамадства, яго мілітарызацыя (рымскія грамадзяне былі ўмелымі і дасведчанымі воінамі), адмысловая дыпламатыя з'яўляліся асноўнымі прычынамі поспеху Рыма ў войнах з суседзямі. Ужо тады рымляне ў сваёй знешняй палітыцы кіраваліся прынцыпам «раздзяляй і ўладар». Яны стараліся не дапусціць аб'яднання сваіх праціўнікаў у войнах. Той жа прынцып рымляне ажыццяўлялі і на скораных імі тэрыторыях. Пераможаным яны давалі розныя правы, каб у тых было як мага менш агульных інтарэсаў. Поўнымі правамі валодалі толькі грамадзяне Рыма.




Найважнейшыя падзеі ў VIII–II стст. да н. э.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пасля працяглых войнаў, якія Рым вёў у V—III стст. да н. э. з рознымі плямёнамі, яму ўдалося падпарадкаваць практычна ўвесь паўвостраў.

**Пачатак шырокай ваеннай экспансіі і стварэнне прафесійнай арміі. Крызіс рэспубліканскай сістэмы.** Каля сярэдзіны III ст. да н. э. Рым пачаў экспансію за межамі Апенінскага паўвострава. Там магутнасць Рыма, што ўсё ўзрастала, сутыкнулася з інтарэсамі вядучых дзяржаў Міжземнамор'я.

На 120 гадоў расцягнулася супрацьстаянне Рыма і Карфагена, магутнага горада-дзяржавы, заснаванага фінікійцамі ў Паўночнай Афрыцы, які ўжо здолеў падпарадкаваць многія тэрыторыі Заходняга Міжземнамор'я. На працягу трох Пунічных войнаў (264—146 гг. да н. э.) фартуна не раз адварочвалася ад рымлян і карфагеняне пагражалі захапіць Рым. Але Карфаген усё ж такі быў разгромлены.

Да канца II ст. да н. э. Рым падпарадкаваў сабе Македонію, Грэцыю, Іспанію, з'явілася і рымская правінцыя ў Малой Азіі. Цяпер Рым стаў гегемонам усяго Міжземнамор'я.

З аднаго боку, пераможныя войны садзейнічалі хуткаму эканамічнаму развіццю Рыма і абагачэнню часткі яго грамадзян. У Рым паступалі тавары з усяго Міжземнамор'я, гандаль і рамяство квітнелі. Прыток рабоў даў магчымасць выкарыстоўваць новыя працоўныя рукі ў земляробстве.

З іншага боку, войны вельмі цяжка адбіліся на небагатых рымскіх грамадзянах. Уладальнікі невялікіх зямельных участкаў, якія служылі ў арміі, апыналіся ў даўгах і хутка разараліся за гады вайны. Гэта выклікала сацыяльныя канфлікты, а ў хуткім часе магло знішчыць рымскую армію.

Унутраны крызіс быў вырашаны ў ходзе пераўтварэнняў у арміі. Паколькі вярнуць землеўладальнікам іх надзелы было немагчыма, можна было збяднелых грамадзян прызваць на ваенную службу. У 107 г. да н. э. гэта зрабіў рымскі палкаводзец Гай Марый. Ён пачаў набіраць грамадзян у легіёны на працяглую службу, нават калі яны ўжо не валодалі зямлёй. Бедната пачала масава запісвацца ў легіёны, не маючы ніякіх спадзяванняў наладзіць жыццё ў самім Рыме. Зброю і ўсё неабходнае легіянер цяпер атрымліваў ад дзяржавы. Служба стала шматгадовай, так што армію таго часу можна ўжо назваць прафесійнай. Аплату легіянеры атрымлівалі ад палкаводца, таму цяпер былі зацікаўлены ў яго перамогах. Пасля заканчэння службы ім абяцалі атрыманне зямельных надзелаў, але не ў Італіі, а на заваяваных землях. Такім чынам, армія стала залежаць ад удачлівых военачальнікаў. Гэтая рэформа на доўгія гады зрабіла рымскую армію эфектыўнай. Пры гэтым багатыя рымляне атрымлівалі магчымасць не служыць у арміі. Аднак падрывалася адна з асноў рымскай цывітас — абавязак кожнага грамадзяніна быць воінам.

У новых умовах паспяховыя палкаводцы маглі паспрабаваць выкарыстаць свае легіёны ў палітычнай барацьбе за ўладу ў Рыме. Гэтая новая палітычная рэальнасць праявілася вельмі хутка, калі ў 83 г. да н. э. пачалася грамадзянская вайна, якая паклала пачатак цэлай серыі такіх сутыкненняў. Супраць аўтарытэту Гая Марыя


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

выступіў іншы палкаводзец — Карнэлій Сула. Грамадзянскія войны і ўнутраная барацьба ў Рыме суправаджаліся змовамі, тэрорам, канфіскацыямі маёмасці. Усё гэта падрывала рэспубліканскі лад.

**Рымская імперыя: ад супольнасці грамадзян да грамадства падданых.** Рымскі палкаводзец Гай Юлій Цэзар (100—44 гг. да н. э.) пачаў паход на поўнач ад Альпаў супраць плямёнаў галаў (кельтаў) у 58 г. да н. э. Праз 8 гадоў тэрыторыя была падпарадкавана і ўзнікла правінцыя Галія. Упершыню ваенны ўплыў Рыма пашырыўся на землі ў Еўропе за межамі Міжземнамор'я і на поўнач ад Альпійскага горнага хрыбта.

Вярнуўшыся з вернымі легіёнамі ў Рым і атрымаўшы перамогу ў грамадзянскай вайне, Юлій Цэзар быў абвешчаны *пажыццёвым дыктатарам* (гэтую пасаду ў Рыме займаў палкаводзец з неабмежаванай уладай, але гэта традыцыйна адбывалася ў перыяд вайны, а не міру). Адначасова ён атрымаў пасады консула, народнага трыбуна, цэнзара і вярхоўнага жраца. Прыхільнікі рэспублікі ў сенаце палічылі гэта знішчэннем каштоўнасцяў рэспубліканскага кіравання. У выніку змовы ў 44 г. да н. э. Цэзар быў забіты.

Аднак рэспубліканскі лад не быў адноўлены. Ва ўмовах пастаянных канфліктаў палкаводцаў толькі моцная цэнтралізаваная ўлада магла вярнуць стабільнасць дзяржаве. Да ўлады прыйшоў усыноўлены Цэзарам Актавіян. Менавіта Актавіян, які атрымаў у 27 г. да н. э. тытул-імя Аўгуст, канчаткова ўсталяваў манархію ў Рыме.

Актавіян абвясціў, што хоча захаваць рэспубліку, і адмовіўся стаць пажыццёвым дыктатарам. Ён узяў тытул імператара як галоўнакамандуючы рымскай арміяй. І з гэтага часу правіцелі Рыма таксама насілі гэты тытул, таму рымскую дзяржаву з часоў Актавіяна Аўгуста гісторыкі называюць імперыяй.

Але знешне дзяржаўны лад амаль не змяніўся, і рымляне працягвалі называць Рым рэспублікай. Дзейнічаў сенат, выбіраліся магістраты, якія затым папаўнялі сенат. І рымляне не адразу зразумелі, што насамрэч іх дзяржава ператварылася ў манархію, а яны — у падданых імператара.

Для рымлян было непрымальным падпарадкаванне масы бяспраўных падданых адзінаўладным валадарам з іх вялізным апаратам нікім не выбраных чыноўнікаў, як у манархіях Усходу. Як і грэкі, яны называлі гэтых людзей варварамі. Актавіян не дазваляў называць яго царом або гаспадаром. Важнай для яго была пасада першага сенатара *(прынцэпса)*, якая давала яму права выступаць першым у сенаце. У выпадку адхілення яго прапаноў Аўгуст мог скарыстаць права «вета», паколькі яго выбралі пажыццёва народным трыбунам. Фактычна рашэнні сената прымаліся па ўказанні імператара-прынцэпса. А пасля яго смерці перасталі склікацца народныя сходы, прыняцце законаў і выбары магістратаў пачалі ажыццяўляцца ў сенаце.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Рымская імперыя IV ст.

*Прааналізуйце сістэму кіравання Рымскай імперыяй з дапамогай схемы.*

Пярэчыць імператару было немагчыма, таму што ён камандаваў прафесійнай арміяй — яго галоўнай апорай. Аўгуст і наступныя імператары стварылі свой апарат чыноўнікаў, які дзейнічаў паралельна з магістратамі. Імператар сам назначаў чыноўнікаў з ліку самых адданых яму людзей, іх ніхто не выбіраў. Чыноўнікі кіравалі асобнай імператарскай казной, самымі багатымі правінцыямі, былі памочнікамі імператара ў кіраванні дзяржавай. Амаль тры стагоддзі імператарская адміністрацыя дзейнічала паралельна з выбарнымі ў сенаце магістратамі.

У 212 г. да н. э. амаль усё свабоднае насельніцтва Рымскай імперыі атрымала правы рымскіх грамадзян. Але насамрэч галоўных грамадзянскіх правоў яны былі пазбаўлены. Не яны, а сенат на чале з прынцэпсам-імператарам прымаў законы, у сенаце ж выбіралі і магістратаў, уплыў якіх на кіраванне дзяржавай няўхільна змяншаўся. А сенат фарміраваўся па волі імператара.

Супраціўляцца гэтаму было немагчыма: рымская армія стала не апалчэннем узброеных грамадзян, а наёмным прафесійным войскам, падпарадкаваным імператару і залежным ад яго. Так паступова грамадзяне Рыма ператвараліся ў падданых імператара.

У канцы I ст. да н. э. — I ст. н. э. Рымская імперыя дасягнула вяршыні сваёй магутнасці. Яе межы распасціраліся ад берагоў Атлантычнага акіяна да Егіпта і Арменіі, ад паўнаводных рэк Рэйна і Дуная ў Еўропе да пустыні Сахара ў Афрыцы. На тэрыторыі імперыі пражывала, па падліках сучасных гісторыкаў, больш


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Рост тэрыторыі Рымскай дзяржавы

*Якія тэрыторыі ўвайшлі ў склад Рымскай імперыі?*

за 40 млн чалавек. Але агрэсіўная моц Рыма слабела, патрабавалася ўсё больш рэсурсаў і сіл, каб утрымаць у падпарадкаванні вялізныя масы насельніцтва і тэрыторыі. Кіраванне імператараў II ст. н. э. было названа «залатым векам»: пасля Рымская імперыя адмовілася ад новых заваёў, галоўным клопатам яе правіцеляў стала абарона рубяжоў імперыі.

III ст. было стагоддзем бурных узрушэнняў. На Рымскую імперыю абрынуліся плямёны варвараў, у асноўным германцаў. Яна знаходзілася на мяжы краху, але здолела ўстаяць. У канцы III ст. яе адзінства было адноўлена імператарам Дыяклетыянам. Ён адкінуў шырму рэспубліканскіх устаноў, і манархічны лад Рыма больш нічым не маскіраваўся. Усімі дзяржаўнымі справамі кіраваў імператар, абапіраючыся на вялізны штат чыноўнікаў сваёй адміністрацыі. Імператара з гэтага часу адкрыта называлі «гаспадаром», перад ім падалі на калені.

**49–44 гг. да н. э.**
Кіраванне Гая Юлія Цэзара

**27 г. да н. э.**
Усталяванне імперыі ў Рыме

**395 г.**
Падзел імперыі на Заходнюю і Усходнюю

**476 г.**
Падзенне Заходняй Рымскай імперыі

Найважнейшыя падзеі ў I ст. да н. э. — V ст. н. э.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Падзел Рымскай імперыі і ўтварэнне варварскіх дзяржаў

У Рымскай імперыі была шырока распаўсюджана найцяжэйшая эксплуатацыя рабоў і насельніцтва правінцый, створаных у ходзе заваяванняў. Менавіта захоп новых рабоў быў адной з прычын пастаянных заваёўніцкіх войнаў нароўні з захопам зямлі і крыніц сыравіны. У значнай меры рымская эканоміка цяпер будавалася на выкарыстанні працы рабоў. Але ўсё часцей армія цярпела паражэнні ў баях на граніцы, з цяжкасцю стрымлівала націск ваяўнічых варвараў-германцаў у Еўропе і шматлікіх іранцаў на Блізкім Усходзе. Кіраваць велізарнай краінай стала немагчыма. У 395 г. адбыўся падзел на Заходнюю і Усходнюю Рымскую імперыю. А пагроза варожага ўварвання павялічылася, пад націскам гунаў з усходу набліжалася агромністая хваля варварскіх народаў. Асноўная яе сіла абрынулася на Заходнюю Рымскую імперыю, якая ў 476 г. спыніла сваё існаванне.

*Старажытны Рым прайшоў шлях развіцця ад невялікага горада-дзяржавы да найвялікшай імперыі старажытнасці. Дзяржаўны лад Рыма грунтаваўся на ідэалах грамадзянскасці: кожны грамадзянін меў правы і абавязкі перад грамадствам і дзяржавай. Ён стаў узорам для многіх пазнейшых дзяржаў аж да нашага часу. Рымская імперыя была самай магутнай дзяржавай старажытнасці і распаўсюдзіла ўплыў на палову тэрыторыі Еўропы, увесь Блізкі Усход і Паўночную Афрыку. У ёй была створана развітая эканамічная сістэма, былі наладжаны цесныя гандлёвыя сувязі з рознымі рэгіёнамі, што давала магчымасць пракарміць шматмільённае насельніцтва. Але асновай росквіту Рыма была эксплуатацыя працы шматлікіх рабоў і бяспраўнага насельніцтва рымскіх правінцый.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як прыродныя ўмовы вызначылі асноўныя заняткі жыхароў Апенінскага паўвострава?
2. Растлумачце, у якіх гістарычных умовах з'явіліся паняцці «рэспубліка», «імперыя». Раскрыйце змест гэтых паняццяў.
3. Пра якую з'яву піша старажытнагрэчаскі пісьменнік і гісторык Ксенафонт: «Ва ўсіх людзей існуе адвечны закон: калі захопліваюць горад, то ўсё, што там знаходзіцца, — людзі і маёмасць — належыць пераможцу»? Пракаментуйце яго выказванне.
4. Ахарактарызуйце рэспубліканскае кіраванне ў Рыме.
5. Якое значэнне мелі рымскія заваёвы для далейшага развіцця скораных народаў? Ці можна даць ім адназначную ацэнку?
6. Ахарактарызуйце сацыяльную структуру старажытнарымскага грамадства.
7. Ахарактарызуйце ўплыў каштоўнасцяў антычных грэчаскай і рымскай цывілізацый на развіццё хрысціянскай еўрапейскай цывілізацыі.
8. Падрыхтуйце артыкул пра Старажытны Рым для школьнай энцыклапедыі. Падбярыце ілюстрацыі, складзіце схемы.

## § 7. Культурная спадчына старажытных цывілізацый

*Які ўклад старажытныя цывілізацыі ўнеслі ў сусветную культуру?*



*У чым былі адрозненні дзяржаўнага ладу старажытнаўсходніх цывілізацый і антычных полісаў? Якім быў дзяржаўны лад Рымскай імперыі? Успомніце выдатныя культурныя дасягненні старажытных цывілізацый.* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас)

**Развіццё пісьменства.** Вялікія цывілізацыі Старажытнага свету стварылі багатую і разнастайную духоўную культуру і такім чынам аказалі прыкметны ўплыў на станаўленне сучаснай сусветнай цывілізацыі.

Адным з найважнейшых іх дасягненняў стала вынаходства пісьменства. У першабытны перыяд узнікненне маўлення садзейнічала з'яднанню чалавечага калектыву, дало магчымасць больш канструктыўна ўзаемадзейнічаць і перадаваць вопыт. З'яўленне пісьменства спрыяла станаўленню дзяржаўнасці, дапамагло захоўваць веды і вопыт, дазволіла падтрымліваць стасункі не толькі на адлегласці, але і праз час. Мы чытаем цяпер творы нашых продкаў і можам зразумець, пра што яны думалі і марылі многія тысячы гадоў таму.

Суаднесці словы і гукі са знакамі людзям удалося не адразу. Першым этапам у развіцці пісьма было з'яўленне *піктаграфіі*. Піктаграмы ўяўлялі сабой малюнкі, якія перадавалі паведамленні.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Першай сістэмай уласна пісьменства лічыцца *іерагліфічнае пісьменства*, у рамках якога асобны знак уяўляў сабой спачатку слова-вобраз, потым слова-сімвал, затым з'явіліся знакі, якія адпавядалі асобным складам. Знакі ўжо суадносіліся не з вобразамі, а з гукамі. Такое пісьмо названа *фанетычным*. Гэтае развіццё заняло некалькі тысяч гадоў. Іерагліфічнае пісьменства набывала розныя формы ў розных цывілізацыях.

Найстаражытнейшыя пісьмовыя помнікі знойдзены ў шумераў у Паўднёвай Месапатаміі і датуюцца сярэдзінай IV тысячагоддзя да н. э. Шумерская сістэма пісьма атрымала назву *клінапіс*, ён быў пераняты і ў далейшым развіты народамі ўсёй Месапатаміі. Асноўным матэрыялам для пісьма стала даступная гліна. Знакі ў форме клінкоў выціскалі на гліняных дошчачках трысняговымі палачкамі, адсюль і назва гэтай сістэмы пісьма. Клінапіс выкарыстоўваўся для запісу як адміністрацыйных, гаспадарчых, так і літаратурных, гістарычных дакументаў.

**N.B.**

Шумеры пакінулі нам легенду аб з'яўленні пісьменства. У паэме, якая была складзена ў пачатку II тысячагоддзя да н. э., апісана, як адзін правіцель накіраваў да другога свайго пасланніка. Аднак ён, відаць, сумняваўся, што той запомніць усё правільна. «Паколькі рот пасланніка быў цяжкім, і ён не мог паўтарыць [паведамленне], уладар … разраўнаваў крыху гліны і нанёс на яе словы, як на таблічку. Да гэтага ні слова не было запісана на гліне».

*Што называюць шумеры ў якасці прычыны ўзнікнення пісьменства? Якія яшчэ прычыны вы можаце прывесці?*

Старажытнаегіпецкае пісьменства ўзнікла на рубяжы IV і III тысячагоддзяў да н. э. Егіпецкія іерогліфы таксама спачатку былі піктаграфічнымі, а затым сталі больш складанымі і шматлікімі. Егіпцяне высякалі надпісы на камені і пісалі на папірусе. Старажытнаегіпецкая іерагліфіка прайшла шлях развіцця ад прымітыўных формаў да складанага сумяшчэння старажытных піктаграфічных і фанетычных знакаў.



Егіпецкія іерогліфы

У Старажытным Кітаі іерагліфічнае пісьменства склалася ў пачатку II тысячагоддзя да н. э. З часам у ім таксама з'явілася мноства фанетычных знакаў. Спачатку кітайцы пісалі на планках з дрэва або бамбуку. Яны першымі пачалі выкарыстоўваць для пісьма паперу. Сучаснае кітайскае іерагліфічнае пісьменства заснаванае на іерагліфіцы, якая ўзнікла яшчэ ў старажытнасці.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Фінікійскі алфавіт

*Складзіце класіфікацыю розных відаў пісьменства ў выглядзе схемы або ментальнай карты. Звяжыце віды пісьменства з дзяржавамі, у якіх яны ўзніклі.*

У XI ст. да н. э. фінікійцы стварылі першы *алфавіт*, у якім кожнаму знаку-літары адпавядаў адзін гук. Яны выкарыстоўвалі 22 знакі для абазначэння зычных гукаў. Галосныя гукі на пісьме не абазначаліся. Пісалі справа налева. Фінікійскае пісьменства было першым алфавітным пісьменствам у гісторыі, яно стала родапачынальнікам большасці сучасных алфавітаў. Стварэнне алфавіта было сапраўды выдатным культурным дасягненнем фінікійцаў. Яно значна палегчыла пісьмо, паколькі цяпер любое слова можна было хутка запісаць, выкарыстоўваючы літары.

У працэсе гандлю з алфавітам пазнаёміліся старажытныя грэкі. Старажытнагрэчаскае пісьмо ўзнікла ў канцы IX ст. да н. э. Грэкі мадыфікавалі фінікійскія літары, крыху спрацiўшы іх напісанне, дадалі знакі для абазначэння галосных гукаў, змянілі напрамак пісьма: сталі пісаць злева направа. Урачыстыя надпісы выбівалі на камені, а ў паўсядзённым жыцці пісалі на дошчачках, пакрытых воскам. Для нанясення літар выкарыстоўвалі *стыло* з дрэва, металу або сланоавай косці. Напісанае лёгка сціралася або выпраўлялася, для гэтага трэба было проста разгладзіць воск і зноў зрабіць запіс. На базе грэчаскага пісьма рымляне стварылі свой — лацінскі — алфавіт, якім карыстаюцца многія народы і ў наш час.

**Эпас і літаратура.** Расказы пра гісторыю народа і міфы пра багоў былі першымі аповедамі, якія ствараліся людзьмі. Спачатку іх запаміналі на памяць. З узнікненнем пісьменства пачалі запісваць розныя тэксты, у тым ліку і літаратурныя творы.

Да эпічнага жанру літаратуры належыць шумерскі і вавілонскі «Эпас пра Гільгамеша», вельмі вялікія па аб'ёме індыйскія паэмы «Махабхарата» і «Рамаяна». «Махабхарата», што налічвае больш за 200 тыс. радкоў, дагэтуль застаецца адным з буйнейшых сусветных літаратурных твораў. У эпасах расказы пра дзейнасць людзей цесна пераплятаюцца з гісторыямі аб умяшанні ў іх жыццё багоў, свет людзей і свет багоў практычна не падзелены якімі-небудзь межамі. Менавіта так старажытны чалавек успрымаў навакольны свет.

*З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі дайце азначэнне паняццю «эпас» і назавіце характэрныя рысы эпічнага роду літаратуры.*

Захавалася нямала запісаў міфаў і гімнаў у гонар багоў, якія выкарыстоўваліся ў рэлігійных рытуалах, у тым ліку тых, што засталіся ад старажытнаегіпецкай


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

цывілізацыі. Знакамітыя індыйскія «Веды» ўключаюць збор рэлігійных гімнаў. Праз міфы чалавек імкнуўся растлумачыць з'явы навакольнага свету. Варта адзначыць: нягледзячы на тое што многія народы жылі на вялікай адлегласці адзін ад аднаго, у іх сустракаюцца вельмі падобныя міфы — аб стварэнні свету і чалавека, аб сусветным патопе, аб памерлых і ўваскрэслых багах.



Сюжэт з паэмы Гамера «Адысея». Гравюра XIX ст.

Папулярнымі сярод старажытнаўсходніх літаратурных жанраў былі казкі, легенды, аповесці, павучанні. У Кітаі папулярнасць набылі філасофскія трактаты. Старажытныя яўрэі стварылі кнігі Старога Запавету Бібліі, у якіх гісторыя яўрэйскага народа пераплятаецца з боскімі ўстанаўленнямі.

Выдатнымі літаратурнымі творамі Старажытнай Грэцыі сталі паэмы «Іліяда» і «Адысея». Аўтар гэтых эпічных паэм — Гамер — змог вусныя народныя паданні аб Траянскай вайне аб'яднаць у цэласныя паэмы.

Найбольш вядомымі паэтамі ў Старажытным Рыме былі Вергілій, Авідзій і Гарацый, творчасць якіх адносіцца да канца I ст. да н. э. — пачатку I ст. У гісторыі гэты перыяд атрымаў назву «залатога веку» рымскай паэзіі. Вяршыняй рымскай класічнай паэзіі можна лічыць паэму Вергілія «Энеіда», якая была створана на заказ імператара Аўгуста. Яна з'яўляецца нібы працягам «Іліяды» і «Адысеі» і асвятляе гісторыю рымлян ва ўзаемнай сувязі з гісторыяй грэкаў.

Ужо ў старажытнасці з'явілася і імкненне збіраць вялікія калекцыі пісьмовых твораў. Асірыйскі цар Ашурбанапал загадаў зрабіць копіі мноства літаратурных твораў, для таго каб захоўваць іх у сваім палацы. Пры раскопках археолагі выявілі там велізарнае сховішча з дзясяткамі тысяч фрагментаў гліняных таблічак.

Самае вялікае сховішча папірусных кніг было створана ў Александрыі Егіпецкай. Яно атрымала назву «Александрыйская бібліятэка» (ад грэч. *biblion* — кніга, *thēkē* — сховішча). Сюды з'язджаліся людзі з усяго Міжземнамор'я, каб вывучаць розныя навукі. Чалавецтва ўжо ў старажытнасці ўсвядоміла важнасць сховішчаў інфармацыі, якія ўяўляюць сабой вялікую сацыяльную каштоўнасць.

**Пачатак развіцця навуковых ведаў.** Узнікненне навукі на Старажытным Усходзе было звязана з неабходнасцю вырашэння практычных задач. Зыходзячы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Егіпецкі каляндар у грабніцы Сененмута. XV ст. да н. э.

з гэтага найбольшае развіццё атрымалі медыцына, матэматыка, геаметрыя, астраномія. Навуковымі дасягненнямі вядомы быў Егіпет. Егіпецкія медыкі лічыліся лепшымі ва ўсім Міжземнамор'і, да нас дайшло нямала спецыяльных трактатаў па лекаванні. Герадот пісаў: «Медыцына ў іх падзелена, кожны лекар займаецца асаблівым родам хвароб: адны — лекары вачэй, іншыя — лекары для галавы, трэція — для зубоў, і яшчэ іншыя — для нябачных хвароб». Археолагі выявілі некалькі соцень старажытнаегіпецкіх медыцынскіх інструментаў. Медыкі добра ведалі будову чалавечага цела дзякуючы абраду бальзамавання.

Сведчаннем практычных уменняў старажытнаегіпецкіх інжынераў з'яўляюцца каласальныя піраміды і велічныя храмы, што захаваліся да нашага часу. Цудоўна была спраектавана сістэма ірыгацыі. Старажытнаегіпецкія астраномы штогод дакладна вылічвалі па руху планет пачатак сезона разліву Ніла.

Астраномы Месапатаміі заклалі асновы календара, якім мы карыстаемся і цяпер. Яны падзялілі год на 12 месяцаў па 30 дзён, у Месапатаміі таксама з'явіўся тыдзень з 7 дзён, кожны з якіх прысвячаўся асабліваму звязанаму з планетамі бажаству. Мы карыстаемся назвамі сузор'яў, многія з якіх былі прыдуманы вавілонскімі астраномамі. Дагэтуль мы выкарыстоўваем шасцідзесяцярычны падлік шумераў: 360 градусаў у акружнасці, 60 хвілін у гадзіне і 60 секунд у хвіліне.

Найважнейшым дасягненнем старажытнаіндыйскай навукі стала стварэнне дзесяцічнай сістэмы вылічэння, якую выкарыстоўваюць і цяпер. Тут матэматыкі ўпершыню сталі ўжываць паняцце «нуль», што дало магчымасць весці тэарэтычныя матэматычныя разлікі. Многія сучасныя матэматычныя тэрміны маюць індыйскае паходжанне: «сінус», «корань». Індыйскія медыкі праводзілі 300 відаў аперацый з дапамогай 120 хірургічных інструментаў.

Да нашых дзён дайшоў кітайскі зборнік «Матэматыка ў дзевяці кнігах», які даказвае, што кітайцы ведалі сутнасць тэарэмы, вядомай як тэарэма Піфагора, яны


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рашалі складаныя ўраўненні. Кітайскія медыкі ўжо ў старажытны час адкрылі іголкаўколванне і выкарыстоўвалі чай як лекі. Падарожжы кітайскіх купцоў далі магчымасць скласці зборнік «Кніга гор і мораў», што паклала пачатак геаграфіі. Старажытным кітайцам былі вядомыя компас і сейсмограф.

Вялікі ўклад у далейшае развіццё навуковых ведаў унеслі грэкі і рымляне. Вядомы старажытнагрэчаскі медык Гіпакрат вучыў: для таго каб вылечыць чалавека, неабходна ўмацоўваць сілы яго арганізма, а не чакаць умяшання боскіх сіл. Для ўмацавання здароўя ён раіў прытрымлівацца дыеты, займацца лячэбнай гімнастыкай. «Клятва Гіпакрата» лічыцца этычнай асновай паводзін сучасных урачоў.

Навуковае тлумачэнне арганізацыі навакольнага свету даў грэчаскі вучоны Дэмакрыт. Ён сцвярджаў, што не існуе боскага творцы людзей. На яго думку, людзі выйшлі з вады і навучыліся жыць дзякуючы свайму вопыту. Вучоны Парменід лічыў Зямлю шарам, а загадчык Александрыйскай бібліятэкі Эратасфен даволі дакладна падлічыў акружнасць зямнога шара.

У Старажытнай Грэцыі ўзнікла і атрымала значнае развіццё гістарычная навука. Яе «айцом-заснавальнікам» лічыцца Герадот, які, расказваючы пра грэка-персідскія войны, апісаў папярэднюю ім гісторыю Грэцыі і многіх краін Блізкага Усходу. Заснавальнікам геаграфіі прызнаюць Страбона.

**Архітэктура, скульптура, жывапіс.** Манументальная архітэктура і выяўленчае мастацтва таксама пачалі развівацца ў перыяд старажытных цывілізацый, прытым гэтае развіццё было бурным і пакінула нам матэрыяльныя помнікі, многія з якіх увайшлі ў лік шэдэўраў сусветнай культуры.

Сімвалам Старажытнага Егіпта да гэтага часу з'яўляюцца велічныя піраміды, пабудаваныя яшчэ ў пачатку егіпецкай цывілізацыі. Знакамітая постаць Сфінкса побач з пірамідамі высечана з суцэльнай скалы. Галоўным будаўнічым матэрыялам быў камень. У Егіпце захавалася шмат руін велічных храмаў, напрыклад, у горадзе Фівы — старажытнай сталіцы Егіпта. Пячорны храм на поўдні Егіпта ў Абу-Сімбеле выразаны ўнутры каменнай гары. Перад уваходам у яго размешчаны чатыры аднолькавыя скульптуры фараона Рамзэса II у паставе седзячы. Іх вышыня складае 20 м.



Скульптуры Рамзэса II у храме ў Абу-Сімбеле. XIII ст. да н. э.

Бюст царыцы Неферціці, аўтарам якога з'яўляецца скульптар Тутмас, лічыцца шэдэўрам сусветнага мастацтва. Грабніца фараона Тутанхамона, адзіная не разрабаваная ў старажытнасці, уражвае колькасцю


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Вялікая Кітайская сцяна. Сучасны выгляд



Порцік карыятыд храма Эрэхтэён, г. Афіны, Грэцыя. Канец V ст. да н. э.



Пантэон, г. Рым, Італія. II ст.

сабраных для тагасветнага жыцця скарбаў.

У Месапатаміі будавалі з цэглы. У цэнтры кожнага горада размяшчаліся храмы з накіраванымі ўверх спецыяльнымі масіўнымі вежамі — зікуратамі. Мясцовае насельніцтва верыла, што там размяшчалася «жыллё» багоў. Цудам свету лічылі ў старажытнасці дзівоснае збудаванне ў Вавілоне — знакамітыя «вісячыя сады» (на дахах цагляных палацаў уладкоўвалі сады з сапраўднымі дрэвамі).

Да грандыёзных архітэктурных збудаванняў традыцыйна адносяць Вялікую Кітайскую сцяну, даўжыня якой складала 10 тыс. лі (каля 5 тыс. км). Таксама вельмі цікавым узорам старажытнакітайскай скульптуры з'яўляюцца больш за 8 тыс. гліняных фігур узброеных воінаў, знойдзеныя ў грабніцы Цынь Шыхуандзі.

Антычная цывілізацыя стварыла непаўторны стыль у архітэктуры і мастацтве. Грэкі і рымляне асабліва старанна ўзводзілі храмы і грамадскія збудаванні. Руіны розных антычных пабудоў можна знайсці ў многіх гарадах сучаснай Еўропы.

Найвышэйшым дасягненнем старажытнагрэчаскай архітэктуры лічаць збудаванні афінскага Акропаля, перш за ўсё вытанчаны храм Парфенон. Архітэктары Ікцін і Калікрат так сканструявалі яго, што велізарнае беламармуровае збудаванне здаецца вельмі лёгкім.

Рымская архітэктура ўвасабляла веліч, магутнасць і багацце «вечнага горада». Пабудаваны ў I ст. н. э. вялізны



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

амфітэатр Калізей змяшчаў дзясяткі тысяч гледачоў. Самым цудоўным збудаваннем, якое захавалася да нашых дзён, стаў храм усіх багоў Пантэон. Яго асаблівасць — дугападобны купал, які нагадвае небасхіл.


Ніка Самафракійская. II ст. да н. э.

Дасканаласці формаў дасягнула старажытнагрэчаская скульптура, неперaўзыдзенымі ўзорамі якой сталі творы выдатных скульптараў Мірона, Фідыя і Паліклета. Рэалістычнасць стала адметнай рысай антычнага мастацтва, а ў далейшым і асаблівасцю ўсяго еўрапейскага мастацтва. Ствараючы статую кап'яносца, Паліклет адкрыў правілы перадачы аблічча ідэальнага грамадзяніна поліса, героя і бога. Чалавека ў руху змог увасобіць скульптар Мірон, адлюстраваўшы ў статуі дыскабола тое імгненне, калі дыск вылятае з рукі спартсмена. Знакамітая скульптура Фідыя паказвае бога Зеўса. Вобразы багоў у антычным мастацтве поўнасцю паўтаралі рэальныя чалавечыя вобразы.

**Грамадскія відовішчы.** Многімі відамі грамадскіх відовішчаў (напрыклад, такімі як тэатр, цырк, Алімпійскія гульні і інш.) мы абавязаны антычнай цывілізацыі. Тое, што давала задавальненне старажытным грэкам і рымлянам, захавала папулярнасць і ў сучасным свеце. Напрыклад, на працягу некалькіх тысяч гадоў людзей прываблівае тэатральнае мастацтва.


Старажытнагрэчаскі тэатр у Эфесе. II ст.

Тэатральныя паказы (грэч. *theatron* — месца для відовішчаў) з'явіліся ў сярэдзіне VI ст. да н. э. як частка рэлігійных свят у гонар грэчаскага бога Дыяніса. Спачатку яны былі прадстаўлены песнямі, якія ўслаўлялі бажаство, але ў хуткім часе з'явіліся акцёры, якія дэкламавалі міфалагічныя сюжэты. Паступова акцёраў станавілася ўсё больш, а сюжэты пастановак сталі выходзіць за межы рэлігійнай сферы; у іх усё часцей разглядаліся чалавечыя ўзаемаадносіны. У аснову тэкстаў для многіх пастановак у Афінах былі пакладзены падзеі ў самім полісе. Грэчаскі тэатр быў прадстаўлены двума жанрамі: трагедыяй


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Гладыятары. Рымская мазаіка на падлозе. III ст.

і камедыяй. Вялікія драматургі Эсхіл, Сафокл і Эўрыпід выхоўвалі павагу да грамадзянскіх свабод і каштоўнасцяў, адзначалі важнасць патрыятызму. Тэатр лічыўся інструментам выхавання грамадзян. Пры Перыкле афінская дэмакратыя аплачвала наведванне тэатра бедным грамадзянам для захавання ў іх пачуцця далучанасці да грамадзянскага калектыву поліса.

Грамадскія відовішчы рымлян у меншай ступені былі звернуты да ўнутранага духоўнага свету чалавека, на першы план выходзіла відовішчнасць. «Хлеба і відовішчаў!» — патрабавалі рымскія беднякі, і імператары дбалі аб задавальненні іх жаданняў.

Папулярнымі публічнымі відовішчамі ў Старажытным Рыме былі гладыятарскія баі да смерці. Такія баі заўсёды грунтоўна рыхтаваліся, арганізоўваліся. Іх вызначалі размах і масавасць. Так, Юлій Цэзар вывеў на арэну 500 пар гладыятараў, іншыя рымскія імператары — па некалькі тысяч рабоў. А імператар Веспасіян пабудаваў у цэнтры Рыма Калізей — велічэзную арэну, на якой можна было праводзіць нават пастаноўкі марскіх баёў. Масавыя відовішчы арганізоўваліся ў гонар важных дзяржаўных свят або па жаданні знатных грамадзян.

§ 7–1

**Узнікненне хрысціянства.** У перыяд антычнай цывілізацыі ўзнікла і пашырылася рэлігійнае вучэнне, якое пануе ў Еўропе і цяпер, — хрысціянства. Гэтая новая рэлігія вызначыла новае бачанне свету і разуменне сэнсу чалавечага жыцця. Хрысціянства — ***монатэістычная рэлігія***, заснаваная на веры ў аднаго ўсёмагутнага Бога-стваральніка. Пасланнікам Бога да людзей быў сын Божы Ісус Хрыстос.

Хрысціянства зарадзілася ў аддаленай правінцыі Рымскай імперыі — Іўдзеі — у пачатку I ст. сярод яўрэйскага насельніцтва, якое чакала вызвалення ад рымскага прыгнёту і верыла ў прыход новага яўрэйскага цара. Некаторыя яўрэі палічылі за яго Ісуса з Назарэта, празванага Хрыстом. Калі ён уехаў у Іерусалім, яго сустракалі натоўпы людзей. Але рымскія ўлады схапілі яго і асудзілі да пакутнай смерці на крыжы, паколькі баяліся яўрэйскіх выступленняў. Гэтыя падзеі адбыліся ў Іўдзеі ў перыяд кіравання імператара Тыберыя, рымскага намесніка ў Іўдзеі Понтыя Пілата і яўрэйскага першасвяшчэнніка Іосіфа Каіафы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Хрыстос — настаўнік і пастыр.
Фрэска ў рымскіх катакомбах Аўрэлія.
Сярэдзіна III ст.

Але абшчына паслядоўнікаў Ісуса Хрыста не распалася. Яны верылі, што ён уваскрос з мёртвых і яго цела знікла з магілы ў скале. Яго лічылі сынам Бога, народжаным пасля беззаганнага зачацця зямной дзяўчынай Марыяй. Згодна з хрысціянскімі апісаннямі жыцця Хрыста — *Евангеллямі*, Ісус Хрыстос чыніў цуды і вучыў новаму стаўленню да Бога, новым узаемаадносінам паміж людзьмі. Паводле яго вучэння, чалавек не павінен грашыць, трэба жыць духоўным, чыстым жыццём. У час пропаведзяў Хрыстос заклікаў ратаваць не фізічнае чалавечае цела, а душу для яе існавання пасля смерці ў Царстве Нябесным.

У адпаведнасці з Евангеллямі, толькі праз веру ў Ісуса Хрыста і духоўную любоў да Бога людзі змогуць пазбавіцца грахоў, бед і няшчасцяў. Гэтую веру пачалі распаўсюджваць сярод розных народаў 12 вучняў Хрыста — *апосталаў*. Сімвалам далучэння да хрысціянства стаў абрад хрышчэння. Хрысціянінам мог стаць любы чалавек незалежна ад нацыянальнасці і сацыяльнага становішча. Ужо на мяжы I—II стст. рымляне пісалі аб тым, што ў многіх гарадах імперыі з’явіліся абшчыны хрысціян. І ўсё ж такі спачатку хрысціяне часта зведвалі ганенні з боку ўлад.

Паступова папулярнасць ідэй хрысціянства расла, многія рымскія грамадзяне пачалі вызнаваць гэтае вучэнне. У 313 г. імператар Канстанцін прызнаў хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй і ўраўнаваў у правах з іншымі. У 325 г. у горадзе Нікеі быў сабраны Першы Усяленскі сабор усіх хрысціянскіх абшчын. На ім былі зацверджаны галоўныя палажэнні хрысціянскай веры — сімвал веры. Хрысціянская царква была арганізавана як сукупнасць асобных вялікіх самакіраваных абшчын. У 392 г. імператар Феадосій прызнаў хрысціянства адзінай рэлігіяй імперыі, забараніўшы любое пакланенне язычніцкім багам і спыніўшы правядзенне Алімпійскіх гульняў.

**Сусветнае значэнне антычнай культуры.** У гісторыі Еўропы і ўсяго свету антычная культура пакінула вельмі глыбокі след. Практычна ў любой галіне сучаснага жыцця мы бачым уплыў ідэй Антычнасці. Уся еўрапейская цывілізацыя вядзе сваё паходжанне ад антычных дзяржаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Рымскі форум. Сучасны выгляд

Грэчаская дзяржаўная структура, прадстаўленая полісамі, спарадзіла разуменне грамадзянства і неад'емных грамадзянскіх правоў, якія сумешчаны з абавязкамі перад усім калектывам. Гэтыя правы адлюстроўвалі роўнасць грамадзян поліса (іншаземцы і рабы выключаліся) у палітычных правах і перад законам. Ідэі грамадзянскіх правоў і інстытутаў фарміруюць і наша сучаснае грамадства.

Сучаснае разуменне дзяржаўнага ладу бярэ свой пачатак у Антычнасці. Грэчаскія традыцыі сфарміравалі сучасную палітычную тэрміналогію: «дэмакратыя», «алігархія», «арыстакратыя», «манархія», «тыранія» і г. д. Менавіта ў Рыме ўзніклі паняцці «рэспубліка», «імператар», «дыктатар» і інш.

Антычная культура ўвабрала ў сябе розныя традыцыі і творча іх спалучыла. Грэкі стварылі ўнікальныя формы рэалістычнага мастацтва і развітой філасофскай думкі. Яе пашырэнне ў перыяд заваёў Аляксандра Македонскага значна ўзбагаціла культуры старажытных цывілізацый Блізкага Усходу. Але ў эліністычны перыяд ішоў і адваротны ўплыў старажытнаўсходніх народаў на грэкаў і свет Міжземнамор'я. У далейшым палітычна моцны Рым, які падпарадкаваў вялікія тэрыторыі на некалькіх кантынентах, стаў актыўна ўспрымаць дасягненні элінізму. У выніку зліцця рымскіх і грэчаскіх традыцый з'явілася антычная культура ва ўсёй яе разнастайнасці.

У Старажытнай Грэцыі пачалося развіццё многіх сучасных навук: астраноміі, анатоміі, заалогіі, батанікі, геаметрыі, гісторыі, геаграфіі, філасофіі і інш. Характэрна, што ўсе гэтыя тэрміны — старажытнагрэчаскія па паходжанні, гэтаксама як і слова «школа».

Навуковыя дасягненні грэкаў перанялі рымляне. Асабліва актыўна яны развівалі прыкладныя навукі. Напрыклад, рымляне стварылі першакласную тэарэтычную і практычную медыцыну. Яны ўпершыню прымянілі наркоз, рабілі пластычныя аперацыі. Рымскае земляробства было заснаванае на веданні аграноміі. Здабыча карысных выкапняў стымулявала развіццё мінералогіі, а затым і металургіі. Імкненне да вывучэння велізарнай краіны прывяло да развіцця геаграфіі і картаграфіі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Асаблівае значэнне ў Рыме мела юрыспрудэнцыя. Рымляне лічылі, што кожная галіна чалавечай дзейнасці павінна рэгулявацца сваімі правіламі, якія належыць выкласці ў законах. Рымскае права на працягу ўсёй гісторыі Еўропы было ўзорам для стварэння заканадаўства. Яно не страціла свайго значэння нават цяпер.

Грэкі шмат у чым заклалі асновы развітога горадабудаўніцтва. Доказ гэтаму — Александрыя Егіпецкая. Але менавіта рымляне давялі прынцыпы гарадской архітэктуры да дасканаласці. Рым стаў увасабленнем вобраза «вечнага горада», як яго называлі самі жыхары. Была вырашана праблема забеспячэння пітной вадой праз акведукі. Сетка дарог з мастамі і тунэлямі звязала ўсю тэрыторыю краіны. Вынаходства бетону, выкарыстанне арак у архітэктурных канструкцыях адкрылі абсалютна новыя магчымасці для будаўніцтва. Многія старажытнарымскія пабудовы захаваліся, іх можна ўбачыць у сучасным Рыме.

Асноўныя літаратурныя роды — эпас, лірыка, драма — пачалі развівацца ў Грэцыі, а затым і ў Рыме. У Старажытнай Грэцыі ўзніклі Алімпійскія гульні, тэатр, прамоўніцкае майстэрства. Рэалістычнае выяўленчае мастацтва Антычнасці натхняе і сучасных майстроў.

*Культурная і навуковая спадчына антычнай цывілізацыі стала асновай культуры не толькі Еўропы, але ўсяго сучаснага чалавецтва. Хрысціянства, якое ўзнікла ў той перыяд, мае найбольшую колькасць прыхільнікаў у сучасным свеце, гэта значыць з’яўляецца самай масавай рэлігіяй. Антычная цывілізацыя была пабудавана на ідэі грамадзянскіх правоў і абавязкаў, якая стала асновай узнікнення дэмакратычнага ладу, што лічыўся найважнейшым дасягненнем Антычнасці і існуе цяпер.*

**1.** Чым было абумоўлена ўзнікненне пісьменства ў старажытнасці?
**2.** Выкажыце свой пункт гледжання: паэмы Гамера «Іліяда» і «Адысея» — гэта выдатныя літаратурныя творы або каштоўныя гістарычныя крыніцы?
**3.** Як вы думаеце, чаму на Старажытным Усходзе навуковыя веды мелі практычны характар?
**4.** З апорай на ілюстрацыйны матэрыял параграфа і іншыя крыніцы інфармацыі складзіце спіс адметных асаблівасцяў старажытнаўсходняй і антычнай архітэктур.
**5.** Чым адрозніваўся старажытнагрэчаскі тэатр ад старажытнарымскага? Як вы думаеце, чым былі выкліканы гэтыя адрозненні?
**6.** Пацвердзіце або абвергніце сцвярджэнне, што рымская культура была не самастойнай, а з’яўлялася толькі пераймannем культуры Старажытнай Грэцыі.
**7.** Назавіце асаблівасці антычнай культуры. Чаму, на ваш погляд, яны сфарміраваліся?
**8.** Падрыхтуйце віртуальную экспазіцыю «Культурныя шэдэўры Старажытнага свету». Правядзіце па ёй экскурсію для аднакласнікаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела I

**1.** Складзіце характарыстыку першабытнага грамадства, выкарыстоўваючы «воблака слоў». Дадайце паняцці, неабходныя для больш поўнай характарыстыкі эпохі першабытнасці. Размяркуйце прадстаўленыя тэрміны на групы. Крытэрыі для дыферэнцыяцыі выберыце самастойна. Складзіце характарыстыку першых дзяржаў, выкарыстоўваючы словы адной з груп або ўсіх груп.




**2.** Пералічыце крыніцы нашых ведаў аб старажытных цывілізацыях. Прывядзіце прыклады найбольш важных помнікаў пісьменства гэтых цывілізацый.

**3.** Параўнайце магчымасці першабытных людзей і нашых сучаснікаў. Зрабіце выснову: ці можна першабытных людзей лічыць «адсталымі»?

**4.** Пакажыце на карце: рэгіёны з'яўлення першых людзей, дзяржавы Старажытнага Усходу і Антычнасці, імперыю Аляксандра Македонскага, эліністычныя дзяржавы. Растлумачце ўплыў прыродна-геаграфічнага фактару на станаўленне дзяржаў.

**5.** Назавіце і згрупуйце характэрныя для дзяржаў Старажытнага Усходу рысы.

**6.** Ахарактарызуйце развіццё дзяржаў Старажытнага Усходу і Антычнасці ў адпаведнасці з планам:
а) палітыка, б) сацыяльна-эканамічнае развіццё, в) культура.

**7.** Вызначце падобныя і адрозныя рысы крыцкай цывілізацыі з цывілізацыямі Старажытнага Усходу.

**8.** Растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| Прыродныя ўмовы ў далінах рэк → | Пераход да высокапрадукцыйнага земляробства |
| Неалітычная рэвалюцыя → | Рост насельніцтва |
| Грамадскі падзел працы → | З'яўленне дзяржавы |
| Няўменне тлумачыць прыродныя з'явы → | Узнікненне рэлігіі |

**9.** Звярніцеся да візітнай карткі вывучанага гістарычнага перыяду (гл. с. 13), падрыхтаванай вамі на першых уроках у 10-м класе. Як бы вы яе змянілі? Чаму?

**10.** Назавіце 5 найбольш значных з пункту гледжання далейшага развіцця чалавецтва дасягненняў перыяду першабытнага грамадства і Старажытнага свету. Абгрунтуйце свой выбар.

**11.** Параўнайце выказванні старажытнаўсходніх правіцеляў пра ўладу. Ці можна на падставе іх лічыць кіраванне аўтараў прыведзеных выказванняў дэспатыяй (несправядлівым, жорсткім кіраваннем)? Знайдзіце ў слоўніку тэрмін «суб'ектыўны» і дайце яму азначэнне, зыходзячы з аналізу прапанаваных урыўкаў.

***Уступ да законаў вавілонскага цара Хамурапі (XVIII ст. да н. э.)***

*Я — Хамурапі, цар дасканалы, не быў няўважлівы да чорнагаловых [людзей], якіх дараваў мне [бог] Эліль і пастырства над якімі ўручыў мне [бог] Мардук. Я не быў нядбайны. Я… адкрываў выйсце з цяжкіх бедстваў і прымусіў святло ўзысці над імі. <…> Я выкараняў міжусобіцы, палепшыў становішча краіны, пасяліў людзей у надзейных мясцінах і пазбавіў іх ад страху. <…> Я — цар, які пераўзыходзіць іншых цароў, мае словы выдатныя, мая мудрасць не мае сабе роўных.*

***Асірыйскі цар Сінахерыб праслаўляе сябе (691 г. да н. э.)***

*Я — Сінахерыб, вялікі цар, магутны цар, цар населенага свету, цар Асірыі, цар чатырох краін свету, наймудрэйшы пастыр, паслухмяны вялікім багам, захавальнік ісціны, які любіць справядлівасць, робіць добрае, прыходзіць на дапамогу ўбогаму, звяртаецца да дабра, поўны герой… першы з усіх правіцеляў, аброць, якая ўтаймоўвае свавольных, спапяляючы маланкай супастатаў. <…> непакорлівых я зброяй пабіў, трупы іх развесіў на па́лях, якія вакол горада загадаў паставіць. <…> Горад Марубішты і горад Акуду, яго рэзідэнцыі, разам з 24 гарадамі малымі, што ў наваколлі, я аблажыў, узяў, разбурыў, знёс, агнём спаліў.*

**12.** Прачытайце ўрывак з трагедыі «Персы» старажытнагрэчаскага паэта Эсхіла (V ст. да н. э.), удзельніка Марафонскай і Саламінскай бітваў.

*Не да ўцёкаў*<br>
*Рыхтуючыся, эліны спявалі*<br>
*Свяшчэнны гімн, але рвучыся ў бой.*<br>
*Спяшаўся флот, і чуўся крык агульны:*<br>
*«Наперад, о хутчэй, сыны Элады!*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Ратуйце родны край, ратуйце сем’і,*
*Дзяцей сваіх, багоў бацькоўскіх храмы,*
*Магілы продкаў; бой цяпер — за ўсё!»*
*Насустрач несліся і персаў крыкі...*

*(Пераклад Н. Кучмель)*

1. Якія пачуцці і настроі грэкаў перадае Эсхіл? Якія словы і выразы ён для гэтага выкарыстоўвае? 2. Ці можна дапусціць, што ў персаў, якія ўдзельнічалі ў гэтай бітве, была падобная матывацыя? 3. Як вы лічыце, ці дае гэты верш аб’ектыўнае ўяўленне аб гістарычных падзеях? 4. Ці можна, з вашага пункту гледжання, міф або літаратурны твор лічыць гістарычнай крыніцай? Аргументуйце сваю пазіцыю.

**13.** Прааналізуйце тэкст грамадзянскай прысягі, высечанай на беламармуровай пліце, якая была ўсталяваная на цэнтральнай плошчы Херсанэса, і зрабіце высновы аб тым, што́ жыхары горада лічылі найвышэйшымі грамадзянскімі каштоўнасцямі. Ці запатрабаваныя гэтыя каштоўнасці ў наш час?

*Клянуся Зеўсам, Геяй, Геліёсам, Дзеваю, багамі і багінямі алімпійскімі, героямі, якія валодаюць горадам, тэрыторыяй і ўмацаванымі пунктамі херсанэсцаў. Я буду нязменны ў думках адносна дабрабыту і свабоды дзяржавы і грамадзян і не здраджу Херсанэсу, Керкінітыдзе, Цудоўнай Гавані і іншым умацаваным пунктам... нічога нікому — ні эліну, ні варвару, але буду берагчы ўсё гэта для херсанэскага народа. Я не буду абвяргаць дэмакратыі і не дазволю гэтага таму, хто здраджвае і абвяргае... Я буду служыць народу і раіць яму найлепшае і найбольш справядлівае для дзяржавы і грамадзян... Я не буду даваць або прымаць да́ру на шкоду дзяржаве і грамадзянам.*

**14.** Назавіце імёны найбольш значных з вашага пункту гледжання дзеячаў Старажытнага свету, якія лічацца знакавымі фігурамі а) палітыкі, б) навукі, в) культуры. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з іх і прадстаўце яго класу ў форме аўтабіяграфіі, буклета, рэзюмэ, флаера, інфаграфікі, водзыву сучасніка і г. д. (выберыце прыдатны для вас варыянт).

**15.** Разгледзьце экспазіцыю «Гліна» Метраполітэн-музея (Нью-Ёрк) на сайце ГуглАрт-Акадэміі (https://artsandculture.google.com/). Падбярыце экспанаты, якія адносяцца да гісторыі Старажытнага свету, і стварыце сваю віртуальную выставу па рэгіёнах з кароткім апісаннем экспанатаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Раздзел II

# ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

***Вы навучыцеся:***

*• арыентавацца ў сучасным свеце, разумець, як складваліся і развіваліся цывілізацыі Сярэднявечча, спадкаемцамі якіх з'яўляюцца многія краіны, народы, рэлігіі сучаснага свету;*

*• аналізаваць прычыны і наступствы сучасных канфліктных сітуацый, ведаць, як фарміраваліся культуры (цывілізацыі), узнікалі і вырашаліся канфлікты паміж людзьмі розных культур, рэлігій, народаў, дзяржаў у Сярэднія вякі.*

**Паходы вікінгаў.**
**«Вялікая хартыя вольнасцяў»:**
**ля вытокаў саслоўнага прадстаўніцтва ў Англіі.**
**Сярэднявечная інквізіцыя.**
**Рыцарства ў еўрапейскай і сусветнай гісторыі.**
**Жанчына ў сярэднявечным еўрапейскім грамадстве.**
**Бусідо — «Шлях воіна»: звычаі і традыцыі самураяў.**
**Культурныя традыцыі Кітая.**
**Вобразы манархаў Сярэднявечча ў школьных падручніках.**
**Геральдыка заходнееўрапейскага Сярэднявечча.**
**Гатычны сабор як сімвал сусвету.**
**Культурна-гістарычныя сімвалы эпохі Сярэднявечча.**
**Вераванні старажытных славян. Язычніцтва.**
**Прасторавыя ўяўленні людзей Сярэднявечча на старых гістарычных картах.**


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Храналогія перыяду Сярэднявечча**

| | |
|---|---|
| 476 г. | Падзенне Заходняй Рымскай імперыі |
| Каля 500 г. | Узнікненне дзяржавы франкаў |
| VII ст. | Узнікненне ісламу. Утварэнне Арабскага халіфата |
| 681 г. | Утварэнне Першага Балгарскага царства |
| VIII ст. | Выданне першай друкаванай газеты ў Кітаі |
| IX в. | Распад Арабскага халіфата |
| 800 г. | Пераўтварэнне Франкскай дзяржавы ў імперыю |
| 843 г. | Распад Франкскай імперыі |
| 863 г. | Стварэнне славянскай азбукі Кірылам і Мяфодзіем |
| 882 г. | Утварэнне Кіеўскай Русі |
| 962 г. | Утварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі |
| 60-я гг. X ст. | Заснаванне Польскай дзяржавы |
| 988 г. | Прыняцце хрысціянства на Русі |
| 1054 г. | Раскол хрысціянства на каталіцкую і праваслаўную цэрквы |
| 1066 г. | Нармандскае заваяванне Англіі |
| 1067 г. | Бітва на р. Нямізе і першая згадка пра Мінск |
| 1096–1099 гг. | Першы крыжовы паход |
| Каля 1113 г. | «Аповесць мінулых гадоў» |
| 1204 г. | Захоп крыжаносцамі Канстанцінопаля |
| 1206 г. | Утварэнне імперыі Чынгісхана |
| 1206 г. | Утварэнне Дэлійскага султаната |
| 40-я гг. XIII ст. | Мангольскае заваяванне Русі |
| 1265 г. | Пачатак работы парламента ў Англіі |
| 1302 г. | Скліканне Генеральных штатаў у Францыі |
| 1337–1453 гг. | Стагадовая вайна |
| 1368 г. | Вызваленне Пекіна ад манголаў «чырвонымі войскамі» |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| 1380 г. | Бітва на Куліковым полі |
| 1385 г. | Крэўская унія |
| 1389 г. | Бітва на Косавым полі |
| 1410 г. | Бітва пад Грунвальдам |
| 1419–1434 гг. | Гусіцкія войны |
| 1453 г. | Падзенне Канстанцінопаля |
| 1455 г. | Выданне Іаганам Гутэнбергам першай друкаванай кнігі ў Еўропе |
| 1479 г. | Аб’яднанне Кастыліі і Арагона ў адзінае каралеўства Іспанія |

Выкарыстоўваючы матэрыял, вывучаны ў 6-м класе, і схему, ахарактарызуйце перыяд гісторыі ад Вялікага перасялення народаў да Ранняга Адраджэння. Дапоўніце схему іншымі важнымі, на ваш погляд, дасягненнямі перыяду Сярэднявечча.

**СЯРЭДНІЯ ВЯКІ**

| | | |
|---|---|---|
| • Стварэнне варварскіх дзяржаў<br>• Візантыйская імперыя<br>• Імперыя Карла Вялікага<br>• Арабскі халіфат | **Ранняе Сярэднявечча**<br>канец V – IX ст. | • Храм святой Сафіі<br>• Каралінгскае Адраджэнне<br>• Узнікненне ісламу<br>• Першая ў свеце газета ў Кітаі |
| • Крыжовыя паходы<br>• Мангольская імперыя<br>• Камунальны рух<br>• «Вялікая хартыя вольнасцяў» | **Высокае Сярэднявечча**<br>X–XIII стст. | • Кодэкс самурайскага гонару<br>• Рыцарская культура<br>• Універсітэты<br>• Раманскі і гатычны стыль<br>• Разборны шрыфт у Кітаі |
| • Цэнтралізацыя дзяржаў<br>• Саслоўна-прадстаўнічая манархія<br>• Стагадовая вайна<br>• Падзенне Візантыі | **Позняе Сярэднявечча**<br>XIV–XV стст. | • Кнігадрукаванне ў Еўропе<br>• Пачатак Адраджэння<br>• Ранні гуманізм<br>• Плаванні Калумба |

Запоўніце ў сшытку табліцу, запісаўшы ў яе па 3–4 найбольш важныя падзеі гісторыі Сярэдніх вякоў. Растлумачце свой выбар.

| Фарміраванне новай сістэмы дзяржаўнага кіравання | Уплыў рэлігіі на жыццё сярэднявечнага грамадства | Дасягненні навукі і культуры |
|---|---|---|
| | | |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ТЭМА 1. ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА І ВІЗАНТЫЯ

## § 8. Палітычная карта сярэднявечнай Еўропы

*Якія змены адбываліся на палітычнай карце Еўропы ў Сярэднявеччы? Якія агульныя тэндэнцыі праявіліся ў развіцці дзяржаўнасці ў перыяд феадалізму?*

*Якімі прычынамі было выклікана Вялікае перасяленне народаў і як яно паўплывала на гісторыю Еўропы? Успомніце азначэнні паняццяў «феадалізм», «феадальная раздробленасць», «Рэканкіста», «саслоўна-прадстаўнічая манархія».* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)



**Ранняе сярэднявечча: ад варварскіх каралеўстваў да імперыі Карла Вялікага.** ***Сярэднімі вякамі*** (Сярэднявеччам) мы называем перыяд у гісторыі чалавецтва з канца V ст. да канца XV ст., які ідзе пасля Антычнасці і папярэднічае Новаму часу.

Яшчэ з III ст. узмацніўся націск германскіх плямёнаў на Рымскую імперыю. Ад нападаў яны паступова перайшлі да сапраўдных заваяванняў. Аслабелая Заходняя Рымская імперыя была ўжо не здольная стрымаць націск варварскіх плямёнаў і пала. Да канца V ст. германцы рассяліліся практычна па ўсёй яе тэрыторыі. Так былі створаны варварскія каралеўствы.

Вялікае перасяленне народаў (IV–VII стст.)

↓

Падзенне Заходняй Рымскай імперыі (476 г.)

↓

Утварэнне варварскіх каралеўстваў

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **астготы** ў Італіі | **франкі** ў Галіі | **вандалы** ў Паўночнай Афрыцы | **вестготы** ў Іспаніі | **англы** і **саксы** ў Брытаніі |

Рассяленне варварскіх плямёнаў і стварэнне варварскіх каралеўстваў

*Прасачыце па гістарычнай карце, якім чынам адбывалася рассяленне варварскіх плямёнаў і дзе былі створаны варварскія дзяржавы.*

Каля 500 г. у франкаў узнікла каралеўства на чале з Хлодвігам, якому ўдалося перамагчы іншых племянных правіцеляў і захапіць значныя тэрыторыі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Хлодвіг I, кароль франкаў.
Мастак *Франсуа-Луі Дэжуін*. 1835 г.

*Якія дэталі сведчаць аб тым, што на партрэце адлюстраваны кароль?*

Хлодвіг заснаваў першую каралеўскую дынастыю франкаў — Меравінгскую. Знаходзячыся на чале ўлады, ён абапіраўся як на апалчэнне свабодных франкаў, так і на знаць.

Франкі вялі шмат войнаў і паступова захапілі ўсю тэрыторыю Галіі, а ў VIII ст. пакарылі поўнач Італіі і ўсходнюю частку Германіі. Іншыя варварскія каралеўствы былі з цягам часу захоплены Візантыяй і арабамі. Арабы паспрабавалі рушыць наперад у Еўропу, але былі разбіты франкамі ў бітве каля Пуацье ў 732 г.

*Успомніце, чаму рымляне называлі германцаў варварамі.*




Значныя перыяды гісторыі Сярэднявечча

**N.B.** Узніклая Франкская дзяржава дасягнула поспехаў дзякуючы не толькі ваеннай сіле, але і дакладнаму палітычнаму разліку правіцеляў, якія ўсталявалі цесны саюз з царквой, прыняўшы хрысціянства ад рымскіх пап. Гэтым яны значна ўзнялі аўтарытэт дзяржавы ў хрысціянскім свеце. Умацаванню каралеўскай улады садзейнічала складанне пісьмовага зборніка законаў — «Салічнай праўды».

Найбольшай магутнасці дзяржава франкаў дасягнула пры Карле Вялікім (768—814). Ён праводзіў актыўную знешнюю палітыку і значна пашырыў межы дзяржавы, зрабіўшы больш за 50 заваёўніцкіх паходаў у суседнія краіны.

У 800 г. Карл прыбыў у Рым, дзе быў абвешчаны імператарам і каранаваны папам рымскім. Рэзідэнцыяй імператара франкаў стаў г. Ахен. Так на палітычнай карце Еўропы размясціліся дзве імперыі: на захадзе — Франкская, на паўднёвым усходзе — Візантыйская.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

N.B.

Эпоху Карла Вялікага называюць «Каралінгскім Адраджэннем». Яна стала пачаткам новага культурнага ўздыму пасля заняпаду Рымскай імперыі. Карл сабраў пры двары самых адукаваных людзей таго часу, садзейнічаў адкрыццю школ, прычым не толькі для знаці, але і для іншых саслоўяў. Пры ім сталі збіраць старажытныя летапісы, якія перапісваліся і сістэматызаваліся ў спецыяльных скрыпторыях (майстэрнях па перапісцы рукапісаў) пры манастырах. Ствараліся бібліятэкі, была праведзена рэформа пісьма і сістэмы навучання. Пры ім асвойваліся закінутыя землі, былі пабудаваны новыя гарады, масты і дарогі.

Імперыя франкаў была адзінай нядоўга. Пасля смерці Карла ў 814 г. яго сын Людовік падзяліў дзяржаву на некалькі частак і перадаў сваім сынам, захоўваючы за сабой тытул імператара. Аднак у хуткім часе пачаліся міжусобныя войны паміж спадкаемцамі. Барацьба завяршылася ў 843 г., калі ў Вердэне ўнукі Карла Вялікага падпісалі дагавор аб падзеле імперыі на тры часткі. У далейшым на гэтых тэрыторыях утварыліся Францыя, Германія і Італія.

**Флор Ліёнскі. Скарга аб падзеле імперыі**

Франкская нацыя ззяла ў вачах усяго свету. Замежныя каралеўствы… пасылалі да яе пасольствы… сам Рым… быў падпарадкаваны гэтай нацыі: там яе кіраўнік, моцны падтрымкай Хрыста, атрымаў сваю дыядэму як апостальскі дар… Але цяпер, прыйшоўшы ў заняпад, гэтая вялікая дзяржава страціла адразу і свой бляск, і назву імперыі; дзяржава, нядаўна яшчэ адзіная, падзелена на тры часткі, і нікога ўжо нельга лічыць імператарам; замест гасудара — дробныя правіцелі, замест дзяржавы — адзін толькі кавалачак. Агульнае дабро перастала існаваць, усякі займаецца сваімі ўласнымі інтарэсамі: думаюць пра што заўгодна, аднаго толькі Бога забылі. Пастыры Божыя, якія прывыклі збірацца, не могуць больш пры такім падзеле дзяржавы ладзіць свае сіноды, няма больш сходу народнага, няма законаў… У той час як імперыя разрываецца на кавалкі, людзі весяляцца і называюць мірам такі ход рэчаў, які не забяспечвае ніводнай з даброт міру.

*Якую ацэнку Франкскай імперыі дае багаслоў Флор Ліёнскі? Якія негатыўныя наступствы падзелу імперыі Карла Вялікага ён называе? Як вы думаеце, каму быў выгадны Вердэнскі падзел?*

**Еўропа Высокага сярэднявечча: феадальная раздробленасць.** Перыяд Высокага сярэднявечча ў еўрапейскіх дзяржавах характарызаваўся палітычнай нестабільнасцю, слабасцю каралеўскай улады і пастаяннымі міжусобіцамі. Пачалася эпоха феадальнай раздробленасці. Напружаная ўнутрыпалітычная сітуацыя ўскладнялася нападамі качэўнікаў (венграў, полаўцаў і манголаў). На Пірэнейскім паўвостраве ішла Рэканкіста — вызваленчая барацьба супраць маўраў (арабаў-мусульман). Самі еўрапейцы ажыццяўлялі крыжовыя паходы ў Іерусалім і краіны Блізкага Усходу для вызвалення Труны Гасподняй і Святой зямлі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Падзел Франкскай імперыі ў 843 г.




Францыя ў перыяд феадальнай раздробленасці (1030 г.)

*З дапамогай картасхемы вызначце, на якія дзяржавы распалася Франкская імперыя. Якія сучасныя дзяржавы знаходзяцца цяпер на гэтых тэрыторыях?*

Французскае каралеўства, дзе з X ст. кіравала дынастыя Капетынгаў, складалася першапачаткова з 14 вялікіх феадальных уладанняў. На сваіх землях феадалы карысталіся шырокімі паўнамоцтвамі, дараванымі каралём. Яны маглі чыніць суд над мясцовым насельніцтвам, збіралі падаткі і трымалі свае ўзброеныя атрады.

Аб'яднанне Францыі пад каралеўскай уладай пачаў у першай палове XII ст. Людовік VI. Ён падпарадкаваў сабе феадалаў, якія валодалі землямі вакол Парыжа. Паступова каралі распаўсюджвалі сваю ўладу на іншыя тэрыторыі Францыі. Іх галоўнымі сапернікамі сталі каралі Англіі, дзе з сярэдзіны XII ст. пачалося кіраванне дынастыі Плантагенетаў, заснаванай французскім графам Анжу Генрыхам Плантагенетам. Пад уладай Плантагенетаў апынулася палова тэрыторыі Францыі. У пачатку XIII ст. кароль Францыі Філіп II Аўгуст змог падпарадкаваць сабе большую частку іх французскіх уладанняў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Атон I у «Хроніцы саксаў і цюрынгаў».
*Лукас Кранах Старэйшы.* Каля 1530–1535 гг.

Найбуйнейшай дзяржавай у Заходняй Еўропе стала Свяшчэнная Рымская імперыя. Яе заснавальнік — германскі кароль Атон I — абвясціў сябе імператарам пасля таго, як у 962 г. захапіў поўнач Італіі і горад Рым. Таксама ў склад дзяржавы Атона былі ўключаны Чэхія, частка паўднёва-ўсходняй Францыі і некаторыя славянскія землі. Ён, як у свой час Карл Вялікі, імкнуўся падкрэсліць пераемнасць паміж сваёй дзяржавай і Рымскай імперыяй.

Галоўнай задачай імператараў было падпарадкаванне ўсёй Італіі. У гэтых мэтах яны давалі шырокія паўнамоцтвы князям,




Еўропа ў канцы XI ст.

*З дапамогай картасхемы вызначце самыя вялікія заходнееўрапейскія дзяржавы ў перыяд Высокага сярэднявечча.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

каб заручыцца іх падтрымкай у італьянскіх паходах. Аднак уся Італія так і не была захоплена, а імператарская ўлада значна аслабла. Манарх не мог умешвацца ва ўнутраныя справы асобных княстваў, і яго ўлада не была спадчыннай.

Італія ў перыяд Высокага сярэднявечча таксама не была адзінай дзяржавай. Паўночныя і частка цэнтральных зямель уваходзілі ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі. Вынікам барацьбы італьянцаў супраць падпарадкавання імперыі стала з'яўленне ў Паўночнай Італіі ў XII ст. шэрагу незалежных гарадоў-дзяржаў, у якіх вярхоўная ўлада належала сходу гараджан. Паўднёвыя землі Італіі доўгі час адносіліся да Візантыі, а ў XII ст. тут было заснавана каралеўства Сіцылія.

У ходзе вызваленчай барацьбы супраць мусульман на Пірэнейскім паўвостраве паступова ўтварыліся незалежныя каралеўствы: Арагон, Кастылія, Леон, Навара, Партугалія. Пры падтрымцы заходнееўрапейскіх рыцараў аб'яднаная армія пірэнейскіх каралеўстваў у 1212 г. разбіла войска маўраў. У наступныя некалькі стагоддзяў мусульмане былі выгнаны з усёй тэрыторыі паўвострава, за выключэннем невялікай дзяржавы з цэнтрам у горадзе Гранада.

У 1066 г. Англія была скорана нармандскім герцагам Вільгельмам Заваёўнікам, які стаў яе каралём. Спадкаемцы Вільгельма вялі ўпартыя войны за падпарадкаванне Уэльса, Шатландыі і Ірландыі. Да XIV ст. Уэльс быў скораны, а Шатландыя, заваяваная раней, наадварот, дабілася незалежнасці. Таксама англійскія каралі падпарадкавалі сабе невялікую частку Ірландыі.

Англійскі вучоны Эдуард Фрымен даваў адмоўную ацэнку нармандскаму заваяванню Англіі, мяркуючы, што нармандская тыранія падавіла «дэмакратычныя свабоды» англасаксаў. Таму ўсю далейшую гісторыю Англіі аж да стварэння парламента пры Эдуардзе I ён разглядаў як «барацьбу англасаксаў за вызваленне ад нармандскага прыгнёту».

Яшчэ адзін англійскі вучоны Вільям Стэбс аспрэчваў высновы Фрымена. Ён лічыў, што сацыяльна-палітычныя адносіны ў грамадстве англасаксаў перашкаджалі «развіццю ў краіне моцнай дзяржаўнасці» і «пагражалі ёй палітычным распадам». Таму нармандскае заваяванне 1066 г. ён лічыў «вялікім дабром» для Англіі.

*З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі падбярыце гістарычныя факты, якія пацвярджаюць адзін з пунктаў гледжання, і правядзіце ў класе дыскусію аб уплыве нармандскага заваявання на далейшае развіццё Англіі.*

**Позняе сярэднявечча: фарміраванне цэнтралізаваных дзяржаў.** XIV–XV стст. у гісторыі заходнееўрапейскіх краін азнаменаваліся тэндэнцыяй да пераадолення феадальнай раздробленасці ў шэрагу краін. У выніку гэтага з'явіліся дзяржавы з моцнай цэнтральнай уладай манарха, якому падпарадкоўваліся ўсе феадалы.

Да пачатку XIV ст. французскія каралі кантралявалі ўжо тры чвэрці зямель сваёй дзяржавы. Аднак у хуткім часе Францыя ўступіла ў цяжкую Стагадовую вайну з Англіяй (1337–1453 гг.), у ходзе якой Англія захапіла частку французскіх зямель.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Еўропа ў XV ст.

Становішча ўскладнілася міжусобнай барацьбой буйны́х груповак феадалаў. Але ў выніку Францыя здолела адстаяць сваю незалежнасць, а ўлада французскага караля яшчэ больш умацавалася. У кіраванне караля Людовіка XI (1461—1483) завяршылася аб’яднанне французскіх зямель.

У самой Англіі ўспыхнула 30-гадовая міжусобная вайна Пунсовай і Белай Ружы (1455—1485). Перамогу ў ёй атрымаў знатны род Цюдораў. Новы кароль Генрых VII Цюдор пачаў жорстка падаўляць сепаратызм феадалаў. Улада манарха ў цэнтралізаванай дзяржаве ўзмацнілася.



Бітва пры Азенкуры ў час Стагадовай вайны. Мініяцюра XV ст.

Аб’яднаўчыя працэсы былі характэрныя і для іншых заходнееўрапейскіх дзяржаў. Так, у 1397 г. правіцелі Даніі, Швецыі і Нарвегіі заключылі палітычны саюз на чале з адзіным манархам — Кальмарскую унію. А ў 1479 г. каралеўствы Кастыліі і Арагона аб’ядналіся ў цэнтралізаваную дзяржаву. Так утварылася ***Іспанія***.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Манарх**

Адзіныя законы для ўсіх падданых

Наёмная армія

Адзіная сістэма мер і вагаў, манеты, стварэнне ўнутранага рынку

| **Духавенства** (служба Богу, але падпарадкаванне каралю) | **Казна** | **Феадалы** (падпарадкаванне і служба каралю) |
|---|---|---|
| Царкоўная дзесяціна | Дзяржаўныя падаткі | Феадальныя павіннасці сялян |

Сяляне, гараджане, падатковае насельніцтва

Структура цэнтралізаванай дзяржавы

Італьянскія землі па-ранейшаму заставаліся раз'яднаныя і належалі розным дзяржавам. Свяшчэнная Рымская імперыя перажывала глыбокі палітычны крызіс і фактычна распадалася.

*N.B.*

У 1215 г. у гісторыі Англіі адбылася важная падзея: кароль Іаан Беззямельны вымушаны быў падпісаць грамату аб правах свабодных людзей — «Вялікую хартыю вольнасцяў». У адпаведнасці з гэтым дакументам кароль абавязваўся не ўводзіць новых падаткаў без згоды агульнага савета каралеўства, які складаўся з баронаў, без рашэння суда не арыштоўваць свабодных людзей і не адбіраць у іх маёмасць. У выпадку парушэння ўмоў «Вялікай хартыі вольнасцяў» савет баронаў меў права абвясціць каралю вайну. Так быў пакладзены пачатак існаванню саслоўна-прадстаўнічай манархіі.

Усведамляючы неабходнасць шырокай падтрымкі ў барацьбе з буйны́мі феадаламі з боку розных саслоўяў, каралі адважыліся на стварэнне саслоўна-прадстаўнічых органаў улады — парламента ў Англіі і Генеральных штатаў у Францыі.

У 1265 г. у Англіі прайшло першае пасяджэнне парламента, які складаўся з палаты лордаў і палаты абшчын. У першую ўваходзілі запрошаныя каралём буйны́я свецкія і царкоўныя феадалы, а другая фарміравалася з гараджан (па двое ад кожнага вялікага горада) і рыцараў (па двое ад кожнага графства). Спачатку парламент склікаўся для абмеркавання падаткаў, але затым пачаў удзельнічаць і ў прыняцці законаў.



Эдуард I у парламенце. Мініяцюра XV ст.

§ 8–1


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Структура саслоўна-прадстаўнічай манархіі ў Францыі

У 1302 г. французскі кароль Філіп IV упершыню склікаў Генеральныя штаты, каб заручыцца падтрымкай духавенства, дваранства і заможных гараджан у барацьбе з папам рымскім. Прадстаўнікі трох саслоўяў засядалі паасобку і збіраліся разам толькі для вынясення канчатковага рашэння. Кожнай палаце належаў адзін голас.

*Пачатак новаму этапу ў гісторыі сярэднявечнай Еўропы быў пакладзены нашэсцямі германскіх плямёнаў, якія прайшлі да Іспаніі і Паўночнай Афрыкі. У Раннім сярэднявеччы былі створаны германскія каралеўствы, самым уплывовым сярод якіх стала Франкская дзяржава. Перыяд Высокага сярэднявечча адзначаны феадальнай раздробленасцю. У Познім сярэднявеччы пачаўся працэс цэнтралізацыі шэрагу дзяржаў: Францыі, Англіі, Іспаніі. Германія і Італія надоўга захавалі раздробленасць на асобныя палітыка-тэрытарыяльныя адзінкі. Аднак менавіта ў Сярэднявеччы пачалося фарміраванне сучаснай палітычнай карты Еўропы.*

**1.** Якія, на вашу думку, галоўныя вынікі палітычнага развіцця Еўропы ў Раннім сярэднявеччы?
**2.** Што, на ваш погляд, стала асноўнай прычынай феадальнай раздробленасці?
**3.** На прыкладзе Францыі растлумачце механізм фарміравання цэнтралізаванай дзяржавы. Якія былі асаблівасці аб'яднаўчых працэсаў у іншых заходнееўрапейскіх краінах?
**4.** Якія прычыны прывялі да стварэння саслоўных прадстаўніцтваў у сярэднявечных дзяржавах Еўропы? Якія былі функцыі англійскага і французскага парламентаў?
**5.** Параўнайце прадстаўленыя ў параграфе картасхемы і прасачыце, як мянялася «палітычнае аблічча» Еўропы ў розныя перыяды Сярэднявечча. Пракаментуйце вынікі даследавання аднакласнікам.
**6.** З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі ахарактарызуйце адносіны Англіі і Францыі ў XIV–XV стст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 9. Еўропа феадальная



*Як змяняліся сацыяльныя адносіны ў сярэднявечным феадальным грамадстве? З чым гэта было звязана?*

*Як свабодныя сяляне станавіліся залежнымі? Як узнікалі гарады? Успомніце азначэнне паняццяў «феод», «феадал», «сеньёр», «васал», «саслоўе», «натуральная гаспадарка», «таварна-грашовая гаспадарка».* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Ранняе сярэднявечча — зараджэнне феадальных адносін.** Падзенне Заходняй Рымскай імперыі ў выніку ўварвання варвараў прывяло да змянення сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ва ўтвораных германскіх каралеўствах. Асновай эканомікі там была натуральная гаспадарка, накіраваная на самазабеспячэнне ўсім неабходным без рынкавых адносін. Сяляне ў Заходняй Еўропе былі арганізаваны ў сельскія абшчыны. Асноўным відам землекарыстання сялян з'яўляўся ***алод*** — індывідуальна-сямейная зямельная ўласнасць. Алод перадаваўся ў спадчыну, але ў другой палове VI ст. права распараджацца ім належала абшчыне. Затым алод стаў цалкам прыватнай уласнасцю — зямлю можна было завяшчаць, падарыць, прадаць.

Тэхналогія апрацоўкі зямлі была даволі прымітыўнай і патрабавала наяўнасці ў гаспадарцы вялікай колькасці працоўных рук. Таму сялянскія сем'і лічылі за лепшае мець шмат дзяцей для больш эфектыўнага вядзення сельскай гаспадаркі. Аднак затым бацьку сямейства даводзілася дзяліць зямлю паміж сваімі сынамі, перадаючы яе ў спадчыну. У выніку такія спадчынныя надзелы аказваліся занадта малымі, сям'я ўжо не магла ні пракарміцца, ні забяспечыць выплату падаткаў каралю. Таму з цягам часу збяднелыя сяляне траплялі спачатку ў пазямельную,




Феадалізм як сістэма адносін, заснаваных на ўласнасці на зямлю


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сеньёр назірае за зборам вінаграду. Мініяцюра XV ст.

а затым і ў асабістую залежнасць ад феадалаў. Залежныя сяляне за карыстанне зямлёй павінны былі працаваць на гаспадара, выконваючы феадальныя павіннасці (адпрацоўваючы паншчыну), або плаціць натуральны аброк.

Акрамя таго, частыя войны і неўраджаі, ад якіх цярпелі сяляне, вымушалі іх шукаць абароны ў феадалаў. Такім чынам, атрымліваючы падтрымку ад буйнога зямельнага ўласніка, сяляне станавіліся пазямельна або нават асабіста залежнымі ад гаспадара. Яны страчвалі права ўласнасці на свае надзелы і не маглі пакідаць гэтую зямлю, былі вымушаны працаваць на ёй. Адбывалася запрыгоньванне, або прымацаванне сялян да зямельных надзелаў. Так узнікла прыгоннае права.

У VIII ст. у Франкскай дзяржаве адбыліся аграрныя пераўтварэнні, у выніку якіх пануючай формай зямельнага ўладання стаў бенефіцый.

***Бенефіцый*** (ад лац. *beneficium* — дабрадзейства) — гэта зямельнае ўладанне, якое перадаецца ў пажыццёвае карыстанне *бенефіцыярыю* пры ўмове нясення службы (ваеннай, адміністрацыйнай, прыдворнай). За невыкананне ўмоў трымальнікам бенефіцыю яго маглі пазбавіць зямельнага ўладання. Таксама бенефіцый вяртаўся ўласніку або яго спадчыннікам у выпадку смерці трымальніка. Аднак сын бенефіцыярыя мог атрымаць бацькоўскае зямельнае ўладанне пры ўмове нясення службы і прынясення асобнай клятвы вернасці ўласніку зямлі.

**N.B.**

Лічыцца, што пачатак феадальнаму землеўладанню паклала ваенная рэформа правіцеля франкаў Карла Мартэла. Ім была створана цяжкая ўзброеная конніца з воінаў-рыцараў, якія ў пажыццёвае валоданне на ўмовах нясення ваеннай службы атрымлівалі бенефіцыі, населеныя сялянамі. На 40 дзён за год такі цяжкаўзброены конны воін павінен быў з'яўляцца на службу да караля. Даходы ад бенефіцыяў давалі воіну магчымасць набыць неабходнае ўзбраенне і забяспечваць сябе.

Таксама ў працэсе развіцця пазямельных адносін у асяроддзі вышэйшага саслоўя ў Заходняй Еўропе да VIII ст. паступова афарміўся такі тып землеўладання, як ***вотчына***. Пад гэтым тэрмінам маецца на ўвазе валоданне зямлёй з арганізацыяй гаспадарчых работ і правамі на залежных сялян. Частку гэтай зямлі ў выглядзе асобных зямельных уладанняў уласнік мог аддаваць бенефіцыярыю ў якасці бенефіцыю для пажыццёвага валодання або сялянам на час.

У IX–XI стст. у Заходняй Еўропе паступова сфарміраваўся новы грамадскі лад, які атрымаў назву ***феадалізм***. Словам «феод» абазначалі зямлю як спадчыннае ўла-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

данне, аддадзенае за службу гаспадаром свайму падначаленаму. Такога гаспадара называлі «сеньёр» (лац. *senior* — старэйшы), а атрымальніка зямлі — «васал». Кароль быў вярхоўным сеньёрам, яго называлі «сюзерэн». Феод як форма зямельнага ўладання з'яўляўся вынікам эвалюцыі сістэмы бенефіцыяў.

§ 9, п. 1–1

**Сюзерэнітэт-васалітэт, феадальная іерархія.** Перадача зямлі *(інвестытура)* ад сеньёра да васала суправаджалася спецыяльнай цырымоніяй, званай ***амаж***. Яна была сімвалічным замацаваннем васальнай пазямельнай залежнасці. У час амажу васал укладваў свае злучаныя далоні ў далоні сеньёра. Ён даваў клятву верна служыць сеньёру і прызнаваў сябе «яго чалавекам». У адказ сеньёр гарантаваў сваю падтрымку.



Прынясенне клятвы вернасці сеньёру. Сярэднявечная мініяцюра

Васал абавязаны быў удзельнічаць у ваенных паходах на баку сеньёра, ён таксама мог служыць пры двары гаспадара, займаючыся адміністрацыйнай або судовай дзейнасцю. Ваенная служба звычайна доўжылася 30—40 дзён на год. Калі сеньёр трапляў у палон, выходзіла замуж яго старэйшая дачка або яго старэйшы сын пасвячаўся ў рыцары, васал аказваў фінансавую дапамогу.

Атрымаўшы зямельнае ўладанне, феадал, у сваю чаргу, мог перадаць яго частку іншаму васалу, робячыся ў дачыненні да яго сеньёрам. Таму вынікам развіцця феадальных адносін стала лесвічная структура грамадства землеўладальнікаў. На верхняй прыступцы гэтай лесвіцы знаходзіўся манарх, які раздаваў землі сваім васалам, што месціліся прыступкаю ніжэй за сюзерэна-караля. Яны, у сваю чаргу, раздавалі землі іншым феадалам, якія знаходзіліся на больш нізкай прыступцы феадальнай лесвіцы. Феадальная лесвіца заканчвалася прыступкай «аднашчытных» рыцараў, якія ўжо не маглі дазволіць сабе мець васала з-за недастатковай колькасці зямлі. Такая іерархічная лесвіца існавала ў кожнай феадальнай дзяржаве Заходняй Еўропы.




Феадальная лесвіца

*Як вы думаеце, чым васалам мог лічыцца кароль?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пераход ад бенефіцыю да феода азнаменаваў таксама ўнутрыпалітычныя змяненні ў краінах Заходняй Еўропы. Была сфарміравана ўстойлівая *лесвіца паслядоўнага панавання-падпарадкавання*, заснаваная на пазямельнай (феод) і асабістай (амаж) залежнасці аднаго феадала ад другога. Кожны васал знаходзіўся ў залежнасці толькі ад свайго сеньёра, а сеньёру свайго сеньёра ён ужо не падпарадкоўваўся. Таму многія буйны́я феадалы адчувалі сваю незалежнасць ад вярхоўнай улады. Больш за тое, калі васал лічыў, што сеньёр абараняе яго недастаткова добра, то ён мог выступіць супраць яго са зброяй. У пачатку Высокага сярэднявечча гэта прывяло да таго, што феадалы сталі весці паміж сабой войны. У выніку ў дзяржавах з'явіліся незалежныя буйны́я ўладанні асобных феадалаў. Пачаўся перыяд феадальнай раздробленасці.

Тым не менш сістэма сюзерэнітэту-васалітэту з'яўлялася асновай палітычнага ладу феадальнай манархіі і забяспечвала адзінства паноўнага класа землеўладальнікаў у перыяд феадальнай раздробленасці.

**Саслоўі сярэднявечнага грамадства. Познефеадальнае грамадства.** Феадалізацыя грамадства прывяла да фарміравання ў Высокім сярэднявеччы чатырох асноўных саслоўяў: рыцарства, духавенства, свабодных сялян і гараджан. Першыя два саслоўі лічыліся прывілеяванымі. У сярэднявечным грамадстве адсутнічала сацыяльная мабільнасць. Прыналежнасць чалавека да саслоўя вызначалася пры нараджэнні, перайсці ў іншае саслоўе ён практычна не мог (выключэннем было духавенства, якое фарміравалася не па нараджэнні).

**N.B.**

У сярэднявечным грамадстве лічылася, што сам Бог падзяліў людзей на саслоўі тых, хто «моліцца», «ваюе» і «працуе». Тыя, хто моліцца, — гэта хрысціянскія свяшчэннаслужыцелі, абавязкам якіх было маліцца аб ратаванні чалавечых душ і збавенні грахоў. Тыя, хто ваюе, — кароль і феадалы — павінны былі змагацца з праціўнікамі хрысціянскай веры і абараняць тых, што моляцца і працуюць, ад ворагаў. Тыя, хто працуе (сяляне і гараджане), абавязаны былі карміць тых, хто моліцца, і тых, хто ваюе.

Саслоўе феадалаў аб'ядноўвала буйны́х, сярэдніх і дробных землеўладальнікаў. Пры гэтым таксама з'явілася значная колькасць рыцараў, якія не атрымалі зямлю ў спадчыну.

У перыяд Позняга сярэднявечча адбыліся сур'ёзныя змяненні ў структуры саслоўя феадалаў. Гэта быў час фарміравання цэнтралізаваных нацыянальных дзяржаў, у якіх кароль стаў ужо *рэальным паўнаўладным манархам*, а не *намінальным*, як раней. Цяпер усе феадалы з'яўляліся яго прамымі васаламі. Замест інвестытуры ўзнікла сістэма грашовых узнагарод. Свецкая феадальная іерархія страціла ранейшы сэнс і стала адыгрываць сімвалічную ролю. Адбылося ўтварэнне адзінага саслоўя дваран, у рамках якога тытулы «граф», «барон», «герцаг» паказвалі толькі на прыналежнасць да арыстакратыі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У Высокім сярэднявеччы ў саслоўе сялян уключаліся асабіста залежныя, пазямельна залежныя і поўнасцю свабодныя людзі. З цягам часу стала відавочна, што праца свабодных сялян на арандаваных участках аказалася больш эфектыўнай і прыбытковай, чым праца асабіста залежных. Таму ў Познім сярэднявеччы саслоўе сялян *уніфікавалася* праз атрыманне асабістай свабоды і было ўключана разам з гараджанамі ў падатковае саслоўе.

Таксама ў перыяд Высокага сярэднявечча пачало фарміравацца саслоўе гараджан. Гэта было звязана з працэсам аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі і актыўнай урбанізацыяй. Да Позняга сярэднявечча адбылася дыферэнцыяцыя гараджан па маёмаснай прыкмеце на заможных і беднякоў.

*Высветліце значэнне слова «ўніфікаваць» і замяніце яго ў сказе сінонімам.*

У выніку развіцця сацыяльнай структуры сфарміраваліся тры саслоўі: дваранства, духавенства, падатковае саслоўе.

**Гарады Заходняй Еўропы.** У выніку падзелу рамяства і сельскай гаспадаркі ў канцы Ранняга сярэднявечча пачаўся актыўны працэс урбанізацыі — павелічэння колькасці гарадоў і гарадскога насельніцтва. Сярэднявечныя гарады ўзніклі ў рамках феадальнага грамадства як вынік эвалюцыі натуральнай гаспадаркі. Эканамічнай асновай іх з'яўлення і развіцця было аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі і ператварэнне яго ў асаблівую галіну вытворчай дзейнасці. Гэтаму працэсу таксама спадарожнічала зараджэнне рынкавых адносін і банкаўскай сферы ў гарадской эканоміцы.

З IX ст. шматлікія гарады ўзнікалі на поўдні Францыі і ў Італіі, а затым у Германіі па берагах рэк Дунай і Рэйн. Блізкасць да водных шляхоў давала магчымасць весці гандаль рэдкімі таварамі на далёкія адлегласці, што прыносіла найбольшы прыбытак. Буйнейшымі гарадамі былі Лондан і Парыж, якія налічвалі некалькі дзясяткаў тысяч жыхароў.

Многія гарады, залежныя ад свецкіх або духоўных феадалаў, адчувалі цяжар павіннасцяў і падаткаў на карысць сваіх сеньёраў. Таму з цягам часу яны пачалі барацьбу за права самакіравання. Часта гараджане дабіваліся яго ўзброеным спосабам, але іншым разам набывалі яго за вялікія грошы.

**N.B.**

Выкупы за вольнасці і правы гарадоў служылі для феадалаў істотнай крыніцай даходаў. Аднак, атрымаўшы грошы, некаторыя з іх адмаўляліся даваць гораду абяцаныя правы. Справа даходзіла да ўзброеных сутыкненняў паміж атрадамі феадалаў і гараджанамі. У такіх выпадках абодва бакі звярталіся да караля, спрабуючы грашовымі і іншымі дарункамі забяспечыць жаданае рашэнне. І каралі часта падтрымлівалі гараджан. Гэтым яны аслаблялі феадалаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гарады, якія атрымалі вольнасці, засноўвалі незалежныя ад феадала органы самакіравання. Звычайна гэта быў гарадскі савет на чале з мэрам або бургамістрам, які засядаў у спецыяльным будынку — мэрыі ці ратушы. Дазвол гораду чаканіць манету, ствараць свой суд і набіраць апалчэнне афармляўся ў спецыяльным праве, якое гарантавала таксама асабістую свабоду гараджан ад феадалаў. У Германіі і ў краінах Цэнтральнай Еўропы найбольшае распаўсюджанне атрымала магдэбургскае права.

**Рамяство і гандаль.** Для абароны сваіх інтарэсаў рамеснікі адной спецыяльнасці (майстры) аб'ядноўваліся ў цэхі на чале са старшынёй. Рамеснікі павінны былі працаваць у горадзе згодна са спецыяльным статутам, у якім апісваліся стандарты прадукцыі, што выпускалася.



Рамесная майстэрня. Мініяцюра XIV ст.

*Як вы думаеце, на вытворчасці якога тавару спецыялізавалася гэтая рамесная майстэрня?*

Сярэднявечнае рамяство было заснавана на ручной працы, гаспадаром майстэрні быў сам майстар. У яго распараджэнні працавала некалькі вучняў-чаляднікаў. Яны працавалі бясплатна, асвойваючы прафесію, у спадзяванні здаць экзамен і стаць паўнапраўнымі членамі цэха. Для гэтага яны павінны былі стварыць так званы шэдэўр — дасканалы ўзор вырабу.

Прадметы, што вырабляліся рамеснікамі, сталі больш якаснымі. Таму сяляне самі ўжо не майстравалі рамесныя вырабы, а імкнуліся абмяняць на іх сваю прадукцыю. Так паступова зараджаліся таварна-грашовыя адносіны. Натуральная гаспадарка замянялася таварнай, дзе прадукт быў прызначаны для продажу або абмену, а не для ўласнага спажывання.

Значнае пашырэнне атрымалі гарадскія рынкі і кірмашы, дзе рамеснікі і сяляне маглі прадаць свой тавар. На рынках вялікім попытам карысталіся паслугі грашовых мянял, якія абменьвалі манеты розных дзяржаў, вызначалі іх сапраўднасць. Накопліваючы вялікія грашовыя сумы, мянялы давалі іх у доўг пад высокі працэнт, робячыся ліхвярамі. Паступова на аснове крам мянял і ліхвяроў з'явіліся першыя банкі — арганізацыі, якія давалі грашовыя сродкі ў пазыку, а таксама прымалі ўклады на захоўванне пад працэнты.



Кірмаш. Сярэднявечная мініяцюра

Пасрэднікамі ў гандлёвых аперацыях выступалі купцы. Дзеля абароны сваіх інтарэсаў яны пачалі аб'ядноўвацца ў гільдыі. Купцы італьянскіх гарадоў Венецыя і Генуя кантралявалі выгадныя гандлёвыя шляхі, якія звязвалі Еўропу з краінамі Усходу. Гандаль на поўначы Еўропы кантралявалі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Гарады і гандаль сярэднявечнай Еўропы

купцы нямецкага гандлёвага саюзу Ганза, куды ўваходзілі прадстаўнікі больш як 70 гарадоў.

§ 9–1

*Галоўным багаццем Сярэднявечча была зямля. Воінскае саслоўе атрымлівала ад манархаў зямлю за службу. Паступова зямля стала іх спадчыннай уласнасцю — феодам. Але яе неабходна было апрацоўваць, каб атрымліваць ураджаі. Феадалы не толькі арганізоўвалі працу сялян, але і імкнуліся прымацаваць іх да зямлі. Гэта стала прычынай узнікнення прыгоннага права. Унутры саслоўя феадалаў узнікла іерархічная васальная лесвіца. Вярхоўным сюзерэнам быў кароль, яму падпарадкоўваліся буйны́я феадалы, у васальнай залежнасці ад якіх, у сваю чаргу, знаходзіліся больш дробныя феадалы. Прывілеяванымі саслоўямі былі феадалы-дваране, духавенства. У гарадах сфарміравалася новае свабоднае саслоўе буржуа (гараджан), якія займаліся гандлем і рамёствамі. Паступова структура саслоўяў станавілася ўсё больш складанай.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Складзіце воблака слоў з незнаёмых вам гістарычных паняццяў, якія сустрэліся ў параграфе.
2. З чым былі звязаны змены ў становішчы сялян у перыяд Сярэднявечча і ўсталяванне павіннасцяў?
3. Што ўяўлялі з сябе пазямельныя і асабістыя абавязацельствы васалаў і сеньёраў у адносінах адзін да аднаго?
4. Як змены ў сістэме феадальнага землеўладання паўплывалі на адносіны паміж сеньёрамі і васаламі?
5. Ахарактарызуйце горад, які мае самакіраванне, па наступных пунктах: а) сацыяльная структура; б) заняткі жыхароў; в) аб'яднанні гараджан; г) кіраванне горадам.
6. Якія змяненні адбыліся ў жыцці людзей з пераходам ад натуральнай гаспадаркі да таварна-грашовай?

# § 10. Еўропа хрысціянская



*Якім чынам каталіцкая царква ўплывала на палітычную сітуацыю ў краінах Заходняй Еўропы і сістэму каштоўнасцяў еўрапейцаў Сярэднявечча?*

*Калі і якім чынам узнікла хрысціянства? Чаму яно стала дзяржаўнай рэлігіяй у Старажытным Рыме? Дайце азначэнне паняццям «каталіцкая царква», «духавенства», «місіянеры», «манаства».* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас; § 7 гэтага вучэбнага дапаможніка)

**Хрысціянізацыя Еўропы.** У канцы IV ст. у Рымскай імперыі хрысціянства афіцыйна стала дзяржаўнай рэлігіяй. Аднак язычніцтва ўсё яшчэ панавала сярод большасці варварскіх народаў Еўропы. Таму перад царквой паўстала задача схіліць язычнікаў да хрысціянскай веры. За справу ўзяліся прапаведнікі-місіянеры, актыўная дзейнасць якіх бярэ пачатак з часоў рымскага папы Грыгорыя I Вялікага (590–604). Найбольш значную ролю ў справе хрысціянізацыі адыгралі такія місіянеры, як святы Патрык у Ірландыі, святы Баніфацый у германскіх плямёнаў, святыя Кірыла і Мяфодзій у славян.

Максімальны вынік дасягаўся ў тых выпадках, калі ў хрысціянства пераходзілі манархі і правадыры плямёнаў. Бо пасля прыняцця новай рэлігіі яны былі зацікаўлены ў тым, каб і іх падданыя пераймалі новую веру. Часта гэта адбывалася гвалтоўным шляхам. Германскае племя франкаў прыняло хрысціянства па рымскім, *артадаксальным* узоры, у той час як многія з іх сусе-

*Высвятліце значэнне слова «артадаксальны» і замяніце яго ў сказе сінонімам.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дзяў вызнавалі хрысціянства ў ерэтычным варыянце. Гэтая акалічнасць выкарыстоўвалася франкамі пры нападах на сваіх суседзяў, паколькі такія войны вяліся пад выглядам прывядзення ерэтыкоў да сапраўднай веры. Так Карл Вялікі пераводзіў насельніцтва заваяваных ім тэрыторый у хрысціянства пад апекай папы рымскага.

У выніку ў IX ст. хрысціянства было прынята ў Балгарыі і Чэхіі, у X–XI стст. — у Польшчы, Старажытнай Русі, Венгрыі і Скандынавіі.

**Царкоўны раскол 1054 г.** Яшчэ ў час існавання адзінай Рымскай імперыі рысы, што прысутнічалі ў хрысціянскай рэлігіі на ўсходзе і захадзе, вызначаліся мясцовымі традыцыямі. Напрыклад, па-рознаму вылічвалі даты святкавання Вялікадня. Пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі гэтыя адрозненні пачалі паглыбляцца. Можна сказаць, што хрысціянскі свет падзяліўся на дзве часткі. На захадзе гэта быў «свет лацінскі» (каталіцкі), дзе хрысціянства прымалася народамі Заходняй, Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы на ўзор, устаноўлены царквой Рыма. А на ўсходзе і на Балканскім паўвостраве — «свет праваслаўны», дзе хрысціянства вызнавалі на ўзор візантыйскай царквы.



Помнік «апосталу германскіх зямель» святому Баніфацыю, г. Фульда, Германія

§ 10, п. 1–1

N.B.

Паміж гэтымі двума цэнтрамі — Рымам і Візантыяй — з цягам часу ўзнікла шмат адрозненняў у галіне веравучэння, царкоўнай арганізацыі і абраднасці. Мовай богаслужэння і царкоўнай літаратуры на Захадзе была латынь, а на Усходзе — грэчаская. У пытаннях дагматыкі прынцыповым адрозненнем было вучэнне аб святой Тройцы (Бог-Айцец, Бог-Сын, Бог — Дух Святы). Заходняя царква вучыла, што Святы Дух ідзе і ад Бога-Айца, і ад Бога-Сына, на ўсходзе ж лічылася, што толькі ад Бога-Айца.

На захадзе прызнавалася кіроўная роля аднаго епіскапа Рыма, які пачэсна называўся папам рымскім. На ўсходзе было некалькі самых уплывовых хрысціянскіх цэнтраў — Канстанцінопаль, Александрыя, Антыёхія і Іерусалім. Епіскапы гэтых цэркваў насілі тытулы патрыярхаў і вырашалі найважнейшыя пытанні сумесна. Усе яны прызнаваліся практычна роўнымі адзін аднаму.

З цягам часу папа рымскі стаў прэтэндаваць на аднаасобнае вяршэнства над усёй царквой. Гэтыя прэтэнзіі грунтаваліся на паданні аб тым, што святы апостал Пётр, галоўны вучань Ісуса Хрыста, быў першым епіскапам Рыма. Таму і яго пераемнікі, рымскія епіскапы, павінны атрымаць першынство ва Усяленскай царкве. Усходнія патрыярхі былі не згодны з такім становішчам.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Прычыны падзелу хрысціянства на дзве галіны

Рознымі былі ўзаемаадносіны царквы са свецкай уладай, а значыць, і іх палітычныя памкненні. Калі канстанцінопальскі патрыярх падпарадкоўваўся волі візантыйскага імператара, то папа рымскі меў вялікі ўплыў на заходнееўрапейскіх манархаў.

Рымскія папы на працягу многіх гадоў імкнуліся пашырыць сваю ўладу і на ўсходнюю царкву. Аднак гэтыя спробы былі няўдалымі, а адносіны паміж цэрквамі заставаліся напружанымі. У выніку ў ***1054 г.*** кіраўнікі рымскай і канстанцінопальскай цэркваў абвясцілі адзін аднаму *анафему* (праклянцце) і часова спынілі стасункі. Хрысціянства раскалолася на каталіцтва і праваслаўе.

**Роля царквы ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці Еўропы.** Палітычныя пазіцыі папства значна ўмацаваліся пасля ўступлення ў саюз з франкамі. У ***756 г.*** кароль Піпін Кароткі падараваў папу рымскаму вялізныя тэрыторыі. Так узнікла *Папская вобласць* з цэнтрам у Рыме — дзяржава, у якой пáпы мелі не толькі духоўную, але і свецкую ўладу. У 800 г. папа рымскі каранаваў Карла Вялікага, прызнаўшы яго імператарам, а з 962 г. была ўстаноўлена пастаянная практыка каранацыі германскіх імператараў рымскімі папамі. Усё гэта сведчыла пра значны палітычны аўтарытэт царквы Рыма.



Генрых IV і Грыгорый VII у Каносе ў 1077 г. Мастак *Карла Эмануэль*. Каля 1630 г.

Рымскія папы актыўна ўмешваліся ў палітычнае жыццё, імкнучыся падпарадкаваць сваёй уладзе заходнееўрапейскіх гасудароў. Вялікі канфлікт з-за права прызначаць епіскапаў адбыўся ў канцы XI ст. паміж папам


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Успомніце, якая дзяржава была ўтворана ў 962 г.

рымскім Грыгорыем VII і германскім каралём Генрыхам IV. Кароль абвясціў аб пазбаўленні папы ўлады, папа ж вызваліў падданых Генрыха IV ад прысягі манарху. А феадалы, скарыстаўшыся гэтым, пачалі барацьбу з каралём. У выніку Генрыху IV давялося каяцца і вымольваць у рымскага папы дараванне. Барацьба пап і германскіх манархаў, у якую былі ўцягнуты многія феадалы, землі і гарады Італіі і Германіі, працягвалася больш за 200 гадоў.

Найбольшай магутнасці рымская царква дасягнула пры Інакенцію III (1198–1216). Гэты ўплывовы папа актыўна ўмешваўся ў адносіны паміж манархамі і ва ўнутраныя справы шэрагу еўрапейскіх дзяржаў. Васаламі папы прызналі сябе правіцелі Англіі, Швецыі, Даніі, Польшчы. Менавіта ён ініцыяваў паходы крыжаносцаў у Прыбалтыку, а таксама барацьбу з ерэтыкамі на поўдні Францыі. Усяго за перыяд з XI па XV ст. было арганізавана больш за 20 крыжовых паходаў на Усход і на еўрапейскія тэрыторыі.

**З паслання рымскага папы Інакенція III «Два свяцілы»**

Стваральнік Сусвету стварыў два вялікія свяцілы ў аснове неба; вялікае свяціла кіруе ўдзень, меншае свяціла кіруе ўначы. Тым жа чынам для заснавання ўсяленскай царквы, пра якую гавораць як пра нябесную, ён усталяваў дзве вялікія вартасці: большая нясе на сабе кіраванне душамі (гэта — сутнасць дня), меншая нясе ў сабе кіраванне целамі (гэта — сутнасць ночы). Гэтыя адметнасці ёсць улада пантыфікаў (рымскіх пап) і ўлада каралёў. Да таго ж месяц выводзіць сваё святло ад сонца... Тым жа чынам каралеўская ўлада выводзіць сваю сутнасць ад аўтарытэту пантыфікаў...

*Як, з вашага пункту гледжання, Інакенцій III ацэньвае ўладу рымскіх пап і ўладу каралёў? Прывядзіце ў пацвярджэнне свайго меркавання словы з дакумента.*

Аднак ужо ў XIV ст. уплыў царквы на ўнутраную палітыку асобных дзяржаў значна зменшыўся. З 1378 па 1417 г. царква перажывала Вялікі раскол, калі на чале яе стаяла спачатку два, а затым адразу тры папы адначасова.

Вельмі значнай была роля царквы ў эканамічным жыцці Заходняй Еўропы, паколькі царква з'яўлялася буйнейшым феадалам. Ёй належала каля трэці сельскагаспадарчых угоддзяў, дзе працавала вялікая колькасць залежных сялян. Шматлікія манастыры гандлявалі віном, соллю. А некаторым епіскапам і абатам (настаяцелям манастыроў) належалі нават цэлыя гарады. На карысць царкве насельніцтва аддавала дзесяціну — дзясятую частку даходаў. Для таго каб багацці царквы захоўваліся, а не перадаваліся свяшчэннікамі сваім нашчадкам, рымскі папа Грыгорый VI увёў практыку абавязковай бясшлюбнасці *(цэлібату)*.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На працягу ўсяго Сярэднявечча насельніцтва Заходняй Еўропы было вельмі рэлігійным. Царква ўплывала на сістэму ідэалаў і паводзіны людзей. Сам светапогляд чалавека вызначаўся рэлігіяй. Першапачаткова, у Раннім сярэднявеччы, найбольш адукаванымі былі манахі і царкоўныя дзеячы. Дзякуючы намаганням перапісчыкаў-манахаў папаўняўся і рос бібліятэчны фонд, захоўваліся творы антычных аўтараў. Царква аказала вялікі ўплыў на развіццё манументальнага дойлідства і выяўленчага мастацтва. Цэрквы і манастыры былі самымі прыгожымі і велічнымі збудаваннямі ў сярэднявечнай Еўропе. Лепшыя з мастакоў і скульптараў імкнуліся прыняць удзел у аздабленні сабораў.

Рускі гісторык Уладзімір Іванавіч Гер'е адзначаў, што чым больш узрастала свецкая ўлада папства, якая дасягнула сваёй кульмінацыі ў XIII ст., тым далей адыходзіла царква ад свайго першапачатковага разумення «царства божага» як толькі духоўнага, а не зямнога, падрываючы тым самым уласную моц.

*Ці згодны вы з меркаваннем вучонага? Пацвердзіце свой пункт гледжання гістарычнымі фактамі.*

§ 10–1

**Светаўспрыманне і сістэма жыццёвых каштоўнасцяў еўрапейцаў.** У сярэднявечных жыхароў Заходняй Еўропы было ўяўленне аб дваістым характары навакольнай прасторы: свет для іх падзяляўся на рэальны і звышнатуральны. Абодва гэтыя складнікі ўспрымаліся як непарыўнае цэлае. Лічылася, што сустрэча з анёламі магчымая ў цэрквах і манастырах, а нячыстую сілу найлягчэй сустрэць у лясах і на балотах, а таксама на могілках.



Імператар Генрых II Святы і яго жонка Кунігунда, каранаваныя Хрыстом. Сярэднявечная мініяцюра

Пад уплывам вучэння царквы час успрымаўся лінейна: чалавечая гісторыя — гэта перыяд ад стварэння свету да Страшнага суда і Канца свету.

Аднак у канцы Сярэднявечча паступова пачало фарміравацца і новае разуменне чалавека і свету, што яго акаляў. Зямныя даброты, зямныя інтарэсы чалавека (а не толькі свет духоўны або катаванне плоці і беднасць) сталі ўспрымацца як прыемныя Богу каштоўнасці. Таму пачала заахвочвацца актыўная дзейнасць чалавека, скіраваная на тое, каб зарабіць маёмасць сумленным спосабам.

Сярэднявечная культура і побыт былі цалкам прасякнутыя хрысціянскімі ідэямі і каштоўнасцямі. Таму сувязь чалавека з Богам заставалася ў цэнтры ўвагі на працягу ўсяго перыяду Сярэднявечча. Лічы-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лася пажаданым здзяйсняць паломніцтвы, каб дакрануцца да хрысціянскіх святынь. Шанаванне святых, якія абвяшчаліся ахоўнікамі некаторых прафесій, асобных гарадоў і нават цэлых краін, было найважнейшым культам кожнага хрысціяніна. У цэлым вельмі вялікая ўвага надавалася захаванню абрадавага боку рэлігіі. Строгае выкананне абрадаў і чытанне малітваў лічылася залогам выратавання душы верніка. Сярэднявечнага хрысціяніна палохала не столькі сама смерць, колькі магчымае пакаранне ў замагільным жыцці, пра якое папярэджвала царква. Таму для пастаяннага напаміну пра гэта ў сярэднявечных саборах часта адлюстроўвалі сцэны Страшнага суда.



Уяўленні еўрапейцаў аб уладкаванні свету

*Апішыце, як еўрапейцы ўяўлялі светаўладкаванне.*

*Папства стварыла зладжаную царкоўную арганізацыю, якую мы цяпер называем каталіцкай царквой. У перыяд імперыі Карла Вялікага ўсе яго падданыя сталі хрысціянамі-католікамі. Раскол 1054 г. прывёў да распаду адзінага хрысціянства на каталіцызм і праваслаўе — дзве галіны, што існуюць дагэтуль. На працягу ўсяго Сярэднявечча еўрапейскае насельніцтва было вельмі рэлігійным. Рымскія папы прэтэндавалі нават на вяршэнства над свецкімі правіцелямі. Усю сістэму жыццёвых арыенціраў і каштоўнасцяў сярэднявечных еўрапейцаў вызначала хрысціянства з яго верай у пасмяротную адплату і замагільнае існаванне душы. Веды пра сусвет былі вельмі абмежаванымі.*

**1.** Складзіце воблака слоў з новых паняццяў параграфа.
**2.** Пералічыце шляхі ажыццяўлення хрысціянізацыі Еўропы і прывядзіце прыклады.
**3.** Ахарактарызуйце сістэму кіравання рымскай хрысціянскай царквой.
**4.** Якія фактары сталі падставай для сутыкнення паміж заходняй і ўсходняй хрысціянскімі цэрквамі?
**5.** Прадстаўце адрозненні каталіцызму і праваслаўя ў выглядзе табліцы.
**6.** Прывядзіце факты, якія даказваюць значны ўплыў рымскіх пап у Заходняй Еўропе ў IX–XIII стст. З чым гэта было звязана?
**7.** Ахарактарызуйце ўяўленні сярэднявечнага чалавека аб уладкаванні сусвету і яго сістэму жыццёвых каштоўнасцяў. З чым, на вашу думку, было звязана такое ўяўленне пра сусвет?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 11. Культура заходнееўрапейскага Сярэднявечча



*Якое месца займае сярэднявечная заходнееўрапейская культура ў кантэксце сусветнай?*

*Якую культурную з'яву называюць Раннім Адраджэннем? Хто такія гуманісты? Успомніце выдатныя творы літаратуры і мастацтва Ранняга Адраджэння.* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Сістэма адукацыі ў Заходняй Еўропе.** Пераход ад Антычнасці да Сярэднявечча суправаджаўся заняпадам культуры ў Заходняй Еўропе, што паўплывала і на стан адукацыі, якая перажывала крызіс.

Пасля нашэсця варвараў многія гарады былі разбураны або знаходзіліся ў запусценні. Такім чынам, навучальныя ўстановы ў іх не функцыянавалі. Колькасць пісьменных людзей рэзка скарацілася, адукаваныя людзі сустракаліся рэдка нават сярод вышэйшых слаёў грамадства: многія каралі не ўмелі чытаць і пісаць.

Доўгі час самымі адукаванымі заставаліся служыцелі царквы. Гэта тлумачылася тым, што яны павінны былі ўмець чытаць і перапісваць царкоўныя кнігі, якія выкарыстоўваліся ў час богаслужэнняў. Вельмі важным было веданне каляндарнай сістэмы, каб вызначаць даты царкоўных свят.

У пачатку Сярэднявечча самымі значнымі адукацыйнымі цэнтрамі былі манастырскія школы. У VIII ст. з'явіліся больш высокія па ўзроўні епіскапскія школы. Навучанне пісьму, чытанню і лічэнню ў іх праходзіла звычайна на лацінскай мове.

| Патрэба ў ведах → Узнікненне ўніверсітэтаў | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Царква | | Свецкая ўлада і гараджане | | | Універсітэты | | | | | |
| | | | | | Падрыхтоўчы факультэт | | | Факультэты | | |
| Архітэктура для будаўніцтва цэркваў | Астраномія для вылічэння дат царкоўных свят | Арыфметыка для вядзення гандлю | Права для дзейнасці судоў і складання законаў | Архітэктура для будаўніцтва замкаў і крэпасцей | Латынь для чытання Бібліі | Трывіум: граматыка, рыторыка, дыялектыка | Квадрывіум: арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка | Багаслоўскі | Юрыдычны | Медыцынскі |

Адукацыя ў Сярэднявеччы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Настаўнікі нярэдка каралі розгамі нядбайных вучняў. Такія школы рыхтавалі кадры ў асноўным для самой царквы.



Манастырская школа. Французская мініяцюра XV ст.

Аднак і свецкая ўлада з цягам часу ўсвядоміла патрэбу ў адукаваных людзях: чыноўніках, заканадаўцах, суддзях. З развіццём заходнееўрапейскай цывілізацыі і асабліва з ростам гарадоў, дзе былі патрэбны кваліфікаваныя спецыялісты, у X ст. пачалі з'яўляцца прыватныя школы. Узнікла спецыялізацыя школ па асобных прадметах. Напрыклад, школа горада Меца славілася выкладаннем музыкі, школа горада Камбрэ — матэматыкі, школа горада Салерна — медыцыны. Узровень падрыхтоўкі ў іх быў вышэйшы, чым у царкоўных школах. Царква страціла манаполію на адукацыю, пісьменнасць пачала распаўсюджвацца сярод гараджан і знаці.

**Універсітэты. «Сем вольных мастацтваў».** Вынікам развіцця адукацыі ў Сярэднія вякі стала з'яўленне ў канцы XI ст. у горадзе Балоння (Італія) першага ўніверсітэта. У хуткім часе адкрыліся Оксфардскі ўніверсітэт у Англіі, універсітэт у Парыжы і дзясяткі іншых.

Універсітэты ўяўлялі сабой аб'яднанне навучэнцаў і выкладчыкаў. Першапачаткова такія саюзы або карпарацыі былі вельмі абмежаваны ў сваіх правах адносна ўлад і жыхароў горада, у якім знаходзіўся ўніверсітэт. Аднак з часам у выніку барацьбы за свае правы яны дабіліся самакіравання.

Універсітэт быў арганізаваны наступным чынам. Студэнты адной краіны, як правіла, аб'ядноўваліся ў зямляцтвы, а выкладчыкі, у сваю чаргу, групаваліся па спецыяльнасцях у факультэты. Выкладчыкі і студэнты разам выбіралі рэктара — кіраўніка ўніверсітэта.

На пачатковай стадыі навучання адбывалася асваенне «сямі вольных мастацтваў» на падрыхтоўчым факультэце. Спачатку вывучалі *трывіум*: граматыку (набывалі ўменне чытаць і пісаць), рыторыку (вучыліся прыгожа гаварыць), дыялектыку (развівалі здольнасць лагічна разважаць). Затым студэнты навучаліся *квадрывіуму*, куды ўваходзілі арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка. Пасля авалодання гэтымі дысцыплінамі (на што сыходзіла звычайна 6 гадоў) можна было выбіраць для далейшай вучобы адзін з трох вышэйшых факультэтаў універсітэта: багаслоўскі, медыцынскі, юрыдычны.



Лекцыя ва ўніверсітэце. Барэльеф, г. Балоння, Італія. XIV ст.

Пасля першых гадоў навучання студэнт здаваў экзамены на званне бакалаўра, а яшчэ праз некалькі гадоў можна было атрымаць ступень магістра. Самыя здольныя


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

студэнты маглі атрымаць самае высокае навуковае званне — доктара. Для гэтага патрабавалася паспяхова абараніць на сходзе вучоных вылучаныя імі ідэі, сфармуляваныя ў выглядзе тэзісаў. Ганаровае званне доктара давала права займаць кіраўнічыя пасады ў самім універсітэце, а часам нават браць удзел у гарадскім самакіраванні.

Развіццё навуковых ведаў доўгі час мела кніжны, абстрактны характар. І толькі пад канец Высокага сярэднявечча стаў зараджацца прынцыпова новы метад навуковага даследавання — эксперыментальны. Ля яго вытокаў стаяў англійскі вучоны *Роберт Грасетэст* (1175–1253).

**N.B.**



Роберт Грасетэст (Роберт Вялікая Галава) — заснавальнік оксфардскай філасофскай і прыродазнаўчай школы, тэарэтык і практык эксперыментальнага прыродазнаўства. Быў канцлерам Оксфардскага ўніверсітэта, меў вучоныя званні магістра мастацтваў і магістра тэалогіі. Яго асоба доўгі час заставалася ў ценю славы яго вучня — Роджэра Бэкана. Але сам Бэкан гаварыў пра Грасетэста як пра найбольш выдатнага свайго сучасніка: «…Нямногія з наймудрэйшых дасягнулі дасканаласці ў філасофіі, як, напрыклад … Саламон, а затым для свайго часу — Арыстоцель, і пазней — Авіцэна, а ў нашы дні — Роберт, з нядаўняга часу епіскап Лінкальна…».

**Літаратура.** Сярэднявечная Еўропа была хрысціянскай, таму найбольш папулярнай кнігай у ёй з'яўлялася Біблія, таксама чыталі жыціі святых і творы царкоўных дзеячаў (патрыстыку). Манастыры былі асноўнымі цэнтрамі перапісвання твораў старажытнасці і стварэння новых арыгінальных твораў, напрыклад, гістарычных сачыненняў і хронік. Сярод такіх твораў варта прыгадаць «Гісторыю франкаў» Рыгора Турскага (VI ст.) і «Царкоўную гісторыю народа англаў» Беды Высокашаноўнага (VIII ст.).

Працягвала развівацца і вусная народная творчасць. Сяляне перадавалі з пакалення ў пакаленне традыцыйныя песні і апавяданні.

**N.B.**

У Англіі склаўся цэлы цыкл народных балад пра шляхетнага разбойніка Робіна Гуда, які разам са сваімі сябрамі стаў сапраўдным гаспадаром Шэрвудскага лесу, абараняў бедных і наводзіў жах на несправядлівых сеньёраў. Аднак пры гэтым у народзе існавала меркаванне, што аднавіць справядлівасць можа і вялікі гасудар, ідэальным вобразам якога ў англійскіх сялян стаў Рычард Ільвінае Сэрца.

Асаблівае развіццё з XII ст. атрымала гарадская літаратура. Тут панавалі кароткія ананімныя творы, звычайна жартаўлівага, грубаватага характару. Яны былі напісаны простай народнай мовай, без вытанчаных зваротаў. Напрыклад,


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

у адным творы расказваецца пра чалавека, які пасля смерці ішоў у рай, але яго спынілі апосталы. Яны адмовіліся яго прапусціць, бо ён шмат грашыў. Але чалавек нагадаў, што яны таксама грашылі, некаторыя нават адракаліся ад Хрыста. Прысаромленыя апосталы прапусцілі яго да праведнікаў.



Гібель Раланда. Вітраж у саборы, г. Шартр, Францыя. XIII ст.

Выключную папулярнасць мелі рыцарскія раманы. Эпічная паэма «Песня пра Раланда», напісаная ў Францыі ў пачатку XII ст., расказвае пра бітву Карла Вялікага з мусульманамі ў Іспаніі. Раланд паказаны як ідэал высакароднага рыцара, адданага свайму сеньёру. У германскай эпічнай паэме «Песня пра Нібелунгаў» (XIII ст.) атрымалі яркае апісанне феадальныя міжусобіцы.

Часта ў аснове такіх твораў знаходзіліся антычныя сюжэты пра Трою і Аляксандра Македонскага, але перанесеныя ў рэаліі сярэднявечнага грамадства. Сярод твораў на рыцарскую тэматыку выключнай папулярнасцю карыстаўся цыкл сачыненняў пра караля Артура і рыцараў Круглага стала.

На поўдні Францыі, у Правансе, зарадзілася лірычная паэзія. Аўтарамі такіх твораў былі паэты-трубадуры. У сваёй творчасці яны ўслаўлялі каханне да высакародных дам і доблесныя подзвігі адважных рыцараў.

У сярэдзіне XV ст. нямецкі вучоны Іаган Гутэнберг вынайшаў кнігадрукаванне, у 1445 г. ён выдаў першую кнігу. Гэтае вынаходства зрабіла значна таннейшым выпуск кніг, мецъ якія раней маглі сабе дазволіць толькі вельмі багатыя людзі. Такім чынам, літаратура стала даступнай для больш шырокага кола чытачоў.

**Архітэктура.** У сярэднявечную эпоху самымі шматлікімі відамі пабудоў былі замкі і хрысціянскія храмы. Першапачаткова адзіны архітэктурны стыль адсутнічаў. Але з пачаткам Высокага сярэднявечча ў архітэктуры заходнееўрапейскіх гарадоў замацаваўся строгі раманскі стыль.



Сабор, г. Пуацье, Францыя

Для пабудоў у гэтым стылі былі характэрныя тоўстыя сцены з даволі вузкімі невялікімі вокнамі ў выглядзе байніц. Характэрным атрыбутам раманскай архітэктуры былі элементы паўкруглай аркі. Самі збудаванні, як правіла, уяўлялі сабой масіўныя будынкі з гладкімі сценамі без пышнага дэкору і вялікімі вежамі. Храмы і манастыры, пабудаваныя ў такім стылі, цалкам маглі выконваць абарончыя функцыі. Сваім знешнім выгля-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сабор, г. Кёльн, Германія



Сабор Парыжскай Божай Маці, г. Парыж, Францыя



Вясна. Мастак *Сандра Батычэлі.* 1482 г.

дам яны павінны былі падкрэсліваць магутнасць хрысціянскай царквы.

З цягам часу развіццё архітэктурных ведаў і інжынернай справы прывяло да эвалюцыі дойлідства. У XII ст. стаў набіраць папулярнасць новы архітэктурны стыль — готыка, які яшчэ больш падкрэсліваў веліч царквы. Перавага прамых вертыкальных ліній, лёгкія калоны, каляровыя вітражы ў вокнах, стральчатыя аркі і скляпенні, а таксама высокія востраканцовыя вежы (часцей за ўсё дзве) — вось адметныя рысы гатычнага стылю. Знешняя ўяўнасць лёгкасці збудавання дасягалася за кошт ужывання новай каркаснай структуры. Сцены і вагу будынка падтрымлівалі знешнія контрфорсы. Пераразмеркаванне часткі вагі на контрфорсы дало магчымасць рабіць сцены больш тонкімі і высокімі.

Класічнымі прыкладамі гатычнай архітэктуры з'яўляюцца знакамітыя Сабор Парыжскай Божай Маці (Нотр-Дам дэ Пары) у Францыі і Кёльнскі сабор у Германіі (вышыня апошняга — 157 м, яго будаўніцтва ішло больш за трыста гадоў).

Ва ўяўленні сучаснікаў гатычны сабор быў своеасаблівай мадэллю хрысціянскага сусвету, адлюстраванай у архітэктурна-мастацкіх вобразах, і з'яўляўся сімвалам памкнення чалавека да Бога.

**Ранняе Адраджэнне і ранні гуманізм.** Культурныя дасягненні Сярэднявечча зрабілі магчымым далейшае развіццё еўрапейскага духоўнага жыцця.

У Познім сярэднявеччы на поўначы Італіі, дзе было шмат незалежных гарадоў і феадальныя сувязі ў грамадстве сталі разбурацца раней, пачаў фарміравацца прынцыпова новы тып культуры. Ён быў заснаваны на пошуку і адлюстраванні новых адносін у грамадстве замест феадальных, якія адыходзілі. Прыклад такіх адносін быў знойдзены ў полісах Старажытнай Грэцыі і Рымскай рэспублікі.

Для культурных працэсаў гэтага часу характэрнае адраджэнне цікавасці да мастацтва Антычнасці. Таму згаданая эпоха была названа Адраджэннем. Дзеячы культуры, захопленыя прыкладамі антычнага мас-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

тацтва, лічылі, што ў цэнтры творчасці павінен быць чалавек. Таму іх называюць «гуманістамі» (ад лац. *humanus* — чалавечны). Сусветна вядомымі дзеячамі культуры перыяду Ранняга Адраджэння і гуманізму былі паэты Дантэ Аліг'еры і Франчэска Петрарка, пісьменнік Джавані Бакача, жывапісец Сандра Батычэлі, скульптар Данатэла.

**N.B.**

Слова «шэдэўр» прыйшло да нас з Сярэднявечча. Так называлася рэч, якую павінен быў зрабіць і прадставіць на строгі суд чаляднік-рамеснік, каб атрымаць званне майстра. Тое, што ён рабіў, павінна было быць бездакорным. Таму пазней шэдэўрамі сталі называць самыя дасканалыя творы мастацтва.




Прычыны фарміравання і асаблівасці культуры Ранняга Адраджэння

*У Раннім сярэднявеччы пісьменнасць была пашырана амаль выключна ў асяроддзі духавенства, таму што існавала неабходнасць правядзення царкоўнай службы і вядзення календара хрысціянскіх свят. Адраджэнне адукацыі пачалося ў Высокім сярэднявеччы і суправаджалася з'яўленнем універсітэтаў. Грамадства, якое развівалася, адчувала моцную патрэбу ў адукаваных людзях (найперш у галіне юрыспрудэнцыі, медыцыны, багаслоўя). Апрача багаслоўскай літаратуры з'явілася вялікая колькасць свецкіх рукапісных кніг. Галоўным складнікам культуры Сярэднявечча была архітэктура. Масіўны раманскі стыль саступіў месца велічнай готыцы, што стала сімвалам інжынерных дасягненняў еўрапейцаў. У канцы Сярэднявечча менавіта ў мастацтве выявілася цікавасць да ўнутранага свету чалавека. Гэта азнаменавала адыход ад замкнёнасці рэлігійнай свядомасці і стала пачаткам гуманізму.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Які ўплыў хрысціянства аказала на культуру Сярэднявечча?
2. Вылучыце перыяды ў развіцці адукацыі ў сярэднявечнай Еўропе і ахарактарызуйце кожны з іх.
3. Раскажыце пра сістэму навучання ў сярэднявечных універсітэтах. З дапамогай рэсурсаў сеткі інтэрнэт знайдзіце адрозненні паміж імі і сучаснымі ўніверсітэтамі.
4. Чым адрозніваліся творы царкоўнай, рыцарскай літаратуры і фальклору? Прывядзіце прыклады такіх твораў.
5. Адлюструйце схематычна раманскі і гатычны храмы ў разрэзе. Растлумачце, чаму вы паказалі іх менавіта так.
6. Назавіце галоўнае адрозненне культуры Ранняга Адраджэння ад сярэднявечнай.
7. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі і вучэбнага матэрыялу складзіце воблака слоў, што характарызуе гатычны стыль. Выкарыстоўваючы яго, падрыхтуйце апісанне сабора Нотр-Дам.
8. Уявіце, што вы пішаце кнігу (складаеце каталог) пра заходнееўрапейскую архітэктуру (мастацтва) эпохі Сярэднявечча. Распрацуйце разгорнуты план кнігі і яе вокладку. Якую фатаграфію вы зробіце асноўнай на вокладцы? Чаму?

## § 12. Візантыя ў Сярэднявеччы



*Якія былі асаблівасці дзяржаўнага, грамадскага і культурнага развіцця Візантыі? З чым яны былі звязаны?*

*Калі і чаму адбыўся падзел Рымскай імперыі на Заходнюю і Усходнюю? Якія дзяржавы былі самымі вялікімі на палітычнай карце Еўропы ў Раннім сярэднявеччы? Якія былі прычыны расколу хрысціянства на заходнюю і ўсходнюю цэрквы? Дайце азначэнне паняццям «мазаіка», «фрэска», «абраз».* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас; § 10 гэтага вучэбнага дапаможніка)

**Візантыйская імперыя на палітычнай карце Сярэднявечча.** Сваю назву Візантыйская імперыя атрымала ад горада Віза́нтый, на месцы якога ў 330 г. імператар Канстанцін заснаваў новую сталіцу — Канстанцінопаль. Сучаснікі называлі гэтую дзяржаву Рамейскай (гэта значыць Рымскай) імперыяй, а афіцыйная назва сталіцы гучала як «Новы Рым». Падданыя візантыйскага імператара ганарова называлі сябе «рамеямі», што ў перакладзе з грэчаскай мовы азначала «рымляне». Такім чынам, Візантыя, якая ўзнікла на месцы Усходняй Рымскай імперыі, успрымалася яе імператарамі як прамы пераемнік некалі адзінай магутнай рымскай дзяржавы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| Візантыя ў Сярэднявеччы | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Моцная ўлада імператара | Не была захоплена варварамі | Шматнацыянальная дзяржава | Панаванне грэчаскай мовы | Высокі ўзровень развіцця культуры |

Аснову насельніцтва Візантыі складаў грэчаскі народ. Але на вялізнай тэрыторыі дзяржавы жылі таксама сірыйцы, армяне, грузіны, яўрэі, славяне. Імперыя на момант росквіту ўключала ў свой склад Балканскі паўвостраў, Малую Азію, Сірыю, Егіпет, частку Закаўказзя.

Адным з самых магутных імператараў Візантыі быў ***Юстыніян*** (527—565). Зрабіўшы спробу аднавіць Рымскую імперыю ў былых межах, ён арганізаваў буйны́я ваенныя паходы на захад Міжземнамор'я. Вынікам войнаў, якія вёў Юстыніян, стала заваяванне Паўночнай Афрыкі (каралеўства вандалаў), Італіі (каралеўства остготаў), паўднёвай часткі Іспаніі (каралеўства вестготаў). Аднак пераемнікі Юстыніяна не змаглі ўтрымаць гэтыя заваёвы. Частку тэрыторый на ўсходзе давялося саступіць Ірану. Пачынаючы з VII ст. пад націскам арабаў Візантыя страціла такія правінцыі, як Сірыя, Палесціна, частку Арменіі, Егіпет, усе тэрыторыі ў Паўночнай Афрыцы, астравы Крыт і Сіцылію. Некалькі разоў арабскае войска беспаспяхова аблажвала сам Канстанцінопаль.

У X—XI стст. Візантыя часова аднавіла магутнасць, вярнуўшы ў свой склад Грузію, Арменію, Балгарыю. У арабаў адваявалі Сірыю і Палесціну. Але ўжо ў 1071 г. візантыйская армія пацярпела значнае паражэнне ад туркаў-сельджукаў, якія ў хуткім часе заваявалі большую частку Малой Азіі. У 1204 г. падчас чацвёртага крыжовага паходу заходнееўрапейскія рыцары занялі Канстанцінопаль і стварылі Лацінскую імперыю. Яна праіснавала да 1261 г., калі візантыйцы вярнулі гэтыя землі і аднавілі сваю дзяржаву. Аднак пастаянныя войны аслабілі Візантыю, якая да XV ст. ужо страціла былую моц. Гэтым скарысталіся туркі-асманы, якія 29 красавіка 1453 г. захапілі Канстанцінопаль. Візантыйская імперыя перастала існаваць.



Юстыніян і епіскап Максімільян у атачэнні світы. Мазаіка ў царкве Сан-Вітале, г. Равена, Італія. VI ст.

*Разгледзьце мазаіку і вызначце асаблівасці візантыйскага дзяржаўнага ладу, адлюстраваныя ў ёй.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Візантыя ў VI ст.

*Ахарактарызуйце з апорай на картасхему знешнепалітычнае становішча Візантыі ў VI ст.*

**Сацыяльныя адносіны ў Візантыі.** На чале візантыйскага грамадства стаяў імператар, які быў абсалютным манархам-самадзержцам. Ён лічыўся «богаабраным» і павінен быў несці перад Богам адказнасць за сваіх падданых. З цягам часу замест лацінскага слова «імператар» сталі выкарыстоўваць грэчаскі тэрмін «васілеўс».

**N.B.** Магутнасць і багацце імператараў сімвалізавалася нават колерам. Золата і пурпур (асаблівае яркае адценне чырвонага) лічыліся колерамі, годнымі выключна імператарскай сям'і. Пурпурным было нават чарніла, якім імператар падпісваў дакументы. Пры аздабленні імператарскага палаца выкарыстоўваўся рэдкі камень чырвонага колеру — парфір.

Імператарская ўлада лічылася спадчыннай. Чыноўнікі, вышэйшая знаць і духавенства складалі «вярхі» візантыйскага грамадства. Васілеўс дараваў ім або землі, або штогадовыя выплаты з казны. У той жа час для Візантыі была характэрная барацьба за ўладу. Здаралася, што змоўшчыкі забівалі імператара і ўзводзілі на трон новага правіцеля.

Манарх кіраваў імперыяй з дапамогай вялікага штату чыноўнікаў. Такая велізарная бюракратычная сістэма патрабавала значных сродкаў на сваё ўтрыманне. Гэта выклікала рост падаткаабкладання. Да VII ст. сельская гаспадарка ў экано-




Візантыя ў XI–XII стст.

*Вызначце, якія тэрытарыяльныя змены адбыліся ў Візантыі да сярэдзіны XIII ст. Высветліце, з чым яны былі звязаны.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

міцы Візантыі стала грунтавацца на працы свабодных сялян-абшчыннікаў. Яны валодалі ворнай зямлёй на правах прыватнай уласнасці, а таксама маглі карыстацца абшчыннымі ўгоддзямі і млынамі. На карысць дзяржавы яны плацілі падаткі — пазямельны і падушны. Існаваў прынцып кругавой парукі пры выплаце падаткаў. Акрамя таго сяляне павінны былі несці дзяржаўныя павіннасці: будаваць абарончыя ўмацаванні, дарогі, масты. Аднак з цягам часу яны траплялі ў асабістую залежнасць ад багатых землеўладальнікаў або ад дзяржавы. Існаваў таксама слой свабодных сялян-арандатараў.

*Прачытайце ў свабоднай энцыклапедыі «Вікіпедыя» ўводзіны да артыкула «Візантыйскі імператар». Назавіце падставы, якія дазвалялі заняць імператарскі трон. Як яны змяняліся з цягам часу? Якімі былі асаблівасці жыцця імператара? Падрыхтуйце інфаграфіку пра візантыйскага імператара.*




Дзяржаўны лад Візантыі

**Візантыйскія гарады.** Пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі пад націскам варвараў назіраўся рэзкі заняпад гарадоў. Сітуацыя ў Візантыі была крыху іншай: гарадское жыццё працягвала развівацца, а гарады былі цэнтрамі рамяства і гандлю, навукі і мастацтва.

Галоўным горадам імперыі была яе сталіца — Канстанцінопаль, які ў Старажытнай Русі велічна называлі Царградам. Гэта быў адзін з самых багатых і вялікіх гарадоў таго часу. Раскошны выгляд сталіцы павінен быў падкрэсліць магутнасць дзяржавы і трываласць улады імператара.

У сталіцы імперыі знаходзіўся царскі палац — рэзідэнцыя правіцеля. Канстанцінопаль славіўся вялікімі рынкамі, навучальнымі ўстановамі, храмамі. Самім горадам кіраваў эпарх — спецыяльны чыноўнік, якога прызначаў імператар.



Візантыйская манета з выявай Юстыніяна


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Канстанцінопаль.
Сучасная рэканструкцыя



Квадрыга святога Марка,
якая ўпрыгожвала іпадром,
г. Канстанцінопаль, Візантыя. IV ст. да н. э.

Эканамічнае працвітанне Канстанцінопаля забяспечвалася за кошт выгаднага геаграфічнага становішча. Міжземнае мора давала магчымасць весці гандаль з многімі краінамі. Сам горад стаяў на самых значных гандлёвых шляхах таго часу. Сухапутны Вялікі шаўковы шлях вёў з Азіі ў Еўропу, а водны «з вараг у грэкі» злучаў Візантыю са Скандынавіяй і праходзіў праз землі ўсходніх славян. Візантыйскія купцы падтрымлівалі актыўныя гандлёвыя адносіны з заходнееўрапейскімі краінамі, Іранам, Індыяй і Кітаем. Купцы павінны былі плаціць гандлёвыя пошліны на карысць дзяржавы.

Акрамя Канстанцінопаля самымі вялікімі і значнымі гарадамі з’яўляліся Александрыя і Антыёхія. У візантыйскіх гарадах былі добра развітыя розныя рамёствы. Рамеснікі выплачвалі ў дзяржаўную казну падаткі. Сярод рамесных заняткаў, якія не былі тады распаўсюджаны на Захадзе, але квітнелі ў Візантыі, варта назваць вытворчасць папірусу, шклянога посуду, шаўковых тканін.

Гарадское жыццё Візантыі складана ўявіць без грамадскіх відовішчаў, самымі папулярнымі з якіх сталі гонкі на калясніцах. Гэтыя конныя спаборніцтвы праходзілі на спецыяльных іпадромах.

**Праваслаўная царква ў Візантыі.** Хрысціянская рэлігія справядліва лічылася адной з асноў развіцця духоўнага жыцця Візантыі. У імперыі панаваў праваслаўны (усходні) тып хрысціянства. Калі ў заходнім хрысціянстве кіраўніком царквы прызнаваўся епіскап Рыма, то праваслаўнай царквой кіравалі чатыры патрыярхі: канстанцінопальскі, александрыйскі, антыёхійскі і іерусалімскі. Гэта сведчыць пра так званую калегіяльную форму кіравання, паколькі найбольш важныя рашэнні патрыярхі прымалі разам. У той жа час фактычнае першынство ў гэтай калегіі належала патрыярху Канстанцінопаля. Але і яго паўнамоцтвы былі абмежаваны імператарскай уладай. Менавіта імператар меў права прызначаць на царкоўныя пасады і здымаць з іх. Ён мог склікаць царкоўныя саборы і зацвярджаў іх рашэнні. Такім чынам, свецкая ўлада кантралявала рэлігійнае жыццё ў імперыі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Значным для развіцця грамадства было манаства. Манахі актыўна займаліся літаратурнай дзейнасцю. Яны пісалі арыгінальныя творы і перапісвалі працы антычных аўтараў. На пачатак XI ст. у імперыі налічвалася каля 7 тыс. манастыроў.

З умацаваннем хрысціянства ў суседніх дзяржавах Візантыя старалася паўплываць на іх. Старажытная Русь, Балгарыя і Сербія прынялі хрысціянства ад Візантыі. Візантыйскія царкоўныя дзеячы браты Кірыла і Мяфодзій у IX ст. стварылі на аснове літар грэчаскага алфавіта славянскую азбуку — кірыліцу, якой мы карыстаемся і цяпер. З грэчаскай на славянскія мовы перакладалася царкоўная і свецкая літаратура. Візантыйскія архітэктары ўзвялі першыя на Русі храмы з каменю.

**Культурная спадчына Візантыі.** Галоўнай асаблівасцю культуры Візантыі было тое, што яна фарміравалася на скрыжаванні традыцый Усходу і Захаду, у яе аснову пакладзена антычная грэка-рымская спадчына. З пачаткам Сярэднявечча ў ёй не назіраўся характэрны для заходнееўрапейскіх краін заняпад. У Візантыі працягвала развівацца гарадское жыццё, а гарады з'яўляліся асноўнымі цэнтрамі культуры. Працэнт адукаваных людзей быў значна вышэйшы, чым на Захадзе. Пісьменнасць сярод простага люду была не рэдкасцю. Сістэма адукацыі ўключала як царкоўныя, дзяржаўныя, так і прыватныя школы. Пачатковая адукацыя складалася з навучання лічэнню, пісьму і чытанню. Першая вышэйшая школа ў Візантыі была створана згодна з імператарскім указам у сярэдзіне XI ст. Гэтая навучальная ўстанова складалася з філасофскага і юрыдычнага факультэтаў. На мяжы XI—XII стст. была створана другая вышэйшая навучальная ўстанова, дзе ўжо вывучалі медыцыну. Аднак, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх універсітэтаў, вышэйшыя школы Візантыі не мелі аўтаноміі, а поўнасцю залежалі ад дзяржавы.

З навуковых дысцыплін найбольш паспяхова развіваліся матэматыка, астраномія, геаграфія, хімія, медыцына, інжынерная справа. Візантыйскія вучоныя захоўвалі сакрэты вырабу шкла, лекавых сродкаў і фарбаў. У ваеннай справе візантыйцы выкарыстоўвалі «грэчаскі агонь» — гаручую сумесь, якая выкідвалася са спецыяльных гармат. Гэтым агнём падпальвалі варожыя караблі, прымянялі яго пры аблозе і абароне гарадоў. Састаў «грэчаскага агню» (як мяркуецца, сумесь нафты і смалы) захоўваўся ў найстражэйшай таямніцы.



Музыканты з арганам, аўлосам і лірай. Мазаіка з візантыйскай вілы, в. Мар'ямін, Сірыя. Канец IV ст.

Гістарычная навука атрымала ў Візантыі значнае развіццё. Адным з самых вядомых гісторыкаў быў Пракопій Кесарыйскі, які напісаў вялікую працу «Гісторыя войнаў» (VI ст.). Распаўсюджаным гістарычным жанрам


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Інтэр'ер сабора Святой Сафіі,
г. Стамбул, Турцыя. Сучасны выгляд

з'яўлялася хроніка — сістэматычны кароткі выклад падзей па гадах, пачынаючы ад стварэння свету. У гэтым жанры, напрыклад, была напісана вядомая «Хроніка», створаная Яўсевіем Кесарыйскім і «пераказаная» Іеранімам Блажэнным (IV–V стст.).

Візантыйскія географы пераўзыходзілі заходнееўрапейскіх у справе стварэння карт і планаў гарадоў. Вялікая ўвага ў Візантыі надавалася кніжнай справе. Візантыйскія вучоныя захавалі шматлікія рукапісы антычных аўтараў, дзякуючы чаму многія творы грэчаскіх і рымскіх пісьменнікаў дайшлі да нашага часу.

Асаблівае развіццё ў імперыі атрымала архітэктура. Да XI ст. сфарміраваўся найбольш распаўсюджаны тып царкоўнага будынка — крыжова-купальны. Самым праслаўленым помнікам візантыйскага дойлідства з'яўляецца знакаміты храм Святой Сафіі, пабудаваны ў 537 г. Над узвядзеннем будынка працавалі на працягу 5 гадоў 10 тыс. чалавек. Храм уяўляе сабой чатырохвугольны будынак з вялізным купалам, які абапіраецца на два паўкупалы. У цэнтры будынка знаходзіцца агромністая зала, напоўненая святлом, якое бруіцца з сарака вокнаў каля купальнай асновы. Сцены храма былі багата аздоблены мазаікай і фрэскавым жывапісам.

**З апісання храма Святой Сафіі ў творы Пракопія Кесарыйскага**

У вышыню ён падымаецца нібыта да неба, і, як карабель на высокіх хвалях мора, ён вылучаецца сярод іншых збудаванняў, быццам бы схіляючыся над астатнім горадам… Невыказным хараством славіцца ён… Можна было б сказаць, што месца гэтае не звонку асвятляецца сонцам, а што бляск нараджаецца ў ім самім: такая колькасць святла напаўняе гэты храм. Чыстым золатам выкладзена столь, злучаючы з хараством раскошу… яго ззянне перамагае бляск камянёў. З аднаго і другога боку — дзве галерэі; і ў іх столь з'яўляецца купалам, а ўпрыгажэннем — золата. Адна з гэтых галерэй прызначана для мужчын, якія моляцца, другая — для жанчын… Хто злічыў бы пышнасць калон і мармураў, якімі ўпрыгожаны храм? Можна было б падумаць, што знаходзішся на раскошным лузе, пакрытым кветкамі.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце сваё апісанне храма Святой Сафіі і правядзіце віртуальную экскурсію для аднакласнікаў.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У цэлым па ўзроўні культурнага развіцця Візантыя доўгі час апераджала краіны Заходняй Еўропы і нават уплывала на іх. Сюды з Захаду прыязджалі атрымліваць адукацыю, вывучаць рамёствы і мастацтва заходнееўрапейскія майстры. Правіцелі краін Заходняй Еўропы часта запрашалі да свайго двара знакамітых візантыйскіх мастакоў, ювеліраў, архітэктараў, вучоных.

Гісторык-медыевіст З. У. Удальцова лічыла, што захаванне ў Візантыі цэнтралізаванага кіравання і моцнай імператарскай улады аказала вялікі ўплыў на ідэалогію і культуру Візантыі.

*Падбярыце гістарычныя факты, якія даказваюць або абвяргаюць гэтую думку.*

У цэлым можна канстатаваць, што высокі ўзровень культуры з'яўляўся адметнай рысай Візантыі і быў цесна звязаны з іншымі асаблівасцямі развіцця дзяржавы.

*У Візантыі захаваліся традыцыі Рымскай імперыі. Але цяпер этнічнай асновай дзяржавы быў грэчаскі народ, а рэлігійнай — хрысціянства ў форме праваслаўя. Сталіцай Візантыі з'яўляўся Канстанцінопаль — найважнейшы цэнтр рамяства, які звязаў Еўропу з усходнімі краінамі гандлёвым мостам. Улада імператара была неабмежаванай. Структура візантыйскага грамадства не была такой саслоўна размежаванай, як у Заходняй Еўропе, аднак сяляне і тут паступова траплялі ў розныя формы залежнасці ад буйны́х землеўладальнікаў. Заняпад Візантыі прадвызначылі нашэсці мусульманскіх народаў: арабаў, туркаў-сельджукаў, потым туркаў-асманаў, якія і ўзялі Канстанцінопаль у 1453 г.*

1. Вызначце храналагічныя рамкі існавання Візантыйскай імперыі. Перадайце яе гісторыю ў 4–5 сказах.
2. У чым былі асаблівасці імператарскай улады ў Візантыі? Што збліжала візантыйскага імператара са старажытнымі ўсходнімі правіцелямі?
3. Якія сацыяльныя групы можна вылучыць у візантыйскім грамадстве? Ахарактарызуйце становішча кожнай з іх.
4. Чым адрознівалася становішча хрысціянскай царквы ў Візантыі і ў Заходняй Еўропе?
5. У чым праяўляўся ўплыў Антычнасці на гісторыю і культуру Візантыі? Як вы думаеце, чаму Візантыя (у адрозненне ад Заходняй Еўропы) змагла захаваць антычныя традыцыі?
6. Напішыце эсэ «Унёсак Візантыі ў сусветную культуру».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Тэма 2. СЛАВЯНСКІЯ НАРОДЫ Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

## § 13. Палітычнае развіццё славянскага свету ў Сярэднявеччы



*Якім чынам адбывалася станаўленне дзяржаў у славян?*

*Пералічыце групы славянскіх народаў. Калі яны з'явіліся ў Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропе? Назавіце прыкметы дзяржавы. У чым былі прычыны і значэнне Вялікага перасялення народаў у сусветнай гісторыі?* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас; гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**З'яўленне славян і пачатак славянскай дзяржаўнасці.** Вучоныя адносяць з'яўленне славян да першай паловы I тысячагоддзя і адзначаюць, што яны насялялі Цэнтральную і Усходнюю Еўропу. Больш дакладна вызначыць тэрыторыю першапачатковага пражывання славян пакуль складана. Часцей за ўсё лічыцца, што славяне пражывалі паміж рэкамі Лабай (сучасная Эльба) і Віслай, Дняпром і Днястром, на поўнач ад Карпат. Аднак пытанне аб іх прарадзіме застаецца адкрытым. Адна з апошніх тэорый сцвярджае, што найстарэйшая *археалагічная культура*, якая суадносіцца са славянамі, знойдзена ў беларускім Палессі і датуецца IV ст.

*З дапамогай сучаснай карты Еўропы пералічыце назвы дзяржаў, размешчаных на тэрыторыях, якія ў старажытнасці насялялі славянскія плямёны.*

Славяне сталі хутка рассяляцца ў Еўропе. У пачатку VI ст. яны з'явіліся на Дунаі, адкуль прайшлі на Балканы. Славяне засялілі і тэрыторыю сучасных Чэхіі і Польшчы. Некаторыя плямёны пасяліліся на Дняпры і далей на поўнач. У ходзе Вялікага перасялення народаў адбываўся працэс этнічнай дыферэнцыяцыі, у выніку якога выдзеліліся ўсходнія, паўднёвыя і заходнія славяне. Дагэтуль славяне, якія размаўляюць на блізкіх мовах, застаюцца самай шматлікай моўнай групай Еўропы. Менавіта блізкасць мовы дала магчымасць аўтару «Аповесці мінулых гадоў» вылучыць славян сярод іншых плямёнаў.

*Высветліце, што такое археалагічная культура. Параўнайце азначэнні гэтага тэрміна ў розных крыніцах, у тым ліку ў слоўніку, і на падставе гэтага складзіце сваё тлумачэнне. Пры дапамозе дадатковых крыніц інфармацыі вызначце, пра якую археалагічную культуру ў беларускім Палессі ідзе гаворка. Назавіце асноўныя прыкметы, якія дазволілі аднесці гэтую культуру да славянскіх.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**«Аповесць мінулых гадоў»**

...Селі славяне па Дунаі, дзе цяпер зямля Венгерская і Балгарская. Ад тых славян разышліся славяне па зямлі і прazваліся імёнамі сваімі ад месцаў, на якіх селі. Так адны, прыйшоўшы, селі на рацэ імем Марава і празваліся маравы, а іншыя назваліся чэхі. А вось яшчэ тыя ж славяне: белыя харваты, і сербы, і харутане. Калі волахі [паводле розных меркаванняў, волахі — румыны або кельты] напалі на славян дунайскіх, і пасяліліся сярод іх, і ўціскалі іх, то славяне гэтыя прыйшлі і селі на Вісле і празваліся ляхамі, а ад тых ляхаў пайшлі палякі, іншыя ляхі — люцічы, іншыя — мазаўшане, іншыя — памаране.

Таксама і гэтыя славяне прыйшлі і селі па Дняпры і назваліся палянамі, а іншыя — драўлянамі, таму што селі ў лясах, а яшчэ іншыя селі паміж Прыпяццю і Дзвіною і назваліся дрыгавічамі, іншыя селі па Дзвіне і назваліся палачанамі — па рэчцы, што ўпадае ў Дзвіну, па імені Палатá, ад яе і атрымалі назву палачане. Тыя ж славяне, якія селі каля возера Ільменя, празваліся сваім імем — славянамі, і пабудавалі горад, і назвалі яго Ноўгарадам. А іншыя селі па Дзясне, і па Сейму, і па Суле і назваліся севяранамі. І так разышоўся славянскі народ, а па яго імені і грамата назвалася «славянская».

*Складзіце карту рассялення славян. Адзначце на ёй плямёны, згаданыя ў дакуменце. Вызначце, якія з іх адносяцца да паўднёвых, якія — да заходніх і якія — да ўсходніх славян.*

У ходзе рассялення славянам давялося не толькі заваёўваць новыя землі, але і адбіваць напады непрыяцеля. Паступова праз войны адбывалася накапленне багаццяў асобнымі плямёнамі. Гэта прывяло да з'яўлення маёмаснай і сацыяльнай няроўнасці, вылучэння ваеннага лідара племені (князя) і яго дружыны.

**Утварэнне першых славянскіх дзяржаў.** Першапачаткова славяне жылі родамі і плямёнамі на чале з князямі. Неабходнасць абароны ад больш моцных суседзяў і імкненне пашырыць сферу свайго ўплыву прывялі да аб'яднання плямёнаў і стварэння племянных саюзаў. Яны станавіліся асновай будучых славянскіх дзяржаў. Асноўнымі цэнтрамі станаўлення дзяржаўнасці ў славян сталі Старажытная Русь (нейкі час у яе ўваходзілі Полацкае і Тураўскае княствы), Польшча, Чэхія, Балгарыя, Сербія, Харватыя.




Перадумовы стварэння дзяржаў у славян


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Рассяленне славян у VI–X стст.
Першыя славянскія дзяржавы

На працягу ўсяго Сярэднявечча славяне вялі барацьбу за тэрыторыі з суседнімі дзяржавамі. З-за гэтага межы дзяржаў, а адпаведна і арэал рассялення народаў, часта мяняліся.

Першымі славянскімі дзяржаўнымі аб'яднаннямі сталі Саюз сямі плямёнаў і дзяржава Са́ма, утвораныя ў VII ст. Гэтыя дзяржавы былі няўстойлівымі і хутка распаліся. Больш трывалым было Першае Балгарскае царства (681—1018). Імкнучыся пашырыць свой уплыў і тэрыторыі, яно вяло войны з суседнімі дзяржавамі.

У IX ст. у большасці славян ішоў працэс фарміравання дзяржаўнасці. Першым буйны́м палітычным аб'яднаннем заходніх славян стала Вялікая Маравія. Праўда, дзяржава гэта апынулася нетрывалай і ў хуткім часе была разгромлена суседзямі. На яе руінах у канцы X ст. узнікла Чэшскае княства.

У сярэдзіне IX ст. ішоў працэс стварэння польскай дзяржавы. Цэнтрам аб'яднання выступіла племя палян. Як вынік, у другой палове X — першай чвэрці XI ст. былі закладзены асновы будучага Полацкага княства.

У сярэдзіне XI ст. афармлялася дзяржаўнасць у харватаў і сербаў, якія падпарадкавалі сабе іншыя паўднёваславянскія плямёны. За ўплыў на сербскае і харвацкае княствы змагаліся Візантыя, Рым, венгерскія правіцелі, што ў выніку прывяло да ўваходжання славян у склад іншых дзяржаў.

Важную ролю ў стварэнні славянскіх дзяржаў адыгрывалі гандлёвыя шляхі. Праз тэрыторыю пражывання ўсходніх славян праходзіў шлях «з вараг у грэкі». Уздоўж яго ўзніклі гарады, якія прэтэндавалі на ролю лідара ўсходнеславянскага свету: Ноўгарад, Кіеў і Полацк. На поўначы цэнтрам палітычнага прыцягнення стаў Ноўгарад, а на поўдні — Кіеў. Паміж імі ішло саперніцтва за пашырэнне ўплыву. Наўгародцы ў 862 г. прызвалі на княжанне варажскага князя Рурыка. Ён стаў заснавальнікам роду Рурыкавічаў, які быў першай княжацкай дынастыяй. У 882 г.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

наўгародскі князь Алег захапіў Кіеў, пакарыў суседнія плямёны і паклаў пачатак іх аб’яднанню ў адзінай дзяржаве — Старажытнай Русі (Кіеўскай Русі).

**«Аповесць мінулых гадоў» пра гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі»**

И бе путь из варяг в греки и из грек до Днепру и верх Днепра волок до Ловати, и по Ловати внити в Илмерь озеро великое; из него же озера потечет Волхов и втечет в озеро великое Нево; и того озера внидет устье в море Варяжское; и по тому морю внити даже и до Рима… А Днепр втечет в Понтеское [Черное] море треми жерелы [устьями], иже море слывет Руское…

*Выкарыстоўваючы тэкст дакумента і карту, складзіце даведнік для купцоў IX ст. па гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі». Уключыце ў яго кароткую інфармацыю пра сам шлях, пра гарады, якія стаяць на шляху, магчымасці гандлю і г.д.*

Сталіцай Старажытнай Русі стаў горад Кіеў. У гэтую дзяржаву ўвайшлі ўсе ўсходнеславянскія плямёны, а таксама многія суседнія народы. Старажытная Русь некалькі стагоддзяў панавала ва Усходняй Еўропе. Кіеўскі князь Уладзімір у 988 г. прыняў хрысціянства з Канстанцінопаля. Пасля гэтага ён значна ўмацаваў і пашырыў дзяржаву. Яго сын — князь Яраслаў Мудры — зрабіў Кіеў адным з квітнеючых гарадоў на ўсходзе Еўропы. Ён парадніўся праз дынастычныя шлюбы з многімі правіцелямі Еўропы, што сведчыць пра шырокае прызнанне Старажытнай Русі.




Славяне і іх першыя дзяржавы

*Пры дапамозе гістарычнай карты ўспомніце і назавіце тэрытарыяльную прыналежнасць першых славянскіх дзяржаў.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Славянскія землі ў перыяд раздробленасці.** У XII ст. у гісторыі славян пачаўся перыяд палітычнай раздробленасці. Існуюць розныя думкі адносна яго прычын. Адны гісторыкі называюць у якасці галоўнай перадумовы раздробленасці ўвядзенне прынцыпу сеньёрату. Іншыя бачаць яе ў феадальным спосабе вытворчасці, які грунтаваўся на ўзмацненні эксплуатацыі феадальназалежных сялян, а не на даходах ад збору падаткаў і атрымання прыбытку шляхам ваенных паходаў. Таксама сярод фактараў, якія садзейнічалі пачатку раздробленасці, называюць этнічную неаднароднасць насельніцтва Старажытнай Русі і знешнепалітычныя фактары, адсутнасць цэнтралізаванай сістэмы кіравання.

*Растлумачце кожную з названых прычын раздробленасці Старажытнай Русі. Якая з іх, на ваш погляд, з'яўляецца найбольш важкай?*

У другой палове XII ст. Старажытная Русь канчаткова распалася на шэраг самастойных княстваў. Найбольш значнымі ў той час былі Кіеўскае княства (якое ў выніку разбуральнага нашэсця манголаў у 1237—1240 гг. страціла ролю цэнтра аб'яднання рускіх зямель), Уладзіміра-Суздальскае, Галіцка-Валынскае, Полацкае княствы, Наўгародская зямля і некаторыя іншыя княствы. На чале ўсіх гэтых дзяржаўных утварэнняў знаходзіліся прадстаўнікі дынастыі Рурыкавічаў.




ПОЛАЦКАЕ Старажытнарускія княствы (землі)
Напрамкі паходаў мангольскіх заваёўнікаў
Лічбамі пазначаны: 1 — Тэўтонскі ордэн; 2 — Мазавецкае княства; 3 — Каралеўства Польшча

Мангольскае заваяванне Русі

Палітычная раздробленасць Старажытнай Русі існавала ва ўмовах узмацнення знешняй пагрозы. На берагах Балтыйскага мора замацаваліся крыжаносцы з Германіі і іншых еўрапейскіх краін, якія імкнуліся хрысціць язычнікаў Літвы і іншых зямель Балтыі. На поўдні і ўсходзе мангольскія заваёўнікі знішчылі многія старыя палітычныя цэнтры, разрабавалі тэрыторыю і прызначылі цяжкую даніну. Мангольскія ханы Залатой Арды рознымі спосабамі падтрымлівалі раз'яднанасць зямель. Раздробленасць аслабляла магчымасці да супраціўлення.

Толькі ў XIV ст. стала ўзмацняцца Маскоўскае княства, правіцелі якога пачалі весці барацьбу за збіранне рускіх зямель. На захадзе ўсходнеславянскія землі ўвай-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

шлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Гэта прадвызначыла ў будучым барацьбу дзвюх дзяржаў за спадчыну і распаўсюджанне ўплыву на тэрыторыі, што ўваходзілі раней у склад Старажытнай Русі.

**Наступствы раздробленасці**

- Росквіт гарадоў ва ўдзельных землях
- Пастаянныя княжацкія ўсобіцы
- Драбленне княстваў паміж спадкаемцамі
- Аслабленне абараназдольнасці і палітычнага адзінства
- Развіццё рамяства і гандлю

*Якія з пералічаных наступстваў можна назваць станоўчымі, а якія — адмоўнымі?*

Ваенны ўплыў Залатой Арды быў аслаблены Кулікоўскай бітвай 1380 г. Маскоўскі князь Дзмітрый Данской узначаліў войска, сфарміраванае многімі рускімі княствамі, і атрымаў перамогу над мангола-татарамі. Аднак яшчэ 100 гадоў маскоўскія князі плацілі цяжкую даніну залатаардынскім ханам. Тым не менш з гэтага часу менавіта Маскоўскае княства стала прызнаным лідарам аб'яднання. Практычна ўся тэрыторыя цэнтральнай Расіі апынулася пад уладай Масквы. Нават моцная Наўгародская рэспубліка на поўначы пасля шэрагу ваенных паражэнняў вымушана была лічыцца з меркаваннем маскоўскіх князёў.

**Прычыны ўзвышэння Масквы ў XII–XV стст.**

- Арганізацыя барацьбы за ліквідацыю ардынскага ўплыву
- Падтрымка царквы
- Абароненасць ад знешніх нападаў
- Скрыжаванне гандлёвых шляхоў
- Цэнтральнае становішча сярод рускіх зямель

У пачатку XI ст. Візантыі ўдалося захапіць аслабелае Першае Балгарскае царства. На працягу больш як 150 гадоў балгары вялі барацьбу супраць Візантыі. Яе вынікам стала вызваленне і ўтварэнне Другога Балгарскага царства (1187–1396). Аднак ужо ў XIV ст. балгары не змаглі процістаяць турэцкім заваёўнікам, іх землі апынуліся ў складзе Асманскай імперыі.

У 1372 г. туркі-асманы ўварваліся на тэрыторыю Сербіі і ў хуткім часе захапілі яе. 15 чэрвеня 1389 г. на Косавым полі адбылася вырашальная бітва, у ходзе якой сербскія войскі былі разбіты. Сербія трапіла ў васальную залежнасць ад Асманскай імперыі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Помнік Карлу IV, чэшскаму каралю, імператару Свяшчэннай Рымскай імперыі

*Як вы думаеце, чаму скульптар паказаў імператара менавіта такім? Якія рысы характару Карла IV, на ваш погляд, адлюстраваныя ў гэтай скульптуры?*

Разам з тым частка славян змагла ўмацаваць свае дзяржавы. Гаворка ідзе пра Чэшскае і Польскае княствы. У пачатку XI ст. у Чэшскім княстве барацьба за велікакняжацкі тытул суправаджалася канфліктамі паміж мясцовымі князямі. Яна ўскладнялася ўмяшаннем Свяшчэннай Рымскай імперыі і Польшчы. З-за міжусобіц чэшскі князь у сярэдзіне XI ст. вымушаны быў прызнаць васальную залежнасць ад імператара. Аднак ужо ў 1158 г. ён атрымаў тытул караля. Завяршэнне перыяду раздробленасці звязваюць з кіраваннем чэшскага караля Пржэмысла І Атакара (1197—1230). Выкарыстоўваючы слабасці Свяшчэннай Рымскай імперыі, ён дабіўся прывілей для сваёй дзяржавы. Гэта дало магчымасць Чэшскаму каралеўству ўжо ў другой палове XIII ст. стаць адным з буйнейшых у Цэнтральнай Еўропе. У XIII—XIV стст.

| VII–XV стст. барацьба паўднёвых славян: | VII–XV стст. барацьба заходніх славян: | IX–XIII стст. барацьба Старажытнай Русі: | XIV–XV стст. барацьба Маскоўскага княства: |
|---|---|---|---|
| • з Візантыяй;<br>• паміж сабой за ўплыў (паміж Балгарыяй і Сербіяй);<br>• з Венгрыяй;<br>• з туркамі-асманамі | • з франкамі;<br>• з немцамі;<br>• з крыжаносцамі;<br>• паміж сабой за ўплыў;<br>• са Старажытнай Руссю;<br>• з Венгрыяй | • з Хазарскім каганатам;<br>• з печанегамі і полаўцамі;<br>• з Візантыяй;<br>• з Польскім княствам;<br>• з манголамі | • з манголамі;<br>• з крыжаносцамі;<br>• з ВКЛ |

Ваенныя канфлікты славян у Сярэднявеччы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чэшскае каралеўства перажывала росквіт. Ён быў звязаны з дзейнасцю чэшскага караля і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Карла IV Люксембурга (1346–1378), які зрабіў Прагу цэнтрам велізарнай дзяржавы.

Пасля перыяду раздробленасці польскіх зямель, які пачаўся ў сярэдзіне XII ст., ужо ў сярэдзіне XIV ст. стаў адбывацца працэс іх аб’яднання. Пасля абмежавання мясцовай дынастыі Пястаў польская знаць пайшла на збліжэнне з Вялікім Княствам Літоўскім і падпісанне Крэўскай уніі. У выніку дынастычнага шлюбу з польскай каралевай Ядвігай вялікі кароль літоўскі Ягайла стаў каралём Польшчы. Ядвіга памерла, не нарадзіўшы нашчадка, затое шлюб Ягайлы з князёўнай Соф’яй Гальшанскай прывёў да з’яўлення еўрапейскай дынастыі Ягелонаў. Амаль на 200 гадоў гэтая дынастыя замацавалася на польскім троне. Некаторы час Ягелоны былі чэшскімі і венгерскімі каралямі.

*Пытанне аб прарадзіме славян застаецца дыскусійным. Іх падзел на моўныя групы і плямёны адбываўся ў працэсе рассялення на велізарнай тэрыторыі ад Балтыкі да Міжземнамор’я. Асноўнымі цэнтрамі станаўлення славянскай дзяржаўнасці сталі Старажытная Русь, Польшча, Чэхія, Балгарыя, Сербія, Харватыя. На працягу ўсяго Сярэднявечча славянскім краінам даводзілася весці цяжкую барацьбу за тэрыторыі з суседнімі дзяржавамі, таму межы дзяржаў, а значыць і рассялення народаў, часта мяняліся.*

*На працэс стварэння адзінай дзяржавы ў розных груп славян аказалі ўздзеянне розныя фактары. Сярод князёў вылучаліся правіцелі, якія мелі ўплыў унутры зямель і за іх межамі. Яны прэтэндавалі на ролю аб’яднальнікаў. Важную ролю адыгрывалі прыналежнасць да адной рэлігіі, моўная блізкасць насельніцтва, агульнасць традыцый. Да яднання падштурхоўвала і знешняя пагроза: на поўначы Еўропы яе ўяўлялі крыжаносцы, а на поўдні — туркі.*

1. Апішыце працэс рассялення славян у сярэдзіне I тысячагоддзя. Дзе, на думку вучоных, магла знаходзіцца прарадзіма славян?
2. Паводле якога крытэрыю аўтар «Аповесці мінулых гадоў» вылучыў славян у асобную групу? Пра пачатак якога працэсу гэта сведчыць?
3. Назавіце перадумовы стварэння дзяржаў у славян. Ахарактарызуйце іх.
4. Якія падзеі суправаджалі ўтварэнне першых славянскіх дзяржаў?
5. Вызначце агульныя рысы і асаблівасці ўтварэння дзяржаў у заходніх, паўднёвых і ўсходніх славян.
6. Якія падабенствы і адрозненні перыяду раздробленасці назіраліся ў паўднёвых, заходніх і ўсходніх славян?
7. Па якіх прычынах Маскоўскае княства стала цэнтрам аб’яднання ўсходнеславянскіх зямель у XV ст.?
8. Якія змены на палітычнай карце славянскага свету адбыліся ў XI–XV стст.? Ахарактарызуйце іх.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 14. Эканоміка і грамадства славян у перыяд Сярэднявечча



*Якія заканамернасці і асаблівасці выявіліся ў грамадскім і эканамічным развіцці славянскіх народаў у Сярэднявеччы?*

*Што такое феадалізм? Якія яго асноўныя прыкметы?* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Асноўныя гаспадарчыя заняткі.** Вялікая тэрыторыя рассялення славян, розныя прыродныя ўмовы абумовілі спецыфіку іх гаспадарчай дзейнасці. У старажытнасці славянскія плямёны пераважна мясціліся ў лясных рэгіёнах, таму асновай гаспадаркі доўгі час былі падсечна-агнявое земляробства, жывёлагадоўля, паляванне і збіральніцтва. Да канца Сярэднявечча асноўнымі заняткамі ўсіх славян былі земляробства, садоўніцтва, паляванне, рыбалоўства, бортніцтва. Ужо ў VII—VIII стст. у славян пачала развівацца рамесная вытворчасць.

Славяне вырошчвалі проса, пшаніцу, ячмень, жыта. На поўдні культывавалі таксама грэчку. Рэпа, капуста, цыбуля і часнок, бабовыя, у тым ліку гарох, былі асноўнымі культурамі ў раслінаводстве. Улюбёнымі пладовымі дрэвамі былі яблыні і вішні. Адзенне выраблялі з лёну, таму яго вырошчвалі заўсёды шмат. Славяне часта займаліся пчалярствам, бо мёд быў адной з найважнейшых крыніц цукру. Актыўна разводзілі свойскую жывёлу: кароў, коз, коней, свіней. Таму на зіму трэба было нарыхтоўваць шмат корму для жывёлы.

Першапачаткова земляробчыя прылады працы былі вельмі прымітыўнымі. Лес высякалі і выпальвалі, а глебу ўзворвалі самай простай сахой з некалькімі заточанымі зубамі-галінамі. У якасці цяглавай жывёлы выкарыстоўвалі быкоў, радзей — коней. Са з'яўленнем металічнага плуга ўраджаі пачалі хутка расці, у выніку павялічвалася колькасць насельніцтва. З'яўленне ў Познім Сярэднявеччы такой сістэмы севазвароту, як трохполле, і многіх іншых агранамічных прыёмаў яшчэ больш садзейнічала прагрэсу земляробства.

Вялікі ўплыў на развіццё эканомікі славян аказвалі не толькі прыродныя ўмовы, але і асаблівасці ўнутрыпалітычнага развіцця. У XI—XIV стст. ішоў актыўны працэс засялення новых зямель. Унутраная каланізацыя ў Чэхіі была звязана з зацікаўленасцю правіцеляў і дваранства ў павышэнні грашовых даходаў ад сялянскіх зямель, развіцці трохполля, распрацоўцы руднікоў. Для ўзворвання новых зямель і асваення радовішчаў карысных выкапняў часта запрашаліся спецыялісты з нямецкіх зямель. Гэта прыводзіла да ўзнікнення новых галін гаспадаркі і сістэм гаспадарання. У XIII—XIV стст. назіраўся эканамічны ўздым на чэшскіх землях, дзе актыўна развівалася здабыча жалезнай руды і серабра.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У Старажытнай Русі традыцыйна пераважала абшчыннае землеўладанне. З канца XI ст. узрастала роля буйной індывідуальнай зямельнай уласнасці — вотчыны. Аднак палітычная раздробленасць не садзейнічала развіццю ўнутранага рынку і з'яўленню новых галін гаспадаркі. Больш за тое, у выніку мангольскага нашэсця адбылося разарэнне і эканамічнае аслабленне зямель. Ратуючыся ад мангольскага прыгнёту, усходнія славяне сыходзілі на землі Паўночна-Усходняй Русі. Прыток туды людзей прывёў да неабходнасці пашырэння плошчы ворнай зямлі, сталі ўзнікаць новыя гарады. Усё гэта спрыяла эканамічнаму росту рэгіёна. Асноўным цэнтрам у ім стаў спачатку горад Уладзімір, затым пачала ўзвышацца Масква.

**Узнікненне гарадоў і іх развіццё.** Рассяляючыся па тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, славяне пачалі будаваць умацаваныя паселішчы. Многія з іх паступова сталі гарадамі, населенымі рамеснікамі і гандлярамі. У гарадах жылі князі з дружынай, размяшчаліся іх адміністрацыі. Таксама ў працэсе рассялення частка славян апынулася ў тых раёнах, дзе раней ужо існавалі дзяржавы і гарады.

Першыя гарадскія паселішчы ўзнікалі як ваенныя і адміністрацыйныя цэнтры. На тэрыторыях, дзе праходзілі гандлёвыя шляхі і быў выхад да мора, гарады з'яўляліся раней і развіваліся хутчэй. Пачынаючы з VII ст. стала развівацца рамесная вытворчасць. Аднак толькі да XIII ст. ва ўсіх славянскіх землях гарады сталі цэнтрамі рамяства і гандлю. Гарады належалі як каралям і князям, так і феадалам.

Для будаўніцтва гарадоў выбіралася месца, якое было зручным, з аднаго боку, для абароны, з другога — для развіцця гандлю. Пры выбары ўлічваліся прыродныя аб'екты, здольныя ўзмацніць абарону. Часта будавалі на стромкіх узгорках каля водных патокаў, на мысах у месцах зліцця рэк, на мысах ці астравах на беразе мора, на цяжкадаступных узвышшах.

*Як бы вы растлумачылі выбар месца для будаўніцтва Мінска?*

Першапачаткова ўсе гарадскія пабудовы славяне ўзводзілі з дрэва. Для ўмацавання насыпалі земляны вал, які ўмацоўвалі ўкапанымі дубовымі стваламі або каменнем. На вале ставілі драўляныя ўмацаванні. У горад вялі ўсяго некалькі брам, каб ускладніць атаку ворага ў выпадку нападу. У самым цэнтры горада размяшчалася яшчэ адно ўмацаванне, якое служыла адначасова рэзідэнцыяй князя з дружынай. Гарадское насельніцтва жыло ў драўляных дамах, на вуліцах клалі драўляны насціл, каб не было бруду.

N.B.

Археолагі раскапалі паселішчы і гарады славян, дзе дзякуючы клімату добра захаваліся падмуркі многіх дамоў, на падставе чаго можна рэканструяваць планіроўку. Самымі знакамітымі сталі раскопкі Ноўгарада, дзе захаваліся асновы дамоў і многія пласты гарадской брукаванкі. Акрамя таго, у Ноўгарадзе


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

знайшлі шматлікія берасцяныя граматы, якія ўяўлялі сабой пісьмы, што захаваліся. Як выявілася, гарадское насельніцтва ў XI–XII стст. было пісьменным. Берасцяныя граматы знойдзены і ў беларускіх гарадах Віцебску і Мсціславе. Старажытны горад Берасце таксама раскапаны, яго пабудовы законсерваваны ў спецыяльна створаным музеі дзякуючы намаганням беларускага археолага Пятра Лысенкі.



Залатыя вароты, г. Кіеў, Украіна. Сучасны выгляд

*Даведайцеся, пра каго з польскіх каралёў гаварылі, што ён «атрымаў Польшчу драўлянай, а пакінуў мураванай».*

Развіццю гарадоў садзейнічаў гандаль. Так, на шляху «з варагаў у грэкі» ва ўсходніх славян з'явіліся першыя гарады: Кіеў, Ноўгарад, Полацк. Яны хутка багацелі і развіваліся. Кіеў, які распасцерся на крутых узгорках над Дняпром, стаў сталіцай магутнай раннефеадальнай дзяржавы Кіеўская Русь. Сюды з'язджаліся гандляры з далёкіх краін. Горад захапляў сучаснікаў і гасцей шматлюднасцю і колькасцю мураваных цэркваў. Першымі мураванымі будынкамі былі цэрквы, а ў хуткім часе з каменю або цэглы пачалі будаваць і ўмацаванні. Сваёй магутнасцю ўражвалі Залатыя вароты Кіева.

Сталіцай сярэднявечнай польскай дзяржавы стаў горад Кракаў, які размясціўся на каменным узгорку над ракой Вісла. Тут быў пабудаваны ўмацаваны каралеўскі замак — Вавель. Асаблівую ролю ў гісторыі чэшскага народа адыграла Прага над ракой Влтавай, якая заўсёды была яго сталіцай. Гэтыя гарады таксама квітнелі за кошт гандлю.

Будаўніцтва гарадоў і ўмацаванняў актывізавалася ў перыяд палітычнай раздробленасці і нарастання знешняй пагрозы. Гэта было звязана з жаданнем правіцеляў як абараніць свае ўладанні, так і атрымаць максімальную эканамічную выгаду. Адначасова з развіццём гарадоў ішло развіццё рамёстваў, ускладнялася сацыяльная структура гарадскога насельніцтва. Паступова ўзрастала значэнне ў жыцці горада мясцовай знаці, пад уплывам якой знаходзіліся гандляры і рамеснікі. Аднак захоп і разбурэнне знешнімі ворагамі гарадоў, неабходнасць выплаты даніны прыводзілі да заняпаду рамеснай вытворчасці і ўзмацнення эксплуатацыі.

У заходніх і часткі ўсходніх славян некаторыя гарады развіваліся на аснове магдэбургскага права, што распаўсюдзілася з зямель Германіі, і мелі шырокае самакіраванне. Першапачаткова яно ўводзілася там, дзе ўзнікалі новыя гарады, заснаваныя нямецкімі каланістамі. З цягам часу зацікаўленыя ў росце даходаў каралі сталі ўво-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дзіць магдэбургскае права і ў іншых гарадах. Сістэма самакіравання згодна з магдэбургскім правам садзейнічала развіццю рамяства і гандлю, умацаванню гарадоў і пашырэнню правоў гарадскога насельніцтва.

**Асаблівасці сацыяльнага развіцця і феадальных адносін.** Першапачаткова славяне жылі родамі, плямёнамі і саюзамі плямёнаў, дзе ўлада належала народнаму сходу. Назапашванне багацця паступова вяло да расслаення грамадства і сацыяльнай няроўнасці. Галоўная роля стала належаць князю з дружынай. З цягам часу вылучыліся вярхі з княжацкіх дружыннікаў, якія атрымалі вялікія зямельныя ўладанні. Высокія пазіцыі ў грамадстве займала служылая і мясцовая знаць, якая пайшла на службу да князя і змагла захаваць за сабой землі і прывілеі. Астатняе насельніцтва ўмоўна можна падзяліць на свабодных і залежных людзей. Рамеснікі і гандляры сяліліся ў гарадскіх паселішчах, якія кантраляваў князь. Сяляне жылі вялікімі абшчынамі.

*Успомніце, як называлася ў Старажытнай Русі служылая і мясцовая знаць, якая пайшла на службу да князя і змагла захаваць за сабой землі і прывілеі.*

У Старажытнай Русі вялікі князь лічыўся вярхоўным уласнікам усіх зямель, насельніцтва якіх плаціла яму даніну. На працягу IX—XI стст. такая форма зямельнай




Сацыяльная структура сярэднявечнага славянскага грамадства


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

уласнасці — княжацкая (дзяржаўная) — з’яўлялася паноўнай. Князь мог раздаваць гарады і розныя тэрыторыі сваім дружыннікам для збору даніны. Інакш кажучы, у Старажытнай Русі васальныя адносіны існавалі не ў выглядзе зямельнага падаравання, а ў выглядзе права на збор даніны. Яе памер у сярэдзіне X ст. быў рэгламентаваны княгіняй Вольгай. Буйна́я індывідуальная зямельная ўласнасць (вотчына) у Старажытнай Русі ўзнікла толькі з канца XI ст. Шляхі яе набыцця былі рознымі, але асноўны — княжацкае падараванне.

*Як вы думаеце, з якой мэтай княгіня Вольга рэгламентавала памер даніны?*

Як і ў краінах Заходняй Еўропы, у славянскіх дзяржавах вярхі грамадства, якія захапілі зямлю, сталі пераводзіць сялян у розныя формы пазямельнай і асабістай залежнасці. Гэта знайшло адлюстраванне ў законах, напрыклад, у прынятай у XI ст. у Старажытнай Русі «Рускай Праўдзе» або прынятым у Сербскім царстве ў 1349 г. «Законніку» Стафана Душана. У дакументах замацоўвалася існаванне розных катэгорый насельніцтва з рознымі правамі. Гэта сведчыла пра моцнае сацыяльнае расслаенне.

Важную ролю ў развіцці грамадства адыгрывала царква, якая з цягам часу станавілася буйны́м землеўладальнікам. Прадстаўнікі духавенства непасрэдна або ўскосна бралі ўдзел у палітычным жыцці славянскіх дзяржаў.

У гісторыі славян фарміраванне феадальных адносін мела свае рэгіянальныя асаблівасці. У Кіеўскай Русі гэты працэс праходзіў ва ўмовах палітычнай раздробленасці. Так, пасля з’езда ў Любечы (1097 г.) у Старажытнай Русі некаторы час захоўвалася дзяржаўнае адзінства. Аднак ужо да сярэдзіны XII ст. Кіеўская Русь канчаткова распалася на шэраг самастойных княстваў. У кожным з іх захоўвалася сацыяльная іерархія, што існавала раней: князь — баяры — народ. Разам з тым узнікненне ўдзельных княстваў вяло да фарміравання ў іх сваёй сістэмы кіравання.

У гарадах таксама склалася свая сацыяльная структура. У старажытнарускіх княствах гарадское насельніцтва — рамеснікі і гандляры — было асабіста свабодным і карысталася рознымі правамі пры арганізацыі эканамічнага жыцця. У заходнеславянскіх дзяржавах і ў Вялікім Княстве Літоўскім у адпаведнасці з магдэбургскім правам гарадамі кіраваў гарадскі савет, які ўзначальваў бургамістр. Савет прадстаўляў інтарэсы горада, дбаў пра бяспеку, вызначаў памер падаткаў і выплат, чыніў суд. У яго ўключаліся найбольш заможныя гараджане. Да кіравання рэдка дапускалі сярэдні слой мяшчан (звычайных рамеснікаў, гаспадароў гандлёвых крам, дробных купцоў). Яшчэ больш бяспраўным быў плебс — беднякі і жабракі.

*Успомніце, чаму каралі выдавалі прывілеі.*

У XIII–XIV стст. у заходнеславянскіх грамадствах ішло фарміраванне феадальных саслоўяў: духавенства, шляхты (магнацка-рыцарскага саслоўя, якое


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ў розных народаў называлася па-рознаму), гараджан і сялян. Шляхта дзякуючы прывілеям атрымлівала дадатковыя палітычныя, юрыдычныя, фінансава-эканамічныя правы, гэта значыць была прывілеяваным саслоўем.

*На працягу доўгага часу асновай гаспадаркі славян было падсечна-агнявое земляробства, важную ролю адыгрывалі паляванне і жывёлагадоўля. Першыя гарадскія паселішчы ўзнікалі як ваенныя, адміністрацыйныя, гандлёвыя цэнтры і толькі паступова станавіліся месцамі канцэнтрацыі рамеснай вытворчасці. У грамадстве вылучыліся ваенныя вярхі з княжацкіх дружыннікаў, якія атрымалі вялікія зямельныя ўладанні. Мясцовая знаць пры падпарадкаванні князям захоўвала землі і прывілеі. Сяляне жылі вялікімі абшчынамі. Як і ў краінах Заходняй Еўропы, вярхі грамадства, якія захапілі зямлю, сталі пераводзіць сялян у розныя формы пазямельнай і асабістай залежнасці.*

§ 14–1

1. Назавіце фактары, якія абумовілі спецыфіку гаспадарчай дзейнасці славянскіх народаў у перыяд Сярэднявечча.
2. Вызначце асаблівасці развіцця гарадоў у краінах славянскага свету.
3. Растлумачце прычынна-выніковыя сувязі: назапашванне багацця — расслаенне грамадства — сацыяльная няроўнасць — галоўная роля князя з дружынай.
4. Ахарактарызуйце эканамічнае і сацыяльнае развіццё паўднёвых, заходніх і ўсходніх славян.
5. Якім чынам былі ўзаемазвязаны змены ў грамадскім жыцці славян?
6. Параўнайце сістэму кіравання ўсходнеславянскімі дзяржавамі з сістэмай кіравання старажытнагрэчаскімі полісамі. Вынікі прадстаўце ў выглядзе табліцы.

# § 15. Культура ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян



§ 15–1

§ 15–2

§ 15–3

*Якім чынам хрысціянства дало магчымасць славянам далучыцца да дасягненняў сусветнай культуры і стварыць уласную культурную традыцыю?*

*Назавіце прычыны прыняцця хрысціянства народамі Еўропы. З якіх цэнтраў славяне прымалі хрысціянства?* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, Гісторыя Беларусі, 6 клас)

**Язычніцтва славян.** Першыя пісьмовыя сведчанні характарызуюць славян як язычнікаў. Яны пакланяліся сілам прыроды і шанавалі розных духаў і багоў. Часцей за ўсё славяне маліліся ў прыродным асяроддзі — у гаях, каля крыніц, на ўзгорках. Спецыяльных храмаў першапачаткова не было або яны былі вельмі простымі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Згодна з уяўленнямі старажытных славян, увесь свет быў населены рознымі духамі. Побач з чалавекам «жылі» добразычлівыя духі: у доме — дамавік, у полі — палявік, у лазні — лазнік і г. д. Але калі славянін аддаляўся ад дому, духі станавіліся ў яго ўяўленні ўсё больш непрыязнымі: у лесе падпільноўвалі лесуны і мара́, у вадзе і каля яе — вадзянікі і небяспечныя русалкі, а ўначы маглі нападаць начніцы. Славянін павінен быў ведаць, як правільна абараняцца ад злосных духаў, і насіў розныя абярэгі. Адзенне і дамы ўпрыгожвалі ахоўнымі выявамі, напрыклад, у выглядзе сонца.

Славянская рэлігія фарміравалася на працягу доўгага перыяду ў працэсе вылучэння старажытных славян з індаеўрапейскай супольнасці ў II—I тысячагоддзях да н. э. і ва ўзаемадзеянні з міфалогіяй і рэлігіяй суседніх народаў. Славянскія язычніцкія ўяўленні маюць агульныя рысы з міфалогіяй іранамоўных качэўнікаў стэпаў сучаснай Украіны — скіфаў, з міфалогіяй і рэлігіяй ваяўнічых германцаў і кельтаў.

Мы мала ведаем пра багоў і вераванні славян у найстаражытнейшы перыяд. Гэта тлумачыцца многімі фактарамі, і перш за ўсё — адсутнасцю ў той час у славян уласнага пісьменства. Адным з першых апісанняў іх рэлігіі з’яўляецца сведчанне візантыйскага гісторыка Пракопія Кесарыйскага, што адносіцца да VI ст.

**Пракопій Кесарыйскі. Вайна з готамі**

Гэтыя плямёны, славяне і анты, не кіруюцца адным чалавекам, але спрадвеку жывуць у народапраўстве [дэмакратыі], і таму ў іх шчасце і няшчасце ў жыцці лічыцца агульнай справай. І ва ўсім астатнім у абодвух гэтых варварскіх плямёнаў усё жыццё і законы аднолькавыя. Яны лічаць, што адзін толькі бог, стваральнік маланак, з’яўляецца ўладаром над усімі, і яму прыносяць у ахвяру быкоў і здзяйсняюць іншыя свяшчэнныя абрады. Лёсу яны не ведаюць і наогул не прызнаюць, што ён у адносінах да людзей мае якую-небудзь сілу, і калі ім вось-вось пагражае смерць, ці ахопленым хваробай, ці на вайне, як трапяць у небяспечнае становішча, то яны даюць абяцанне, калі ўратуюцца, адразу ж прынясуць богу ахвяру за сваю душу; пазбегнуўшы смерці, яны прыносяць у ахвяру тое, што абяцалі, і думаюць, што ратаванне імі куплена цаной гэтай ахвяры. Яны шануюць рэкі, німфаў і ўсякіх іншых багоў, прыносяць ахвяры ўсім ім, і пры дапамозе гэтых ахвяр праводзяць і варажбу.

*Якое сцвярджэнне з тэксту параграфа можна праілюстраваць радкамі з гэтага дакумента?*

Праз некалькі стагоддзяў аўтар «Аповесці мінулых гадоў» падрабязна апісаў рэлігійную рэформу, ажыццёўленую князем Уладзімірам у 980 г., падчас якой


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*У якіх славянскіх народаў Пярун быў апекуном князя і дружыны? Як вы думаеце, чаму?*

князь спрабаваў стварыць адзіны для ўсёй Русі пантэон язычніцкіх багоў. Галоўным богам быў прызнаны Пярун. Гэты бог добра вядомы ва ўсіх славян як грозны, але справядлівы бог грому і маланак. Беларуская мова, у якой слова *«пярун»* азначае *«гром»*, паказвае, што імя бога паходзіць ад назвы самой прыроднай з'явы. Пракопій Кесарыйскі, мяркуючы па ўсім, менавіта Перуна называў «стваральнікам маланак, уладаром над усімі». Пры стварэнні дзяржаў вобраз бога Перуна набыў яшчэ і сацыяльнае значэнне, пачаўшы лічыцца апекуном князя і дружыны. Гэта знайшло адлюстраванне ў тым, што менавіта драўляная статуя Перуна была пастаўлена на ўзгорку побач з церамам-палацам князя Уладзіміра. Побач з ракой Днепр у гандлёва-рамесным пасадзе стаяла статуя яшчэ аднаго папулярнага ва ўсіх славян бога — Вялеса, бога жывёлы і ўрадлівасці. Месцы пакланенняў называлі капішчамі, першапачаткова яны ўзнікалі каля крыніц, у лесе, а пазней з'явіліся і ў славянскіх гарадах.

Буйны́м рэлігійным язычніцкім цэнтрам у славян быў храм бога Святавіта на в. Руян (сучасны в. Руген у Германіі). Гэты бог шанаваўся ўсімі плямёнамі славян па рацэ Лабе (Эльбе). Яму рабілі багатыя прынашэнні. Абараняючы Святавіта і сваю зямлю, палабскія славяне доўга змагаліся са Свяшчэннай Рымскай імперыяй і спрабавалі супрацьстаяць нямецкаму ўварванню, аднак пацярпелі паражэнне, у выніку яго храм быў знішчаны, а насельніцтва прыняло хрысціянства.

З прыходам хрысціянства язычніцкія вераванні славян захаваліся ў культурных і каляндарных святах, у традыцыях. У гонар летняга сонцастаяння славяне працягваюць адзначаць Купальскую ноч, якая дагэтуль лічыцца самай шчаслівай і цудоўнай часінай году. У перыяд зімовага сонцастаяння ўсе славянскія народы святкуюць Каляды, калі вясёлымі абрадамі імкнуцца адагнаць варожыя сілы і зноў «павярнуць сонца на лета». Вельмі шмат язычніцкіх уяўленняў захавалася ў фальклорных творах: казках, былінах, легендах і паданнях.

**Прынящце і распаўсюджанне хрысціянства.** Першыя звесткі аб прынящці славянамі хрысціянства адносяцца да другой паловы VII ст. Гаворка ідзе пра з'яўленне на тэрыторыі рассялення паўднёвых славян хрысціянскіх місіянераў. Аднак гаварыць пра пераход славян у новую рэлігію ў поўнай меры можна толькі з IX–X стст. Яны прымалі хрысціянства з Візантыі і Рыма.

Вырашальную ролю ў распаўсюджанні хрысціянства сярод славян адыграла місія двух візантыйскіх манахаў з г. Салунь (сучасныя Салонікі) — Кірылы і Мяфодзія, якія называюць «апосталамі славян». Каля Салуні пражывала


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

як грэчаскае, так і шматлікае славянскае насельніцтва, таму браты ведалі славянскія дыялекты.

**N.B.**

У 862 г. да візантыйскага імператара Міхаіла III прыбыло пасольства з узніклай у Цэнтральнай Еўропе буйной славянскай дзяржавы Вялікая Маравія ад князя Расціслава. Паслы перадалі просьбу князя прысланць у Маравію місіянераў, якія маглі б весці пропаведзь і богаслужэнне на роднай для мараван славянскай мове замест латыні — мовы каталіцкага богаслужэння. Князь Расціслаў лічыў, што гэта зробіць яго падданых незалежнымі ад германскага ўплыву праз царкву.

Імператар Міхаіл і канстанцінопальскі патрыярх Фоцій з радасцю прынялі просьбу Расціслава і накіравалі ў Маравію ў якасці місіянераў вучоных манахаў, братоў Кірылу і Мяфодзія. Выбар быў не выпадковы: Кірыла праславіўся ўжо як выдатны рэлігійны прамоўца і дыпламат, місіянер.

Каб пераканаць папу ў неабходнасці выкарыстоўваць славянскую мову для пропаведзі і богаслужэнняў, браты адправіліся ў Рым. Намер братоў чытаць пропаведзі на славянскай мове выклікаў здзіўленне рымскага папы. Аднак ён падтрымаў іх. Створанае Кірылам і Мяфодзіем славянскае пісьмо дапамагло перакласці шматлікія багаслоўскія кнігі на мову, зразумелую славянскаму насельніцтву. Гэта адкрыла магчымасць для з'яўлення славянскага духавенства і шлях для шырокага прыняцця хрысціянства славянамі.

У прыняцці хрысціянства ў першую чаргу былі зацікаўлены кіроўныя вярхі. Бо новая рэлігія дазваляла ўмацаваць уладу князя, падпарадкаваць сабе грамадства ва ўмовах фарміравання феадальных адносін. Вялікае значэнне пераход у новую веру меў і з пункту гледжання міжнароднага статусу дзяржавы. З прыняццем хрысціянства правіцель ураўноўваўся ў правах з правіцелямі іншых хрысціянскіх краін, яго статус рабіўся роўным статусу еўрапейскіх манархаў. Доўгі час насельніцтва захоўвала веру ў язычніцкіх багоў і адмаўлялася ад хрысціянства. Аднак з цягам часу хрысціянства ўмацавалася як асноўная рэлігія славянскіх народаў.



Абраз з выявай святых Кірылы і Мяфодзія

У 831 г. хрысціліся правіцелі і народ Вялікай Маравіі, з гэтага часу хрысціянства замацавалася на землях Чэхіі. У 864 г. хрысціянства было прынята ў Першым Балгарскім царстве. У 966 г. польскі князь Мешка быў хрышчаны, што паклала пачатак хрысціянізацыі польскіх зямель. Кіеўскі князь Уладзімір у 988 г. прыняў хрысціянства з Канстанцінопаля. Пасля гэтага хрысціянства зацвердзілася ў Полацку і Тураве.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Важную ролю ў распаўсюджанні новай рэлігіі адыграла заснаванне епіскапстваў і архіепіскапстваў на славянскіх землях. Гэта значным чынам уздымала прэстыж самой дзяржавы і дазваляла мясцовым князям праводзіць больш незалежную палітыку. Асабліва гэта было заўважна, калі на чале епіскапстваў стаялі мясцовыя свяшчэннаслужыцелі. Ужо ў 870 г. царква Балгарыі стала самастойнай, хоць пасля падзення Першага Балгарскага царства страціла свой статус. Каля 1000 г. уласнае архіепіскапства ўзнікла ў Польшчы. У пачатку XIII ст. Сербія атрымала царкоўную аўтакефалію. А ўжо ў 1346 г. цар Стафан Душан абвясціў сербскую патрыярхію. Гэта значыць, сербскі патрыярх стаў роўны патрыярхам Візантыі. Гэта азначала з'яўленне новай праваслаўнай царквы.

Царква Кіеўскай Русі доўгі час кіравалася з Канстанцінопаля, адкуль у асноўным і прысылалі мітрапалітаў. Але пасля мангольскага нашэсця ўплыў Кіева рэзка аслабеў, ён перастаў быць бяспечным. Тады мітрапаліты пераехалі ва Уладзімір, а затым у Маскву. З 1448 г. царква Маскоўскай дзяржавы стала самастойнай.

**Вынікі прыняцця хрысціянства славянамі**

- Распаўсюджанне пісьменства
  - Садзейнічала ўзмацненню палітычнай і культурнай незалежнасці самастойных славянскіх дзяржаў
  - Пісьменства на нацыянальнай мове ў хуткім часе стала выкарыстоўвацца ў справаводстве
- Адкрыццё славянскім народам шляху да асваення культурнай спадчыны хрысціянскага свету
  - Развіццё літаратуры
  - Развіццё архітэктуры
  - Далучэнне да заходнееўрапейскай і візантыйскай культуры
  - Новыя духоўныя каштоўнасці

*Якія змены адбыліся пасля прыняцця хрысціянства ў славянскіх дзяржавах? Ці ёсць адрозненні ў ходзе працэсу хрысціянізацыі ў славянскім свеце ў параўнанні з Рымскай імперыяй?*

На славянскіх землях пастаянна разгортвалася барацьба за рэлігійны ўплыў паміж Рымам і Канстанцінопалем. Раскол царквы на каталіцкую і праваслаўную, які адбыўся ў сярэдзіне XI ст., прывёў да таго, што ў Польшчы, Чэхіі, Харватыі замацавалася каталіцкае веравучэнне, а ў Балгарыі, Сербіі, Старажытнай Русі — праваслаўнае.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**З'яўленне славянскага пісьменства.** З'яўленне пісьменства ў любога народа сведчыць пра высокі ўзровень развіцця сацыяльнага жыцця, пераход да цывілізаванага існавання. Без наяўнасці пісьменства немагчымае і станаўленне развітой дзяржаўнасці. Пісьменства з'яўляецца адным з самых важных, фундаментальных адкрыццяў на доўгім шляху эвалюцыі чалавецтва. Славянскае пісьменства, спадкаемцам якога з'яўляецца наша сучаснае пісьмо, узнікла больш за тысячу гадоў таму, у IX ст. Менавіта ў гэты час пачалося фарміраванне дзяржаўнасці ў розных славянскіх народаў.

Паходжанне славянскага пісьменства і царкоўнаславянскай мовы звязана з місіянерскай і асветніцкай дзейнасцю Кірылы і Мяфодзія. Пачаўшы пропаведзь на славянскай мове, браты паставілі сабе за мэту стварыць і адзінае пісьменства, зразумелае для носьбітаў усіх славянскіх дыялектаў. Царкоўнаславянская мова павінна была стаць найважнейшым інструментам далучэння славян да хрысціянства.

Кірыла і Мяфодзій бліскуча выканалі пастаўленую перад імі задачу, было створана нават два алфавіты — глаголіца і кірыліца. Некаторы час яны ў аднолькавай ступені выкарыстоўваліся пры напісанні богаслужэбных кніг, але паступова кірылічны алфавіт выцесніў глагалічны. Пасля вынаходства славянскай азбукі на царкоўнаславянскую мову былі перакладзены асноўныя богаслужэбныя кнігі. Вельмі важна, што станаўленне пісьменства дало магчымасць славянам ствараць летапісы і хронікі — уласныя дзяржаўныя гістарычныя творы. Знойдзеныя археолагамі ў Ноўгарадзе берасцяныя граматы з кароткімі паведамленнямі-пісьмамі сведчаць аб тым, што пісьменнымі былі нават простыя гараджане.

*Знайдзіце інфармацыю аб тым, ці адзначаецца Дзень славянскага пісьменства ў Рэспубліцы Беларусь*

Многія сучасныя славянскія краіны адзначаюць 24 мая як Дзень славянскага пісьменства ў памяць пра братоў Кірылу і Мяфодзія. Гэтая дата і сёння аб'ядноўвае славян.

**Літаратура, архітэктура і жывапіс.** Распаўсюджанне пісьменства прывяло да з'яўлення рукапісных кніг у славян. Найперш гэта была літаратура рэлігійнага зместу: царкоўныя сачыненні, пропаведзі, жыціі святых. Раней за ўсё гэтыя творы, напісаныя на славянскай мове, з'явіліся ў Першым Балгарскім царстве. Менавіта яно стала ачагом развіцця славянскага пісьменства, што дае магчымасць вучоным ахарактарызаваць другую палову IX–XIV ст. як «залаты век балгарскай літаратуры».

Неабходнасць стварэння гісторыі дзяржаў выклікала з'яўленне летапісаў і хронік. Кіеўскі манах Нестар стварыў летапіс, вядомы нам як «Аповесць мінулых гадоў». Казьма Пражскі ў «Чэшскай хроніцы» паслядоўна выклаў гісторыю Чэшскага каралеўства, а Гал Анонім у «Хроніцы і дзеяннях князёў або правіцеляў польскіх» — Польскага каралеўства.

Пачынаючы з XII ст. у славянскай літаратуры сталі з'яўляцца свецкія творы. Гэта былі як перакладныя, так і арыгінальныя работы. Вялікі ўплыў на развіццё


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

літаратуры аказвалі падзеі, што адбываліся ў славянскіх землях. Сапраўдным шэдэўрам старажытнарускай літаратуры з’яўляецца «Слова пра паход Ігараў», што расказвае пра барацьбу з качэўнікамі. У Чэшскім каралеўстве папулярнасцю карысталіся сачыненні багаслова і вучонага Яна Гуса, напісаныя на чэшскай мове. У іх ён заклікаў да «барацьбы за праўду Божую», аднаўлення нормаў ранняга хрысціянства, асуджаў заганы царквы і ўлад. Вучэнне Яна Гуса пакладзена ў аснову ідэалогіі руху гусітаў першай паловы XV ст.

З распаўсюджаннем хрысціянства развіццё ў славянскіх краінах атрымала культавае будаўніцтва. Узвядзенне храмаў было цесна звязана з развіццём і распаўсюджаннем іканапісу і насценнага жывапісу. Вялікі ўплыў на архітэктуру і жывапіс славянскіх народаў аказалі заходнееўрапейскія і візантыйскія традыцыі.

Сімвалам велічы Кіеўскай Русі стала будаўніцтва Сафійскага сабора па прыкладзе Святой Сафіі ў Канстанцінопалі. Гэты сабор з манастыром, што



Нестар Летапісец. Скульптар *Марк Антакольскі*. 1890 г.




*Прыдумайце назву для схемы, замяніўшы пытальнік словам або словазлучэннем. Прывядзіце прыклады да кожнага кампанента схемы.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сафійскі сабор, г. Кіеў, Украіна



Храм Успення Багародзіцы ў манастыры Студзеніца, Сербія



Базіліка св. Іржы (Георгія) у Пражскім Градзе, г. Прага, Чэхія



Ратонда св. Пракопа, г. Стшэльна, Польшча

ўзнік побач, — Кіева-Пячэрскай лаўрай — стаў цэнтрам распаўсюджання хрысціянства на ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі. У хуткім часе Сафійскія саборы былі пабудаваны ў Полацку і Ноўгарадзе.

Вялікія змены ў архітэктуры былі звязаны з пачаткам раздробленасці Кіеўскай Русі. У гэты час кожны ўдзельны правіцель узводзіў мураваныя храмы, замкі, гарады і жылыя пабудовы.

Для славянскай архітэктуры XI–XII стст. быў характэрны раманскі стыль. У шэрагу зямель ён спалучаўся з мясцовымі традыцыямі, што прывяло да фарміравання ўласных славянскіх архітэктурных школ. Захавалася не так шмат помнікаў той эпохі. Сярод дайшоўшых да нашых дзён пабудоў прыкладам раманскай архітэктуры ў славян служыць ратонда святога Пракопа ў Стшэльне ў Польшчы, базіліка святога Іржы (Георгія) у Пражскім Градзе, храм Успення Багародзіцы ў манастыры Студзеніца ў Сербіі і інш.

Гатычная архітэктура на славянскіх землях развівалася ў XIII–XV стст. Найбольш выдатным помнікам таго часу стаў пражскі Сабор святога Віта, пабудаваны на месцы аднайменнай базілікі XI ст. У Польшчы прыкладам гатычнага мастацтва служыць Марыяцкі касцёл у Кракаве, галоўны алтар якога быў створаны вядомым скульптарам Вітам Ствошам у канцы XV ст.

*Як вы думаеце, у якіх славянскіх дзяржавах мацней праяўляўся заходнееўрапейскі ўплыў, а ў якіх — візантыйскі? Чаму?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**N.B.**

Гарады Другога Балгарскага царства складаліся з крэпасці і пабудоў гараджан каля яе ўзножжа. Так былі спланаваны сталіца Вяліка-Тырнава, гарады Ловеч, Чэрвен і інш. Царскі палац у Вяліка-Тырнаве, пабудаваны на ўзгорку, складаўся з жылых памяшканняў, царквы і багата аздобленай троннай залы. Палацавая царква ўнутры была ўпрыгожана мармурам і мазаікай, а звонку — керамічным дэкорам.



Архітэктурна-музейны запаведнік «Царавец», г. Вяліка-Тырнава, Балгарыя

Культура еўрапейскага Ранняга Адраджэння значна паўплывала на культуру славян. Так, на перыяд кіравання імператара Карла IV прыпаў росквіт чэшскай культуры. Сярод найбольш выдатных помнікаў архітэктуры таго часу вылучаюць Карлаў мост цераз Влтаву, а таксама замак Карлштэйн, пабудаваны недалёка ад Прагі.



Абраз Багародзіцы Элеусы, напісаны ў Несебры, Балгарыя. XIV ст.

Будаўніцтва храмаў суправаджалася развіццём фрэскавага жывапісу і іканапісу. У XII—XIV стст. у Другім Балгарскім царстве склаліся некалькі жывапісных школ. Галоўнае месца сярод іх займала Тырнаўская школа. У XIII — пачатку XVI ст. сфарміравалася і сербская школа жывапісу. Шэдэўрамі сербскага сярэднявечнага жывапісу прызнаны фрэскі царквы Узнясення ў Мілешаве і Траецкай царквы манастыра ў Сапачанах.

Значную ролю ў жывапіснай культуры Сярэднявечча адыгрывалі кніжныя мініяцюры. Яны сталі важным складнікам чэшскага зборніка евангельскіх тэкстаў «Вышаградскі кодэкс» (XI ст.). Па колькасці мініяцюр і афармленні ён належыць да найбольш цікавых рукапісаў сярэднявечнай Еўропы.



Тайная вячэра.
Мініяцюра з «Вышаградскага кодэкса». XI ст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Уплыў рэлігіі на духоўнае і культурнае развіццё славян.** Прыняцце хрысціянства садзейнічала далучэнню славян да еўрапейскай цывілізацыі. Яно кардынальна мяняла асновы і традыцыі грамадства. Адмяняючы звычаі, звязаныя з язычніцтвам, хрысціянства патрабавала выканання строгіх маральных прынцыпаў ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі, у тым ліку ў сям'і.

Прыняўшы хрысціянства, славянскія правіцелі сталі ў адзін шэраг з правіцелямі Еўропы, а славянскія краіны зрабіліся паўнапраўнымі ўдзельнікамі палітычных працэсаў.

Хрысціянства садзейнічала пашырэнню сярод славян пісьменнасці. У якасці мовы богаслужэння было дазволена выкарыстоўваць царкоўнаславянскую. Славянская мова стала трэцяй мовай у Еўропе, на якой афіцыйна дазвалялася весці богаслужэнне (следам за лацінскай і грэчаскай).

Не менш важную ролю хрысціянства адыграла ў развіцці дойлідства і жывапісу. Цэнтрамі развіцця мясцовай культуры станавіліся манастыры. У іх пісалі і перапісвалі кнігі, стваралі кніжныя мініяцюры. Пры манастырах фарміраваліся літаратурныя школы асобных славянскіх народаў.

Трэба адзначыць, што ў Сярэднявеччы ўплыў царквы на грамадства быў вельмі моцным. Усё гэта сведчыла пра значэнне царквы як аднаго з найважнейшых фактараў, што аб'ядноўвалі насельніцтва.

*Духоўнае жыццё славян у старажытнасці вызначала язычніцтва, у якім толькі пачаў фарміравацца пантэон. Прыняцце хрысціянства і стварэнне славянскага пісьменства спрыялі славянам у далучэнні да хрысціянскай і сусветнай культуры. Гэта праявілася ў стварэнні рэлігійных кніг на царкоўнаславянскай мове, а затым і летапісаў асобных дзяржаў. Славянскія літаратура, архітэктура, жывапіс зведвалі на сабе ўплыў як заходнееўрапейскіх, так і візантыйскіх традыцый. Гэта дало магчымасць славянам стварыць своеасаблівую культуру, якая развівалася ў рэчышчы хрысціянскіх каштоўнасцяў.*

1. Падбярыце хэштэгі да тэмы 2. Выкарыстоўваючы іх, складзіце карту памяці.
2. Ахарактарызуйце язычніцкую рэлігію славян. Назавіце яе асноўныя рысы. Пры неабходнасці скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі.
3. Чым тлумачыцца невялікая колькасць звестак пра язычніцтва славян?
4. Ахарактарызуйце гістарычную сітуацыю, што склалася напярэдадні прыняцця славянскімі народамі хрысціянства.
5. Якую ролю ў распаўсюджанні хрысціянскага вучэння адыгрывала заснаванне архіепіскапстваў і патрыярхій? Як яно паўплывала на палітычнае жыццё краіны?
6. Якія перадумовы вынаходства славянскага пісьменства?
7. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, у тым ліку рэсурсы сеткі інтэрнэт, падбярыце фатаграфіі, ілюстрацыі, якія даказваюць, што вялікі ўплыў на культавае дойлідства славянскіх народаў аказалі заходнееўрапейскія і візантыйскія традыцыі. Прадстаўце вынік сваёй працы ў выглядзе каталога (прэзентацыі, буклета) або фотавыставы з апісаннем архітэктурных помнікаў. Выкарыстайце «Пашпарт архітэктурнага аб'екта» (для работы з ім звярніцеся да памяткі, размешчанай на электронным адукацыйным рэсурсе).


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Тэма 3. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ

## § 16. Гаспадарчае жыццё і палітычная карта Азіі ў Сярэднявеччы



*Якія змены адбываліся на палітычнай карце Азіі ў розныя перыяды Сярэднявечча? З чым гэтыя змены былі звязаны?*

*Якія цывілізацыі існавалі ў Сярэднявеччы ў Азіі? Чым вядомыя ў гісторыі Чынгісхан і Цімур? Успомніце азначэнні паняццяў «Вялікі шаўковы шлях», «іслам», «халіфат».* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Асноўныя гаспадарчыя заняткі насельніцтва. Этнічныя змяненні.** У Сярэднія вякі развіццё краін Азіі значна адрознівалася ад развіцця Еўропы. У процілегласць еўрапейскім рэгіёнам, гаспадарчае жыццё якіх было практычна аднародным і характарызавалася панаваннем земляробства, у цывілізацыях Азіі, Афрыкі і Амерыкі існавалі самыя розныя гаспадарчыя ўклады.

У раёнах старажытных цывілізацый працягвала развівацца высокапрадукцыйнае земляробства, ствараючы ўмовы для хуткага росту насельніцтва ў далінах рэк. Там існавала шмат буйны́х гарадоў. Рамяство было высокаразвітым. Гэта давала магчымасць весці вельмі прыбытковы гандаль, які здаўна з'яўляўся адным з найважнейшых заняткаў насельніцтва Азіі. Яго сімвалам стаў ***Вялікі шаўковы шлях***, які злучыў Кітай з Рымскай імперыяй і потым з Візантыяй праз увесь Еўразійскі кантынент.

Асаблівасцю цывілізацый Азіі была аддаленасць земляробчых і палітычных цэнтраў адзін ад аднаго. Тысячы кіламетраў і цяжкапераадольныя перашкоды аддзялялі Кітай ад Індыі, Індыю ад Сярэдняй Азіі і Ірана. Сувязі паміж гэтымі цывілізацыямі былі слабымі. У адрозненне ад еўрапейскіх геаграфічныя ўмовы Азіі па-ранейшаму значна ўскладнялі кантакты: вялізныя тэрыторыі займалі бязводныя стэпы і пустыні, горныя хрыбты і плато, шырокія рэкі і азёры. У старажытнасці гэтыя малаабжытыя раёны раздзялялі ачагі цывілізацыі. Тут жылі шматлікія качавыя плямёны. У азіяцкіх стэпах насельніцтва значна пазней перайшло да цывілізацыі, а асновай гаспадарчай дзейнасці тут была жывёлагадоўля.

У Сярэднявеччы пачала імкліва мяняцца карціна рассялення народаў, этнічная карта Азіі. Па-ранейшаму найбольш актыўна развіваліся рэгіёны старых цывілізацыйных цэнтраў: Блізкі Усход і Месапатамія, Іран, Індыя, Сярэдняя Азія, Кітай. Аднак у перыяд Сярэднявечча побач з імі з'яўляліся ўсё новыя дзяржаўныя


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Вялікі шаўковы шлях

ўтварэнні: пачалі ўзнікаць велізарныя дзяржавы качавых народаў. Качэўнікі імкнуліся захопліваць тэрыторыі земляробчых цэнтраў, але затым іх дзяржавы хутка распадаліся.

Пустынны паўвостраў Аравія атрымаў назву ад качавых арабскіх плямёнаў, якія тут жылі. З распаўсюджаннем ісламу яны пачалі рух і рассяліліся на вялізнай тэрыторыі Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Дагэтуль насельніцтва краін на гэтай тэрыторыі размаўляе на арабскай мове. Арабы падпарадкавалі і раёны старажытных цывілізацый — Егіпет, Месапатамію і Іран.

Пояс стэпаў і паўпустынь працягнуўся амаль праз увесь Еўразійскі кантынент ад Кітая да Карпат. Тут пражывалі і свабодна перамяшчаліся са сваімі статкамі на тысячы кіламетраў шматлікія плямёны качэўнікаў. У Сярэднявеччы ў гэтым рэгіёне адбылося станаўленне новай сям'і моў — цюркскай. Плямёны цюркаў у хуткім часе рассяліліся на велізарнай тэрыторыі і нават падпарадкавалі сабе асобныя раёны земляробчых цывілізацый. Нашчадкамі гэтых плямёнаў з'яўляюцца такія сучасныя народы, як туркі, туркмены, азербайджанцы, казахі, узбекі, кіргізы і некаторыя іншыя. Усе яны размаўляюць на цюркскіх мовах.

На поўначы ў Сібіры працягнуліся бяскрайнія таёжныя лясы, што пераходзяць у тундру. Тут жылі плямёны, якія займаліся паляваннем і аленегадоўляй. Яны былі адносна нешматлікія, што перашкаджала ўзнікненню ў іх дзяржавы.

У выніку практычна на ўсёй тэрыторыі Еўразіі ўзніклі дзяржаўныя ўтварэнні. Па-ранейшаму дзяржавы земляробчых цэнтраў былі больш стабільнымі, чым дзяржавы качэўнікаў, што хутка ўзнікалі і гэтак жа хутка разбураліся.

**Палітычная карта Азіі ў Сярэднявеччы.** ***Кітай.*** Кітай заставаўся галоўнай палітычнай сілай і самай густанаселенай краінай на Далёкім Усходзе цягам усяго


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| Дынастыя Тан 618–907 гг. | 5 дынастый і 10 царстваў 907–960 гг. | Дынастыя Сун 960–1279 гг. | Дынастыя Юань 1271–1368 гг. | Дынастыя Мін 1368–1644 гг. |
|---|---|---|---|---|

Кіруючыя дынастыі ў Кітаі ў перыяд Сярэднявечча

Сярэднявечча. Аднак перыяды яго палітычнай магутнасці змяняліся перыядамі раздробленасці, заняпаду і падпарадкавання іншаземным захопнікам. Новае ўзвышэнне Кітая было звязана з пачаткам кіравання дынастыі Тан у 618 г. Арміі імператара Лі Юаня ўдалося аб’яднаць усе кітайскія тэрыторыі, а затым пачаць наступленне на В’етнам і Карэю. Гэтыя краіны ў хуткім часе прызналі сваю залежнасць. Кітайскае насельніцтва пастаянна засяляла тэрыторыі ўсё далей ад даліны Хуанхэ. У Сярэднявеччы кітайцы канчаткова асвоілі даліну ракі Янцзы, засялілі ўзбярэжжа акіяна аж да граніцы з В’етнамам, пачалі засяляць стэпы на поўнач і захад ад даліны Хуанхэ.




Імперыя Тан

Жыццёва важным для імперыі быў кантроль над Вялікім шаўковым шляхам. Імперыя Тан не толькі аднавіла сувязь па гэтым гандлёвым маршруце, але і стварыла ўмацаваныя пункты ўздоўж да граніц з Сярэдняй Азіяй. Але, прайграўшы ў 751 г. Таласкую бітву з арабамі-мусульманамі, кітайцы надоўга пакінулі гэтыя далёкія тэрыторыі.

Амаль два стагоддзі Кітай квітнеў, стабільная ўлада забяспечыла развіццё сельскай гаспадаркі і гандлю. Магутнасць імперыі Тан пахіснулі народныя паўстанні ўнутры краіны. У 907 г. імперыя пала, і Кітай зноў паглыбіўся ў міжусобную барацьбу.

***Дзяржава Чынгісхана.*** Мангольскія плямёны жылі далёка ад старажытных палітычных цэнтраў, займаліся качавой жывёлагадоўляй, суседзі лічылі іх нецывілізаваным народам. У 1206 г. у стэпах Манголіі вярхоўным валадаром усіх плямёнаў быў абвешчаны Чынгісхан. Аб’яднаныя новым правіцелем манголы сталі ўяўляць сабой грозную сілу. Чынгісхан з’яднаў армію жорсткай


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| 1206 г. | 1219 г. | 1237–1238 гг. | 1240 г. | 1271 г. | 1368 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Стварэнне дзяржавы Чынгісхана | Уварванне Чынгісхана ў Сярэднюю Азію | Заваяванне рускіх княстваў ханам Батыем | Разгром Кіева манголамі, уварванне ў Еўропу | Заснаванне мангольскай дынастыі Юань у Кітаі | Звяржэнне ўлады манголаў у Кітаі |

Асноўныя падзеі з гісторыі Мангольскай дзяржавы



Чынгісхан на паляванні. Сярэднявечны малюнак на шоўку. XV ст.

дысцыплінай і добра ўзброіў яе па адзіным узоры. Армія пастаянна ваявала і атрымала неацэнны баявы вопыт.

Першымі былі захоплены землі Паўночнага Кітая. Затым пала вялікая дзяржава харэзмшахаў у Сярэдняй Азіі і Іране, а ўжо ў 1223 г. передавая армія манголаў разграміла аб'яднаную армію князёў Русі ў бітве на рацэ Калка. Праціўнікаў уражвала бязлітаснасць манголаў да тых, хто са зброяй у руках спрабаваў супраціўляцца. Армія Чынгісхана спецыяльна знішчала складаныя арашальныя сістэмы землякробаў Сярэдняй Азіі і Кітая, каб голад спусташаў цэлыя раёны.

Выкарыстоўваючы створаную Чынгісханам рухомую конную армію, заваяванні працягнулі яго сыны і ўнукі. Мангольская імперыя пашырыла сваю ўладу на агромністыя тэрыторыі ад стэпаў сучаснай Украіны да Ціхага




Дзяржава Чынгісхана


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

акіяна, ад пустынь Егіпта да сібірскай тайгі. Прарваўшыся ў Польшчу і Венгрыю, манголы адступілі толькі з-за неабходнасці ўзяць удзел у выбарах новага вялікага хана. У прыволжскіх стэпах пазней сфарміравалася Залатая Арда.

Кіраваць такой вялізнай краінай — ад Дуная да Ціхага акіяна — з адной сталіцы было немагчыма. Імперыя была падзелена паміж чатырма сынамі Чынгісхана. Але вялікім (гэта значыць галоўным) ханам заставаўся правіцель Манголіі. Ім стаў хан Хубілай. У 1271 г. на землях Манголіі і заваяванага Кітая ён абвясціў новую дынастыю Юань. Сталіцай новай імперыі стаў горад Даду (сучасны Пекін), яе эканамічным і палітычным цэнтрам заставаліся землі, на якіх узнікла кітайская цывілізацыя.

Дынастыя Юань была звергнута ў ходзе паўстанняў кітайскага насельніцтва. У 1368 г. паўстанцы-пераможцы абвясцілі кітайскую дынастыю Мін на чале з імператарам Чжу Юаньчжанам. Армія Мін здолела вызваліць увесь Кітай. У перыяд кіравання дынастыі Мін Кітай быў найбуйнейшай дзяржавай свету.

**N.B.**

У час кіравання дынастыі Мін Кітай пачаў нават марскую экспансію. Адмірал Чжэн Хэ па загадзе імператара пабудаваў «Вялікі флот» і арганізаваў 7 далёкіх марскіх экспедыцый. Фактычна гэта была спроба ўзяць пад кантроль гандаль у Індыйскім акіяне. Чжэн Хэ быў мусульманінам і таму мог лягчэй знайсці агульную мову з арабскімі гандлярамі. Кітайскія караблі прыбылі да ўзбярэжжа Усходняй Афрыкі раней за партугальскія. Аднак кітайскія ўлады палічылі марскія экспедыцыі занадта дарагімі і нявыгаднымі з пункту гледжання прыбытку. Флот прыйшоў у заняпад і больш не адрадзіўся.

***Японія.*** Першыя дзяржаўныя ўтварэнні ўзніклі на Японскіх астравах у II ст. да н. э. Дынастыя Ямата перамагла ў міжусобнай барацьбе ў IV ст. н. э. З таго часу ў Японіі існуе адзіная дзяржава. У VII ст. Ямата быў перайменаваны ў Ніхон, і гэтую назву краіна носіць дасюль. На працягу Сярэднявечча імператары паступова падпарадкоўвалі сабе ўсе тэрыторыі астравоў. Культурныя дасягненні Кітая і Карэі ўваходзілі ў жыццё японцаў. Японская дзяржава настолькі ўзмацнілася, што здолела адбіць напады мангольскай арміі хана Хубілая ў 1274 і 1281 гг.

***Арабскі халіфат.*** У 610 г. у горадзе Мека на ўсходзе Аравійскага паўвострава пачаў сваю пропаведзь ісламу прарок Мухамед. Ён заклікаў верыць у адзінага і ўсёмагутнага Алаха. У 622 г. ён і яго паслядоўнікі вымушаны былі бегчы з Мекі і перасяліліся ў Медыну. Гэта падзея атрымала назву *хіджра*, што з арабскай мовы перакладаецца як «уцёкі». Пасля працяглай вайны ў 630 г. Мека прызнала іслам і запрасіла Мухамеда. Хутка і большасць арабскіх плямёнаў Аравіі прынялі новую рэлігію.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Арабскія ваенныя атрады рушылі ў розных напрамках, падпарадкоўваючы мясцовае насельніцтва і распаўсюджваючы іслам. Яны захапілі ўвесь Блізкі Усход, Іран, Сярэднюю Азію, Паўночную Афрыку, пераправіліся ў Еўропу і падпарадкавалі Пірэнейскі паўвостраў. Візантыйцы спынілі рух арабаў толькі пад сценамі сваёй сталіцы. У 732 г. франкі на чале з Карлам Мартэлам у жорсткай бітве пры Пуацье нанеслі паражэнне мусульманскаму войску і спынілі яго прасоўванне ў Заходнюю Еўропу. У 751 г. у Таласкай бітве арабы разграмілі кітайскую армію і скарылі Сярэднюю Азію. Халіфат раскінуўся на вялізных тэрыторыях ад Атлантычнага акіяна да граніц Кітая.

Арабскі халіфат быў шматнацыянальнай дзяржавай, у якой арабы не з'яўляліся большасцю насельніцтва. Краіну аб'ядноўвала рэлігія — іслам. Яна садзейнічала стварэнню адзінай ісламскай культуры на вялікіх прасторах ад Іспаніі да Кітая. Іслам сталі добраахвотна прымаць многія народы. Аднак унутраная барацьба і пастаянныя паўстанні скораных народаў падарвалі магутнасць халіфату.

У пачатку XI ст. на Блізкім Усходзе з'явіліся новыя заваёўнікі — туркі-сельджукі. Яны прынялі іслам. Захапіўшы практычна ўвесь Блізкі Усход, сельджукі намінальна захавалі ўладу багдадскіх халіфаў як рэлігійных уладароў мусульман. Аднак адзінства мусульманскага свету было канчаткова страчана.




Арабскі халіфат

*Прасачыце па картасхеме рост тэрыторыі Арабскага халіфата. Да якога часу гэтая дзяржава дасягнула найвышэйшага росквіту? Якія еўрапейскія тэрыторыі былі захоплены арабамі?*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Манголы, захапіўшы Багдад у 1258 г., давяршылі разгром халіфата і забілі апошняга халіфа.

| 622 г. | 717–718 гг. | 732 г. | 751 г. | 1258 г. |
|---|---|---|---|---|
| Хіджра — пачатак мусульманскай эры | Няўдалая аблога Канстанцінопаля | Разгром арміі мусульман пры Пуацье | Талаская бітва | Захоп Багдада манголамі |

Падзеі з гісторыі Арабскага халіфата

***Дзяржава Цімура.*** У стэпах Сярэдняй Азіі пасля распаду адзінай Мангольскай дзяржавы ішла пастаянная барацьба паміж яе спадчыннікамі — Чынгізідамі. У 1370 г. сярод палкаводцаў Сярэдняй Азіі вялікім эмірам — «военачальнікам» — быў абвешчаны Цімур. У Еўропе ён быў вядомы як Тамерлан. Яму ўдалося з'яднаць розныя плямёны цюркаў і манголаў у грозную і жорсткую армію, якая зноў стала наводзіць жах на вялізныя тэрыторыі Сярэдняй Азіі, Ірана, Блізкага Усходу, Паўночнай Індыі і інш. Змагаючыся з Залатой Ардой, войскі Цімура дайшлі да Дняпра ў стэпах сучаснай Украіны і да граніц Маскоўскай дзяржавы. Усю захопленую здабычу і лепшых рамеснікаў звозілі ў сталіцу імперыі Цімура — Самарканд. Ён хутка стаў адным з найбагацейшых і найпрыгажэйшых гарадоў сярэднявечнага свету. Аднак пасля смерці Цімура яго імперыя даволі хутка распалася.

***Асманская імперыя.*** Сярод мусульманскіх краін хутка набіралі сілу ваяўнічыя туркі-асманы. У часы Цімура яны ўтварылі невялікую дзяржаву ў Пярэдняй Азіі. Але паступова туркі-асманы не толькі падпарадкавалі сабе былыя ўладанні Візантыі на азіяцкай тэрыторыі, але пераправіліся і ў Еўропу на Балканскі паўвостраў. Канстанцінопаль у хуткім часе апынуўся практычна ў акружэнні. А ў 1453 г. пасля доўгай цяжкай аблогі туркам удалося ўзяць сталіцу Візантыі і падпарадкаваць гэтую дзяржаву. Уладанні туркаў-асманаў сталі магутнай дзяржавай, а яе сталіцай абвясцілі Стамбул (так стаў называцца Канстанцінопаль). Правіцель узяў тытул султана і цяпер змагаўся за прызнанне сябе «ўладаром усіх прававерных» мусульман. Асманская імперыя размяшчалася ў трох частках свету: Еўропе, Азіі і Паўночнай Афрыцы. Арміі асманаў больш як стагоддзе пагражалі Еўропе ўварваннем, пачынаючы з першай аблогі Вены ў 1529 г. Туркі зрабілі Чорнае мора сваім унутраным морам, выйшаўшы на граніцы Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы. Хрысціянскі свет з цяжкасцю абараняўся.

***Індыя.*** Індыя была населена вялікай колькасцю народаў, якія размаўлялі на розных мовах. Але на ўсёй яе велізарнай тэрыторыі існавалі агульныя культурныя традыцыі. Дзяржавы, утвораныя рознымі народамі, хутка ўзнікалі ў асобных рэгіёнах краіны, але затым гэтак жа хутка распадаліся. Перыяды нашэсцяў змяняліся росквітам земляробчых раёнаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Дэлійскі султанат

§ 16–1

У пачатку VIII ст. на ўсходзе Індыі з'явіліся першыя мусульманскія атрады заваёўнікаў. У канцы XII ст. мусульманская армія захапіла Паўночную Індыю і горад Дэлі. У 1206 г. быў заснаваны Дэлійскі султанат. Султаны і большасць заваёўнікаў паходзілі з цюркаў-мусульман, а асноўную масу насельніцтва складалі індусы. На поўдні Індыі існавала больш за дзясятак індуісцкіх дзяржаў, якія ўпарта вялі барацьбу паміж сабой, але адначасова адчайна змагаліся з мусульманскай пагрозай.

*Тэрыторыі старажытных земляробчых цывілізацый у Сярэднявеччы працягвалі адыгрываць ролю асноўных палітычных цэнтраў. Аднак цяпер практычна ва ўсёй Азіі існавалі дзяржаўныя ўтварэнні. Перыяд Сярэднявечча тут азнаменаваўся хуткім стварэннем і панаваннем вялізных дзяржаў качавых народаў. Яны захоплівалі тэрыторыі земляробчых цэнтраў, але затым дзяржавы хутка распадаліся. Распад многіх, здавалася б, самых магутных дзяржаў Сярэднявечча вельмі проста растлумачыць: яны аб'ядноўвалі тэрыторыі з вельмі розным эканамічным развіццём, народы, што ў іх уваходзілі, мелі абсалютна розныя традыцыі, а нацыянальная самасвядомасць яшчэ не сфарміравалася. Стабільнасць дзяржавам Сярэднявечча надавала адзінае веравызнанне.*

**1.** Чым была выклікана нераўнамернасць развіцця цывілізацый Азіі ў перыяд Сярэднявечча?
**2.** Ахарактарызуйце карту рассялення народаў Азіі.
**3.** Ахарактарызуйце перыяды, якія вылучаюцца ў развіцці Кітая ў Сярэднія вякі.
**4.** Назавіце прычыны паспяховых заваяванняў манголамі вялізных тэрыторый і развітых дзяржаў.
**5.** Якім чынам ствараўся і чаму распаўся Арабскі халіфат?
**6.** Якую ролю ў еўрапейскай гісторыі адыграла Асманская імперыя?
**7.** Падрыхтуйце інфармацыю аб адной з краін сярэднявечнай Азіі ў фармаце артыкула для Вікіпедыі з гіперактыўнымі спасылкамі для ключавых слоў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 17. Сацыяльныя адносіны ў сярэднявечных цывілізацыях Азіі

*Што было ўласціва грамадскім адносінам у сярэднявечных цывілізацыях Азіі? У чым праяўляліся іх адрозненні ад грамадскіх адносін у заходнееўрапейскай цывілізацыі? Што было агульнага?*



*Якія былі асаблівасці дзяржаўнага кіравання і сацыяльных адносін у краінах Старажытнага Усходу? Якую ролю адыгрывала рэлігія ў арганізацыі грамадскага жыцця сярэднявечных цывілізацый у Азіі? Успомніце азначэнне паняццяў «іерархія», «канфуцыянства», «варна».* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Сацыяльная структура сярэднявечных усходніх цывілізацый.** Сацыяльныя структуры сярэднявечных цывілізацый Азіі і заходнееўрапейскага грамадства істотна адрозніваліся. Аднак, як і ў Еўропе, значны ўплыў на азіяцкія сацыяльныя сістэмы аказвала рэлігія. Дзяржаўны лад па-ранейшаму характарызаваўся многімі рысамі, якія ўзніклі яшчэ ў старажытнасці. Напрыклад, улада правіцеляў захоўвала дэспатычны, неабмежаваны характар, яны лічыліся вярхоўнымі ўласнікамі ўсёй зямлі. Таму дзяржава па-ранейшаму панавала над грамадствам, за асобнага чалавека перад уладамі маглі заступіцца абшчына або саслоўе, да якіх ён належаў. Найважнейшым элементам сацыяльнай структуры ўсходняй дзяржавы быў слой чыноўнікаў, якія складалі бюракратычны апарат і дапамагалі ў кіраванні краінай. Яны ўсё больш адцяснялі на другі план раней магутную спадчынную арыстакратыю. Арыстакратыя ў краінах Усходу не валодала зямлёй, а атрымлівала даход ад насельніцтва пэўнай тэрыторыі, замацаванай загадам правіцеля. Права на такі даход было звязана з займаемай пасадай і не перадавалася ў спадчыну ні сярод арыстакратаў, ні сярод чыноўнікаў.

Галоўнай задачай дзяржавы было наладжванне высокапрадукцыйнай гаспадаркі ў краіне. Перш за ўсё трэба было арганізаваць на высокім узроўні сельскую гаспадарку. Моц дзяржавы залежала і ад колькасці насельніцтва. Толькі шматлюдная краіна мела магчымасць арганізаваць складаную сістэму земляробства, процістаяць ваенным уварванням, будаваць вялікія гарады — цэнтры рамяства і гандлю. Таму сялянскія абшчыны адыгрывалі важную ролю ў жыцці грамадства і выконвалі не толькі гаспадарчую і адміністрацыйную, але і рэлігійную функцыю. Для абшчын былі прадугледжаны правы на самакіраванне і абарону сваіх прадстаўнікоў ад ціску ўлад.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А вось сярэднявечныя гарады Усходу так і не змаглі дабіцца ніякіх правоў на самакіраванне, як гэта было ў Еўропе. Гарады поўнасцю падпарадкоўваліся правіцелю або ўплывовым арыстакратам, якія там жылі. Уся арганізацыя жыцця горада была падпарадкавана інтарэсам уладароў: рамяство і гандаль арганізоўваліся імі дзеля атрымання найбольшага прыбытку для сябе. Гарады ў Сярэднявеччы іншым часам хутка дасягалі вялікіх памераў, аднак гэтак жа хутка прыходзілі ў занядпад пры змене ўлады.

Паўсядзённае жыццё людзей у цывілізацыях Азіі было строга рэгламентавана дзяржаўнымі законамі і рэлігійнымі патрабаваннямі. Практычна адзінай магчымасцю змяніць існуючае становішча былі народныя паўстанні. У ходзе такіх паўстанняў «нізы» і «вярхі» часам мяняліся месцамі: на месца зрынутага правіцеля прыходзіў кіраўнік паўстанцаў, а арыстакратамі станавіліся яго прыбліжаныя. Аднак у цэлым гэта ніколі не мяняла традыцыйную структуру грамадства.

**Сацыяльная арганізацыя Танскага Кітая.** Дамінуючай у палітычных і культурных адносінах дзяржавай Далёкага Усходу заставаўся Кітай. Сістэма кіравання там пачала складвацца яшчэ ў старажытнасці. На вяршыні сацыяльнай лесвіцы стаяў абагаўлёны імператар — Сын Неба, якому належала ўся зямля ў краіне, а ўсе жыхары былі яго падданымі.

Арыстакратычныя сем'і былі буйны́мі землеўладальнікамі і адносіліся да прывілеяванай часткі грамадства. Да яе належалі таксама чыноўнікі, якія атрымалі адукацыю, але свае пасады, зямлю і прывілеі яны не маглі перадаць у спадчыну. Усе, хто меў уласнасць, адносіліся да «добрага люду». У горадзе гэта былі купцы і рамеснікі. Аднак аснову кітайскага грамадства складалі сяляне, якіх аб'ядноўвала абшчына, што выконвала гаспадарчыя і адміністрацыйныя функцыі. Самае нізкае становішча ў грамадстве займаў «подлы люд»: залежныя сяляне, рабы, слугі. Яны мелі толькі невялікую асабістую ўласнасць і поўнасцю залежалі ад гаспадароў.




Сістэма дзяржаўнага кіравання імперыі Тан (618–907 гг.)


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Імператар Цзяцзін на баржы.
Скрутак. Каля 1538 г.

У 485 г. у Кітаі была ўведзена *сістэма «роўных палёў»*. У імперыі Тан яна стала асновай арганізацыі земляробства. Сяляне ад 15 да 70 гадоў атрымлівалі роўныя ўчасткі зямлі для вядзення гаспадаркі, якія яны не маглі цяпер пакідаць. Участак падзяляўся на дзве часткі: зямлю ў асабістай уласнасці і зямлю, якая апрацоўвалася, з якой трэба было плаціць падатак дзяржаве. Калі селянін не мог апрацоўваць зямлю, дзяржава забірала яе і пакідала толькі асабісты ўчастак. Пры гэтым захоўваліся буйны́я ўладанні родавай арыстакратыі, якая таксама імкнулася прыцягнуць сялян для работы на сваіх землях.

Сістэма «роўных палёў» у імперыі Тан прымацавала сялян да зямлі. Дзяржава зладжана і гібка арганізавала сялянскую працу для атрымання высокіх ураджаяў. Гэтая сістэма давала магчымасць усяму насельніцтву атрымаць зямлю, інакш кажучы, яна стала дзейсным інструментам барацьбы з беднасцю. Дзяржава збірала зерне і падаткі, а потым перадавала ўжо ў выглядзе ўзнагароды чыноўнікам. Такую сістэму некаторыя гісторыкі называюць «дзяржаўным феадалізмам». Вынікам арганізацыі сістэмы «роўных палёў», якая на некалькі стагоддзяў паслужыла эканамічнай асновай рэзкага дэмаграфічнага росту, стаў працяглы росквіт імперыі Тан. Кітай на той момант стаў самай густанаселенай краінай свету. Колькасць насельніцтва, як падлічылі сучасныя гісторыкі на падставе перапісу хатніх гаспадарак, склала ад 50 да 70 млн чалавек.

Аднак рост насельніцтва, які стаў вынікам увядзення сістэмы «роўных палёў», у далейшым ператварыўся ў асноўную прычыну крызісу. Больш не было зямлі для раздачы новым ахвотным карыстацца ёю ў адпаведнасці з законам.

Сістэма па сутнасці была ўраўняльнай, гэта значыць не давала магчымасці багацець квітнеючым сялянскім гаспадаркам. А гэта моцна стрымлівала эканамічную ініцыятыву насельніцтва. Рост колькасці чыноўнікаў і гарадскіх жыхароў патрабаваў усё большай колькасці прадуктаў харчавання. А гэтага сістэма «роўных палёў» без эканамічнага стымулу і ініцыятывы даць ужо не магла. Улады бачылі толькі адно выйсце — узмацненне эксплуатацыі сялян.

Гэта прывяло да сялянскай вайны. У 881 г. паўстанцы завалодалі сталіцай, а іх правадыр Хуан Чаа абвясціў сябе імператарам. Але становішча сялян не палепшылася, толькі лідары паўстанцаў занялі вышэйшыя пасады. Выступленне ў хуткім часе было падаўлена. Крывавыя паўстанні супраць Тан забралі жыцці каля $\frac{2}{3}$ насельніцтва.

**Асаблівасці сацыяльнага развіцця ў сярэднявечнай Японіі.** Японія пачала развівацца пазней за Кітай, затое магла карыстацца яго дасягненнямі ў сацыяльным


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Іерархічная арганізацыя японскага грамадства

і культурным жыцці. У аб'яднанай японскай дзяржаве Ніхон імператарская ўлада была першапачаткова моцная. Аднак тут яшчэ не быў пераадолены ўплыў радавой арыстакратыі, якая мела значную эканамічную і палітычную ўладу. Узяўшы за прыклад сістэму рангаў і сістэму надзелаў «роўных палёў» у Кітаі, імператары, наадварот, узмацнілі арыстакратыю. У VII—VIII стст. знатныя сем'і сканцэнтравалі ў сваіх руках велізарныя зямельныя ўладанні. Улада на месцах перайшла да знаці, якая, дабіўшыся пасад кіраўнікоў адміністрацыйных акруг, перадавала іх у спадчыну, а дзяржаўныя тэрыторыі разглядала як свае асабістыя ўладанні. Буйны́я землеўладальнікі — *даймё* — утрымлівалі прафесійныя ваенныя атрады, якія складаліся з воінаў-*самураяў*. У выніку, у адрозненне ад Кітая, у Японіі склалася сістэма сувязяў, якая нагадвала еўрапейскую феадальную лесвіцу. Сяляне трапілі ў асабістую залежнасць.

З цягам часу самураі ператварыліся ў замкнёную прывілеяваную сацыяльную групу, падобную да заходнееўрапейскага рыцарства. Галоўным абавязкам самурая было верна служыць свайму гаспадару і храбра змагацца за яго. Таму яны пастаянна трэніраваліся ў авалоданні баявымі мастацтвамі, і перш за ўсё майстэрствам карыстання баявым мячом. Паражэнне ў баі, гібель гаспадара або неналежны ўчынак вымушалі самурая праводзіць рытуал публічнага самазабойства *сэпуку* (харакіры).

Абапіраючыся на атрады шматлікіх самураяў, даймё пачалі ўзброеную барацьбу за падпарадкаванне імператара і ўсёй краіны сваёй уладзе. У 1192 г. Мінамота Ёрытома абвясціў сябе *сёгунам* — «вялікім палкаводцам». Імператары сталі лічыцца рэлігійнымі заступнікамі краіны, а рэальная ўлада апынулася ў руках сёгунаў роду Мінамота.



Японскі сярэднявечны горад

*Падбярыце з дапамогай сеткі інтэрнэт ілюстрацыі, якія выяўляюць сярэднявечны японскі горад. Апішыце яго знешні выгляд.*

Японскія гарады сталі цэнтрам развіцця рамяства і гандлю з Кітаем, Карэяй і краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі. Многія гарады паступова дабіліся нават права на самакіраванне. Тут існавалі шматлікія карпарацыі гандляроў і рамеснікаў, падобныя па структуры да еўрапейскіх сярэднявечных цэхаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Асаблівасці сацыяльных адносін у мусульманскіх краінах.** Арабскі халіфат аб'яднаў вялізную тэрыторыю на Блізкім Усходзе, дзе для насельніцтва была характэрная гаспадарка розных тыпаў: качавая жывёлагадоўля ў стэпах і пустынях і ірыгацыйнае земляробства ў далінах рэк. Гэта садзейнічала вялікай разнастайнасці сацыяльных груп у Арабскім халіфаце. Людзі займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам, рамяством і гандлем, разнастайнымі відамі іншых работ.

У мусульманскіх краінах іслам актыўна ўплываў на ўсе бакі жыцця грамадства. Гэта рабіла іх сацыяльную структуру вельмі спецыфічнай для перыяду Сярэднявечча.

Усе мусульмане лічыліся роўнымі паміж сабой у адпаведнасці з ісламскім рэлігійным заканадаўствам, якое рэгламентавала нормы і правілы паводзін чалавека. Пры гэтым важную ролю ў жыцці грамадства адыгрывалі радавыя і племянныя сувязі.

Тым не менш роўнасць мусульман у правах зусім не азначала сацыяльнай роўнасці, існаваў падзел на багатых і бедных. На думку мусульман, такім стварыў грамадства людзей Алах і ўсё адбываецца па яго волі. Затое разбагацець і, адпаведна, павысіць у сувязі з гэтым свой сацыяльны статус мог кожны, хто пажадае. Таленавітыя дзеці з сем'яў беднякоў станавіліся вышэйшымі чыноўнікамі ў шэрагу мусульманскіх краін, напрыклад, у Асманскай імперыі. Любы чалавек незалежна ад таго, у якім асяроддзі быў народжаны, мог пайсці ў армію і стаць военачальнікам.

У сярэднявечным мусульманскім грамадстве прызнавалася рабства, у некаторых рэгіёнах было шмат рабоў. Іслам забараняў здзекавацца з іх і без неабходнасці забіваць. Дзіўна, што атрады грамадскага парадку ў гарадах часта фарміраваліся менавіта з рабоў.

За ваенную службу халіфы пачалі надзяляць воінаў, а часам і чыноўнікаў зямельнымі ўладаннямі з сялянамі, якія працавалі там. Падаткі з гэтых зямель атрымліваў ужо ўладальнік, а не дзяржава. Воіны маглі цяпер сыходзіць у доўгія паходы, не хвалюючыся за дабрабыт сваіх сем'яў. У Асманскай імперыі з XIV ст. такая сістэма ўмоўнага валодання зямельнымі надзеламі з мясцовымі сялянамі атрымала назву ***тымар***. Уладальнікі тымараў не мелі права павялічваць аб'ём падаткаў з сялян, які дакладна фіксаваўся дзяржавай.

Мусульмане падчас заваёў скарылі многія народы, якія вызнавалі іншыя рэлігіі. Спачатку яны не навязвалі сілай прыняцце ісламу. Затое рэзка павышалі падаткі для немусульманскага насельніцтва, што выклікала ў многіх жаданне добраахвотна прыняць іслам. Тым не менш значнай часткі насельніцтва захопленых зямель удавалася захоўваць уласную веру — хрысціянства і іўдаізм, паколькі, згодна з канонамі ісламу, прыхільнікі гэтых рэлігій — гэта «людзі Пісання». Лічылася, што ім даступна шанаванне Бога, але не адкрыта ўся ісціна, якую ведае толькі іслам. Аднак мусульмане абавязаны былі абараняць хрысціян і іўдзеяў і даваць ім правы ў дзяржаўным жыцці, што і рабілі ў большасці выпадкаў сярэднявечныя мусульманскія правіцелі. З таго часу на Блізкім Усходзе ў ісламскіх краінах жыве нямала хрысціян.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Хрысціянская армянская Царква 40 пакутнікаў, г. Алепа, Сірыя. XV ст.

*Падрыхтуйце буклет аб архітэктурных помніках, выявы якіх прадстаўлены ў параграфе.*

Качавое насельніцтва, перш за ўсё арабы-бедуіны, працягвала весці ў пустынях той лад жыцця, што складаўся стагоддзямі. Людзі абменьвалі прадукты жывёлагадоўлі на земляробчыя тавары з аазісаў. Асноўную масу насельніцтва складалі сяляне-земляробы. Разам з тым гарадское насельніцтва ў Арабскім халіфаце было шматлікім. Тут квітнела рамяство. Гандлёвыя караваны перавозілі рамесныя тавары ў самыя аддаленыя краіны, дзе тыя высока цаніліся. Але гарады не мелі правоў самакіравання і кіраваліся адміністратарамі правіцеляў.

Сталіцай Арабскага халіфата на працягу больш як паловы тысячагоддзя быў горад Багдад (у перакладзе з персідскай — «Божы дар»). Горад быў пабудаваны ў 762 г. па загадзе халіфа перасяленцамі арабамі-мусульманамі недалёка ад руін старажытнага Вавілона на беразе ракі Тыгр. У цэнтры Багдада ўзвялі круглую ўмацаваную цытадэль з моцнымі сценамі вышынёй 24 метры і з чатырма брамамі. У цытадэлі размяшчаліся два галоўныя збудаванні — палац халіфа і мячэць. Упершыню пры будаўніцтве Багдада мячэць была крыху адсунута ад цэнтра, дзе цяпер узвышаўся палац.

У хуткім часе горад стаў цэнтрам не толькі адміністрацыйнага, але і эканамічнага і культурнага жыцця ўсяго Блізкага Усходу. Сюды сцякаліся тавары з Еўропы і Кітая, Сярэдняй Азіі і Егіпта, Афрыкі і Індыі. Багдад стаў канкурэнтам Канстанцінопаля.

Халіфы заснавалі ў Багдадзе Дом мудрасці, які часта называюць першым у свеце ўніверсітэтам. На самай справе галоўнай яго задачай быў пераклад антычных, індыйскіх і блізкаўсходніх кніг з усяго рэгіёна на арабскую і персідскую мовы. Дом мудрасці на некалькі стагоддзяў стаў буйнейшым навуковым цэнтрам, а арабская і персідская — мовамі навукі і культуры. У Багдадзе была заснавана першая ў Заходняй Азіі майстэрня па вытворчасці паперы высокай якасці.



Палац Абасідаў,
г. Багдад, Ірак. Канец XII–XIII ст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Сацыяльная структура ў Індыі.** На ўладкаванне індыйскага грамадства аказалі ўплыў уяўленні, звязаныя з індуізмам. Старажытная сістэма варнаў, на якія падзялялася грамадства, ператварылася ў больш разнастайную і складаную сістэму кастаў. З'яўленне кастаў стала неабходным у сувязі з вялікай разнастайнасцю заняткаў унутры сфер прафесійнай дзейнасці і неабходнасцю ўлічваць пражыванне ў Індыі многіх плямёнаў і наяўнасць этнічных рэгіянальных асаблівасцяў. Асобныя прафесіі і плямёны сталі самастойнымі кастамі. Вельмі часта сістэму кастаў параўноўваюць з замкнёным самакіраваннем у прафесійных або этнічных калектывах. У адну касту маглі ўваходзіць як адносна багатыя, так і бедныя людзі, але іх аб'ядноўвалі прафесія і паходжанне. У кожнай касты былі свае ўмовы жыцця, свае дазволы, забароны і абмежаванні, напрыклад, абмежаванні ў ежы і адзенні.

Самай ніжэйшай кастай лічыліся недатыкальныя, якія нават не ўваходзілі ў сістэму варнаў. Яны не маглі датыкацца не толькі людзей іншых кастаў, але нават іх ценяў.

Нарадзіўшыся ў пэўнай касце, індус ніколі не мог перайсці ў іншую. Індуізм вучыў, што змяніць сваё становішча чалавек можа толькі пасля перараджэння. Прычым чым больш правільна ён жыў, тым лепшым будзе яго жыццё ў наступным увасабленні. У выніку каставая сістэма вяла да вельмі строгіх формаў сацыяльнага прыгнёту, калі нельга было нават спадзявацца штосьці змяніць у гэтым жыцці.




Спецыфіка развіцця грамадства ў Індыі

Асаблівасці прыроды Індыі абумовілі неабавязковасць стварэння вялікіх ірыгацыйных сістэм, чым павінна была б займацца цэнтральная ўлада. Група вёсак, якая складала абшчыну, стварала замкнёную і прадукцыйную сістэму земляробчай або земляробча-жывёлагадоўчай гаспадаркі. Адрозніваючыся ў этнічных і каставых адносінах, такія абшчыны фарміравалі трывалыя гаспадарчыя структуры. Змена палітычнай улады ў далёкіх сталіцах ніяк іх не закранала, яны працягвалі адасоблена існаваць і плаціць $1/6$ частку ўраджаю ўладам. Такое становішча шмат у чым вызначала палітычную слабасць і раздробленасць Індыі ў Сярэднія вякі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Культура.

| Культурныя дасягненні сярэднявечных цывілізацый Азіі | |
|---|---|
| **Ісламская цывілізацыя** | *Дом мудрасці* быў арганізаваны ў Багдадзе (IX ст.), яго называюць адной з першых акадэмій у свеце. Тут размяшчаліся бібліятэка, абсерваторыі і г. д.<br>*Медыцына*: Абу-Бакр Мухамед ар-Разі «Усёабдымная кніга па медыцыне» (X ст.); Ібн-Сіна (Авіцэна) «Кніга вылячэння» («Канон урачэбнай навукі») (XI ст.).<br>*Матэматыка*: Аль-Харэзмі зрабіў алгебру самастойнай часткай матэматыкі (IX ст.).<br>*Астраномія*: Абу Рэйхан аль-Біруні разлічыў радыус Зямлі (XI ст.).<br>*Геаграфія*: Ібн Батута аб’ехаў усе мусульманскія краіны і падрабязна апісаў іх (XIV ст.).<br>*Літаратура*: зборнік казак «Тысяча і адна ноч» (X ст.); паэма Фірдаўсі «Шах-намэ» («Кніга цароў») (X–XI стст.); паэма Рудакі «Лейлі і Маджнун» (X ст.); творчасць паэта Амара Хаяма (XI–XII стст.).<br>*Архітэктура*: храм Кааба ў Мецы; мячэць у горадзе Самара (Ірак, IX ст.); мінарэт Кутб-Мінар у Дэлі (XII–XIV стст.); палац Альгамбра ў горадзе Гранада (Паўднёвая Іспанія, XIII–XV стст.); маўзалей Гур-Эмір у Самаркандзе (XV ст.).<br>*Выяўленчае мастацтва*: арабескі — асаблівы від арнамента; мініяцюра — жывапісныя выявы ў ісламскіх сярэднявечных рукапісах.<br>*Каліграфія* — мастацтва прыгожага пісьма. |
| **Індыйская цывілізацыя** | *Матэматыка*: уведзены паняцці сінус і косінус, дзесяцічная сістэма лічэння, якая ўключала нуль.<br>*Астраномія*: Ар’ябхата падлічыў памеры Зямлі і Месяца, а таксама прыблізнае значэнне ліку $\pi$ (VI ст.).<br>*Літаратура*: паэмы і драмы Калідасы (IV–V стст.).<br>*Архітэктура*: будыйскія пячорныя храмы ў Аджанце (I–VII стст.); будыйскія і індуісцкія пячорныя храмы ў Элоры (VI–IX стст.); храмы Каджураха (IX–XIII стст.); храм Сур’і на беразе Бенгальскага заліва (XIII ст.).<br>*Выяўленчае мастацтва*: дробнае бронзавае ліццё (IX–XII стст.); рэльеф «Сыходжанне Гангі» ў Махабаліпураме. |
| **Кітайская цывілізацыя** | *Гістарычная навука*: Лю Чжыцзі «Пранікненне ў гісторыю» (VIII ст.).<br>*Геаграфія*: геаграфічныя апісанні паломнікаў-будыстаў; Сюань Цзан «Падарожжа ў Заходні край» (VII ст.).<br>*Літаратура*: VIII ст. — «залаты век» кітайскай паэзіі (Ван Вэй, Лі Бо, Ду Фу).<br>*Архітэктура*: шматпавярховыя каменныя пагады ў гарадах Кайфэн (VI ст.), Чан’ань (VII ст.).<br>*Выяўленчае мастацтва*: фрэскі ў «Пячоры тысячы будаў» каля горада Дуньхуан (IV ст.); жывапіс па шоўку і паперы.<br>*Каліграфія*.<br>*Тэатр*: тэатр пантамімы. |
| **Японская цывілізацыя** | *Гістарычная навука*: хроніка «Ніхон сёкі» («Японскі летапіс») (VIII ст.).<br>*Літаратура*: зборнік японскіх міфаў і легенд «Кадзікі» («Запісы аб дзеях старажытнасці») (VII–VIII стст.); зборнік вершаў японскіх паэтаў «Ман’ёсю» («Збор мірыяд лістоў») (VIII ст.).<br>*Архітэктура*: будыйскія храмы Хару-дзі (VII ст.), Тосёдай-дзі (VIII ст.), Кінкаку-дзі (XIV ст.), Роан-дзі (XV ст.); сінтаісцкі храм Ісэ-Дзінгу (I ст.); замкі ў гарадах Кіёта і Осака.<br>*Выяўленчае мастацтва*: жывапіс ямата-э (IX–XIV стст.); XIV ст. — стыль сумі-э (манахромная акварэль); манументальная каменная скульптура.<br>*Тэатр*: тэатр Но (акцёры ігралі ў масках і шыкоўных касцюмах). |

*Перавядзіце ў ментальную карту інфармацыю, прадстаўленую ў табліцы. Выберыце тэму, якая вас зацікавіла, і складзіце па ёй прэзентацыю, плакат або інфаграфіку. Выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*У сярэднявечных азіяцкіх грамадствах прыбытак прыносілі зямля і ўраджай з яе. Таму гаспадарчае жыццё грунтавалася на падпарадкаванні або заняволенні сялян для таго, каб іх праца прыносіла пастаянны прыбытак. Правіцелі захоўвалі дэспатычную ўладу і лічыліся ўладальнікамі ўсёй зямлі ў краіне. У аснове сацыяльнай структуры сярэднявечных грамадстваў знаходзіліся ідэі жорсткай сацыяльнай дыферэнцыяцыі. У большасці грамадстваў перайсці ў іншую сацыяльную групу было вельмі складана. У некаторых грамадствах, напрыклад, у індыйскай сістэме кастаў, пераход быў зусім немагчымы.*

**1.** Складзіце воблака слоў з новых паняццяў, якія сустрэліся вам у тэксце параграфа. Пастарайцеся выкарыстаць гэтыя паняцці пры адказе на наступныя пытанні.
**2.** Параўнайце сістэмы землеўладання ў сярэднявечных Кітаі і Японіі. У чым было асноўнае іх адрозненне? Што ў развіцці Японіі адрознівалася ад звычайнай усходняй мадэлі?
**3.** У чым было падабенства грамадскіх адносін у сярэднявечных Японіі і Заходняй Еўропе?
**4.** Прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць, што іслам рэгуляваў сацыяльныя адносіны ў Арабскім халіфаце.
**5.** Якія змены адбыліся ў сацыяльнай структуры Індыі ў перыяд Сярэднявечча ў параўнанні з перыядам старажытнай гісторыі? Наколькі сур'ёзна гэтыя змены закранулі грамадскі лад Індыі?
**6.** Падрыхтуйце ілюстраваны электронны каталог, прысвечаны культурным дасягненням сярэднявечных цывілізацый Азіі.

# § 18. Амерыка і Афрыка ў Сярэднявеччы



*У чым унікальнасць гістарычнага развіцця сярэднявечных цывілізацый Амерыкі і Афрыкі?*

*Якія цывілізацыі склаліся ў Сярэднявеччы ў Амерыцы? Якія дасягненні амерыканскіх цывілізацый былі пераняты еўрапейцамі? Якія дзяржавы існавалі ў Трапічнай Афрыцы? Якімі былі сувязі гэтых дзяржаў з еўрапейцамі і арабамі?* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Геаграфічнае становішча і заняткі насельніцтва амерыканскага кантынента ў Сярэднія вякі.** Цывілізацыі Амерыкі і некаторыя цывілізацыі Афрыкі, плямёны якіх знаходзіліся яшчэ на ўзроўні першабытнага грамадства, былі практычна поўнасцю ізаляваныя ад кантактаў з іншымі цывілізацыямі.

Амерыка — вялікі кантынент, які займае прастору ад самай поўначы да самага поўдня, адпаведна, там змяняюцца ўсе вядомыя геаграфічныя зоны. Народы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

крайняй поўначы Амерыкі займаліся паляваннем і рыбалоўствам. Вялізныя лясныя і стэпавыя прасторы Паўночнай Амерыкі ў той час былі населены пераважна паляўнічымі і жывёлаводамі. Земляробства звычайна адыгрывала другарадную ролю, даючы магчымасць атрымліваць дадатковыя прадукты. Рэдкія плямёны ў гэтай зоне вялі гаспадарку з пераважаннем земляробства.

Поўнач Цэнтральнай Амерыкі ўяўляе сабой засушлівыя тэрыторыі, якія пераходзяць у густыя трапічныя лясы. Горныя раёны выходзяць да прыморскіх раўнін. Народы, якія тут жылі, найбольш рана перайшлі да цывілізацыі і складання дзяржаўных утварэнняў. Земляробства ў розных формах здаўна з'яўлялася тут асновай гаспадарчага жыцця.

На астравах Карыбскага мора і ў джунглях басейна Амазонкі людзі займаліся паляваннем і рыбалоўствам, роля земляробства была другараднай, у той час як на захадзе Паўднёвай Амерыкі ў адносна вузкай паласе паміж акіянам і Андскімі гарамі мясцовае насельніцтва даўно перайшло да земляробчай гаспадаркі. Высокага ўзроўню развіцця дасягнулі і земляробчыя абшчыны на андскіх пласкагор'ях і ў далінах. У Сярэднія вякі тут утвараліся шматлікія дзяржавы.

**Земляробства ў Амерыцы і першыя дзяржавы.**

**N.B.**

У Цэнтральнай Амерыцы на беразе Мексіканскага заліва ў XII ст. да н. э. зарадзіўся першы ачаг развітога земляробства. Яно садзейнічала аселаму ладу жыцця. Многія разрозненыя земляробчыя паселішчы былі аб'яднаны племем альмекаў. Узнікла дзяржаўнае ўтварэнне, пра якое нам вядома толькі па археалагічных раскопках, паколькі пісьменства альмекаў не расшыфравана. Тут жа ўпершыню мы сустракаем збудаванні ў выглядзе пірамід, якія стануць на доўгія стагоддзі асноўнай формай храмаў Цэнтральнай Амерыкі.

У Цэнтральнай Амерыцы не ўзнікла пастаянных і стабільных цэнтраў цывілізацыі. Гэта было звязана з тым, што людзі тут жылі не ў далінах вялікіх рэк, якія дазвалялі весці высокапрадукцыйнае земляробства, а развівалі падсечна-агнявое земляробства ў джунглях. Гэты тып земляробства вызначаўся працазатратнасцю, хуткім спусташэннем зямлі, патрабаваў пастаяннага пашырэння пасеваў, калі колькасць насельніцтва расла. Гэта быў *экстэнсіўны тып земляробства*.

*Як вы разумееце выраз «экстэнсіўны тып земляробства»?*

У асноўным земляробства было матычным, толькі ў найбольш развітых раёнах у дадатак стваралі ірыгацыйныя сістэмы. Іншым разам практыкавалі араанне земляробчых тэрас. Важна зразумець, што земляробства ў Амерыцы развівалася незалежна ад земляробства ў Еўразіі. Важкім доказам гэтаму служыць тое, што ў Еўразіі і ў Амерыцы вырошчваліся зусім розныя культуры і розныя мясцовыя іх сарты. Гэта значыць, чалавек выкарыстоўваў для сваіх патрэб магчымасці мясцовай флоры. У Амерыцы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вырошчвалі кукурузу, бульбу, фасолю, памідоры, тытунь, мясцовыя гатункі перцу, бобу, гарбузоў, пшаніцы, ячменю. Сёння гэтыя расліны здаюцца нам звыклымі, аднак у Сярэднія вякі яны не былі вядомыя еўрапейцам. Амерыканскія цывілізацыі практычна не ведалі жывёлагадоўлі, адзінай свойскай жывёлай у іх была лама. Мясны рацыён быў даволі бедны. Не ведалі жыхары Амерыкі і кола. Прадстаўнікам сярэднявечных амерыканскіх цывілізацый зусім не было вядомае жалеза, але яны ўмелі апрацоўваць золата, серабро, медзь, вырабляць тканіны з бавоўны.




Цывілізацыі Амерыкі ў Сярэднія вякі

**Дзяржавы Цэнтральнай Амерыкі ў Сярэднявеччы.** Каля 200 г. у Цэнтральнай Амерыцы плямёны майя стварылі моцныя гарады-дзяржавы. Да іх адносяцца гарады Чычэн-Іца, Ушмаль, Капан. Яны ніколі не аб'ядноўваліся ў цэласнае дзяржаўнае ўтварэнне, тым не менш на доўгі час усталявалася *гегемонія* (найгалоўнейшае становішча) майя ў рэгіёне.

Майя стваралі гарады з вялікай колькасцю мураваных будынкаў і разгалінаванай сістэмай водазабеспячэння. Развітое матычнае земляробства дазваляла карміць шматлікае насельніцтва. Майя стварылі ўласнае пісьменства і распрацавалі сваю складаную каляндарную сістэму. Гэта ставіць іх у адзін шэраг з вялікімі сусветнымі цывілізацыямі.

Гарады-дзяржавы майя нярэдка вялі паміж сабой жорсткія міжусобныя войны. Часам той ці іншы горад атрымліваў перамогу. Але ніхто так і не здолеў аб'яднаць іх у дзяржаву з адзінай культурай.

**Амерыканскія цывілізацыі ў Сярэднявеччы**

Майя; Ацтэкі; Інкі

**ДАСЯГНЕННІ** (Майя, Ацтэкі, Інкі)
Каляндар,
ступеньчатыя піраміды

Вузялковае пісьмо (Інкі)

**АСАБЛІВАСЦІ** (Майя, Ацтэкі, Інкі)
Не ведалі выплаўкі жалеза,
не было плуга, колавых павозак,
ганчарнага круга


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Піраміда Сонца, Тэатыўакан



Геогліф Наскі

*З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі высвятліце, што называюць геогліфамі Наскі. Раскажыце пра іх аднакласнікам.*

З IX ст. пачаўся заняпад гарадоў-дзяржаў майя. У хуткім часе майя перасталі ўзводзіць новыя мураваныя збудаванні. Вучоныя лічаць, што прычынай заняпаду сталі засухі ў сувязі са змяненнем клімату, якія падарвалі асновы гаспадаркі. Яна цяпер не магла пракарміць вялікую колькасць гарадскіх жыхароў. Аднак невялікія дзяржавы майя працягвалі існаваць яшчэ вельмі доўга.

У сучаснай Цэнтральнай Мексіцы, значна больш на поўнач ад зоны рассялення майя, панаваў адзіны буйны́ горад — Тэатыўакан. У планіроўцы вуліц Тэатыўакана выкарыстоўваліся прамыя вуглы, так што вуліцы ўтваралі кварталы, падобныя да сучасных. Гэты горад лічыцца адным з самых вялікіх гарадоў ва ўсім сярэднявечным свеце. Ён быў цесна звязаны з гарадамі-дзяржавамі майя. Многія гісторыкі лічаць Тэатыўакан перш за ўсё рэлігійным цэнтрам, куды здзяйснялі паломніцтва жыхары ўсёй Цэнтральнай Амерыкі. Тэатыўакан страціў сваю значнасць за некалькі стагоддзяў да страты майя магутнасці.

У пачатку XIV ст. з паўночных стэпаў і пустынь у сучасную Цэнтральную Мексіку прыйшоў ваяўнічы народ ацтэкаў. На берагах і астравах аднаго з вялікіх азёр яны пабудавалі ў 1325 г. сваю сталіцу — горад Тэначтытлан. Больш за сотню гадоў правіцелі ацтэкаў у няспынных войнах падпарадкоўвалі іншыя народы і пашыралі межы сваёй дзяржавы. У выніку ўся тэрыторыя сучаснай Мексікі была імі захоплена, два акіяны сталі граніцамі краіны на захадзе і на ўсходзе. Для кіравання вялізнымі ўладаннямі ацтэкі пабудавалі развітую сістэму дарог, якая давала магчымасць хутка перамяшчацца і пашыраць гандаль.

**N.B.**

Легенда ацтэкаў расказвае, што іх народ вандраваў каля 200 гадоў, каб знайсці ўказанае багамі месца для паселішча. Яны павінны былі ўбачыць арла, які сядзіць на кактусе і раздзірае змяю. Яны сапраўды ўбачылі арла на адным з астравоў на возеры. На гэтым месцы і ўзнік Тэначтытлан. Цяпер возера ўжо асушана, а на яго месцы размяшчаецца сталіца Мексікі — горад Мехіка. Але легенда не забытая: арол адлюстраваны на гербе і сцягу сучаснай Мексікі.



Герб Мексікі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Асноўныя дзяржавы Андскага рэгіёна ў Сярэднявеччы.** Усе дзяржаўныя ўтварэнні ў Паўднёвай Амерыцы ўзніклі ў перадгор'ях Андскага горнага масіву. Гэтая горная града стварыла спрыяльныя ўмовы для гаспадарчай дзейнасці чалавека, адгароджваючы прыбярэжныя тэрыторыі каля Ціхага акіяна ад вільготных джунгляў басейна Амазонкі.

Зараджэнне цывілізацыі ў Паўднёвай Амерыцы пачалося пазней, чым у Цэнтральнай. Каля 900 г. да н. э. узніклі першыя ачагі цывілізацыі на заходніх схілах Андскіх гор.

На ўзбярэжжы сучаснага Перу ў I ст. узнікла дзяржаўнае ўтварэнне народа мочэ. Аб існаванні дзяржавы сведчаць багатыя пахаванні правіцеляў. Былі пабудаваны першыя мураваныя храмы ў выглядзе пірамід у гонар Месяца і Сонца.

На высокіх горных плато на тэрыторыі сучаснай Балівіі ў II ст. таксама ўзнікла вялікая дзяржава, цэнтрам якой стаў горад Тыўанака (3860 м над узроўнем мора). Былі створаны развітыя ірыгацыйныя сістэмы на берагах возера Тытыкака, якія кармілі вялікія гарады. Развядзенне лам давала мяса і воўну. Гандлёвыя шляхі аб'ядналі практычна ўсе рэгіёны нагор'яў і прыбярэжных тэрыторый.

З гэтага часу ў згаданым рэгіёне пастаянна існавалі вялікія дзяржавы, якія варагавалі паміж сабой і змагаліся за ўплыў. У пачатку XIII ст. невялікае племя інкаў заснавала горад Куска ў высакагорнай даліне. З сярэдзіны XV ст. дзяржава інкаў — Таўантынсую — стала самай магутнай імперыяй у Амерыцы. Армія інкаў падначаліла ўсе горныя і прыбярэжныя тэрыторыі. Каменныя дарогі злучылі ўсе часткі дзяржавы, якая распасцерлася практычна па ўсім ціхаакіянскім узбярэжжы Паўднёвай Амерыкі.

**Сацыяльная структура і культурныя дасягненні дзяржаў Амерыкі.** У дзяржавах амерыканскага кантынента былі створаны складаныя сацыяльныя структуры. Правіцелям, якія стаялі на чале дзяржаў, пакланяліся як багам, лічылася, што яны звязвалі грамадства з багамі.

У імперыях ацтэкаў і інкаў усе прывілеі належалі ваенным саслоўям. Ваяўнічыя вярхі грамадства трымалі ў падпарадкаванні шматлікія скораныя народы. Ваенныя заслугі давалі магчымасць заняць высокае становішча ў грамадстве людзям з ніжэйшых сацыяльных груп. Яны атрымлівалі розныя чыноўніцкія пасады. Жыццё ўсяго грамадства кантраляваў разгалінаваны апарат чыноўнікаў.

Ва ўсіх дзяржавах Амерыкі прывілеяванае становішча займалі жрацы. У кожнай дзяржаве пакланяліся вялікай колькасці багоў. Многія з іх уяўляліся жорсткімі і патрабавалі крывавых ахвярапрынашэнняў. Таму багоў баяліся і шанавалі.

Рамеснікі і гандляры адыгрывалі вельмі важную ролю ў жыцці ўсіх сярэднявечных дзяржаў Амерыкі. Напрыклад, у ацтэкаў многія групы гандляроў прыраўноўваліся па сваім становішчы да воінаў. Але асноўнае значэнне ў эканамічным


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

жыцці ў перыяд Сярэднявечча мелі свабодныя абшчыны земляробаў або жывёлаводаў. Гэтыя абшчыны павінны былі плаціць або адпрацоўваць шматлікія падаткі для дзяржавы ці для мясцовай знаці і чыноўнікаў.

Першымі з народаў Цэнтральнай Амерыкі пісьменства вынайшлі альмекі. Аднак знойдзена вельмі мала ўзораў гэтага пісьменства, яны не былі дэшыфраваныя. Пісьменства майя добра вядома даследчыкам, якія лічаць, што яно складалася з іерогліфаў-складоў. Вялікая колькасць знакаў расшыфравана, аднак пісьмо майя тоіць яшчэ шмат загадак. Многія народы Цэнтральнай Амерыкі ўспрынялі пісьменства майя, перапрацаваўшы яго. Ацтэкі прыстасавалі мясцовыя сістэмы пісьма да сваёй мовы і фактычна атрымалі падобны да пісьма майя варыянт пісьменства. Цывілізацыі Паўднёвай Амерыкі не стварылі ўласнай сістэмы пісьма. Затое ў інкаў вядомае так званае вузельчатае пісьмо — кі́пу, у якім паведамленне перадавалася з дапамогай завязаных на вяроўках вузельчыкаў.

Цывілізацыі Амерыкі распрацавалі розныя каляндарныя сістэмы, што сведчыць пра высокі ўзровень развіцця гэтых цывілізацый. Самым развітым апынуўся каляндар майя. Яго дакладнасць і працягласць злічэння ўражваюць нават сучасных вучоных.

**Сярэднявечныя дзяржавы Афрыкі.** На самай поўначы афрыканскага кантынента дзяржаўныя ўтварэнні сталі ўзнікаць яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Найбольш вядомым з'яўляецца Старажытны Егіпет у даліне ракі Ніл. Пазней Рымская імперыя ўключыла ў свае межы ўсё міжземнаморскае ўзбярэжжа Афрыкі, стварыўшы там развітую земляробчую гаспадарку.

Аднак астатняя тэрыторыя Афрыкі была адрэзана шырокай цяжкапраходнай паласой пустыні Сахара. Людзі тут практычна не жылі, акрамя невялікіх качавых плямёнаў, перш за ўсё туарэгаў. Яны выжывалі за кошт жывёлагадоўлі і вырошчвання фінікавай пальмы ў рэдкіх аазісах.

Ва Усходняй Афрыцы на поўдзень ад пустынь яшчэ ў старажытнасці ўтварыліся невялікія раннія дзяржавы. У верхнім цячэнні ракі Ніл у II ст. узнікла дзяржава Аксум. Тут пачало распаўсюджвацца хрысціянства. З XII ст. у горнай мясцовасці сфарміравалася Эфіопская дзяржава, у якой хрысціянства стала афіцыйнай рэлігіяй. Мясцовыя правіцелі здолелі збудаваць вялікае і стабільнае дзяржаўнае ўтварэнне, якое спыніла рух арабаў-мусульман у гэты рэгіён.



Тымбукту — найбуйнейшы горад Малі, заснаваны туарэгамі

Затое мусульманскія гандляры і невялікія ваенныя атрады асвойвалі ўзбярэжжа Усходняй Афрыкі. Адсюль у ісламскія краіны вывозілі розныя тавары. Асабліва месца займаў гандаль захопленымі рабамі. Самае буйное гандлёвае паселішча было заснавана на востраве Занзібар.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На поўдзень ад Сахары размяшчалася паласа саваннаў, дзе насельніцтва займалася жывёлагадоўляй, якая дасягнула даволі высокага ўзроўню развіцця. У Заходняй Афрыцы было некалькі вялікіх рэк, напрыклад, рака Нігер. У іх далінах развівалася земляробства. Раннія дзяржавы тут сталі ўзнікаць досыць позна. Самымі вялікімі былі Гана, Малі і Сангай. У рэгіёне паступова распаўсюджваўся іслам, які пачалі падтрымліваць мясцовыя правіцелі. Цэнтральная Афрыка пакрыта джунглямі, але і тут у Сярэднявеччы з'явіліся першыя дзяржавы, хоць толькі ў XIV–XV стст. Гэта былі Конга, Луба, Лунда. На поўдзень ад трапічных лясоў узнікла ў XII ст. толькі адно вялікае дзяржаўнае ўтварэнне — Манаматапа. Гандлёвыя адносіны з ім усталявалі арабскія гандляры з Занзібара.



Сярэднявечныя дзяржавы Афрыкі

Звычайна на чале дзяржаў Трапічнай Афрыкі знаходзіліся правіцель-манарх і радавая знаць. Манарх меў армію, з дапамогай якой ваяваў з суседнімі плямёнамі і дзяржавамі за кантроль над гандлёвымі шляхамі. У заваяваных вобласці правіцелі звычайна назначалі намеснікаў з военачальнікаў або сваякоў. У час войнаў захоплівалі рабоў, якіх потым прадавалі. Гэта была важная крыніца даходу для правіцеляў.

Асноўная частка насельніцтва займалася земляробствам і жыла абшчынамі. Старэйшыны размяркоўвалі паміж абшчыннікамі зямлю, кіравалі іх працай. Тонкі ўрадлівы пласт глебы выключаў прымяненне плуга ў Трапічнай Афрыцы — зямлю апрацоўвалі матыкамі. Абшчыннікі аддавалі частку ўраджаю і рамесных вырабаў правіцелю або апрацоўвалі яго землі. У абшчынах выкарыстоўвалася праца рабоў з ліку палонных. Аднак рабства мела дамашні характар, нашчадкі рабоў звычайна станавіліся свабоднымі. Афрыканскія рамеснікі займаліся выплаўкай і апрацоўкай металаў, выраблялі тканіны, гліняны посуд, шкляныя рэчы.

*Цывілізацыі Амерыкі і некаторыя цывілізацыі Афрыкі развіваліся ва ўмовах адсутнасці кантактаў з іншымі цывілізацыямі, у тым ліку еўрапейскімі, што абумовіла спецыфіку іх палітычнага, гаспадарчага, культурнага жыцця ў Сярэднія вякі. Пры гэтым яны значна адрозніваліся паміж сабой з прычыны рознасці геаграфічных умоў. Першымі*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*да земляробчай гаспадаркі і дзяржаўнасці прыйшлі народы, якія пражывалі на поўначы Цэнтральнай Амерыкі. Земляробства было пераважна матычным. Альмекі першымі з народаў Цэнтральнай Амерыкі вынайшлі пісьменства, але яно не было расшыфравана, у адрозненне ад пісьменства майя. Моцныя гарады-дзяржавы былі пабудаваны плямёнамі майя. У Цэнтральнай Мексіцы панаваў горад Тэатыўакан. Пазней у гэтым рэгіёне ацтэкі стварылі магутную дзяржаву. У Паўднёвай Амерыцы дзяржавы з'явіліся пазней. Самай моцнай з іх стала дзяржава інкаў.*

1. Чаму ў Цэнтральнай Амерыцы не ўзнікла адзінага цэнтра цывілізацыі?
2. Назавіце адметныя рысы гаспадарчага развіцця амерыканскіх цывілізацый.
3. Назавіце найбольш буйныя дзяржаўныя ўтварэнні ў Амерыцы. Якія характэрныя для іх асаблівасці вы можаце прывесці?
4. З апорай на картасхему на с. 157 раскажыце пра цывілізацыі Амерыкі. У чым была своеасаблівасць іх развіцця?
5. Якія дзяржавы існавалі ў Трапічнай Афрыцы? Як адбывалася ўзаемадзеянне афрыканскіх дзяржаў з еўрапейскай і арабскай цывілізацыямі?
6. Раскажыце пра грамадскія адносіны ў сярэднявечных цывілізацыях Трапічнай Афрыкі і Амерыкі.
7. Абмяркуйце ў класе, у чым непаўторнасць гістарычнага развіцця цывілізацый Трапічнай Афрыкі і Амерыкі.

## Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела II

1. Назавіце і ахарактарызуйце храналагічныя рамкі гісторыі Сярэдніх вякоў. Пералічыце найбольш вялікія дзяржавы таго часу, пакажыце іх на карце, супастаўце час іх існавання з перыядамі Сярэднявечча.
2. Размяркуйце прадстаўленыя паняцці і тэрміны па групах. Крытэрыі для групавання вызначце самастойна. Складзіце расказ пра перыяд Сярэднявечча, выкарыстоўваючы словы адной з груп або ўсіх груп. Складзіце сваё «воблака слоў», уключыўшы ў яго неабходныя з вашага пункту гледжання паняцці для найбольш дакладнай характарыстыкі перыяду.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Складзіце ў сшытку схему (ментальную карту, гекс) «Формы кіравання ў перыяд Сярэднявечча», адлюстраваўшы ў ёй асаблівасці дзяржаўнага ладу еўрапейскіх краін, славянскіх дзяржаў, краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі.
**4.** Ахарактарызуйце развіццё адной з дзяржаў эпохі Сярэднявечча ў адпаведнасці з планам: а) палітыка, б) сацыяльна-эканамічнае развіццё, в) культура.
**5.** Выдзеліце і згрупуйце характэрныя рысы гісторыі Сярэднявечча.
**6.** Прачытайце ўрывак з твора візантыйскага імператара Маўрыкія Стратэга (канец VI ст.) і выканайце заданні.

*Плямёны славян і антаў падобныя сваім ладам жыцця, сваім норавам, сваім імкненнем да свабоды; іх ніякім чынам нельга схіліць да рабства або падпарадкавання ў сваёй краіне. Яны шматлікія, вынослівыя, лёгка трываюць гарачыню, холад, дождж, галізну, недахоп ежы. Да прыбылых да іх іншаземцаў яны ставяцца ласкава і аказваючы ім знакі сваёй прыхільнасці [пры пераходзе іх] з аднаго месца ў іншае, ахоўваючы іх у выпадку неабходнасці... Тых, хто знаходзіцца ў іх у палоне, яны не трымаюць у рабстве, як іншыя плямёны, на працягу неабмежаванага часу, але, абмяжоўваючы [тэрмін рабства] пэўным часам і [робячы] вядомым выкуп, прапануюць ім на выбар: ці жадаюць яны вярнуцца да сябе дадому або застацца... на становішчы свабодных і сяброў?*

*Яны селяцца ў лясах, каля цяжкапраходных рэк, балот і азёр, робяць у сваім жыллі шмат выхадаў з-за магчымасці надыходу... небяспекі.*

*Змагацца са сваімі ворагамі яны любяць у месцах, густа парослых лесам, у цяснінах, на стромах; з выгадай для сябе карыстаюцца [засадамі], раптоўнымі атакамі, хітрыкамі...*

*Мужна вытрымліваюць яны знаходжанне ў вадзе... Пры гэтым яны трымаюць у роце спецыяльна апрацаваныя вялікія выдзеўбаныя ўнутры чараціны, што даходзяць да паверхні вады... дыхаючы з іх дапамогай... Кожны ўзброены дзвюма невялікімі дзідамі, некаторыя маюць таксама шчыты... Яны карыстаюцца таксама драўлянымі лукамі і невялікімі стрэламі, намочанымі асаблівай для стрэл атрутай...*

1. На якія звычаі славян звяртае ўвагу аўтар? Пералічыце іх. Як яны характарызуюць славян? 2. Растлумачце, чаму аўтара цікавяць менавіта тыя рысы жыцця славян, якія ён апісаў. 3. Вызначце, якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі: а) усходнія славяне першыя засялілі Усходнюю Еўропу; б) усходнія славяне падпарадкавалі ўсе плямёны, якія пражывалі на тэрыторыі Усходняй Еўропы; в) славяне і мясцовыя плямёны аказвалі ўзаемны ўплыў адно на аднаго; г) некаторыя славянскія багі мелі іранскія імёны. Растлумачце свой адказ.

**7.** Вызначце падабенствы дзяржаў і грамадства на Захадзе і Усходзе.
**8.** Складзіце спіс адрозненняў цывілізацый Усходу ад дзяржаў сярэднявечнай Заходняй Еўропы.
**9.** Якія з'явы ў жыцці сярэднявечных грамадстваў сведчылі аб культурным развіцці цывілізацый Захаду і Усходу?
**10.** Якія з дасягненняў Сярэднявечча дагэтуль маюць значэнне ў палітыцы, эканамічным жыцці, навуцы і культуры?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**11.** Вывучыце гістарычную крыніцу. Адкажыце на пытанні і выканайце заданні да яе.

***Нататкі янычара, XV ст.***

*Парадак і кіраванне ў Турэцкай зямлі найперш грунтуюцца на тым, што султан усе замкі ва ўсіх сваіх землях, заняўшы іх янычарамі або сваімі выхаванцамі, моцна трымае ў сваёй руцэ, ніякага замка ніводнаму з вяльможаў не аддаючы; і той горад, які мае ўмацаванні і замак у ім, султан, заняўшы сваімі людзьмі, таксама трымае сам.*

*Калі здараецца, што яны [туркі] уварвуцца ў якую-небудзь зямлю і захопяць палонных, то султанскі пісар ідзе следам за імі, і колькі ёсць хлопчыкаў, усіх іх ён бярэ ў янычары і за кожнага дае пяць залатых, а іх пасылаюць за мора.*

*...Хрысціян туркі называюць гяуры, і султан ведае колькасць усіх, хто знаходзіцца пад уладай туркаў, і колькі іх у кожнай зямлі. Султану плацяць даніну кожны год з кожнай хрысціянскай галавы 40 аспараў, што складае адзін залаты; за год султан атрымлівае гэтай даніны некалькі соцень тысяч. А калі хто можа зарабіць грошы, той дае [султану] яшчэ адзін залаты ў год, выключаючы дзяцей і жанчын; і ўсё гэта, не ўлічваючы іншых даходаў, якія паступаюць да яго [султана] у яго казну з мора, з зямлі і з сярэбраных гор. Хрысціяне ж даюць сваім панам, пад якімі яны знаходзяцца і якіх называюць тымарэрлер, палову султанскай даніны і да таго ж з дзясятак галоў усякай жывёлы або зерне. Работы ж ніякай яны ні на султана, ні на свайго пана не выконваюць і не паступаюць на службу. Хрысціяне, якія знаходзяцца пад уладай султана, павінны паставіць дзясяткі тысяч уючных жывёл або коней, правіянт, аддаючы гэта сваімі рукамі, пасля чаго над імі валадараць па справядлівасці, не чынячы ім шкоды. Пад такім вось кіраваннем усе жывуць.*

1. Выпішыце з тэксту дакумента ўсе незнаёмыя словы і дайце ім тлумачэнне. 2. Пра якую катэгорыю насельніцтва Асманскай імперыі ідзе гаворка ў дакуменце? 3. Якім было становішча названага насельніцтва ў Асманскай імперыі? Якія павіннасці яно несла і чаму? 4. З якой мэтай у армію турэцкага султана забіралі юнакоў з хрысціянскіх сем'яў? Чаму султан лічыў, што яны будуць адданыя яму?

**12.** Назавіце выдатных дзеячаў Сярэднявечча, якія лічацца знакавымі фігурамі: а) палітыкі; б) навукі; в) культуры. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі падрыхтуйце прэзентацыю пра аднаго з іх і прадстаўце яе класу ў выглядзе аўтабіяграфіі, буклета, рэзюмэ, флаера, інфаграфікі, водгуку сучасніка і г. д. (выберыце адзін прыдатны для вас варыянт).

**13.** Падрыхтуйце для аднакласнікаў віртуальную экскурсію па адным з сярэднявечных гарадоў Еўропы, Азіі, Афрыкі або Амерыкі. Прадстаўце сваю работу ў любым зручным для вас фармаце.

**14.** Падрыхтуйце апісанне аднаго з сабораў, пабудаваных у раманскім або гатычным стылі і захаваных да нашых дзён, раскажыце пра яго гісторыю. Прадстаўце сваю работу ў любым зручным для вас фармаце.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Раздзел III

# ЛЯ ВЫТОКАЎ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

***Вы навучыцеся:***

*• арыентавацца ў сучаснай эпосе ў выніку разумення механізму ўзнікнення сучаснай заходняй цывілізацыі і яе ўзаемадзеяння з навакольным светам;*

*• аналізаваць прычыны сучасных міждзяржаўных і міжцывілізацыйных канфліктаў на аснове ведаў аб канфліктах, што ўзніклі ў перыяд пераходу ад традыцыйнага аграрнага грамадства да індустрыяльнага.*

**Гісторыка-культурныя сімвалы геаграфічных адкрыццяў і асваення чалавекам новай прасторы (помнікі першаадкрывальнікам, землепраходцам і мараходам).**
**Каталіцтва і пратэстантызм: падобныя і адметныя рысы.**
**Партрэт дзеяча эпохі Асветніцтва (на выбар).**
**Эпоха Адраджэння: асноўныя ідэі і дасягненні.**
**Культура краін Еўропы XVII–XVIII стст.: асноўныя стылі і кірункі, творцы, дасягненні.**
**Палітычныя і эканамічныя перадумовы ўсталявання панавання еўрапейскіх дзяржаў у свеце.**
**Партрэт дзеяча эпохі рэвалюцый (на выбар).**
**Гістарычны жывапіс Новага часу.**


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Храналогія ранняга Новага часу

| | |
|---|---|
| 1479 г. | Аб’яднанне Кастыліі і Арагона ў Каралеўства Іспанія |
| 1480 г. | «Стаянне на Угры» — ліквідацыя залежнасці Маскоўскай Русі ад Арды |
| 1488 г. | Адкрыццё мыса Добрай Надзеі |
| 1492 г. | Адкрыццё Амерыкі Х. Калумбам |
| 1494 г. | Заключэнне Тардэсільяскага дагавора |
| 1498 г. | Адкрыццё шляху ў Індыю В. да Гама |
| 1517 г. | Апублікаванне «95 тэзісаў» М. Лютэра. Пачатак Рэфармацыі |
| 1519 г. | Заваяванне іспанскім канкістадорам Э. Картэсам імперыі ацтэкаў.<br>Завяршэнне Рафаэлем карціны «Сікстынская мадонна» |
| 1519–1522 гг. | Першае кругасветнае плаванне экспедыцыі Ф. Магелана |
| 1524–1525 гг. | Сялянская вайна ў Германіі |
| 1532–1536 гг. | Заваяванне канкістадорам Ф. Пісара імперыі інкаў |
| 1534 г. | Царкоўная Рэфармацыя ў Англіі. Узнікненне англіканскай царквы |
| 1534 г. | Французская экспедыцыя Ж. Карцье дасягнула вусця ракі Св. Лаўрэнція |
| 1536 г. | Пачатак рэфармацыйных пропаведзяў Ж. Кальвіна ў Швейцарыі |
| 1540 г. | Заснаванне каталіцкага духоўнага ордэна «сяброў Ісуса» (езуітаў) |
| 1543 г. | Выданне кнігі М. Каперніка аб вярчэнні Зямлі вакол Сонца.<br>Адкрыццё партугальцамі шляху ў Японію |
| 1547 г. | Вянчанне Івана IV (Грознага) на царства |
| 1558–1583 гг. | Лівонская вайна |
| 1560 г. | Пачатак рэлігійных войнаў паміж католікамі і пратэстантамі ў Францыі |
| 1566–1609 гг. | Буржуазная рэвалюцыя ў Нідэрландах |
| 1569 г. | Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай |
| 24 жніўня. 1572 г. | Варфаламееўская ноч у Францыі |
| 1579 г. | Утварэнне Галандыі. Утварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі |
| 1588 г. | Зацвярджэнне 3-га Статута ВКЛ |
| 1598 г. | Нанцкі эдыкт |
| 1599 г. | Першыя пастаноўкі п’ес У. Шэкспіра ў лонданскім тэатры «Глобус» |
| 1607 г. | Заснаванне англійскімі пратэстантамі першай калоніі ў Вірджыніі |
| 1608 г. | Заснаванне Квебека як фарпоста французскіх уладанняў у Канадзе |
| 1618–1648 гг. | Трыццацігадовая вайна ў Еўропе |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| 1620 г. | Першая група англійскіх пратэстантаў высадзілася ў Новым Плімуце |
| 1639 г. | Забарона еўрапейцам (акрамя галандцаў) наведваць Японію |
| 1640–1660 гг. | Англійская рэвалюцыя |
| 1643–1715 гг. | Кіраванне ў Францыі «караля-сонца» Людовіка XIV |
| 1649 г. | Пакаранне смерцю Карла I. Абвяшчэнне Англіі рэспублікай.<br>Прыняцце Сабορнага ўлажэння пры цары Аляксею Міхайлавічу Цішайшым |
| 1648 г. | Пачатак нацыянальна-вызваленчай казацкай вайны ва Украіне |
| 1653–1658 гг. | Пратэктарат Олівера Кромвеля ў Англіі |
| 1654 г. | Пераяслаўская рада |
| 1655–1660 гг. | Паўночная вайна паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай |
| 1666 г. | Заснаванне Акадэміі навук у Парыжы |
| 1688–1689 гг. | «Слаўная рэвалюцыя» ў Англіі |

Выкарыстоўваючы вучэбны матэрыял 7-га класа і схему, ахарактарызуйце першы перыяд гісторыі Новага часу. Складзіце разгорнуты план свайго адказу.




Запоўніце ў сшытку табліцу, запісаўшы ў яе па 3–4 найбольш важныя падзеі першага перыяду гісторыі Новага часу. Растлумачце свой выбар.

| **Новыя грамадска-палітычныя погляды еўрапейцаў** | **Станаўленне новых палітычных рэжымаў у Еўропе і свеце** | **Дасягненні навукі і культуры** |
|---|---|---|
| | | |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Тэма 1. ЗАХОДНІ СВЕТ У XVI–XVIII стст.

## § 19. Новы час як асаблівы перыяд сусветнай гісторыі



*Чаму Новы час названы гісторыкамі «новым»? Якія змяненні адбыліся ў гэты час у заходнім свеце і з чым яны былі звязаны?*

*Якія працэсы адбываліся ў феадальным грамадстве Еўропы канца эпохі Сярэдневечча? Якія краіны Еўропы ўзмацніліся да канца Сярэдневечча і чаму? Якая была роля чалавека ў грамадстве і свеце паводле ўяўленняў гуманістаў?* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас)

**Новы час і яго перыядызацыя.** ***Новы час*** — асаблівы перыяд сусветнай гісторыі. Гэта паняцце ўзнікла ў эпоху Адраджэння ў асяроддзі італьянскіх гуманістаў. Росквіт навукі і мастацтва яны пачалі называць Новым часам. Сярод іх таксама афармілася ўяўленне аб тым, што развіццё грамадства мае агульнасусветны характар. Гуманісты падзялілі гісторыю чалавецтва на старажытную, сярэднюю і новую. Гэты падзел пакладзены ў аснову і сучаснай перыядызацыі.

Гісторыя Новага часу пачынае адлік з XVI ст. і заканчваецца пачаткам XX ст. Гэтую эпоху прынята падзяляць на два вялікія перыяды. Першы пачынаецца эпохай Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і завяршаецца Вялікай французскай рэвалюцыяй канца XVIII ст. Другі перыяд ахоплівае XIX і пачатак XX ст. Рубежнай падзеяй Новага і Навейшага часу з'яўляецца Першая сусветная вайна 1914–1918 гг.




Існуюць і іншыя погляды на храналагічныя рамкі Новага часу. У якасці зыходнага пункту эпохі некаторыя даследчыкі разглядаюць адкрыццё Амерыкі ў 1492 г. і нават падзенне Канстанцінопаля ў 1453 г. Нямецкі філосаф XIX ст. Г. В. Ф. Гегель цэнтральнай падзеяй Новага часу лічыў Вялікую французскую рэвалюцыю канца XVIII ст., а пазней — нямецкую Рэфармацыю. Апошняя, на яго думку, пашырыла ўнутраную волю чалавека ў процівагу татальнаму панаванню каталіцкай царквы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Перыядызацыя гісторыі Новага часу

над свядомасцю чалавека Сярэднявечча. Карл Маркс і яго паслядоўнікі звязвалі адлік Новага часу з пачаткам Англійскай рэвалюцыі — важнай для ўсёй Еўропы падзеяй, якая азнаменавала ўсталяванне капіталістычных адносін. Канец Новага часу марксісты бачылі ў перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

*Які пункт адліку Новага часу, на ваш погляд, найбольш слушны? Абгрунтуйце свой адказ.*

| | |
|---|---|
| Эканамічныя адносіны | • пераход да капіталістычных адносін;<br>• фарміраванне новых гандлёвых шляхоў і рынкаў збыту;<br>• пачатак станаўлення агульнасусветнага гандлёвага рынку |
| Дзяржаўная ўлада | • станаўленне абсалютызму і далейшая барацьба з ім;<br>• з'яўленне ў ходзе рэвалюцый буржуазных рэспублік |
| Сусветная палітыка | • станаўленне нацыянальных дзяржаў;<br>• нацыянальныя інтарэсы дзяржаў сталі дамінаваць у сусветнай палітыцы |
| Узаемадзеянне цывілізацый | • Вялікія геаграфічныя адкрыцці, геаграфічнае вывучэнне свету;<br>• дамінаванне еўрапейскай цывілізацыі |
| Чалавек Новага часу | • пераацэнка каштоўнасцяў у духоўным і культурным жыцці людзей;<br>• гуманізм, секулярызацыя жыцця грамадства |

Змены ў жыцці еўрапейскага грамадства

*Прывядзіце прыклады гістарычных падзей, якія ілюструюць гэтыя змены.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Новы час стаў перыядам грандыёзнай трансфармацыі ва ўсіх сферах жыцця не толькі еўрапейскага грамадства, але і астатняга свету.

**Вытокі Новага часу.** Што ж стала зыходным пунктам змен, якія адбыліся ў Новы час? Іх вытокі трэба шукаць перш за ўсё ў эпосе Адраджэння, калі ў Еўропе атрымалі распаўсюджанне ідэі гуманізму і антрапацэнтрызму. Адбылося не проста адраджэнне цікавасці да антычнай спадчыны ў культуры. Была праведзена глабальная філасофская пераацэнка месца чалавека ў свеце. Новы погляд на навакольную рэальнасць прывёў да станаўлення свецкай навукі і культуры.

Вытокі Новага часу звязаны таксама з Рэфармацыяй (XVI — пачатак XVII ст.) у Еўропе. Гэты перыяд азнаменаваўся падзеннем аўтарытэту каталіцкай царквы, якая падтрымлівала феадальную сістэму адносін, і з'яўленнем новых пратэстанцкіх цэркваў. Спроба царквы ў саюзе з дынастыяй Габсбургаў адстаяць свае пазіцыі, вядомая як Контррэфармацыя, прывяла да рэлігійных войнаў у Еўропе ў XVI–XVII стст. Вестфальскі мір 1648 г. паклаў канец палітычнай магутнасці папскага прастола і даў пачатак новай сістэме міжнародных адносін. У яе аснове знаходзілася ідэя дзяржаўнага суверэнітэту. А дзяржава да гэтага часу стала ўсведамляцца як палітычны адбітак нацыі — нацыянальная дзяржава.

Новы перыяд гісторыі быў неаддзельны ад Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, якія пашырылі еўрапейскія гарызонты. Адбывалася збліжэнне краін і народаў. Адваротным бокам гэтага з'яўлялася пачатая яшчэ ў XV ст. еўрапейская каланіяльная экспансія. Так Еўропа стала ўсталёўваць сваё панаванне над светам.

Спачатку феадальная, а затым і капіталістычная Еўропа ажыццяўляла захоп чужых тэрыторый, рабавала і вынішчала карэннае насельніцтва Амерыкі, Азіі і Афрыкі. Нават некалі магутныя краіны Усходу ператварыліся ў калоніі і напаўкалоніі еўрапейскіх дзяржаў. Адна цывілізацыя паступова распаўсюдзіла свой уплыў на іншыя дзяржавы свету.

**Палітычная карта Еўропы ў XVI ст.** Да пачатку XVI ст. межы еўрапейскіх дзяржаў заставаліся слаба акрэсленымі, а ідэя нацыянальнай дзяржавы яшчэ не набыла шырокай падтрымкі. Еўрапейскія правіцелі часта ставілі свае дынастычныя выгады вышэй за інтарэсы нацыі. Аднак з узмацненнем каралеўскай улады і цэнтралізацыяй дзяржаўнага кіравання манархі Еўропы ўсё часцей сталі кіравацца нацыянальнымі інтарэсамі.

У пачатку Новага часу найбольш развітымі краінамі былі імперыя Габсбургаў (уключаючы Іспанію), Партугалія, Вялікабрытанія, Францыя, Нідэрланды. Аднак не ўсе дзяржавы змаглі захаваць эканамічную магутнасць і высокае становішча на міжнароднай палітычнай арэне.

Іспанія і Партугалія раней за ўсіх заняліся захопам новых зямель і першымі стварылі каланіяльныя ўладанні. Паступова па шэрагу прычын іх эканомікі пераcталі быць канкурэнтаздольнымі. А вось Галандыя, Англія і Францыя пачалі актыўна ўкараняць новыя капіталістычныя метады ў вытворчасць. Землі, якія ім


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Еўропа ў першай палове XVI ст.

дасталіся, не вызначаліся багаццем. Аднак дзякуючы бурнаму развіццю капіталізму яны імкліва вырваліся наперад па ўзроўні эканамічнага развіцця. Гэтыя дзяржавы падключыліся да каланіяльнай гонкі крыху пазней.

Адным з самых магутных каралеўскіх дамоў Еўропы ў пачатку XVI ст. была дынастыя Габсбургаў. Дзякуючы разумнай палітыцы папярэднікаў Карл V Габсбург сканцэнтраваў у сваіх руках землі Аўстрыі, Германіі, Іспанскіх Нідэрландаў, часткова Італіі і Францыі. Кіраванне аўстрыйскімі землямі ён даручыў свайму брату Фердынанду І. Пагроза турэцкага заваявання садзейнічала далучэнню да аўстрыйскіх зямель Венгрыі і Чэхіі ў 1526 г. З гэтага часу ў Еўропе ўтварыліся дзве галіны Габсбургаў: аўстрыйская, якая складалася з нашчадкаў Фердынанда, і іспанская, што паходзіла ад Карла V. Габсбургі выступалі ў абарону каталіцызму супраць


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пратэстантызму, які набіраў моц, праводзілі антыфранцузскую палітыку і баранілі Еўропу ад Асманскай імперыі. Магутнасць іспанскіх Габсбургаў была падарваная Трыццацігадовай вайной і Нідэрландскай рэвалюцыяй. Яны страцілі італьянскія і германскія землі, хоць і захоўвалі свой уплыў на іх. Так Іспанія ператварылася ў другарадную дзяржаву Еўропы. Аўстрыйскія ж Габсбургі здолелі захаваць свой уплыў яшчэ на некалькі стагоддзяў. Аднак іх сілы траціліся на падтрыманне адзінства шматнацыянальнай дзяржавы і на адбіццё турэцкай пагрозы.

У адрозненне ад Іспаніі і Партугаліі, у Англіі, Галандыі і ў меншай ступені ў Францыі набірала тэмп капіталістычная вытворчасць. У Англіі і Францыі гэты працэс быў звязаны з узмацненнем улады манарха, а ў Галандыі — з атрыманнем незалежнасці ў выніку Нідэрландскай рэвалюцыі.

У Англіі заснавальнік дынастыі Цюдораў (з 1485 г.) Генрых VII пры падтрымцы шырокіх слаёў насельніцтва і парламента жорстка расправіўся з буйны́мі феадаламі і канфіскаваў іх землі. Палітыку цэнтралізацыі дзяржавы працягвалі і яго пераемнікі. Падпарадкаванне царквы дзяржаве пры Генрыху VIII таксама садзейнічала ўмацаванню ўлады караля. Магутнасць англійскай кароны дасягнула росквіту ў час кіравання Лізаветы I (1558—1603). Менавіта ў гэты перыяд Англія разгарнула сваю гандлёвую экспансію на Блізкі Усход, у Індыю, Новы свет і стала адной з сусветна вядомых дзяржаў.

Да пачатку XVI ст. практычна завяршыўся працэс тэрытарыяльнага аб'яднання Францыі. Улада французскіх манархаў, якія абапіраліся на вялікую армію і бюракратычны апарат, умацавалася. Францыя стала самай вялікай па тэрыторыі і колькасці насельніцтва (15 млн чал.) цэнтралізаванай нацыянальнай дзяржавай Еўропы.

Пасля вызвалення ад іспанскага ўціску маленькая Галандыя стала ў XVI ст. адной з вядучых дзяржаў Еўропы. Шэраг фактараў садзейнічаў яе ператварэнню ў развітую дзяржаву з шырокімі каланіяльнымі ўладаннямі. Да іх ліку адносіліся неразвітасць феадальных адносін, а таксама наяўнасць вялікіх гандлёвых гарадоў, такіх як Амстэрдам і Антверпен, дзе актыўна развіваліся таварна-грашовыя адносіны.

*Растлумачце, як гэтыя фактары ўплывалі на ператварэнне Галандыі ў развітую дзяржаву з каланіяльнымі ўладаннямі.*

Асаблівае месца на карце Еўропы займала Італія. У эпоху Сярэднявечча многія італьянскія гарады сталі гарадамі-рэспублікамі, на чале якіх стаялі незалежныя правіцелі. Самымі буйны́мі з іх былі Венецыя, Мілан, Фларэнцыя, Неапалітанскае каралеўства і Папская вобласць. Італьянскія гарады-дзяржавы багацелі дзякуючы паспяховаму гандлю і развіццю мануфактурнай вытворчасці. Купцы з Венецыі і Генуі кантралявалі гандаль ва Усходнім Міжземнамор'і.

Аднак у пачатку XVI ст. у гэтым рэгіёне пачаўся прыкметны спад вытворчасці. Ён быў звязаны з перамяшчэннем асноўных гандлёвых шляхоў з Міжземнага мора ў Атлантычны, Ціхі і Індыйскі акіяны. Так была падарвана манаполія італьянскіх


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

купцоў на міжнародны гандаль. Яны арыентаваліся пераважна на еўрапейскі рынак і не змаглі канкурыраваць з суконнымі мануфактурамі Англіі і Францыі, што набіралі тэмпы. Італьяскія банкіры таксама былі выцеснены з большасці еўрапейскіх краін. Палітычная раздробленасць Італіі зрабіла яе лёгкай здабычай для ўплывовых еўрапейскіх дзяржаў.

Як паказала гісторыя, захаваць высокае становішча ў Еўропе змаглі дзяржавы, у якіх развіццё капіталістычных адносін абапіралася на моцную дзяржаўную ўладу. У некаторых жа краінах апорай капіталізму сталі ўтвораныя ў выніку буржуазных рэвалюцый рэспублікі.

**Зараджэнне індустрыяльнай цывілізацыі.** У Заходняй Еўропе ўзнік унікальны грамадскі лад — капіталізм, які нярэдка называюць еўрапейскім цудам. Менавіта пры капіталізме атрымала развіццё дэмакратычная форма кіравання, ішло станаўленне індустрыяльнай сістэмы прадукцыйных сіл, класавага грамадства і вядучых яго класаў — буржуазіі і пралетарыяту. Дзякуючы ваеннай і тэхнічнай перавазе Еўропа стала гаспадыняй свету, падначаліўшы сабе развітыя цывілізацыі Азіі. У гэтым заключана вялікая тайна Захаду (Заходняя Еўропа і пазней Паўночная Амерыка): нідзе за межамі Заходняй Еўропы не адбылося самастойнага і натуральнага ўзнікнення капіталізму.

Навуковыя, прамысловыя і сацыяльныя рэвалюцыі непазнавальна змянілі аблічча Еўропы. У выніку ўзнік тып дынамічнай цывілізацыі, што рэзка адрознівалася ад традыцыйных цывілізацый Азіі і Афрыкі. Прамысловая рэвалюцыя, якая пачалася ў Англіі ў другой палове XVIII ст., і працэс мадэрнізацыі шмат у чым вызначылі характар індустрыяльнай цывілізацыі, заснаванай на капіталістычных адносінах.

**Перадумовы пераходу да індустрыяльнай цывілізацыі:**

- Адраджэнне, якое паставіла чалавека ў цэнтр Сусвету (антрапацэнтрызм);
- Вялікія геаграфічныя адкрыцці, якія прывялі да пашырэння межаў вядомага свету, з'яўлення новых гандлёвых шляхоў, рынкаў і калоній;
- Рэфармацыя, што папярэднічала станаўленню новай этычнай сістэмы, у якой крытэрыем каштоўнасці стала выступаць працавітасць;
- прамысловая рэвалюцыя, якая завяршылася станаўленнем фабрычнай сістэмы ў прамысловасці, безумоўнай перавагай прамысловай вытворчасці над сельскай гаспадаркай і з'яўленнем новых класаў — пралетарыяту і буржуазіі.

*Растлумачце, якім чынам названыя перадумовы садзейнічалі пераходу да індустрыялізацыі.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Характарыстыка аграрнага і індустрыяльнага грамадства**

| Традыцыйнае (аграрнае) грамадства | Індустрыяльнае грамадства |
|---|---|
| Раўнавага, стабільнасць грамадства («закрытае грамадства» з наяўнасцю строгай сацыяльнай структуры грамадскіх сувязяў) | Укараненне ў вытворчасць машыннай тэхнікі |
| Дзейнічае закон існавання традыцыйнага грамадства: не прагрэс, а самаўзнаўленне існага | Умацаванне дэмакратычных правоў і свабод, рост дабрабыту грамадства |
| Развіццё грамадства маруднае, эвалюцыйнае, у эканоміцы асноўнымі выступаюць аграрныя адносіны | Урбанізацыя і навукова-тэхнічны прагрэс |

*Дапоўніце табліцу неабходнымі характарыстыкамі. Параўнайце два тыпы грамадства. Складзіце сінквейн пра кожны з іх. Якую выснову можна зрабіць на падставе параўнання?*

*Новы час — гэта перыяд фарміравання новых сацыяльных адносін, палітычных інстытутаў, духоўных каштоўнасцяў на аснове ідэі сацыяльнай роўнасці людзей, фарміравання капіталістычных адносін у эканоміцы з ідэяй недатыкальнасці прыватнай уласнасці.*

**1.** Якія існуюць погляды на храналагічныя рамкі Новага часу?
**2.** Назавіце асноўныя падзеі, якія далі пачатак зменам ва ўсіх сферах жыцця грамадства ў Новы час.
**3.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Палітычная карта Еўропы ў XVI ст.», пры неабходнасці выкарыстайце карту і дадатковыя крыніцы інфармацыі.

| Краіна | Тэрытарыяльныя ўладанні ў Еўропе |
|---|---|
| Іспанія | |
| Аўстрыя | |
| Галандыя | |
| Францыя | |
| Англія | |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** З якімі працэсамі было звязана развіццё капіталістычнай вытворчасці ў Англіі, Галандыі і Францыі?
**5.** Дайце азначэнне паняццю «Новы час» як эпосе палітычных, эканамічных, сацыяльных і тэхналагічных змен.
**6.** Прачытайце пункты 1–2.3 у артыкуле пра Новы час у свабоднай энцыклапедыі «Вікіпедыя». Параўнайце характарыстыкі гісторыі Новага часу, прыведзеныя ў вучэбным дапаможніку і ў «Вікіпедыі». Ці супадаюць гэтыя характарыстыкі? Як вы думаеце, ці можна выкарыстоўваць інфармацыю, прыведзеную ў свабоднай энцыклапедыі, без іншых крыніц? Чаму?
**7.** Выкарыстоўваючы інфармацыю на с. 166–174 гэтага вучэбнага дапаможніка і згадаўшы вывучанае раней, ахарактарызуйце першы перыяд гісторыі Новага часу. Падрыхтуйце візітную картку гэтага гістарычнага перыяду.

# § 20. Зараджэнне капіталізму

*Якія краіны Еўропы і чаму апынуліся лідарамі ў развіцці капіталізму?*



*Як праявіўся крызіс феадальных адносін у Еўропе канца эпохі Сярэднявечча? Якія змены адбыліся ў адносінах да асабістай і пазямельнай залежнасці? Якія прагрэсіўныя змяненні адбываліся ў сельскай гаспадарцы заходнееўрапейскіх краін? Чаму гэтыя пераўтварэнні ажыццяўляліся павольна? Назавіце прыкметы капіталізму.* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас; Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Вытокі капіталізму.** Што ж паслужыла штуршком да станаўлення новага эканамічнага ўкладу — капіталістычнага? Даследчыкі не маюць па гэтым пытанні адзінай думкі. Марксісты звяртаюць увагу на эканоміку, у прыватнасці на змяненне тыпу вытворчасці. Адбыўся пераход ад феадальнага спосабу вытворчасці, заснаванага на ручной сялянскай працы, да капіталістычнай гаспадаркі з машыннай вытворчасцю. Тэхналагічныя вынаходствы XV–XVI стст. у Еўропе, удасканаленне прылад працы, рост унутранага рынку прывялі да таго, што горад усё больш меў патрэбу ў прадукцыі сельскай гаспадаркі. Дробныя сялянскія гаспадаркі феадальнага тыпу ўжо не маглі задаволіць попыт, які ўзрастаў.

Іншыя даследчыкі лічаць, што значныя змены адбыліся ў свядомасці еўрапейцаў у сувязі з Рэфармацыяй. Бо рэфарматары заклікалі да гандлёвай і эканамічнай актыўнасці.

Ёсць і тыя, хто бачыць штуршок да развіцця капіталістычных адносін у знешніх фактарах. Страшная эпідэмія чумы (якую называлі «чорнай смерцю») у XIV ст. стварыла попыт на наёмную працоўную сілу ў еўрапейскай вёсцы. Гэта садзейнічала ломцы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

феадальнай сістэмы, што існавала. Падзенне ж Канстанцінопаля ў 1453 г. і, як вынік, перакрыццё туркамі гандлёвых шляхоў у Азію, заняпад гандлю італьянскіх гарадоў з Усходам прывялі Еўропу да гандлёвага крызісу. Еўрапейцы мелі патрэбу ў новых рынках і золаце, бо без гэтага складана было развіваць эканоміку. Яны вымушаны былі шукаць новыя шляхі ў заморскія краіны, што стала прычынай Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, каланіяльнай экспансіі, а таксама фарміравання новых рынкаў.

**Рост еўрапейскай эканомікі і гандлю, развіццё банкаўскай сістэмы.** Пачынаючы з Позняга сярэднявечча Еўропа перажывала змяненні, якія закранулі ўсе сферы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця. Пачаў фарміравацца новы лад — капіталістычны. У Еўропе, у адрозненне ад краін Усходу, склаліся дзве найважнейшыя ўмовы, неабходныя для развіцця капіталізму: магчымасць назапашвання капіталу і наяўнасць свабодных працоўных рук.

**Перадумовы ўзнікнення мануфактуры**
- рост рамяства;
- рост таварнай вытворчасці;
- накапленне капіталу;
- дыферэнцыяцыя дробных таваравытворцаў;
- павелічэнне попыту на вытворчыя тавары

**Формы мануфактур**

**Рассеяная**
- аперацыі па вытворчасці тавараў былі размеркаваны паміж асобнымі работнікамі, якія працавалі ў розных месцах;
- прадпрымальнік — уласнік капіталу;
- прадпрымальнік забяспечваў збыт гатовай прадукцыі, аплачваў працу

**Змешаная**
- спалучала выкананне асобных аперацый у цэнтралізаванай майстэрні з работай дома;
- узнікала на базе хатняга і саматужнага промыслу

**Цэнтралізаваная**
- усе вытворчыя працэсы былі засяроджаны ў адным або некалькіх будынках;
- выкарыстоўвалася праца наёмных работнікаў;
- праца работнікаў пастаянна кантралявалася ўладальнікам

**Наступствы распаўсюджвання мануфактурнай вытворчасці**
- развіццё таварна-грашовых адносін;
- змяненні ў сацыяльнай структуры грамадства;
- фарміраванне адзінага ўнутранага рынку;
- рост прадукцыйнасці працы і аб'ёмаў вытворчасці

Мануфактурная вытворчасць

*Як вы думаеце, якая мануфактура была больш канкурэнтаздольнай на рынку?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раслі патрэбы ў адзенні і іншых таварах, для вытворчасці якіх было неабходна больш рабочых. Многія людзі мігрыравалі з сельскай мясцовасці ў гарады. Гарадское насельніцтва расло і мела патрэбу ў прадуктах харчавання, таму ўзрасла патрэба і ў сельскагаспадарчых рабочых. Каб прадухіліць іх перасяленне ў гарады, землеўладальнікі павінны былі плаціць ім больш і здаваць зямлю ў арэнду па больш нізкім кошце.

Рост еўрапейскай эканомікі быў цесна звязаны таксама з мануфактурнай вытворчасцю. *Мануфактуры* ўпершыню з'явіліся ў Італіі яшчэ ў пачатку XIV ст. Гэта былі прадпрыемствы, заснаваныя на падзеле працы наёмных рабочых. Але праца заставалася ручной.

Гандляры прадавалі мануфактурныя вырабы ў сельскай мясцовасці, дзе затым куплялі збожжа і іншыя сельскагаспадарчыя тавары для продажу ў гарадах. Пашырыліся гандлёвыя сувязі і паміж краінамі.

Эканоміка Еўропы змянялася таксама дзякуючы развіццю банкаў і крэдытнай сістэмы. З цягам часу спачатку ў Італіі, а затым і ў Паўночнай Еўропе ўзніклі ўплывовыя дынастыі банкіраў.

Буйнейшымі банкірскімі дамамі Еўропы ў пачатку Новага часу былі сямействы Медычы ў Фларэнцыі і Фугераў у нямецкім горадзе Аўгсбург. Багатымі ліхвярамі лічыліся жыхары Ламбардыі. Еўрапейскія ліхвяры прадастаўлялі пазыкі пад высокі працэнт амаль усім правіцелям Еўропы, уключаючы папу рымскага і германскага імператара. З XVI ст. узніклі не толькі прыватныя, але і дзяржаўныя *банкі*.

У XV ст. у Еўропе з'явіліся і першыя *біржы*, якія да XVII ст. былі прадстаўлены практычна ў кожным гандлёвым еўрапейскім горадзе. Слова «біржа» абазначала спецыяльны будынак для правядзення фінансавых і гандлёвых здзелак. Прадпрымальнікі выстаўлялі ўзоры сваіх тавараў, падпісвалі кантракты, атрымлівалі грашовыя крэдыты, набывалі каштоўныя паперы, якія нярэдка выконвалі функцыю грошай.



N.B.

У канцы XIV ст. Якаб Фугер заснаваў банк у Германіі. Як і Медычы, Фугер, перш чым стаць банкірам, быў купцом. У 1370-я гг. ён пачаў імпартаваць бавоўну з Егіпта, каб вырабляць фланелевую тканіну, адзенне з якой карысталася вялікім попытам у еўрапейцаў. Затым Фугер заняўся іншай дзейнасцю — гандлем прыправамі і шоўкам. Справы ішлі ўдала, у хуткім часе Фугер стаў самым багатым чалавекам Еўропы свайго часу.

Бухгалтар Матэус Шварц за працай у канторы Якаба Фугера. Ілюстрацыя з дзённіка М. Шварца. 1517 г.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

N.B.

Назва «біржа» ўпершыню з'явілася ў бельгійскім горадзе Бруге. Купцы збіраліся на плошчы з размешчанай на ёй гасцініцай бельгійскага багацея Ван дэр Бурсе. Слова «біржа», магчыма, паходзіць ад яго прозвішча (Bursa ў перакладзе з лацінскай мовы азначае «скураны мяшок»). Біржа Бурсе яшчэ не была афіцыйнай. Радзімай першай арганізаванай біржы стаў горад Антверпен. «Для гандлёвых людзей усіх краін і нацый» — такая шыльда красавалася над уваходам у будынак для таргоў, пастаўлены ў 1531 г. У 1602 г. адкрылася біржа ў Амстэрдаме.

*Даведайцеся пра першыя ў гісторыі біржы. У якіх краінах яны ўзніклі? Чаму менавіта там? Чым першыя біржы адрозніваліся ад сучасных?*

**Гандлёвая рэвалюцыя і рэвалюцыя цэн.** XVI ст. стала перыядам пашырэння еўрапейскага знешняга гандлю і пачатку фарміравання сусветнага рынку. Гэты працэс увайшоў у гісторыю пад назвай *гандлёвая рэвалюцыя*. Еўропа звязала гандлёвымі шляхамі розныя кантыненты (Афрыку, Амерыку, Азію і Аўстралію), якія ператварыліся ў рынкі збыту еўрапейскіх тавараў. Міжнародны гандаль з Міжземнамор'я перамясціўся ў зону Атлантычнага акіяна. Гэта садзейнічала ўзвышэнню новых дзяржаў — Іспаніі і Партугаліі, а пазней Галандыі і Англіі. Небывалы рост міжнароднага гандлю садзейнічаў з'яўленню вялікага аб'ёму грашовай масы. Так стала магчымая арганізацыя вялікіх прадпрыемстваў.

Яшчэ адной важнай падзеяй першай паловы стагоддзя стала *рэвалюцыя цэн* — рэзкі рост кошту тавараў і спад рэальнага кошту грошай. Прычынай гэтага быў паток золата з Амерыкі, а таксама частае псаванне манет з высакародных металаў.

*Вызначце, ці можна паставіць знак роўнасці паміж тэрмінамі «рэвалюцыя цэн» і «інфляцыя». Свой адказ абгрунтуйце.*

N.B.

Амерыканскае золата і серабро выкарыстоўвалася ў Заходняй Еўропе як плацежны сродак у гандлі. Гэта падсілкоўвала грашовую масу ў абарачэнні і садзейнічала актывізацыі гандлю і фарміраванню новай эканомікі.

У такой сітуацыі прадпрымальнікі імкнуліся хутчэй пускаць грошы ў абарачэнне (укладваць у куплю тавараў, будаўніцтва мануфактур), бо адкладаць манеты, якія з кожным днём таннелі, аказалася нявыгадным. Высокія цэны і адносна нізкія заробкі наёмных рабочых забяспечвалі класу капіталістаў, які зараджаўся, звышпрыбыткі.

Не ўсе дзяржавы разумна распарадзіліся прытокам каштоўных металаў. Іспанія і Партугалія выкарыстоўвалі грошы не на развіццё вытворчасці, а на войны, што прывяло гэтыя краіны ў рэшце рэшт да заняпаду. Галандыя ж і Англія паспяхова ўкладвалі сродкі ў вытворчасць і гандаль.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Першапачатковае накапленне капіталу.** Гандлёвая рэвалюцыя і рэвалюцыя цэн сталі перадумовамі працэсу першапачатковага накаплення капіталу. Слова «капітал» узнікла яшчэ ў XII—XIII стст. Яно абазначала каштоўнасці, г. зн. грошы, якія прыносяць прыбытак. Новы лад — ***капіталізм*** — можна вызначыць як сістэму, пры якой імкненне да максімальнага прыбытку зрабілася пабуджальным матывам усіх дзеянняў. Укладзены капітал павінен быў прыносіць пастаянны прыбытак.

Што ж стала першапачатковай крыніцай капіталу? Капіталізм пачаў фарміравацца не ў сферы вытворчасці, а ў сферах гандлю і фінансаў. Бо самыя высокія прыбыткі прыносілі ліхвярства, банкаўскія аперацыі, але асабліва заваяванні і міжнародны гандаль, часта звязаны з вялікай рызыкай. З Амерыкі, Азіі і Афрыкі ў Еўропу хлынуў паток каштоўных металаў. У XVI ст. запасы серабра ў ёй патроіліся, а золата — узраслі на 20 %. Таксама Еўропа ўзбагачалася за кошт гандлю рабамі і прыправамі, каланіяльнага экспарту і імпарту, а некаторыя краіны, такія як Англія, яшчэ і за кошт карсараў. Усё гэта прывяло да назапашвання вялікіх сродкаў і прыкметнага ўзрастання ролі грошай у еўрапейскай эканоміцы.

*З дапамогай сеткі інтэрнэт знайдзіце азначэнне тэрміна «карсары». Успомніце мастацкія творы (фільмы), дзе паказаны карсары.*

Як правіла, зацікаўленым бокам развіцця капіталістычных адносін была дзяржава, у распараджэнні якой знаходзіліся розныя спосабы здабыць першапачатковы капітал.

Усё большую ролю ў эканоміцы адыгрываў ***пратэкцыянізм*** (ад лац. *protectio* — ахова, заступніцтва) — палітыка дзяржавы, накіраваная на абарону і заахвочванне сваёй вытворчасці шляхам абмежавання ўвозу ў краіну прадукцыі з іншых краін.

**Прадпрымальніцтва і капіталісты.** Надзея на высокія прыбыткі ўцягвала многіх купцоў у заморскія прадпрыемствы. Яны імпартавалі ў Еўропу вострыя прыправы, цукар, шоўк і іншыя тавары, што карысталіся попытам.

Аднак міжнародны гандаль быў рызыкоўным і дарагім. Гандляру трэба было падрыхтаваць карабель і наняць каманду на час доўгага і небяспечнага плавання. Ён павінен быў таксама закупіць вялікую партыю тавараў, не ведаючы, якую цану заплаціць пакупнік у Еўропе.

Гандляроў, якія былі гатовы пайсці на рызыку, разлічваючы на высокія даходы, пачалі называць *прадпрымальнікамі*. Нярэдка свой гандлёвы капітал яны ўкладвалі ў мясцовую вытворчасць, развіваючы тым самым эканомікі сваіх дзяржаў. Яны таксама пашыралі гандаль за кошт наладжвання новых кантактаў з рознымі рэгіёнамі свету. Такім чынам, прадпрымальнікі садзейнічалі ператварэнню еўрапейскай эканомікі з лакальнай сістэмы ў складаную міжнародную.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Новыя капіталісты Еўропы імкнуліся не проста зарабіць на жыццё, але і павялічыць сваё багацце. Уладальнікі мануфактур, а пазней — фабрык і заводаў, плацілі за сыравіну і працу настолькі мала, наколькі было магчыма. Прадавалі ж выробленую прадукцыю максімальна дорага. Гэты «капіталістычны дух» можна ахарактарызаваць такімі словамі: «Дайце мне зарабляць столькі, колькі я магу».

Зарабляць Фугерам і іншым банкірам перашкаджала пазіцыя каталіцкай царквы, якая асуджала ліхвярства, лічачы яго смяротным грахом і самай страшнай заганай. Большасць ліхвяроў-банкіраў ігнаравалі пазіцыю царквы. Паступова роля рэлігіі слабела, што спрыяла росту фінансавага капіталу і прадпрымальніцтва на тэрыторыі Заходняй Еўропы.

**Гандлёвыя кампаніі і палітыка меркантылізму.** Купцы мелі патрэбу ў *капітале*, або вялікіх сумах грошай, каб укласці іх у справу або гандлёвае прадпрыемства. Колькасць гандлёвых кампаній расла з незвычайнай хуткасцю.

Гандляры таксама стваралі *акцыянерныя таварыствы* для фінансавання новых спраў. Нярэдка прадпрымальнікі аб'ядноўвалі капіталы і засноўвалі прыватную гандлёвую кампанію. Затым яны прадавалі акцыі сваёй кампаніі іншым укладчыкам (інвестарам). Калі такое акцыянернае таварыства збірала дастатковы капітал, яно рыхтавала заморскую экспедыцыю. Пасля вяртання карабля кожны інвестар або атрымліваў сваю долю даходу, або дзяліў з кампаньёнамі страты. Часам гандлёвыя кампаніі атрымлівалі ад еўрапейскіх манархаў манапольнае, інакш кажучы, выключнае права на вытворчасць чаго-небудзь або гандаль з якой-небудзь краінай.




Тыпалогія гандлёвых кампаній

*Прывядзіце прыклады гандлёвых кампаній кожнага тыпу з гісторыі і сучаснасці.*

Менавіта так была створана ў 1600 г. брытанская Ост-Індская кампанія, якая атрымала ад кароны шэраг прывілей на гандаль з Індыяй.

Падобную дзейнасць праводзіла магутная галандская Ост-Індская кампанія (1602—1798). Яна гандлявала чаем, меддзю, серабром, тэкстылем, бавоўнай, шоўкам, керамікай і вострымі прыправамі з Японіяй, Кітаем, Цэйлонам, Інданезіяй.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

N.B.

Брытанская Ост-Індская кампанія была створана згодна з указам англійскай каралевы Лізаветы I для правядзення гандлёвых аперацый у Індыі. Кампанія ўяўляла сабой акцыянернае таварыства. Ёй былі дадзены вялікія прывілеі, напрыклад, выключнае права ўвозіць у Англію перац. Фактычна кампанія стала не толькі гандлёвай, але і ваеннай арганізацыяй. Менавіта яна пачала англійскую каланізацыю Індыі. Былі створаны прыватная армія і флот, праводзіўся збор падаткаў з захопленых тэрыторый. Кампанія засноўвала гандлёвыя факторыі.

У канцы XVI ст. марскія экспедыцыі ва Усходнюю Індыю здзяйснялі некалькі галандскіх акцыянерных кампаній. Саперніцтва паміж імі абвастрылася да такой ступені, што пагражала знішчыць гандаль вострымі прыправамі. У выніку ў 1602 г. дзяржава аб'яднала іх у галандскую Ост-Індскую кампанію і прадаставіла ёй манапольнае права гандлю ва Усходняй Індыі.

Галандская Ост-Індская кампанія мела вельмі шырокія правы. Яна магла заключаць дагаворы, набіраць салдат і абвяшчаць вайну ворагам Нідэрландаў. Прынцы, знаць і гандляры навыперадкі ўкладвалі ў яе грошы. Усяго адно паспяховае падарожжа давала магчымасць трымальнікам акцый у 30-разовым памеры акупіць выдаткі.

У XVI ст. еўрапейскія манархі цудоўна разумелі, што іх улада залежыць ад таго, наколькі добра развіты эканоміка і міжнародны гандаль іх краін. Верылі яны і ў тое, што ключом да эканамічнай магутнасці з'яўляюцца каштоўныя металы. Значыць, дзяржава павінна назапашваць як мага больш золата.

Аднак дзяржава не проста захоўвала каштоўны метал. Іспанія, напрыклад, выкарыстоўвала здабытае ў Новым Свеце золата для куплі такіх тавараў, як гарматы, стрэльбы, лес і шоўк. Паколькі Іспанія імпартавала больш тавараў, чым экспартавала, яе золата ішло ў іншыя краіны. Выснова была відавочная: гандаль з'яўляецца больш важным для дзяржавы, чым проста збіранне золата.

У XVII ст. узнікла новая эканамічная тэорыя — *меркантылізм* (ад італ. *mercante* — гандляр, купец). Меркантылісцкія ідэі зводзіліся да таго, што эканамічная магутнасць дзяржавы залежыць ад захавання і павелічэння яе залатога запасу пры дапамозе перавагі экспарту тавараў над іх імпартам.

Меркантылісты лічылі, што правіцелі павінны рэгуляваць гандаль і прамысловасць, каб дзяржава магла існаваць і развівацца за кошт сваіх унутраных рэсурсаў. Яны былі перакананыя, што манархі абавязаны падтрымліваць прамысловасць, напрыклад караблебудаванне, таму што новыя караблі патрэбныя для развіцця гандлю.

Важнае месца ў гэтай тэорыі адводзілася калоніям: яны маглі забяспечваць сыравінай прамысловасць метраполіі. У той жа час калоніі служылі рынкам збыту мануфактурных тавараў з метраполіі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Пачатак прамысловай рэвалюцыі.** У XVIII ст. на змену гандлёваму капіталізму, заснаванаму на меркантылізме, прыйшоў прамысловы капіталізм. Гэтая знамянальная падзея ўвайшла ў гісторыю пад назвай прамысловай рэвалюцыі.

Яна азначала пераход ад мануфактурнай вытворчасці, заснаванай на ручной працы, да фабрычнай. Асноўным адрозненнем фабрык — вялікіх прадпрыемстваў — ад мануфактур было выкарыстанне машын. З вынаходствам складаных груваcткіх механізмаў прадпрымальнікам стала выгадна размяшчаць у адным месцы рабочых і машыны.

Прамысловая рэвалюцыя, або прамысловы пераварот, пачалася з Англіі. Асноўнай яе перадумовай стала вынаходства паравога рухавіка. Яго пачалі выкарыстоўваць на параходах, паравозах і станках. Вынаходства механічнага ткацкага станка (прасніцы Джэні) прывяло да ўзнікнення магутнай тэкстыльнай прамысловасці ў Англіі, тавары якой актыўна прадаваліся ва ўсім свеце. Упершыню Англію сталі называць «майстэрняй свету». Немалы ўклад у прамысловы пераварот унесла брытанская вугальная прамысловасць, што развівалася хуткімі тэмпамі.

Вялікія запасы вугалю і жалезнай руды забяспечылі Англію неабходным матэрыялам для стварэння паравых машын і па́лівам для іх. Будучы каланіяльнай дзяржавай, Англія мела доступ да сыравіны па ўсім свеце. Яна таксама атрымала вялізны рынак збыту выробленых тавараў.




Прамысловая рэвалюцыя ў Англіі

*Вызначце, якія з перадумоў стварылі магчымасць ажыццяўлення прамысловай рэвалюцыі, а якія выклікалі яе неабходнасць. Растлумачце свой адказ.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

N.B.

Англія XVIII ст. была дзяржавай, якая сачыла за тым, каб у гандлі вываз тавараў заўсёды пераважаў над увозам. Бавоўнавым цэнтрам краіны стаў горад Ліверпуль. Дзякуючы гандлю рабамі Брысталь ператварыўся ў асноўны пункт атлантычнага гандлю. Многія купцы і прадпрымальнікі стварылі свой капітал дзякуючы так званаму «залатому трохкутніку»: карабель, загружаны англійскімі прамысловымі вырабамі, адпраўляўся ў афрыканскі порт для продажу тавару, а затым на выручаныя грошы ў гандляроў рабамі набываліся афрыканскія нявольнікі. Іх перавозілі ў Амерыку або на астравы Карыбскага мора, паколькі там за іх можна было выручыць добрыя грошы. Пасля гэтага карабель вяртаўся ў Англію з грузам цукру або тытуню, і гэта прыносіла добры даход.




*За адносна кароткі перыяд еўрапейская цывілізацыя моцна змянілася як знешне, так і ўнутрана. Яе геаграфічнае пашырэнне стала пачаткам фарміравання глабальнага свету. Гэты працэс суправаджаўся ўцягваннем у арбіту еўрапейскага ўплыву новых тэрыторый і народаў. Але галоўнае было ў тым, што ў нетрах еўрапейскай цывілізацыі зарадзіўся ўнікальны тып грамадскай сістэмы — капіталізм.*

**1.** Якія фактары садзейнічалі фарміраванню капіталістычных адносін?
**2.** Як развіццё банкаў і крэдытнай сістэмы паўплывала на эканоміку?
**3.** Складзіце схему «Рэвалюцыя цэн», абапіраючыся на наступныя пазіцыі: прычыны рэвалюцыі цэн; час яе ўзнікнення; сутнасць гэтай з'явы; наступствы рэвалюцыі цэн для розных слаёў насельніцтва і феадальнай сістэмы гаспадаркі ў цэлым.
**4.** Дакажыце, што гандаль у XVI ст. прыняў сусветны характар. Якія працэсы ў эканоміцы еўрапейскіх краін садзейнічалі пашырэнню гандлёвых сувязяў?
**5.** Ахарактарызуйце паняцце «капіталізм» у форме сінквейна.
**6.** Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж экспартам тавараў і палітыкай меркантылізму.
**7.** Пацвердзіце інфармацыяй параграфа, што акцыянернае таварыства — гэта гаспадарчае таварыства, увесь капітал якога падзелены паміж яго ўдзельнікамі.
**8.** Складзіце схему (ментальную карту, гекс), што адлюстроўвае перадумовы прамысловай рэвалюцыі, яе храналагічныя рамкі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 21. Гуманізм і Адраджэнне



*Як гуманістычныя ідэі паўплывалі на культуру Адраджэння?*

*Чым адрозніваюцца погляды гуманістаў на прызначэнне чалавека ад рэлігійных уяўленняў? Чаму гуманістаў цікавіла антычная культура?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Гістарычныя перадумовы развіцця культуры Адраджэння.** Перыяд ідэйнага і культурнага развіцця краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, які ахоплівае XIV—XVI стст., увайшоў у гісторыю пад назвай *Рэнесанс* (фр. *Renaissance* — Адраджэнне). Адмова ад сярэднявечнай рэлігійнасці і аскетызму, росквіт гуманізму, навуковыя адкрыцці і новыя вынаходствы сталі характэрнымі рысамі новай эпохі.

**Перыядызацыя эпохі Адраджэння**

| Эпоха Адраджэння | Храналагічныя рамкі перыяду | Асаблівасці перыяду |
|---|---|---|
| Ранняе Адраджэнне | XIV—XV стст. | Зараджэнне рэнесанснай культуры і яе распаўсюджанне ў Італіі |
| Высокае Адраджэнне | Канец XV — першая трэць XVI ст. | Найвышэйшы росквіт рэнесанснага мастацтва і гуманістычнага светапогляду. Распаўсюджанне рэнесанснай культуры ў Еўропе |
| Позняе Адраджэнне | Другая палова XVI ст. | Сінтэз рэнесанснай культуры і рэлігійнай Рэфармацыі ў Еўропе |

У чым жа былі прычыны станаўлення ў Еўропе новай культуры? У пашырэнні гандлёвых сувязяў і знаёмстве з іншымі народамі? Ва ўрбанізацыі, развіцці рамёстваў і фінансавай сістэмы? У падзенні аўтарытэту каталіцкай царквы і станаўленні нацыянальных дзяржаў? Ці вырашальным фактарам стала абуджэнне цікавасці еўрапейцаў да Антычнасці?

Рэнесанс пачаўся з Італіі — самага ўрбанізаванага рэгіёна Еўропы, дзе найраней пачалі складвацца капіталістычныя адносіны. У італьянскіх гарадах-дзяржавах феадальная знаць была цесна звязана з купецкімі вярхамі, а саслоўная структура была моцна размытая. Менавіта ў гарадскім асяроддзі найбольш выразна стала праяўляцца дынаміка ў светаўспрыманні розных слаёў грамадства. Для вядзення новай камерцыйнай дзейнасці патрабаваўся новы светапогляд, які засяроджваўся б не на Богу, а на дзейсным, актыўным, паспяховым чалавеку.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Не дзіва, што менавіта італьянскія гарады сталі цэнтрамі навукі і мастацтва, вольнымі ад царкоўных канонаў і прадпісанняў.

**Асноўныя рысы эпохі Адраджэння:**

- гуманізм — абгрунтаванне самакаштоўнасці чалавека, яго правоў і свабод;
- антрапацэнтрызм — у цэнтры сусвету стаіць чалавек;
- вальнадумства — вызваленне ад дагматычнага сярэднявечнага мыслення;
- эстэтызм — вядучая роля мастацтва.

Важнай рысай станаўлення культуры Адраджэння стала аслабленне ўплыву царквы на грамадства. Маральная разбэшчанасць і духоўны застой настроілі супраць каталіцкага духавенства вальнадумных людзей. Свецкія правіцелі таксама былі незадаволеныя ўплывам царквы, яны аддавалі перавагу правядзенню незалежнай палітыкі, накіраванай на стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў з абсалютнай уладай правіцеля.

Крыжовыя паходы на Усход, падзенне Візантыі ў 1453 г., а таксама знаёмства з араба-мусульманскім светам узбагацілі еўрапейскую культуру, прывялі да пераймання новых, не характэрных для яе прывычак і звычаяў. Аднак не варта забывацца пра тое, што мусульманская культура ўвабрала ў сябе многае з антычнай спадчыны. На арабскую мову былі перакладзены практычна ўсе знакамітыя працы грэчаскіх аўтараў. З арабскага Усходу ў Еўропу трапілі творы Платона, Арыстоцеля, Піфагора, Эўкліда і інш. Яшчэ ў большай ступені, чым арабская культура, Антычнасцю была прасякнутая культура візантыйцаў. Яны, уцякаючы ў Еўропу пасля падзення Канстанцінопаля, перавозілі свае бібліятэкі з працамі грэчаскіх і рымскіх аўтараў.

Адкрыццё новых зямель і кантынентаў прывяло еўрапейцаў да разумення памылковасці хрысціянскага апісання свету з уяўленнямі плоскай Зямлі і руху Сонца вакол яе. Дасягненні ў галіне астраноміі, далёкія плаванні і кругасветныя падарожжы паказалі людзям рэальны свет. Пашырэнне прасторавых гарызонтаў патрабавала новай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці і месца чалавека ў ёй. Ідэал сярэднявечнага манаха-аскета больш не задавальваў актыўную, прадпрымальную частку еўрапейскага грамадства.

**Гуманізм — філасофія Адраджэння.** На рубяжы Сярэдніх вякоў і Новага часу ў процівагу царкоўнаму погляду на чалавека як на нікчэмную і грахоўную істоту ўзнік новы светапогляд — *гуманізм* (ад лац. *humanus* — людскі, чалавечны). Яго прыхільнікаў пачалі называць гуманістамі. Гуманізм стаў філасофскай асновай, ідэалогіяй еўрапейскага Адраджэння.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Светапоглядныя асновы гуманізму:**

- цікавасць да Антычнасці;
- адмаўленне царкоўна-феадальнай культуры;
- замацаванне ідэалу чалавека-творцы;
- права чалавека на шчасце ў зямным жыцці;
- вера ў розум і рацыянальнае пазнанне;
- абвяшчэнне харастваа свету і чалавека.

*Знайдзіце пацвярджэнне кожнай думкі схемы ў вучэбным матэрыяле.*

Гуманістаў прываблівалі перш за ўсё чалавек і яго справы. Рэлігійны ідэал адмаўлення ад радасцяў жыцця, уласцівы Сярэднявеччу, змяніўся жывой цікавасцю да свету. Мэтай чалавечага існавання абвяшчаліся радасць і асалода ад жыцця, актыўныя дзеянні, накіраваныя на зацвярджэнне свайго месца ў свеце. Як абвясціў італьянскі гуманіст Дж. Піка дэла Мірандала, чалавеку «дадзена валодаць тым, чаго пажадае, і быць тым, кім хоча». Прызнанне неабмежаваных магчымасцяў чалавечага розуму стала неад'емнай часткай самасвядомасці прадстаўнікоў культуры Адраджэння.

Гуманісты абвясцілі права чалавека на шчасце ў зямным, а не замагільным жыцці, права на свабоду, справядлівасць і лепшае грамадскае ўладкаванне. Аднак не трэба ідэалізаваць гуманізм і ігнараваць яго ўнутраныя супярэчнасці. Разняволіваючы чалавечую асобу ад духоўнай улады каталіцкай царквы, гуманізм у той жа час садзейнічаў выхаванню глыбокага індывідуалізму, здольнага аказаць негатыўны ўплыў на ўзаемадзеянне людзей у соцыуме. Прыхільнікі гуманістычных ідэй былі выхадцамі з вышэйшых слаёў грамадства. Яны з пагардай ставіліся да беднякоў і звярталіся, як правіла, да багацеяў і арыстакратаў з заклікам атрымліваць дарагую адукацыю.

У XVI ст. гуманістычны рух ахапіў большасць еўрапейскіх краін: ад Англіі і Нідэрландаў да Германіі і Швейцарыі, ад Пірэнейскага паўвострава да Польшчы і Венгрыі.

§ 21, п. 2–1

Асноўныя ідэі Рэнесансу знайшлі адлюстраванне ў літаратуры. Італьянскія пісьменнікі Франчэска Петрарка, Джавані Бакача, пісьменнікі-гуманісты Франсуа Рабле з Францыі, Уільям Шэкспір з Англіі, Мігель дэ Сервантэс з Іспаніі накіравалі свой позірк на чалавека як асобу, вольную ад рэлігійных забабонаў, са складанымі пачуццямі, імкненнем пазнаць навакольны свет праз разважлівасць і асабісты вопыт.

**Мастацтва Адраджэння.** У эпоху Адраджэння з'явіліся новыя свецкія кірункі жывапісу, новая скульптура і архітэктура, якія адлюстроўвалі змяненні ў поглядах на навакольнае асяроддзе і на чалавека.

Мастакі, выкарыстоўваючы гульню святла і ценю, навучыліся перадаваць адчуванне прасторы. Усю разнастайнасць свету і багацце асобы чалавека імкнуліся


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Аплакванне Хрыста.
Мастак *Джота ды Бандонэ*. 1306 г.



Зняцце з крыжа.
Мастак *Рафаэль Санці*. 1507 г.

*Параўнайце карціны Ранняга і Позняга Адраджэння. Назавіце характэрныя рысы Позняга Адраджэння.*

адлюстраваць на сваіх палотнах выдатныя жывапісцы Адраджэння, якія працавалі ў XVI ст.: Леанарда да Вінчы, Рафаэль Санці, Мікеланджэла і Тыцыян у Італіі, Пітэр Брэйгель Старэйшы ў Нідэрландах, Альбрэхт Дзюрэр у Германіі і інш.



Мадонна і дзіця.
Мастак *Ян ван Эйк*. 1436 г.
Асаблівасць творчасці аўтара — выкарыстанне алейнай тэхнікі жывапісу



Блудны сын.
Мастак *Іеранім Босх*. 1510 г.
Асаблівасць творчасці аўтара — змрочныя містычныя алегорыі



Жніво. Мастак *Пітэр Брэйгель Старэйшы*. 1565 г. Асаблівасць творчасці аўтара — майстэрства ў стварэнні пейзажаў і жанравых сцэн; адлюстраванне жыцця простага народу


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сабор святога Пятра, Ватыкан

Значны ўклад у тэхніку жывапісу ўнеслі фламандскія мастакі. Яны першыя пачалі эксперыментаваць з фарбамі на алейнай аснове. Новыя фарбы, у адрозненне ад ранейшых, тэмперных, высыхалі даўжэй і лягчэй змешваліся. Таму мастакі змаглі перадаваць на сваіх палотнах няўлоўныя цені і самыя тонкія адценні колеру.

У эпоху Рэнесансу мастакі вярнуліся да класічных прынцыпаў грэчаскага і рымскага мастацтва. Яны падарожнічалі па Італіі, чэрпаючы натхненне ў сузіранні старажытнарымскіх збудаванняў і скульптур.

Каб рэалістычна адлюстроўваць чалавечае цела, мастакі звярнуліся да анатоміі, якую яны сталі вывучаць па целах памерлых. З прычыны ганенняў царквы рабіць гэта даводзілася патаемна. У эпоху Адраджэння дзякуючы вывучэнню будовы чалавечага цела было створана шмат шэдэўраў скульптуры і жывапісу.

Радыкальныя змены адбыліся і ў архітэктуры. Інжынерныя прынцыпы, распрацаваныя Філіпа Брунелескі ў XV ст., выкарыстоўваў пры праектаванні купала сабора Св. Пятра ў Рыме знакаміты Мікеланджэла Буанароці.

**Зараджэнне сучаснай навукі.** Эпоха Адраджэння адыграла значную ролю ў развіцці гуманітарных навук і прыродазнаўства.

Штуршком да станаўлення новай навукі стала незвычайная цікавасць гуманістаў да вывучэння культурнай спадчыны Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Даследуючы антычныя тэксты, яны зноў адкрывалі веды, страчаныя або забытыя ў час Сярэднявечча.

Першым з гуманістаў быў ***Франчэска Петрарка*** (1304—1374). Ён шмат падарожнічаў па Еўропе ў пошуках антычных рукапісаў. У антычнай культуры Петрарка знайшоў увасабленне светапогляду, які ставіў у цэнтр не Бога, а чалавека. Праца Петраркі натхніла яго вучняў і паслядоўнікаў. Часта гуманісты літаральна ратавалі старажытныя манускрыпты, адшукваючы іх у манастырскіх бібліятэках, дзе тыя нярэдка валяліся ў кучах смецця.

Вучоныя-гуманісты працавалі ва ўсіх галінах і кірунках навуковых ведаў. На першы план яны вылучалі вопыт, вывучэнне прыроды, эксперыментальны метад даследаванняў. Шэраг эпахальных адкрыццяў звязаны з імёнамі вялікага італьянскага мастака, вучонага і вынаходніка Леанарда да Вінчы, вядомага польскага астранома Мікалая Каперніка, знакамітага італьянскага філосафа і паэта Джардана Бруна і праслаўленага італьянскага фізіка, астранома і філосафа Галілея Галілея.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Дасягненні эпохі Адраджэння ў галіне навукі**

| Вучоныя і мысліцелі | Асноўныя ідэі, адкрыцці | Уплыў на фарміраванне поглядаў |
|---|---|---|
| Мікалай Капернік (1473–1543), Польшча | Стварыў вучэнне аб вярчэнні Зямлі вакол Сонца і вакол сваёй восі | Разбурыў старыя ўяўленні аб нерухомай Зямлі, якая з'яўляецца цэнтрам Сусвету |
| Джардана Бруна (1548–1600), Італія | Стварыў вучэнне аб бязмернасці, бясконцасці і вечнасці Сусвету, які не мае ні цэнтра, ні краю | Разбурыў старыя ўяўленні аб будове Сусвету, даказаўшы, што ні Зямля, ні Сонца не з'яўляюцца цэнтрам свету |
| Галілеа Галілей (1564–1642), Італія | З дапамогай тэлескопа адкрыў новыя нябесныя целы, назіраў горы на Месяцы і плямы на Сонцы. Сфармуляваў законы падзення цел і іншыя законы фізікі | Адкрыцці, зробленыя з дапамогай тэлескопа, пацвярджалі вучэнне М. Каперніка і садзейнічалі стварэнню новых уяўленняў людзей пра будову Сусвету |
| Ісаак Ньютан (1642–1727), Англія | Адкрыў закон сусветнага прыцягнення, законы механічнага руху і распаўсюджання святла, новыя метады матэматычных вылічэнняў | Завяршыў стварэнне новай карціны свету ў ранні Новы час. Яго тэорыя сцвярджала, што прырода падпарадкоўваецца дакладным законам механікі |
| Уільям Гарвей (1578–1657), Англія | Адкрыў механізм кровазвароту і паказаў ролю сэрца ў ім. Стварыў тэорыю аб зараджэнні жыцця на Зямлі | Адкрыцці У. Гарвея далі людзям навуковыя ўяўленні аб кровазвароце і зараджэнні жыцця |
| Фрэнсіс Бэкан (1561–1626), Англія | Навукова абгрунтаваў новыя метады вывучэння з'яў прыроды — назіранні і вопыты | Заклаў асновы новай філасофіі, увёў вопыт і эксперымент як метады навуковага пазнання |
| Рэнэ Дэкарт (1596–1650), Францыя | Лічыў розум чалавека крыніцай ведаў. Адводзіў розуму галоўную ролю ў навуковым даследаванні | Заснавальнік навукі і філасофіі Новага часу. Абараняючы прынцыпы бясконцасці Сусвету, садзейнічаў умацаванню новых уяўленняў пра свет. Лічыў, што навука павінна прыносіць людзям практычную карысць. Яго вучэнне аб ролі розуму ў пазнанні ўзвышала чалавека |

На стагоддзі апярэдзілі свой час інжынерныя адкрыцці Леанарда да Вінчы. Ён пакінуў пасля сябе чарцяжы шматлікіх вынаходстваў, якія сталі вядомыя толькі ў XIX ст.

Прадметам вострых спрэчак паміж навукай і рэлігіяй стала астраномія. Сярэднявечнае рэлігійнае вучэнне аб плоскай Зямлі як цэнтры Сусвету і Богам абранай планеце было абвергнута геліяцэнтрычнай тэорыяй Мікалая Каперніка, згодна


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з якой Зямля верціцца вакол Сонца. Следам за гэтым Джардана Бруна вылучыў палажэнне аб бязмежнасці Сусвету, аб незлічоным мностве сусветаў, падобных да Сонечнай сістэмы. Галілеа Галілей эксперыментальным шляхам пацвердзіў геліяцэнтрычную тэорыю Каперніка. Пры дапамозе створанага ім тэлескопа і матэматычных разлікаў ён выявіў, што паверхні Месяца і Сонца не гладкія і што Млечны Шлях з'яўляецца складанай сістэмай зорак.

Такім чынам, навуковыя адкрыцці XVI ст. заклалі асновы сучаснай навукі.

**Развіццё палітычных ідэй, свецкай адукацыі і кнігадрукавання.** Для сацыяльных і палітычных тэорый эпохі Адраджэння была характэрная пільная ўвага да чалавека. Гуманісты адмовіліся ад уяўлення аб боскім умяшанні ў ход людскіх спраў. Яны лічылі, што палітыку вызначае не Бог, а зямныя інтарэсы людзей і іх патрэбы. Менавіта ў гэты час быў зроблены неацэнны ўклад у разуменне сутнасці дзяржавы як сілы, якая абараняе інтарэсы насельніцтва. Узнікла ідэя моцнай дзяржаўнай улады, здатнай пераадолець унутраную раз'яднанасць соцыуму, — абсалютызму.

Заўзятым прыхільнікам тэорыі абсалютызму быў італьянскі мысліцель ***Нікала Макіявелі*** (1469—1527). Ён лічыў найбольш прымальнай формай дзяржаўнасці цэнтралізаваную дзяржаву на чале з абсалютным правіцелем. На яго думку, толькі стварэнне такой дзяржавы магло б пакласці канец раздробленасці Італіі, якая знемагала на мяжы XV—XVI стст. ад пастаянных міжусобных войнаў.



Статуя Н. Макіявелі ля ўвахода ў галерэю Уфіцы, г. Фларэнцыя, Італія

У творы «Гасудар» Н. Макіявелі апісаў шляхі стварэння моцнай цэнтралізаванай улады. На яго думку, гасудар павінен усяляк умацоўваць дзяржаву, быць моцнай асобай, а не проста атрымаць уладу згодна з правам спадчыны. Для ўмацавання сваёй улады правіцель, як лічыў Н. Макіявелі, можа выкарыстоўваць любыя сродкі, у тым ліку насілле, вераломства, клятвапарушэнне, хітрасць, крывадушнасць, хлусню. Праяўленне такіх якасцяў у палітычнай дзейнасці ў далейшым было названа макіявелізмам.

Найважнейшым сродкам змяншэння ўплыву царквы на грамадства гуманісты лічылі незалежную ад царквы свецкую адукацыю. Адукацыя, на іх думку, павінна развіваць у чалавеку творчы пачатак, здольнасць разважаць, а не механічна запамінаць застылыя догмы і правілы.

Пра важнасць адукацыі пісаў у кнізе «Утопія» англічанін Томас Мор. У ідэальнай дзяржаве, створанай уяўленнем пісьменніка, усім дзецям (і хлопчыкам, і дзяўчынкам) прадпісана вучыцца на роднай мове. Яны павінны ўмець чытаць, пісаць,


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

а таксама разбірацца ў такіх прадметах, як арыфметыка, геаметрыя, музыка, астраномія і прыродазнаўства.

Прынцыпы нагляднасці і сувязі з практыкай, а таксама ідэя важнасці фізічнага выхавання занялі асаблівае месца ў мадэлях ідэальнай адукацыі гуманістаў. Вучоны-гуманіст італьянец Тамаза Кампанэла ва ўтапічным творы «Горад Сонца» падкрэсліваў, што вывучэнне навук павінна суправаджацца наведваннем розных майстэрань, каб дзеці свядома выбіралі будучую прафесію. Для таго каб ім лягчэй было вучыцца правільна гаварыць і пісаць, усюды (і ў дамах, і на вуліцах) павінны развешвацца наглядныя выявы.

Многія задумы гуманістаў у сферы адукацыі былі ўвасоблены ў жыццё толькі ў XX ст. Тым не менш ужо ў эпоху Адраджэння быў пакладзены пачатак свецкай адукацыі. Ідэі гуманізму сталі пранікаць у свецкія пачатковыя школы, якія засноўваліся ўладамі і мясцовымі абшчынамі. Цэнтрамі гуманістычнай думкі сталі ўніверсітэты. Аднак нават пачатковую адукацыю маглі сабе дазволіць толькі дзеці з заможных сем'яў.

**Мішэль Мантэнь. «Вопыты»**

Нават гульні і практыкаванні — і яны стануць неад'емнай і даволі значнай часткай навучання: я маю на ўвазе бег, барацьбу, музыку, танцы, паляванне, верхавую язду, фехтаванне. Я хачу, каб добрае выхаванне, свецкасць, знешнасць вучня ўдасканальваліся разам з яго душою. Бо выхоўваюць не адну душу і не адно цела, але ўсяго чалавека: нельга расчляняць яго напалам.

*Якія прынцыпы былі пакладзены гуманістамі ў аснову выхавання падрастаючага пакалення?*

Рэвалюцыйную ролю ў распаўсюджванні гуманістычных ідэй у Еўропе адыграла кнігадрукаванне. Першым крокам да яго стала перайманне еўрапейцамі ў арабаў тэхналогіі вытворчасці таннай паперы з бавоўны, што дало магчымасць вырабляць матэрыял для пісання ў прамысловых маштабах. Наступным прарывам стала вынаходства ў сярэдзіне 1440-х гг. немцам Іаганам Гутэнбергам друкарскага станка для кнігадрукавання рухомымі літарамі. Вельмі трапна падкрэсліў важнасць укаранення кнігадрукавання ў Еўропе нямецкі філосаф і вучоны XVIII ст. Георг Ліхтэнберг: «Болей, чым золата, змяніў свет свінец, і больш той, што ў друкарскіх літарах, чым той, што ў кулях».

§ 21, п. 3–1

§ 21–1

Кнігавыданне стала папулярным хобі сярод знаці. Кнігі нярэдка ўпрыгожваліся гравюрамі. Дзякуючы кнігадрукаванню пачала стварацца адзіная еўрапейская, а затым і сусветная інфармацыйная прастора.

*Еўрапейскае Адраджэнне стала пераходным перыядам паміж хрысціянскім Сярэднявеччам і напоўненым духам змен Новым часам. Адраджэнне стала зыходным пунктам фарміравання новага светапогляду, новых падыходаў у палітыцы і адукацыі, а таксама стварэння свецкай навукі і культуры.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Вызначце перадумовы развіцця культуры Адраджэння. Складзіце схему (ментальную карту, гекс).
2. Якія ідэі пакладзены ў аснову філасофіі эпохі Адраджэння?
3. Гуманісты стварылі стройную філасофскую сістэму, з'яўленне якой дыктавалася асаблівасцямі свайго часу. Як вы думаеце, ці могуць быць цікавыя іх разважанні пра свет, прыроду, чалавека людзям пачатку III тысячагоддзя?
4. Чаму гуманісты ставілі на першы план досвед, вывучэнне прыроды, эксперыментальны метад даследаванняў? Для чаго ім гэта было патрэбна?
5. Апішыце чалавека эпохі Адраджэння. Складзіце сінквейн пра яго.
6. Якія змены адбыліся ў развіцці сацыяльных і палітычных тэорый у эпоху Адраджэння ў параўнанні з перыядам Сярэдніх вякоў?
7. Складзіце табліцу (аўтар, твор, асноўныя ідэі, значэнне для далейшых даследаванняў). Пры неабходнасці выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі.
8. Стварыце візітную картку эпохі Адраджэння.

## § 22. Пачатак еўрапейскай каланіяльнай экспансіі

*Чаму людзі Новага часу імкнуліся за межы знаёмага свету?*

*Якія працэсы адбываліся ў Еўропе канца эпохі Сярэднявечча? Успомніце ўнутраныя ўмовы сацыяльнага і эканамічнага развіцця еўрапейскага грамадства да пачатку Новага часу.* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)



**Вытокі каланіяльнай экспансіі і яе асаблівасці.** Перыяд з сярэдзіны XV да сярэдзіны XVII ст. называецца эпохай Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Гэты час стаў пачаткам еўрапейскай каланіяльнай экспансіі.

Еўрапейцы Новага часу былі не першымі, хто плаваў на далёкую адлегласць: вікінгі і палінезійцы задоўга да іх здзяйснялі працяглыя марскія падарожжы. Да канца XV ст. еўрапейцы стварылі новы тып марскіх суднаў — каравелы, якія дазволілі ажыццяўляць далёкія падарожжы. Аднак еўрапейская экспансія Новага часу невыпадкова ўвайшла ў гісторыю як эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Яна была ўнікальнай, паколькі характарызавалася хуткасцю і маштабнасцю тэрытарыяльнага ахопу. За некалькі стагоддзяў еўрапейцы наладзілі кантакты практычна з усім зямным шарам. Еўрапейскія мараплаўцы праклалі шляхі на Усход — у Афрыку, Індыю, Паўднёва-Усходнюю Азію, на Захад — у Паўднёвую і Паўночную Амерыку; адкрылі Аўстралію. Еўрапейцы таксама стварылі ўнікальныя тэхналогіі, невядомыя іншым народам. Але, самае галоўнае, яны валодалі агня-

*Пра якія экспедыцыі ідзе гаворка? Што азначалі для Еўропы вынікі гэтых экспедыцый?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | | |
|---|---|---|
| Пагаршэнне ўмоў гандлю Еўропы з краінамі Усходу | Пашырэнне ўяўленняў еўрапейцаў пра сусвет | Выгады геаграфічнага становішча Партугаліі і Іспаніі |
| Узрастанне мабільнасці насельніцтва ў сувязі з крызісам феадальных адносін | Пошук каштоўных металаў, неабходных для гандлю з Усходам | Накапленне геаграфічных ведаў |
| Развіццё мараплаўства і тэхналогій будаўніцтва караблёў | Стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў – Іспаніі і Партугаліі | Спыненне Рэканкісты, вызваленне людскіх і матэрыяльных рэсурсаў |

Перадумовы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў

*Расстаўце перадумовы ў адпаведнасці з храналагічным прынцыпам. Ахарактарызуйце перадумовы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, падзяліце іх на дзве групы: а) перадумовы, якія садзейнічалі пошуку новых шляхоў у краіны Усходу; б) перадумовы, якія садзейнічалі арганізацыі падарожжаў. Растлумачце кожную перадумову, названую ў схеме, па магчымасці праілюструйце іх гістарычнымі фактамі. Як вы думаеце, чаму людзі Новага часу імкнуліся да адкрыцця новых зямель?*

стрэльнай зброяй — той перавагай, якая вызначыла першыя поспехі еўрапейцаў у заваяванні свету.

Каланіяльная экспансія была распачатая Партугаліяй і Іспаніяй. Гэта тлумачыцца тым, што ў XV ст. гэтыя дзяржавы імкнуліся ліквідаваць манаполію італьянскіх гандляроў Венецыі і Генуі ў Міжземнамор'і. Для адкрыцця новых гандлёвых шляхоў яны арганізоўвалі шматлікія экспедыцыі.

Партугальцы марудна, але грунтоўна «асвойвалі» заходняе ўзбярэжжа Афрыкі. Ужо ў 1440-х гг. у Партугалію пачалі паступаць золата, слановая косць і нявольнікі з Гвінейскага ўзбярэжжа. Гэта стала прычынай далейшага руху партугальцаў на поўдзень. У хуткім часе быў адкрыты Мыс Добрай Надзеі і партугальскія караблі абагнулі Афрыку з поўдня, а затым ***Васка да Гама*** дасягнуў усходняга ўзбярэжжа Індыі.

Пачатак іспанскай экспансіі паклалі чатыры экспедыцыі (1492—1503) ***Хрыстафора Калумба***. Іспанцы захапілі частку Антыльскіх астравоў і заснавалі першае паселішча на востраве Эспаньёла (Гаіці). У першай палове XVI ст. іспанцы замацаваліся на вялікай тэрыторыі Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыкі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**З дзённіка першага падарожжа Хрыстафора Калумба**

Ва ўсёй Кастыліі не знойдзецца такога кутка, які хараством і прыветнасцю мог бы параўнацца з гэтай краінай. І ўся Эспаньёла, гэтак жа як і востраў Тартуга, усюды апрацаваны, як даліна Кордавы. <…>

Гэтыя людзі на выгляд дужыя і мужныя і не такія баязлівыя, як іншыя індзейцы. Яны вельмі пачцівыя і ні да якой секты не належаць. <…>

Дзіву даешся, калі бачыш гэтыя даліны, рэкі, крыніцы, землі, прыдатныя для ўсяго — для вырошчвання збожжа, развядзення жывёлы ўсемагчымых парод (жывёлы ж у гэтых мясцінах няма зусім), для садоў і агародаў, для ўсяго, што толькі можа чалавечая душа пажадаць.

*На што ў першую чаргу звярталі ўвагу еўрапейскія падарожнікі ў новых землях? Як вы думаеце, чаму? Успомніце, якія мэты ставілі перад сабой экспедыцыі Х. Калумба. Якія землі былі адкрытыя?*

**Эканамічныя матывы, роля царквы і дзяржавы.** Экспансія шмат у чым была абумоўлена зацікаўленасцю еўрапейцаў у вострых прыправах, а таксама прадметах раскошы. Акрамя таго, хуткае развіццё таварна-грашовых адносін выклікала вялізны попыт на золата як найважнейшы аб'ект абмену. Каштоўны метал дастаўляўся ў Еўропу з Блізкага Усходу. Таксама праз арабскіх пасрэднікаў паступалі кітайскія і індыйскія тавары (напрыклад, вострыя прыправы), якія цаніліся на вагу золата. Аднак у другой палове XV ст. гэты гандаль амаль спыніўся з-за турэцкіх заваёў. Тады погляды еўрапейцаў накіраваліся ў бок акіяна — у пошуках марскіх шляхоў, якія вядуць у Індыю.

Умацаванне абсалютысцкай улады спачатку ў Іспаніі, а затым у Францыі і Англіі таксама падштурхоўвала да экспансіяністкай палітыкі, паколькі для ўтрымання наёмнай арміі і шыкоўнага двара манархам патрабавалася ўсё больш грошай.

Не апошнюю ролю ў ініцыяванні экспедыцый адыгрывала царква, якая імкнулася распаўсюдзіць хрысціянства як мага больш шырока. Еўрапейцы шчыра верылі, што робяць богаўгодную справу, нясуць народам лепшы лад жыцця, ратуюць душы.

Каланіяльнай экспансіі еўрапейцаў садзейнічалі навуковыя і тэхнічныя дасягненні гэтай эпохі. З'яўленне каравелы, шырокае выкарыстанне компаса і астралябіі, па якой вызначалі месцазнаходжанне карабля, зрабілі сапраўдны пераварот у мараплаванні. Цяпер можна было смела выходзіць у адкрыты акіян, не баючыся заблудзіць. Вынаходства пораху і выкарыстанне агнястрэльнай зброі вызначылі ваенную перавагу еўрапейцаў. Цяга да навуковых адкрыццяў таксама адыграла важную ролю. Сярод вучоных XV ст. атрымала распаўсюджанне гіпотэза пра шарападобную форму Зямлі, што сур'ёзна паўплывала на рашэнне Х. Калумба здзейсніць марское падарожжа.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Барацьба еўрапейскіх краін за валоданне марскімі гандлёвымі шляхамі.** Адкрыццё новых марскіх шляхоў і новых зямель прывяло да саперніцтва паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў Азіі, а таксама ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы.

Спачатку вядучая роля ў еўрапейскай экспансіі належала Партугаліі. Будучы занадта слабай, каб захопліваць вялікія тэрыторыі, яна пачала ствараць апорныя базы (крэпасці і гандлёвыя факторыі) на ўсім працягу шляху ад Лісабона да Індыі і Паўднёва-Усходняй Азіі.

Партугальская каланіяльная экспансія часта прымала даволі жорсткія формы. Напрыклад, пасля захопу горада Малака ў Паўднёва-Усходняй Азіі (1511 г.) на працягу тыдня былі знішчаны ўсе мусульмане, якія сустрэліся на шляху партугальскіх салдат. З пачатку XV ст. партугальцы першымі з еўрапейцаў пачалі гандаль рабамі, якіх вывозілі з Афрыкі.

Усталяваўшы кантроль над Малукскімі астравамі, або Астравамі прыпраў, партугальцы сталі кантраляваць марскі гандаль Еўропы з Усходам. Цяпер яны самі маглі танна купляць вострыя прыправы ў Азіі і вельмі выгадна прадаваць іх на еўрапейскім рынку. Гэтая манаполія была настолькі моцнай, што нават егіпецкія і персідскія купцы ў XV ст. атрымлівалі вострыя прыправы праз партугальцаў. У хуткім часе ў Еўропе сталі скардзіцца на тое, што партугальцы ўсталёўваюць вельмі высокія цэны.

Ужо да канца XVI ст. разгарнулася вострае саперніцтва за гандлёвыя шляхі паміж Партугаліяй, Іспаніяй, з аднаго боку, і Францыяй, Англіяй і Нідэрландамі — з другога. Апошнія імкнуліся падарваць манаполію партугальскай і іспанскай кароны на гандаль з калоніямі ў Амерыцы.

У сярэдзіне XVI ст. Францыя спрабавала стварыць свае паселішчы ў Паўднёвай Амерыцы, аднак паступова амаль усе яны былі знішчаны. Стала зразумела, што Францыя занадта слабая, каб весці адкрытую барацьбу з Партугаліяй і Іспаніяй за калоніі.

Затое ў барацьбу ўключыліся англійскія шукальнікі прыгод, якіх падтрымлівала дзяржава. Англічане ўчынялі дзёрзкія напады на іспанскае ўзбярэжжа Амерыкі, захоплівалі і рабавалі іспанскія караблі, нагружаныя золатам і каштоўнымі таварамі. Гэтая здабыча затым паступала ў каралеўскую казну. Піратства наносіла настолькі адчувальны ўрон іспанцам, што прывяло да вайны паміж Іспаніяй і Англіяй (1585—1604). У ходзе ваенных дзеянняў Англіі, на здзіўленне Еўропы, спадарожнічаў поспех. Англія разгарнула *кантрабандны гандаль* (у тым ліку продаж рабоў з Афрыкі іспанскім каланістам) і ўсяляк заахвочвала *піратства*.



Помнік першаадкрывальнікам, г. Лісабон, Партугалія

*Падрыхтуйце паведамленне пра помнік у часопіс для дзяцей 12–13 гадоў.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З канца XVI ст. Галандыя, якая дабілася незалежнасці ад Іспаніі, і Англія накіраваліся на Усход. Пачалася ўласна капіталістычная гісторыя каланіяльнай экспансіі. На працягу XVII—XVIII стст. вядучая роля ў ёй належала гандлёваму капіталу. Галандыя і Англія ставілі сабе за мэту манапалізаваць гандаль з Усходам і атрымаць з гэтага максімальную выгаду. Спачатку тэрытарыяльныя захопы былі нязначныя і ажыццяўляліся не дзеля эксплуатацыі мясцовага насельніцтва, а ў мэтах стварэння спрыяльных умоў для гандлю і выцяснення канкурэнтаў. Правадніком каланіяльнай палітыкі сталі *гандлёвыя кампаніі*, якія атрымалі ад дзяржавы права манапольнага гандлю з краінамі Усходу.

Першымі штурм партугальскай гандлёвай і марской манаполіі пачалі галандцы. У 1595 г. яны накіравалі флот на даследаванне Усходняй Індыі. У 1602 г. для фінансавання далейшых гандлёвых экспедыцый была заснаваная галандская Ост-Індская гандлёвая кампанія. У дасягненні сваіх мэт галандцы былі такія ж бязлітасныя, як і партугальцы: яны нападалі на партугальскія караблі і гандлёвыя факторыі. У выніку ў XVII ст. Партугалія пазбылася дамінуючых пазіцый у гандлі вострымі прыправамі. Яна страціла ў барацьбе са сваім асноўным канкурэнтам — Галандыяй — найважнейшыя ўсходнія факторыі і калоніі: Малукскія астравы і порт Малаку ў Паўднёва-Усходняй Азіі, порт Армуз у Іране, апорныя базы ў Японіі, Тайландзе, Індыі і М'янме. У Азіі Партугалія ўтрымала толькі некалькі факторый у Індыі і Кітаі, а ў Афрыцы — Анголу і Мазамбік.

Паколькі галандскія пазіцыі ў Паўднёва-Усходняй Азіі былі вельмі моцныя, Англія і Францыя засяродзілі сваю ўвагу на Індыі. Абедзве краіны адпраўлялі гандлёвыя экспедыцыі і стваралі невялікія факторыі ўздоўж паўднёвых берагоў гэтай краіны. Ім удалося атрымаць тут гандлёвыя прывілеі часткова таму, што ў другой палове XVII ст. імперыя Вялікіх Маголаў аслабла. Да таго ж некаторыя індускія князі ўступалі ў саюзы з еўрапейцамі супраць сваіх мусульманскіх правіцеляў.

**Стварэнне каланіяльных імперый.** Першымі еўрапейскімі дзяржавамі, якія стварылі свае каланіяльныя імперыі яшчэ ў XVI ст., былі Партугалія і Іспанія.

Асновай партугальскай каланіяльнай імперыі сталі ўладанні ў Паўднёвай Амерыцы — Бразілія, заваяваная ў пачатку XVI ст. Для кіравання кожнай калоніяй кароль назначаў генерал-капітана, а таксама даваў лаяльным падданым вялізныя надзелы зямлі. *Данатарыя* (землеўладальнік) кіраваў атрыманай тэрыторыяй і прыцягваў пасяленцаў апрацоўваць зямлю або гандляваць на сваёй зямлі.

Да 1580 г. Бразілія стала квітнеючай калоніяй. Як і іспанцы ў Вест-Індыі (гістарычная назва астравоў Карыбскага мора), партугальцы ўвозілі ў Бразілію рабоў з Афрыкі для працы на плантацыях цукровага трыснягу. У канцы XVII ст. партугальцы адкрылі радовішчы алмазаў. Тысячы новых пасяленцаў рушылі ў калоніі.

Іспанская каланіяльная імперыя, як і партугальская, таксама стваралася «агнём і мячом». Паколькі шлях на Усход вакол Афрыкі кантралявалі партугальцы, іспанскія караблі ў пошуках Індыі выправіліся ў заходнім напрамку, праз Атлан-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

тычны і Ціхі акіяны. Пасля адкрыцця Амерыкі Хрыстафорам Калумбам іспанцы пачалі пакарэнне мясцовага насельніцтва. Яны мелі агнястрэльную зброю, былі закаваныя ў латы, перамяшчаліся вярхом на конях.

*Як вы думаеце, ці маглі мясцовыя жыхары аказаць супраціўленне каланізатарам і адстаяць сваю незалежнасць?*

У Азіі ў 1521 г. падрыхтаваная Іспаніяй экспедыцыя пад камандаваннем партугальскага мараплаўца ***Фернана Магелана*** адкрыла Філіпінскія астравы, якія былі каланізаваныя ў другой палове XVI ст.

Золата, серабро і прыправы патокам пацяклі ў Іспанію. Асноўная доля гэтай здабычы адпраўлялася ў прыналежныя Іспаніі Нідэрланды — у горад Антверпен, які ў XVI ст. стаў гандлёвай сталіцай Заходняй Еўропы. Праз Антверпен прадавалі свае тавары і партугальцы. Такім чынам, Партугалія і Іспанія зрабіліся для Еўропы найважнейшай крыніцай атрымання каштоўных металаў, прыпраў і розных усходніх тавараў.

XVII ст. стала часам узвышэння галандскай каланіяльнай імперыі. Ужо ў пачатку стагоддзя галандскія гандляры выцеснілі з Малукскіх астравоў партугальцаў і іспанцаў, захапілі на востраве Ява горад Батавія (Джакарта), які ў хуткім часе стаў цэнтрам іх каланіяльных уладанняў. У 1641 г. галандцы захапілі Малаку — апорны пункт партугальскіх уладанняў у Паўднёва-Усходняй Азіі. Яны заснавалі некалькі калоній на поўдні Афрыкі (Капская зямля) і захапілі шэраг невялікіх тэрыторый на заходнім узбярэжжы кантынента. Галандцы нават заснавалі калонію Новыя Нідэрланды ў Паўночнай Амерыцы. Аднак асноўныя галандскія каланіяльныя ўладанні знаходзіліся на Малайскім архіпелагу.

У другой палове XVII ст. Англіі ўдалося падарваць каланіяльную і марскую моц Галандыі. Апошняя змагла захаваць уладанні толькі ў Азіі, і тое дзякуючы ўзмацненню саперніцтва паміж Англіяй і Францыяй. З пачатку XVII ст. уздоўж усходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі адно за адным сталі ўзнікаць англійскія паселішчы.

**Станаўленне каланіяльнай сістэмы ў XVI–XVIII стст.**

| Метраполія | Калоніі | Перыяд захопу |
|---|---|---|
| Іспанія | Цэнтральная і Паўднёвая Амерыка, Філіпіны | XVI ст. |
| Партугалія | Бразілія, Ангола, Мазамбік | XVI ст. |
| Галандыя | Паўднёва-Усходняя Азія, поўдзень Афрыкі | XVII ст. |
| Англія | Паўночная Амерыка,<br>Індыя | XVI–XVII стст.,<br>XVIII ст. |
| Францыя | Індыя | XVII ст. |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 22–1

У другой палове XVIII ст. пачалося заваяванне Індыі, якое ажыццяўлялася ўзброенымі сіламі англійскай Ост-Індскай кампаніі. Англія ператваралася ў буйнейшую каланіяльную дзяржаву свету.

*Вялікія геаграфічныя адкрыцці прывялі да пачатку працяглага працэсу збліжэння і ўстойлівага ўзаемадзеяння цывілізацый. Аднак ён быў азмрочаны еўрапейскай каланіяльнай экспансіяй, у выніку якой значная частка свету ператварылася ў крыніцу абагачэння Еўропы, яе эканамічнай і палітычнай магутнасці. Каланіяльная здабыча стала адной з крыніц першапачатковага накаплення капіталу, умацавання капіталізму і стварэння сусветнага рынку. Разам з тым еўрапейская каланіяльная экспансія забяспечыла пранікненне духоўнай і матэрыяльнай культуры Еўропы ў краіны Усходу і Амерыкі, пашырыла еўрапейскія веды пра іншыя грамадствы і сусвет у цэлым.*

1. Якія краіны першымі прынялі ўдзел у геаграфічных адкрыццях? Растлумачце, чаму менавіта яны. Якія яшчэ дзяржавы ўдзельнічалі ў гэтым працэсе і чаму?
2. Ахарактарызуйце ролю дзяржавы і царквы ў каланіяльнай экспансіі еўрапейцаў.
3. Назавіце і растлумачце прычыны сапернiцтва ў канцы XVI ст. паміж Партугаліяй, Іспаніяй, з аднаго боку, і Францыяй, Англіяй і Нідэрландамі — з другога.
4. Выкарыстоўваючы табліцу «Храналогія ранняга Новага часу» на с. 174–175, назавіце падзеі, звязаныя з Вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі. Ахарактарызуйце значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў для гісторыі і геаграфіі.
5. Як змянілася каланіяльная палітыка еўрапейскіх краін у XVI ст.; у XVII ст.?
6. Праілюструйце змест параграфа. Выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі. Да ілюстрацый падбярыце апісанні.

## § 23. Рэфармацыя і рэлігійныя войны

*Рэфармацыя — гэта абнаўленне духоўных асноў еўрапейскай цывілізацыі або пачатак заняпаду духоўнасці еўрапейцаў?*

*Пералічыце рэлігіі, пашыраныя ў Еўропе ў перыяд Сярэдневечча. Назавіце рэгіёны, дзе яны былі распаўсюджаны. Якія змяненні ў еўрапейскім грамадстве спарадзілі развіццё капіталізму і Вялікія геаграфічныя адкрыцці?* (Гісторыя Сярэдніх вякоў, 6 клас; § 21 і § 23 гэтага вучэбнага дапаможніка)



**Прычыны і перадумовы Рэфармацыі.** ***Рэфармацыя*** (ад лац. *reformatio* — пераўтварэнне) — самы масавы рэлігійны і сацыяльна-палітычны рух XVI ст. Гэта быў


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

перыяд барацьбы за рэфармаванне каталіцкай царквы, якая перажывала ў XIV–XVI стст. вельмі цяжкі крызіс. У шырокім сэнсе Рэфармацыя ўяўляла сабой першую значную бітву буржуазіі, якая зараджалася, супраць феадалізму і яго ідэалагічнай асновы — веравучэння царквы, якое больш не адпавядала прадпрымальнаму духу Новага часу. Адраджэнне аказала вялізны ўплыў на афармленне рэфармацыйнага руху. Гуманісты заклікалі да новага прачытання Бібліі і прац аўтарытэтных хрысціянскіх багасловаў, чаму садзейнічала распаўсюджанне кнігадрукавання. Іх ідэі аб неабходнасці ўнутранага ачышчэння чалавека ад грахоў вельмі хутка сталі пагрозай для каталіцкай царквы.

Часта папы і епіскапы вялі непрыстойнае для царкоўных іерархаў жыццё. Нярэдка прадстаўнікі вышэйшага духавенства адначасова займалі некалькі царкоўных пасад. Некаторыя наогул ігнаравалі свае абавязкі і наймалі за грошы людзей, каб тыя выконвалі за іх усю работу.

**Эразм Ратэрдамскі. «Пахвала глупству»**

Папы, кардыналы і епіскапы не толькі сапернічаюць з правіцелямі ў раскошы, але іншым разам і перасягаюць іх. Наўрад ці хто думае аб тым, што белаcнежныя льняныя шаты азначаюць беззаганнае жыццё… Хто помніць, што рукі, абцягнутыя пальчаткамі, ёсць сімвал чыстага і не звязанага з усім зямным здзяйснення таінстваў, што посах паказвае пільны клопат пра паству, а епіскапскі крыж — перамогу над усімі страсцямі чалавечымі? Але амаль усе… пасвяць толькі саміх сябе, ускладаючы клопат пра авечак або на самога Хрыста, або на вандроўных манахаў і на сваіх вікарыяў. І не ўспомніць ніхто, што само слова «епіскап» азначае працу, клопат і стараннасць: толькі аб здабыцці грошай сапраўды дбаюць яны і тут, як належыць епіскапам, глядзяць ва ўсе вочы.

*Якія заганы духавенства крытыкуе аўтар тэксту? Якім у той час было стаўленне да вярхоў каталіцкай іерархіі?*

Папы і духавенства змагаліся за захаванне прывілей царквы, у той час як магутныя манархі цяпер імкнуліся абмежаваць яе ўмяшанне ў справы сваіх дзяржаў.

Гэтая барацьба патрабавала немалых сродкаў. Таму была павялічана плата за правядзенне царкоўных абрадаў. Папы таксама дазволілі продаж індульгенцый. *Індульгенцыя* — гэта поўнае або частковае дараванне грахоў за плату, а таксама сведчанне аб гэтым.

**N.B.**

Упершыню індульгенцыі былі дараваныя ў час крыжовых паходаў, калі папа рымскі пагадзіўся зняць пакаранне за любыя грахі крыжаносцаў. З цягам часу індульгенцыі сталі дараваць не толькі за пэўную службу, але і за грашовыя ахвяраванні на карысць царквы. Да XVI ст. любы чалавек, нават махляр або злачынец, мог купіць сабе дараванне грахоў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раскоша царквы
- Велікасвецкі лад жыцця духавенства;
- занядбанне выканання царкоўных абяцанняў і статутаў;
- заняткі прыбытковай дзейнасцю (плата за правядзенне абрадаў, сімания, продаж індульгенцый і да т. п.)

↓

- Недавер да духавенства як пасрэдніка паміж Богам і людзьмі;
- ухіленне вернікаў ад выканання царкоўных абрадаў;
- аслабленне ролі царквы ў грамадстве

↓

Фарміраванне новага светапогляду

Прычыны Рэфармацыі

Такая практыка выклікала абурэнне. Неабходнасць у царкоўных рэформах наспявала ўжо даўно, задоўга да Рэфармацыі. Занепакоеныя маральным разбэшчаннем папства і духавенства, многія багасловы і святары спрабавалі знутры аднавіць аўтарытэт і чысціню каталіцкай царквы. Аднак папы не хацелі прызнаць неабходнасць змен. Аналагічныя спробы рэфарматараў у XIV—XV стст. — Дж. Уікліфа ў Англіі і Я. Гуса ў Чэхіі — таксама не мелі поспеху. Папства змагалася з любой праявай іншадумства. Па ўсёй Еўропе палалі вогнішчы *інквізіцыі*, на якіх спальвалі ерэтыкоў і абвінавачаных у вядзьмарстве. Упартых манархаў адлучалі ад царквы. Але інквізіцыя так і не змагла падавіць дух незадавальнення каталіцкай царквой.

У адрозненне ад гуманістаў, арыентаваных на адукаваную частку грамадства, дзеячы Рэфармацыі звярталіся за падтрымкай да розных слаёў насельніцтва. У рэфармацыйны рух былі ўцягнутыя гараджане, сяляне, вучоныя-багасловы, студэнты, збяднелае дваранства і нават каранаваныя асобы. Пачаўшыся ў Германіі, Рэфармацыя вельмі хутка ахапіла амаль усе еўрапейскія краіны.

**Пачатак Рэфармацыі ў Германіі.** У пачатку XVI ст. у Германіі склалася вельмі напружаная сітуацыя. Па краіне прайшлася хваля паўстанняў сялян і гараджан. Абвастрыліся супярэчнасці паміж збяднелым рыцарствам і князямі. У палітычна раздробленай дзяржаве каталіцкая царква адчувала сябе паўнаўладнай гаспадыняй. Адкрытае рабаванне і самавольства, назапашванне багацця і раскоша выклікалі абурэнне каталіцкай царквой. Таму не дзіўна, што менавіта ў Германіі пачаўся шырокі антыцаркоўны рух.

Выразнікам агульнага незадавальнення стаў вучоны манах і прафесар Вітэнбергскага ўніверсітэта ***Марцін Лютэр*** (1483—1546), які ўзначаліў рэфармацыйны, або пратэстанцкі, рух. У ***1517 г.*** ён адкрыта выступіў супраць каталіцкай царквы, адмаўляючы яе ролю як адзінага пасрэдніка паміж Богам і чалавекам.

Ратаванне душы чалавека, лічыў Лютэр, не залежыць ад царкоўных таінстваў, абрадаў і ахвяраванняў на карысць царквы, а дасягаецца чыстай верай.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Тым самым адмаўлялася роля духавенства як найвышэйшага рэлігійнага аўтарытэту. Лютэр заклікаў да секулярызацыі царкоўных зямель (іх перадачы ў дзяржаўную ўласнасць) і закрыцця манастыроў, да поўнай аўтаноміі вернікаў ад царкоўнай іерархіі і папства. Ён гаварыў пра тое, што хрысціяне павінны верыць у Свяшчэннае Пісанне і разумець яго, а не бяздумна падпарадкоўвацца папу.

Царква хацела расправіцца з Лютэрам. Толькі заступніцтва нямецкіх князёў, якія імкнуліся завалодаць царкоўнымі землямі і зменшыць уплыў папства ў Германіі, выратавала яму жыццё. Большасць насельніцтва Германіі прыняло рэформу Лютэра. Яго паслядоўнікі пакінулі каталіцкую царкву.

Выступаючы супраць царквы, Лютэр не заклікаў змяняць само грамадства. Ён прызнаваў сацыяльную несправядлівасць і лічыў, што яе нельга знішчыць. Згодна з вучэннем Лютэра, сапраўдны хрысціянін павінен падпарадкоўвацца ўладзе, якая забяспечвае спакой і парадак у грамадстве. Яго вучэнне выказвала найперш погляды багатых гараджан і нямецкіх князёў. Яны імкнуліся аслабіць папскую ўладу, але захаваць існуючае становішча ў грамадстве. Лютэр быў рашучым праціўнікам сялянскай вайны, якая ўспыхнула ў Германіі ў 1524—1526 гг. Ён не падтрымаў патрабаванні сялян аб адмене прыгоннага права. Вялікі рэфарматар пракляў паўстанцаў і заклікаў да расправы над імі: «Няхай усякі, хто можа, сячэ іх, рэжа і коле».

**Распаўсюджванне Рэфармацыі ў Еўропе і заснаванне пратэстанцкіх цэркваў.** Вучэнне Лютэра спарадзіла рух, які хутка распаўсюдзіўся па ўсёй Германіі і стаў вядомы як лютэранства. Афіцыйна лютэранскі царкоўны абрад прыняў Лівонскі ордэн, што паскорыла распаўсюджанне вучэння Лютэра па берагах Балтыйскага мора. Тое ж зрабіла і Прусія. Ідэі Лютэра праніклі на тэрыторыю нядаўна ўтворанай Рэчы Паспалітай.

Пасля 1529 г. усе рухі рэфарматараў атрымалі агульную назву ***пратэстантызм***. Ідэі пратэстантызму станавіліся ўсё больш папулярнымі ў Еўропе. Паступова з'явіліся розныя пратэстанцкія цэрквы.

Другая хваля Рэфармацыі звязана перш за ўсё з імем французскага тэолага ***Жана Кальвіна*** (1509—1564), які стварыў найбольш паслядоўнае пратэстанцкае вучэнне — кальвінізм. Яго трактат «Настаўленне ў хрысціянскай веры» выказваў інтарэсы буржуазіі. Найважнейшым палажэннем вучэння Кальвіна стаў догмат аб абсалютным наканаванні.

Кальвін вучыў, што адным людзям Бог наканаваў пагібель, іншым — выбраным — ратаванне і вечную асалоду, незалежна ад іх маральнасці і ўчынкаў. Кальвін лічыў валоданне маёмасцю і яе прымнажэнне справай богаўгоднай. Але ён падкрэсліваў, што распараджацца багаццем трэба з праведнымі мэтамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Сцяна Рэфармацыі,
г. Жэнева, Швейцарыя

*Як вы думаеце, каго ўвасабляюць статуі на ілюстрацыі? Растлумачце свой пункт гледжання.*

Кальвін апраўдваў накапленні, імкненне атрымаць прыбытак, найстражэйшую беражлівасць і разлік — якасці, неабходныя для дзелавога і прадпрымальнага чалавека.

Пасяліўшыся ў 1541 г. у Жэневе, Кальвін пачаў рэформу рэлігійнага жыцця. Ён усталяваў строгі нагляд за паводзінамі грамадзян і жорсткія пакаранні за злачынствы супраць маралі і веры. Нязгодных з вучэннем Кальвіна або высылалі з горада, або каралі смерцю.

Бясспрэчным укладам Кальвіна ў рэлігійную рэформу сталі прапанаваная ім структура царквы і абшчыны, а таксама прапаганда дысцыпліны і сціпласці ў жыцці вернікаў. Царкоўная арганізацыя кальвіністаў будавалася па рэспубліканскім прынцыпе. Кіраўнікі (старэйшыны) выбіраліся з ліку вернікаў, іерархія сярод іх адсутнічала. Выбіраліся і прапаведнікі. Разам гэтыя людзі прымалі рашэнні па пытаннях веравучэння, нормаў жыцця. Самакіраваная кальвінісцкая царква не залежала ад дзяржавы.

Кальвінізм пачаў актыўна распаўсюджвацца і за межамі Швейцарыі. Прыхільнікі вучэння Кальвіна ў Францыі сталі вядомыя як гугеноты. Абшчыны кальвіністаў з'явіліся ў Шатландыі, у Паўночна-Заходняй Еўропе, асабліва шмат іх было ў Даніі. Кальвінізм пранікнуў таксама ў Вялікае Княства Літоўскае і Венгрыю. Вялікі ўплыў вучэнне Кальвіна аказала на Англію.

У Англіі незадавальненне каталіцкай царквой наспявала ўжо даўно, перш за ўсё сярод гараджан, якія адмаўляліся плаціць царкоўную дзесяціну. Спачатку


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пратэстантызм на англійскіх землях распаўсюджваўся павольна, паколькі каралеўская ўлада ўсяляк гэтаму перашкаджала. Нападкі на афіцыйную царкву ўлады разглядалі як пагрозу дзяржаве. Аднак сітуацыя змянілася з-за адмовы папы рымскага Клімента VII даць развод англійскаму каралю ***Генрыху VIII*** (1509—1547). Парламент і народ падтрымалі караля, які абвясціў сябе ў 1534 г. кіраўніком царквы. Так у Англіі ўтварылася асобная пратэстанцкая царква — ***англіканская***, што падпарадкоўвалася не папу, а каралю. Каталіцкія догматы і абрады захаваліся. Пры гэтым матэрыяльна царква была моцна ўшчэмлена: манастыры былі закрыты, а іх маёмасць і землі перададзены ў казну.



Распаўсюджанне пратэстантызму ў Еўропе

Кароль Генрых VIII жорстка пераследаваў і католікаў, якія хацелі падпарадкоўвацца папу рымскаму, і пратэстантаў, што патрабавалі больш глыбокіх (у тым ліку і сацыяльных) рэформаў. Апошнія ў далейшым сталі вядомыя як *пурытане*. Пурытанскі рух паступова падрыхтаваў рэлігійную і палітычную апазіцыю англійскаму абсалютызму і стаў «ідэалагічным сцягам» рэвалюцый у Нідэрландах і Англіі.

Акрамя лютэранства, кальвінізму, англіканства ў XVI ст. у Еўропе з'явіліся і іншыя пратэстанцкія цэрквы, якія лёгка маглі прыстасавацца да існавання як у раздробленых дзяржавах і дробных княствах, так і ў моцных каралеўствах.

**Раскол Еўропы на каталіцкую і пратэстанцкую.** З распаўсюджаннем пратэстантызму раней адзіная каталіцкая частка Еўропы апынулася падзеленай на два варожыя лагеры. У Італіі, Іспаніі і Партугаліі, дзе захавалася каталіцкая рэлігія, пераследавалі пратэстантаў, а ў паўночных дзяржавах, якія прынялі пратэстантызм, — Англіі, Шатландыі, Швецыі і большай частцы Германіі — мелі месца ганенні на католікаў.

Яшчэ ў 1529 г. імператар Карл V заклікаў аднавіць каталіцкае богаслужэнне і выкараніць вучэнне Лютэра ў Свяшчэннай Рымскай імперыі. Большасць германскіх князёў падтрымалі імператара. Аднак 5 князёў-лютэран і 14 гарадоў заявілі пратэст, адкуль і пайшла іх агульная назва — пратэстанты. У адказ імператар Карл V пачаў у 1547 г. ваенную кампанію ў мэтах прымусіць лютэранскіх князёў вярнуцца


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ва ўлонне каталіцкай царквы. Князі-лютэране аб’ядналіся ў саюз. Ваенныя дзеянні ішлі з пераменным поспехам, ніводзін з бакоў не мог атрымаць перамогу. У 1555 г. у Аўгсбургу быў падпісаны мір, згодна з якім лютэранства станавілася афіцыйнай рэлігіяй. Вышэйшае дваранства, духавенства і знатныя гараджане Свяшчэннай Рымскай імперыі атрымлівалі права самім выбіраць веравызнанне. Аўгсбургскі мір афіцыйна замацаваў новы раскол хрысціянства.

**Аўгсбургскі рэлігійны мір**

XV. Каб усталяваць мір у Свяшчэннай імперыі германскай нацыі паміж рымскай імператарскай вялікасцю і курфюрстамі, князямі і чынамі, — няхай ні яго імператарская вялікасць, ні курфюрсты, князі і г. д. не чыняць ніякаму чыну імперыі ніякага насілля або зла з нагоды аўгсбургскага веравызнання, але даюць ім у міры прытрымлівацца сваіх рэлігійных перакананняў, літургіі і абрадаў, таксама як карыстацца і сваім багаццем і іншымі правамі і прывілеямі; і поўны рэлігійны мір павінен быць дасягнуты толькі хрысціянскімі сродкамі згоды або страхам пакарання ў форме імперскай няміласці.

XVI. Гэтак жа імперскія чыны, якія прытрымліваюцца аўгсбургскага веравызнання, не будуць перашкаджаць усім чынам і князям, якія трымаюцца старой рэлігіі, жыць у поўным міры і карыстацца ўсімі іх багаццямі, правамі і прывілеямі.

XX. Царкоўная юрысдыкцыя, якая да гэтага часу прымянялася адносна аўгсбургскага веравызнання, догмы, назначэння духоўных асоб, царкоўных распараджэнняў і службы (выключаючы правы курфюрстаў, князёў, калегій і манастыроў на грашовыя падаткі і дзесяціны), з гэтага часу спыніцца, і паслядоўнікам аўгсбургскага веравызнання будзе дазволена свабодна і бесперашкодна праводзіць богаслужэнні і абрады і назначаць духоўных асоб.

*Прааналізуйце ўрывак з Аўгсбургскага рэлігійнага міру і зрабіце высновы наконт яго зместу. Назавіце мэту падпісання Аўгсбургскага міру.*

Да 1555 г. князі ў Паўночнай Германіі былі лютэранамі, а большасць князёў у Паўднёвай Германіі — каталікамі. Але спрэчкі паміж каталікамі і пратэстантамі не скончыліся. Па меры таго як у рэфарматараў станавілася ўсё больш паслядоўнікаў, канфлікт разрастаўся ўсё шырэй і шырэй. Вострую форму ён набыў у Францыі. Дзяржава больш як на 30 гадоў паглыбілася ў рэлігійныя гугеноцкія войны (1562–1598).

Асабліва разбуральны характар мела *Трыццацігадовая вайна* (1618–1648). У яе была ўцягнута большасць еўрапейскіх краін. Буйнейшыя дзяржавы вялі смяротную барацьбу за гегемонію ў Еўропе. Непасрэднай прычынай канфлікту стала спроба аўстрыйскіх Габсбургаў, падтрыманых сваімі іспанскімі сваякамі, сілай вярнуць каталіцкую рэлігію ў Германіі. Французскі кароль, хоць і быў каталікам, падтрымаў


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

саюз пратэстанцкіх правіцеляў Германіі супраць палітычных патрабаванняў Габсбургаў.

У ходзе працяглых і бязлітасных ваенных дзеянняў габсбургскі лагер пацярпеў паражэнне. Спустошаная Германія ляжала ў руінах. У 1648 г. быў падпісаны *Вестфальскі мір*. Ён замацаваў палітычную раздробленасць Германіі і існаванне на яе тэрыторыі як каталіцкіх, так і пратэстанцкіх дзяржаў. Найбольшыя выгады з Трыццацігадовай вайны атрымала Францыя. Прыдбаўшы значныя тэрытарыяльныя ўладанні, яна стала самай магутнай дзяржавай Еўропы.

**Контррэфармацыя.** Пратэстанцкая пагроза прымусіла каталіцкую царкву да актыўных дзеянняў па падаўленні рэфармацыйнага руху. Гэтая палітыка атрымала назву ***Контррэфармацыя***. Ваеннай і палітычнай апорай каталіцкай царквы ў XVI—XVII стст. была дынастыя Габсбургаў, якая кіравала ў Іспаніі і Аўстрыі. Іспанскі кароль Філіп II Габсбург (1556—1598) на працягу свайго кіравання фанатычна змагаўся з пратэстантамі па ўсёй Еўропе: пасылаў войскі ў Нідэрланды, падтрымліваў католікаў у Францыі і Германіі, вёў войны з Англіяй.

§ 23–1

Для барацьбы з Рэфармацыяй каталіцкая царква выкарыстоўвала новы манаскі ордэн — *Супольніцтва Ісуса*. Ён быў таксама вядомы пад назвай *ордэн езуітаў*. Ордэн, зацверджаны папскай булай у 1540 г., узначаліў іспанскі дваранін ***Ігнацій Лаёла***.

Члены ордэна беспярэчна падпарадкоўваліся свайму кіраўніку (генералу). Яны атрымлівалі ўсебаковую падрыхтоўку. Разумныя і адукаваныя, надзвычай спрытныя і цярплівыя, яны не грэбавалі ніякай, нават чорнай, работай.

Дзякуючы намаганням ордэна езуітаў Паўднёвая Германія, Аўстрыя, пратэстанты Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага вярнуліся ва ўлонне каталіцкай царквы, а многія народы Паўднёвай Амерыкі і Азіі перайшлі ў хрысціянства. Супольніцтва Ісуса стала самай магутнай і ўплывовай сілай каталіцкай царквы. Тым не менш вяртанне да ранейшых часоў было ўжо немагчымае.

**Мерапрыемствы Контррэфармацыі:**

- узмацненне дзейнасці інквізіцыі;
- стварэнне ордэна езуітаў, адной з мэт якога была барацьба з пратэстантызмам любымі спосабамі;
- рашэнні Трыдэнцкага сабора, які замацаваў непахіснасць усіх каталіцкіх догматаў, рэфармаваў дзейнасць каталіцкай царквы.

*Рэфармацыя падарвала духоўныя і эканамічныя асновы каталіцызму. Пратэстантызм аказаўся больш прыстасаваным да ўмоў буржуазнага грамадства, якое фарміравалася, чым каталіцызм. Незалежныя ад папскага Рыма новыя хрысціянскія цэрквы, як правіла, былі нацыянальнымі і садзейнічалі ўмацаванню свецкай улады. Межы нацыянальных дзяржаў*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*сталі вызначацца ў тым ліку канфесійнымі рамкамі. Не меншы ўплыў аказала Рэфармацыя на развіццё літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Такім чынам, Рэфармацыя шмат у чым вызначыла аблічча сучаснай Еўропы.*

1. Назавіце не менш чым дзве асноўныя прычыны Рэфармацыі. Ахарактарызуйце іх. Чаму менавіта яны садзейнічалі пачатку Рэфармацыі?
2. Назавіце асноўныя палажэнні вучэння М. Лютэра. На ваш погляд, якія новыя духоўныя патрабаванні прыўнесла ў жыццё еўрапейцаў эпоха Рэфармацыі?
3. Ахарактарызуйце Рэфармацыю ў Германіі і Швейцарыі. Вылучыце падобныя і адметныя рысы. Складзіце ў сшытку табліцу.
4. Ахарактарызуйце палітычную і рэлігійную сітуацыю ў Еўропе ў XVI — сярэдзіне XVII ст.
5. Ахарактарызуйце палітыку Контррэфармацыі ў адпаведнасці з планам: а) прычыны, б) асноўныя мерапрыемствы, в) вынікі і наступствы.
6. Падрыхтуйце інтэрактыўную стужку часу з асноўнымі падзеямі перыяду Рэфармацыі і рэлігійных войнаў у Еўропе. Растлумачце свой выбар падзей. Якая з іх, на ваш погляд, з'яўляецца пераломнай у рэлігійных войнах?

## § 24. Еўрапейская навука і культура канца XVI – XVII ст.



*Як навуковая рэвалюцыя канца XVI — XVII ст. вызначыла сучаснае развіццё свету?*

*Якім чынам змяніліся ўяўленні вучоных пра сусвет у XVII ст.? Чаму менавіта ў Новы час стала магчымым фарміраванне новай карціны свету?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Навуковая рэвалюцыя.** Тэхнічныя вынаходствы XVI–XVII стст. (тэлескоп, ртутны барометр і інш.) выклікалі ўздым у развіцці прыродазнаўчых навук і медыцыны. Новыя тэхналогіі і ўдасканаленыя метады даследавання сталі характэрнымі рысамі *навуковай рэвалюцыі*, якая абумовіла навукова-тэхнічны прагрэс і вызначыла сучаснае развіццё свету. Сутнасцю навуковай рэвалюцыі стала грандыёзнае накапленне ведаў, змяненне каштоўнасцяў і поглядаў людзей адносна прыроды і грамадства.

> *Растлумачце, што такое навуковая рэвалюцыя.*

Часткай навуковай рэвалюцыі стала фарміраванне новых падыходаў да вывучэння прыроды і грамадства. Англійскі філосаф і палітык ***Фрэнсіс Бэкан*** (1561–1626) сфармуляваў сутнасць новага метаду навуковага пазнання — эмпірычнага. Сярэднявечны схаластычны метад разваг *(метад дэдукцыі)*, які ўсё яшчэ панаваў у навуцы, грунтаваўся на тым, што спачатку вылучалася палажэнне, якое патрабавала доказаў, а затым да яго падбіраліся самі доказы (разважанне ад агуль-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нага да асобнага). *Індуктыўны метад* Ф. Бэкана прадугледжваў спачатку аналіз асобных фактаў, пасля чаго на іх падставе рабілася заключэнне (разважанне ад асобнага да агульнага).

Паступова быў выпрацаваны падыход, які атрымаў вядомасць як *навуковы метад*. Ён аб'ядноўваў назіранне і асэнсаванне. Навуковы метад уяўляе сабой паслядоўнае спалучэнне трох элементаў даследавання: спачатку грунтоўнае назіранне і эксперымент, затым тлумачэнне назіранняў і эксперыменту з дапамогай розуму. На завяршальным этапе даследавання навуковыя высновы (тэорыі) пацвярджаюцца матэматычна.

**Дасягненні еўрапейскай навукі**

| Дата | Вучоны і даследаванне |
|---|---|
| 1543 г. | Везалій А. Складанне новага атласа па анатоміі чалавека |
| 1543 г. | Капернік М. «Аб вярчэнні нябесных сфер» |
| 1569 г. | Меркатор Г. Новы спосаб праекцыі геаграфічных карт |
| 1587 г. | К. Геснер. «Гісторыя жывёл» |
| 1597 г. | Лейбау А. Сістэматызацыя ведаў па хіміі («Алхімія») |
| 1600 г. | Гільберт У. «Аб магніце, магнітных целах і вялікім магніце Зямлі» |
| 1607 г. | Галілей Г. Вопыты па вымярэнні скорасці святла |
| 1609 г. | Кеплер І. «Новая астраномія, прычынна абгрунтаваная, або Нябесная фізіка» |
| 1621 г. | Снеліус В. Адкрыццё закона праламлення святла |
| 1625 г. | Бэкан Ф. «Вопыты» |
| 1628 г. | Гарвей У. «Анатамічнае даследаванне аб руху сэрца і крыві ў жывёл» |
| 1629 г. | Дэкарт Р. «Правілы для кіравання розуму» |
| 1632 г. | Галілей Г. «Дыялог пра дзве самыя галоўныя сістэмы свету, пталемееву і капернікаву» |
| 1657 г. | Гюйгенс Х. Вынаходства маятнікавага гадзінніка |
| 1663 г. | Паскаль Б. «Трактат аб цяжкасці масы паветра» |
| 1669 г. | Стэнан Н. Распрацоўка асноўных паняццяў аб крышталях |
| 1675 г. | Левенгук А. Адкрыццё мікраарганізмаў і бактэрый |
| 1686 г. | Лейбніц Г. Увядзенне і азначэнне знаку інтэграла |
| 1687 г. | Фармулёўка І. Ньютанам закона аб сусветным прыцягненні ў кнізе «Прынцыпы» |

*Прааналізуйце табліцу. Якія сферы навуковых ведаў выклікалі асаблівую цікавасць вучоных XVI–XVII стст.? Як вы думаеце, чаму? З якімі адкрыццямі вы пазнаёміліся на вучэбных занятках?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Бенядзікт Спіноза

**Фарміраванне новай карціны свету.** Поспехі прыродазнаўства (адкрыццё закона сусветнага прыцягнення, будовы Сусвету, анатоміі чалавека і інш.) аказалі вялікі ўплыў на развіццё грамадскіх навук. Выкарыстоўваючы законы прыродазнаўства, найперш механікі, мысліцелі часта спрабавалі растлумачыць прыроду чалавека і законы развіцця грамадства.

Французскі філосаф ***Рэнэ Дэкарт*** на першае месца ў тлумачэнні развіцця прыроды, грамадства і чалавека паставіў розум. Ён стаў заснавальнікам кірунку ў філасофіі, які атрымаў назву *рацыяналізму* (ад лац. *ratio* — розум). Ідэі рацыяналізму набылі шырокае распаўсюджанне і аказалі вялікі ўплыў на еўрапейскую навуку і культуру. Згодна з Р. Дэкартам, грамадства і жывы арганізм функцыянуюць у адпаведнасці з законамі механікі. Каб наблізіцца да ісціны, лічыў вучоны, неабходныя аналіз і разважанне. Ён выказаў сваю ідэю ў сцвярджэнні: «Я мыслю, значыць, існую».

Вядомы нідэрландскі філосаф XVII ст. ***Бенядзікт Спіноза*** вывучаў законы прыроды і грамадства, грунтуючыся на законах геаметрыі. Ён лічыў, што прырода, якая і ёсць Бог, спарадзіла сама сябе.

Супраць Спінозы выступілі многія абаронцы рэлігіі. Адным з іх быў ***Готфрыд Лейбніц***, нямецкі філосаф, гісторык, юрыст, матэматык і фізік. Г. Лейбніц лічыў, што Бог стварыў «аптымальны», дасканалы свет, і таму ён амаль не ўмешваецца ў справы людзей. Свет жа функцыянуе ў адпаведнасці са складанымі законамі, у ім усё мае сваю прычыну і вынік.

У канцы XVI ст. у Даніі была пабудавана абсерваторыя, дзе астраном ***Ціхо Браге*** вывучаў планеты і зоркі. Ён скрупулёзна запісваў усё ўбачанае. Назіранні Ц. Браге, зробленыя простым вокам, былі самымі падрабязнымі ў той час. Пасля яго смерці нямецкі астраном і матэматык ***Іаган Кеплер*** выкарыстаў гэтыя даследаванні для пацвярджэння тэорыі М. Каперніка. Больш за тое, ён даказаў, што планеты верцяцца вакол Сонца не па ідэальнай акружнасці, як лічыў М. Капернік, а па іншым тыпе арбіты — эліпсе. Італьянскі астраном ***Галілеа Галілей*** інструментальна — з дапамогай тэлескопа — даказаў, што планеты сапраўды верцяцца вакол Сонца.

Адкрыты англійскім матэматыкам ***Ісаакам Ньютанам*** закон сусветнага прыцягнення быў пакладзены ў аснову новага нерэлігійнага апісання Сусвету. Вучоны разглядаў Сусвет як велізарную, добра наладжаную машыну, якая працуе ў адпаведнасці з пэўнымі законамі прыроды.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Помнік І. Ньютану ў Вестмінстэрскім абацтве, г. Лондан, Вялікабрытанія



*На п'едэстале помніка І. Ньютану выбітыя наступныя радкі: «Тут пахаваны сэр Ісаак Ньютан, які вызначаўся амаль боскім складам розуму і надзвычайна валодаў матэматыкай. Ён даследаваў нябесныя свяцілы, шляхі руху камет, марскія прылівы, прыроду святла, і, што да яго не ўдавалася ніводнаму вучонаму чалавеку, ён зразумеў уласцівасці колераў. Узрадуйцеся, смяротныя, што жыў на свеце такі вялікі прадстаўнік чалавецтва!» Якія дасягненні і адкрыцці І. Ньютана натхнілі аўтараў скульптуры напісаць гэтыя словы?*

Адкрыцці ў галіне медыцыны таксама нанеслі моцны ўдар па рэлігійнай карціне свету. Поспехі прыродазнаўчых навук былі дасягнутыя ў вострай барацьбе супраць царквы, якая спрабавала захаваць манаполію на тлумачэнне ўсяго, што адбываецца ў свеце. Каталіцкая царква прызнала погляды Галілеа Галілея ерэтычнымі і забараніла яго кнігі. Рэлігійныя ганенні зведалі Рэнэ Дэкарт і Іаган Кеплер. Аднак вучоныя яшчэ доўга імкнуліся сумясціць навуковыя погляды і боскае тлумачэнне многіх з'яў. Ньютан, напрыклад, прызнаваў, што нябесныя целы былі прыведзены ў рух «першапачатковым боскім штуршком». Тым не менш развіццё прыродазнаўства садзейнічала абмежаванню рэлігійнага ўплыву ў тлумачэнні карціны свету. Навука сканцэнтравала ўвагу на разуменні «бліжэйшых» прычын таго, што адбываецца ў свеце, царква — на канчатковых, «боскіх» прычынах.

Вынікам навуковай рэвалюцыі XVII ст., выкарыстання новага метаду навуковага даследавання стала стварэнне новай навуковай карціны свету.

**Ідэі сацыяльнай роўнасці і народнага суверэнітэту.** Перад мысліцелямі XVII ст. асабліва востра паўстала пытанне аб ролі індывіда ў грамадстве. У гэты перыяд пачала фарміравацца тэорыя натуральнага права народа і дагаворнага паходжання дзяржавы, а таксама вучэнне аб народным суверэнітэце. Людзі, на думку Спінозы, валодаюць даранымі прыродай «натуральнымі неадчужальнымі правамі», да ліку якіх ён адносіў свабоду і ўласнасць. Дзяржава павінна забяспечваць сваім грамадзянам гэтыя правы.

У той жа час атрымала развіццё канцэпцыя падзелу ўлады, прызнавалася важнасць прынцыпу вяршэнства закону ў дзяржаве.

Мысліцелі заняліся распрацоўкай прынцыпаў арганізацыі канстытуцыйнай дзяржавы. Згодна з іх поглядамі, яна павінна грунтавацца на народным суверэнітэце —


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вяршэнстве правоў народа, вытокам якіх з'яўляюцца «натуральныя» правы. Была сфармулявана канцэпцыя суверэннай улады правіцеля.

Вялікі ўклад у тэорыю суверэнітэту ўнёс англійскі філосаф ***Томас Гобс***. Згодна з Т. Гобсам, каб пазбегнуць хаосу натуральнага стану, людзі дамовіліся перадаць сваю волю правіцелю. Правіцель павінен гарантаваць мір і парадак. Лепшы ўрад, паводле Т. Гобса, той, у якім правіцель мае абсалютную ўладу. Філосаф сцвярджаў, што, заключыўшы такі кантракт, людзі ўжо не могуць паўставаць, нават калі лічаць правіцеля тыранам. Такім чынам, ідэі Т. Гобса абгрунтоўвалі кіраванне абсалютных манархаў.

Усё больш мысліцеляў XVII ст. звярталася да ідэі сацыяльнай роўнасці, што сведчыла пра глыбокія змены ў еўрапейскім грамадстве. Сама ідэя роўнасці людзей была не новая. Гуманісты тлумачылі яе агульнай чалавечай прыродай, а прадстаўнікі Рэфармацыі — прыналежнасцю да адной веры. Папулярызацыі ідэі роўнасці таксама садзейнічалі капіталістычныя адносіны, якія патрабавалі недатыкальнасці прыватнай уласнасці незалежна ад таго, хто ёю валодаў — знатны чалавек або просты гараджанін.

Еўрапейскія мысліцелі XVII ст. прапанавалі свае мадэлі грамадскай арганізацыі, у якіх паспрабавалі рэалізаваць прынцыпы сацыяльнай роўнасці і народнага суверэнітэту. Сярод іх можна вылучыць два кірункі: ліберальны і сацыяльна-ўтапічны.

Прадстаўнікі ліберальнага кірунку на першае месца ставілі свабоду чалавека. Менавіта свабода, на іх думку, з'яўляецца неабходнай умовай для развіцця грамадства і ўсталявання ў ім адоснай роўнасці. Лібералы адстойвалі непахіснасць прыватнай уласнасці. Яны лічылі, што людзі самі могуць дамовіцца паміж сабой, таму законаў у разумна ўладкаваным грамадстве павінна быць няшмат.



Статуя Дж. Лока на заднім фасадзе Каралеўскай акадэміі мастацтваў, г. Лондан, Вялікабрытанія

Такіх поглядаў прытрымліваўся знакаміты англійскі філосаф ***Джон Лок***. У 1690 г. ён апублікаваў «Два трактаты аб кіраванні». Дж. Лок пагаджаўся з Т. Гобсам у тым, што мэтай урада з'яўляецца забеспячэнне парадку ў грамадстве. Ён таксама разглядаў урад як вынік грамадскага дагавору паміж правіцелем і падначаленымі. Аднак у астатнім ідэі Дж. Лока кардынальна адрозніваліся ад вучэння Т. Гобса.

Джон Лок глядзеў на чалавечую прыроду больш аптымістычна. Ён верыў у сілу чалавечага розуму, лічыў, што людзі здольныя супрацоўнічаць адзін з адным. Больш за тое, ён сцвярджаў, што калі правіцель з'яўляецца тыранам, значыць, ён парушае дагавор. Такім чынам, народ мае права на паўстанне.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дж. Лок развіваў і іншыя ідэі, якія мелі значэнне для фарміравання еўрапейскай дэмакратыі. Ён лічыў, што людзі маюць натуральныя правы, уключаючы права на жыццё, свабоду і ўласнасць. Урад прызначаны толькі абараняць гэтыя правы, таму яго ўлада павінна быць абмежаваная.

Іншае бачанне сацыяльных адносін і ідэі роўнасці прапанавалі сацыялісты-ўтапісты. Раннім прадстаўніком сацыялістычнага ўтапізму быў англічанін ***Джон Белерс***, эканаміст і сацыяльны рэфарматар. Ён выступаў за пабудову справядлівага грамадства праз укараненне працоўнага выхавання і лічыў, што дабрабыт грамадства непасрэдна залежыць ад далучанасці народа да працоўнай дзейнасці. Дж. Белерс выступіў пад лозунгам «Хто не працуе, няхай не есць!». Арганізацыя працоўных каледжаў, у якіх будуць навучацца і багатыя і бедныя, згодна з Дж. Белерсам, з'яўлялася неабходнай умовай пачатку грамадскіх змен.

**Дж. Белерс. «Прапановы аб заснаванні працоўнага каледжа ўсіх карысных рамёстваў і сельскай гаспадаркі»**

Дзеці заможных бацькоў могуць быць выхаваны і навучаны ўсім карысным навукам. Яны, назіраючы за работай іншых і за тым, як тыя берагуць час, замест таго каб гуляць, будуць вучыцца якому-небудзь рамяству…

У звычайных умовах жыцця і вытворчасці мужчыны, іх жонкі і дзеці часта страчваюць палову таго, што маюць, у выніку нявыгадных здзелак, кабальных даўгоў або судовых працэсаў, чаго зусім не будзе ў каледжы. І калі зямля будзе толькі працягваць прыносіць свой плён, а працоўны народ толькі выконваць сваю частку работы, яны будуць мець усяго ў дастатку. У той час як цяпер часта і земляроб, і рамеснік абодва даходзяць да галечы, хоць першы мае вялікі ўраджай, а другі вырабіў шмат тавару: грошы, а не праца, зроблены меркаю рэчаў.

Ідэі роўнасці людзей перад законам і народнага суверэнітэту прывялі ў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў да рэвалюцый, якія садзейнічалі зацвярджэнню сістэмы рэспубліканскага кіравання, і стварэння выбарных парламентаў.

**Літаратура і мастацтва.** Новыя з'явы ў жыцці еўрапейскага грамадства яскрава адбіліся ў культуры XVII ст., якая зведала на сабе ўплыў трох стыляў: маньерызму, барока і класіцызму.

Яшчэ з другой паловы XVI ст. у выяўленчым мастацтве, архітэктуры і літаратуры ўсталяваўся новы стыль — ***маньерызм*** (ад італ. *maniera* — манера, стыль). Зарадзіўшыся ў Італіі ў 1520-я гг., ён дамінаваў у Еўропе да 1620-х гг. Маньерызм стаў сімвалам крушэння гарманічнага, ідэальнага свету эпохі Адраджэння, у якім чалавек выяўляўся ў ідэальных вобразах. Маньерызм звярнуў увагу на адмоўны бок жыцця — на пакуты чалавека і супярэчлівасць яго натуры, у якой маглі ўжывацца і высакародныя і ганебныя жаданні. Маньерызм паказваў уяўнасць магутнасці чалавека ў часта варожым для яго свеце.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Кузня Гефеста. Мастак *Джорджа Вазары*. Каля 1540–1560 гг.

*Якія элементы карціны даказваюць, што адлюстравана кузня Гефеста?*

Цікавасць да антычнай класікі змянілася захапленнем эліністычнай філасофіяй, якая паказвала залежнасць чалавека ад боскіх сіл. Акцэнт рабіўся на містычным, нерацыянальным успрыманні свету, пагрозлівага і непрыязнага да чалавека.

У літаратуры маньерызм праявіўся ва ўскладненай структуры твора, вытанчанасці стылю, кантраснасці вобразаў і выкарыстанні алегорый.

У жывапісе гэты стыль праявіўся ў імкненні мастакоў перадаць унутраны вобраз, а не як мага дакладней адлюстраваць знешнюю рэальнасць. Візуальна гэта праявілася ў ламанасці контураў, змеепадобных лініях, свядомым скажэнні прапорцый чалавечага цела, рэзкіх колеравых дысанансах. У архітэктуры назіралася перавага складаных паркавых кантрасных кампазіцый. Незвычайныя прасторавыя эфекты ўзмацняліся спалучэннем розных матэрыялаў (прыродны камень, бронза, мармур). Выкарыстанне лесвіц, дэкаратыўнасць, арнаментальнасць, пластыка, а таксама манументальная скульптура сталі характэрнымі рысамі маньерызму.

Маньерызм стаў пераходным стылем ад Адраджэння да ***барока*** (ад італ. *barocco* — мудрагелісты, дзіўны), які панаваў у Еўропе на працягу практычна ўсяго XVII ст. Некаторыя даследчыкі разглядаюць маньерызм не як асобны стыль, а як частку барока. Сапраўды, абодва стылі вельмі падобныя. Тым не менш прадстаўнікі барока асудзілі маньерызм з-за адыходу ад рэальнасці. Для барока былі характэрныя рэлігійнасць, узвышанасць, цэласнасць і заканамернасць пабудовы сюжэта або формы. У стылі барока ўпершыню ў гісторыі злучыліся класічныя формы Рэнесансу і рамантычнае бачанне рэальнасці. Рэлігійнае каталіцкае светаўспрыманне набыло тут містычнае адценне. Невыпадкова барока называюць «стылем каталіцызму». Гэтая асаблівасць мастацтва барока



Царква Іль Джэзу, г. Рым, Італія. Архітэктары *Джакома да Віньёла* і *Джакома дэла Порта*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

спачатку праявілася ў Італіі, крыху пазней — у Іспаніі, Рэчы Паспалітай. Шырокае распаўсюджанне барока атрымала ў ВКЛ, ператварыўшыся тут у стыль віленскага барока.



Плошча Святога Пятра, г. Рым, Італія

Барока ў першую чаргу ўвасобіла памкненні каталіцкай Контррэфармацыі. Асаблівага росквіту яно дасягнула ў Мадрыдзе, Празе, Вене і Бруселі. Крыху пазней стыль барока распаўсюдзіўся па ўсёй Еўропе і трапіў у Лацінскую Амерыку. Першая барочная царква Іль Джэзу была пабудавана ў Рыме ў 1584 г. Яе фасад стаў узорам для будаўніцтва многіх цэркваў як у Італіі, так і далёка за яе межамі (Парыж, Гродна, Львоў і інш.). Першы ў Рэчы Паспалітай барочны архітэктурны помнік — Фарны касцёл у Нясвіжы — быў пабудаваны ўжо ў 1593 г. італьянскім майстрам Джавані Бернардоні на ўзор Іль Джэзу.

Буйнейшым італьянскім архітэктарам барока, які працаваў у XVII ст., быў ***Джавані Ларэнца Берніні***. Усяму свету вядомая плошча Святога Пятра ў Рыме, створаная па яго праекце. Раскошная каланада ўтварае штучную перспектыву і зрокава павялічвае памеры сабора. Менавіта Берніні завяршыў пачатае Мікеланджэла Буанароці будаўніцтва базілікі Св. Пятра ў Рыме. Рух, эмацыянальнасць і драматычныя эфекты вызначаюць інтэр'ер базілікі, асабліва выкананы архітэктарам трон Св. Пятра.

З другой паловы XVII ст. культурным цэнтрам Еўропы стала Францыя. Менавіта там адбылося вяртанне да класічных формаў эпохі Адраджэння і станаўленне новага стылю. ***Класіцызму*** (ад лац. *classicus* — узорны) былі ўласцівыя выразнасць, прастата і прапарцыянальнасць.

Выразнікам новых павеваў у жывапісе стаў французскі жывапісец ***Нікала Пусен***. Яго сюжэтны зварот да Грэцыі і Рыма, цэхамірнасць пейзажаў, перанятыя з антычнасці позы выяўленых людзей і выкарыстанне карычневых тонаў сталі неад'емнымі рысамі стылю класіцызму.



Чатыры пары года. Восень.
Мастак *Нікала Пусен*. 1660–1664 гг.

У літаратуры станаўленне класічных формаў было звязана з французскім паэтам ***Франсуа Малербам***. Сваімі вершамі ён рэфармаваў французскую мову і фактычна ўкараніў новыя паэтычныя каноны:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*І вось прыйшоў Малерб, і даў французам першы*
*Памеру, рытму падначаленыя вершы...*
*Магутнасць слоў, парадкам злучаных, адкрыў*
*І музу правілам няўхільным пакарыў.*
*Н. Буало. «Паэтычнае мастацтва», 1674 г.*
*(Пераклад Н. Кучмель)*

Прадстаўнікі класіцызму зыходзілі з таго, што існуюць вечныя законы творчасці, якія чалавек павінен вывучаць з пазіцыі розуму і якімі павінен кіравацца. Не дзіва, што класіцысты імкнуліся адлюстраваць не рэальнае жыццё, а ідэальнае. Толькі ў адрозненне ад канцэпцый маньерыстаў і прадстаўнікоў барока іх ідэал высакароднай асобы быў спароджаны не фантазіямі і пачуццямі, а розумам і быў прызначаны ўдасканальваць грамадства. Асаблівую ўвагу класіцысты надавалі тэатральнаму мастацтву, якое было самым папулярным у XVII ст. У эпоху класіцызму адбыўся росквіт драматургіі. Творы П'ера Карнэля, Жана Расіна і Мальера сталі прыкладам класічных драматычных твораў XVII ст.

*Навука і культура канца XVI — XVII ст. па-свойму адлюстравалі змяненні, якія перажывала еўрапейскае грамадства. Навука ўсё далей адыходзіла ад царкоўных догмаў, знайшоўшы апору ў рацыянальным спасціжэнні рэчаіснасці. Культура ж эмацыянальна адлюстравала шырокую палітру чалавечых перажыванняў той эпохі. Вера ў магутнасць чалавечай прыроды, уласцівая Рэнесансу, хутка змянілася няўпэўненасцю і ўцёкамі ад рэальнасці ў маньерызме. Афарбаванае рэлігійнасцю барока стала спробай прымірыць рэалізм першага і рамантызм другога стыляў. Класіцызм жа адлюстраваў імкненне людзей, стомленых ад войнаў і разрухі, да парадку і прастаты, якія стваралі ў грамадстве ілюзію абароненасці.*

1. Назавіце характэрныя рысы навуковай рэвалюцыі XVII ст. Прывядзіце прыклады, якія іх ілюструюць.
2. Складзіце ў сшытку параўнальную табліцу «Еўрапейская навука ў XVI–XVIII стст.», ахарактарызаваўшы ў ёй навуку ў эпоху Адраджэння, навуковую рэвалюцыю XVII ст. і навуку ў XVIII ст. Зрабіце высновы.
3. Які метад, на думку Ф. Бэкана, мае першачарговае значэнне для даследчыка? Чым адрозніваліся пазіцыі Ф. Бэкана і Р. Дэкарта?
4. Якія ідэі сацыяльнай роўнасці і народнага суверэнітэту сфарміраваліся ў XVII ст.? Да чаго прывяло іх з'яўленне і пашырэнне ў грамадстве?
5. Якія змены адбыліся ў еўрапейскай культуры канца XVI — XVII ст.? Што паўплывала на развіццё культуры гэтага перыяду?
6. Ахарактарызуйце мастацкія стылі, якія з'явіліся ў XVII ст. Параўнайце іх.

| **Назва стылю** | **Перыяд росквіту** | **Характэрныя рысы** | **Яркія прадстаўнікі** | **Творы** |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

7. Падрыхтуйце прэзентацыю (буклет, лэпбук) з прыкладамі, прысвечаную архітэктуры (жывапісу) аднаго са стыляў XVII ст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 25. Еўрапейскі абсалютызм



*Ці з'яўляўся абсалютызм прагрэсам у палітычным развіцці еўрапейскага грамадства?*

*Як змянялася палітычная карта Еўропы на працягу першага перыяду Новага часу?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Барацьба вялікіх дзяржаў за панаванне ў Еўропе ў XVI—XVIII стст.** Канец XV — пачатак XVI ст. — час першых крокаў на шляху да фарміравання нацыянальных дзяржаў, якое заняло тры наступныя стагоддзі. Новыя манархіі аб'ядналі тэрыторыі з рознымі мовамі, культурай і гістарычным мінулым.

Войны як сродак вядзення палітыкі ў гэты перыяд сталі больш маштабнымі. Яны набывалі агульнаеўрапейскі характар, а дзякуючы ўдасканаленню тэхналогій апынуліся дарагімі і вялі да большых чалавечых ахвяр.

**Да канфліктаў прыводзілі:**

- **розныя погляды на палітычнае ўладкаванне Еўропы:**
  1) Габсбургі выступалі за адзіную імперыю, на чале якой павінен стаяць імператар, падтрыманы папам рымскім;
  2) Англія і Францыя адстойвалі самастойныя нацыянальныя дзяржавы
- **рэлігійны раскол:** у XVI ст. Еўропа была расколатая па рэлігійнай прыкмеце на каталікоў і пратэстантаў, рэлігійныя войны дасягнулі агульнаеўрапейскага маштабу
- **эканамічныя супярэчнасці:** барацьба за калоніі, за рынкі, за панаванне на марскіх гандлёвых шляхах

Прычыны міжнародных канфліктаў XVI–XVII стст.

У першай палове XVI ст. за панаванне ў Еўропе змагаліся французская дынастыя Валуа, аўстрыйскія і іспанскія Габсбургі. У выніку гэтага супрацьстаяння ў 1557 г. Францыя і Свяшчэнная Рымская імперыя, так і не атрымаўшы вырашальнай перамогі, абвясцілі сябе банкрутамі, растраціўшы пазычаныя домам Фугераў грошы ў ваенных паходах.

Не паспела Францыя аднавіцца пасля нядаўняга канфлікту, як апынулася ў віры рэлігійных войнаў (1562—1598). Іспанію ж зацягнула барацьба з Галандыяй. На ўсход разгарнулася праціборства паміж Расіяй, Рэччу Паспалітай і Швецыяй. Узмацненне апошняй змяніла суадносіны сіл у паўночна-ўсходнім рэгіёне


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Успомніце вывучаныя раней асноўныя падзеі Трыццацігадовай вайны.*

Еўропы і пачало пагражаць магутнасці аўстрыйскіх Габсбургаў. Да 1618 г. разрозненыя тэатры ваенных дзеянняў зліліся ў адзін з самых буйных канфліктаў XVII ст. — Трыццацігадовую вайну (1618—1648).

Вестфальскі мір 1648 г., які азнаменаваў заканчэнне вайны, адкрыў новую эру еўрапейскай міжнароднай палітыкі, звязаную з так званай Вестфальскай сістэмай міжнародных адносін. Пазіцыі Габсбургаў і Свяшчэннай Рымскай імперыі ў Еўропе пахіснуліся. Імператар ужо не мог умешвацца ў справы германскіх дзяржаў. Габсбургі спынілі спробы пашырэння тэрыторыі за кошт іншых еўрапейскіх краін. Аслаблі таксама Іспанія і Данія. Расія ўступіла ў працяглы перыяд ізаляцыі ад Заходняй Еўропы. Адначасова адбылося ўмацаванне пазіцый Галандыі і Швецыі. Вестфальскі мір пацвердзіў тэрытарыяльныя і палітычныя змены, якія мелі месца за папярэднія 50 гадоў. Акрамя таго, новы мір азнаменаваў устанаўленне геаграфічных межаў распаўсюджання каталіцызму і пратэстантызму, якія ў далейшым мала змяніліся. Але самым важным было тое, што трансфармаваліся прынцыпы міжнароднай палітыкі. У выніку складвання Вестфальскай сістэмы яе дзеючай асобай стаў выступаць не манарх, а суверэнная дзяржава.

Вестфальскі мір падрыхтаваў французскую гегемонію ў Еўропе. Тэрытарыяльныя набыткі, а таксама падтрымка германскіх пратэстанцкіх княстваў ператварылі Францыю ў еўрапейскага лідара больш як на паўстагоддзя. Аднак *Вайна за Іспанскую спадчыну* (1701—1714) азнаменавала не толькі падзенне Іспаніі, але і аслабленне міжнародных пазіцый Францыі. Канфлікт вёўся ў Еўропе і за яе межамі. У Паўночнай Амерыцы Англія і Францыя пачалі барацьбу за заморскія землі. Доўгая вайна аслабіла ўсе дзяржавы, і ў 1713 г. ва Утрэхце быў падпісаны мірны дагавор. Францыі ўдалося захаваць свае граніцы. Аўстрыі дасталіся іспанскія Нідэрланды. Вялікабрытанія (у 1707 г. Англія і Шатландыя аб’ядналіся ў Злучанае каралеўства Вялікабрытаніі) атрымала Гібралтар.



Падпісанне Вестфальскага міру ў Мюнстэры. Мастак *Герард Тэрборх*. 1648 г.

Так вяршэнству Францыі ў Еўропе прыйшоў канец. У міжна-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

роднай палітыцы запанаваў прынцып балансу сіл. Гэта азначала, што ніводная з дзяржаў не была дастаткова магутнай, каб дамінаваць у Еўропе.

Да сярэдзіны XVIII ст. на ролю еўрапейскіх лідараў прэтэндавалі дзве германскія дзяржавы — Аўстрыя і Прусія. Вялікабрытанія і Расія таксама адыгрывалі важную ролю ў еўрапейскай палітыцы. Майстэрства дыпламатыі вялікіх дзяржаў у гэты час было ў тым, каб шляхам стварэння саюзаў і альянсаў падтрымаць ужо існуючы баланс сіл.

Між тым рознагалоссі паміж вялікімі еўрапейскімі дзяржавамі былі даволі моцнымі. Невыпадкова ў вайну за аўстрыйскую спадчыну (1740—1748) было ўцягнута мноства еўрапейскіх дзяржаў. Аднак па ўмовах міру ўсе тэрыторыі вярталіся тым краінам, якім яны належалі да вайны. Толькі Прусія пад кіраўніцтвам караля ***Фрыдрыха II Вялікага*** (1740—1786) замацавала за сабой Сілезію. Аўстрыя імкнулася вярнуць Сілезію, а Прусія і Расія хацелі пашырыць свае ўладанні. Вялікабрытанія і Францыя працягвалі сапернічаць за тэрыторыі ў Індыі і Паўночнай Амерыцы. У хуткім часе сутыкненне інтарэсаў прывяло еўрапейскія дзяржавы да *Сямігадовай вайны* (1756—1763), якая праходзіла на тэрыторыі трох кантынентаў: у Еўропе, Азіі і Паўночнай Амерыцы. У выніку вайны Англія стала вядучай каланіяльнай

**Міжнародныя адносіны ў XVI–XVIII стст.**

| Падзея | Дата | Краіны-ўдзельніцы | Вынік |
|---|---|---|---|
| Італьянскія войны | 1494–1559 гг. | Францыя, Італія, Іспанія, Германія |Ката-Камбрэзійскі мір. Італія падпарадкавана Іспаніі |
| Трыццацігадовая вайна | 1618–1648 гг. | Чэхія, Аўстрыя, Германія, Данія, Швецыя, Францыя | Вестфальскі мір. Раўнапраўе веры. Узмацненне раздробленасці Свяшчэннай Рымскай імперыі. Незалежнасць Галандыі |
| Вайна за Іспанскую спадчыну | 1701–1714 гг. | Іспанія, Францыя, Галандыя, Аўстрыя | Францыя аслабела. Іспанія страціла сваю магутнасць |
| Паўночная вайна | 1700–1721 гг. | Данія, Швецыя, Расія, Рэч Паспалітая, Францыя | Ніштацкі мір. Расія атрымала выхад да Балтыйскага мора |
| Сямігадовая вайна | 1756–1763 гг. | Аўстрыя, Іспанія, Швецыя, Расія, Вялікабрытанія, Саксонія, Прусія | Страта Францыяй калоній на карысць Вялікабрытаніі. Прусія захавала свае землі |
| Руска-турэцкая вайна | 1787–1791 гг. | Расія, Турцыя | Аслабленне Асманскай імперыі |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дзяржавай. Згодна з мірнымі дагаворамі 1763 г. Вялікабрытанія атрымала Канаду і ўсе французскія землі на ўсход ад ракі Місісіпі. Францыя захавала свае гандлёвыя факторыі ў Індыі, а таксама два «цукровых» астравы ў Вест-Індыі. Прусія ж здолела замацаваць за сабой Сілезію. У выніку паспяховых заваёўніцкіх войнаў Фрыдрыха II Прусія да канца XVIII ст. стала магутнай дзяржавай і галоўным сапернікам Аўстрыі ў барацьбе за ўладу ў Германіі.

Сямігадовая вайна пакінула Вялікабрытанію і Францыю ў вялікіх даўгах. Палітыка, якую праводзілі гэтыя краіны ў мэтах пагашэння сваіх даўгоў, у далейшым прывяла да падрыву брытанскага панавання ў Паўночнай Амерыцы і падзенню абсалютнай манархіі ў Францыі.

**Станаўленне абсалютысцкіх дзяржаў.** У XVII—XVIII стст. у Еўропе з'явілася новая форма дзяржаўнай улады — *абсалютная манархія*, пры якой уся ўлада (заканадаўчая, выканаўчая і судовая) належала манарху. Саслоўна-прадстаўнічая манархія, пры якой некаторыя саслоўі ўдзельнічалі ў кіраванні дзяржавай, перастала адпавядаць патрэбам нацыянальных дзяржаў.

*Дайце азначэнне тэрміну «абсалютная манархія».*

Станаўленне класавага грамадства ў процівагу саслоўнаму падзелу, развіццё капіталістычных адносін, увядзенне сістэмы пастаяннага падаткаабкладання, а таксама навуковая рэвалюцыя садзейнічалі афармленню абсалютызму. Навуковыя ўяўленні аб тым, што Сонца — цэнтр нашай часткі Сусвету, былі перакладзены на сферу палітыкі, якая стала тлумачыцца зыходзячы з натуральнага парадку рэчаў. Невыпадкова кароль Францыі Людовік XIV называў сябе «каралём-сонцам»: тым самым ён адзначаў, што манарх знаходзіцца ў цэнтры палітычнай сістэмы. Папулярнасць цэнтралізаваных дзяржаў з абсалютнай уладай манарха ўмацоўвалі

**Асноўныя прыкметы еўрапейскага абсалютызму:**

- з'яўленне вялікай колькасці чыноўнікаў, праз якіх манарх ажыццяўляе кіраванне дзяржавай;
- увядзенне адзінай сістэмы мер і вагаў;
- стварэнне пастаяннай арміі як апоры манарха ва ўрэгуляванні пытанняў бяспекі;
- правядзенне адзінай эканамічнай палітыкі;
- стварэнне адзінай падатковай сістэмы;
- падпарадкаванне царквы каралю;
- увядзенне адзінага заканадаўства і адміністрацыйнага падзелу.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Помнік каралю Францыі Людовіку XIV, г. Ліён, Францыя

*Падбярыце ў сетцы інтэрнэт фатаграфіі помнікаў каралю Людовіку XIV і яго партрэты. Ці ёсць у іх агульныя рысы? Як вы думаеце, чаму скульптары і мастакі менавіта так уяўлялі сабе «караля-сонца»?*

спадзяванні на парадак і бяспеку, якіх чакалі еўрапейцы, стомленыя ад войнаў і разрухі.

Найбольш яскравы прыклад абсалютызму — Францыя перыяду кіравання караля ***Людовіка XIV*** (1643–1715). Ваенныя поспехі Францыі, даходы ад заморскіх уладанняў, асабліва ад плантацый цукровага трыснягу з французскіх калоній Карыбскага мора, стварылі неабходную матэрыяльную базу для неабмежаванай улады манарха. Раскоша французскага двара стала сімвалам поспеху кіравання дзяржавай і ўзорам для пераймання. Яшчэ адным сімвалам велічы ўлады манарха стала будаўніцтва шыкоўнага палаца — Версаля.

Аднак глеба для французскага абсалютызму была падрыхтавана раней. Кардынал Рышэлье, з'яўляючыся першым міністрам з 1624 г., аслабіў пазіцыі арыстакратыі і незалежных пратэстанцкіх гарадоў.

23-гадовы Людовік вырашыў кіраваць краінай самастойна. У перыяд свайго кіравання ён нікога не назначаў на пасаду першага міністра. Незадаволеную арыстакратыю ён задобрыў грашовымі выплатамі, вызваленнем ад выплаты рэгулярных падаткаў і дзяржаўнымі пасадамі. Людовік XIV здолеў акружыць сябе таленавітымі людзьмі, такімі як міністр ***Жан Батыст Кальбер***. Ж. Б. Кальбер вёў палітыку, накіраваную на ўмацаванне ўнутранай эканомікі і яе абарону ад канкурэнцыі тавараў з іншых дзяржаў. Аднак нават умелая пратэкцыяніcцкая палітыка Кальбера не змагла ўберагчы Францыю ад разарэння. Тым не менш пераемнікі Людовіка XIV прадоўжылі палітыку абсалютызму.

Многія еўрапейскія дзяржавы сталі капіраваць эканамічны і ваенны курс французскага караля. Выкарыстоўвалі яго вопыт дружалюбныя да Францыі германскія дзяржавы Свяшчэннай Рымскай імперыі. Нават самыя невялікія з іх імкнуліся будаваць мініяцюрныя копіі Версаля, мець пастаянную армію, дзяржаўную царкву і праводзіць пратэкцыяніcцкую палітыку.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Дзяржаўныя органы ўлады ў Францыі ў перыяд абсалютызму

Іншыя краіны Еўропы не пераймалі непасрэдна французскія інстытуты абсалютызму, але дзейнічалі ў кірунку ўмацавання каралеўскай улады. Прыкладам такой дзяржавы можа служыць Англія.

**Рэвалюцыя і ўсталяванне парламенцкай манархіі ў Англіі.** Як і ў астатніх еўрапейскіх дзяржавах, у Англіі ў XVII–XVIII стст. склалася моцнае цэнтралізаванае кіраванне, але ў форме не абсалютнай, а абмежаванай манархіі. Англічане прынялі многія ідэі заснавальніка лібералізму Дж. Лока. Яны лічылі, што дзяржава павінна абараняць асноўныя свабоды і што ўлада даецца правіцелю са згоды яго падданых. Ідэі і інстытуты, што ўзніклі ў Англіі, стварылі ўмовы для фарміравання больш дэмакратычнай формы праўлення.

Каралеўская ўлада ў Англіі была абмежаваная Вялікай хартыяй вольнасцяў. Англійскія манархі павінны былі таксама лічыцца з рашэннямі парламента. Ужо да XVI ст. англійскі парламент заваяваў права зацвярджаць новыя падаткі і законы, прапанаваныя каралём. Аднак усё роўна ў манархаў заставалася больш улады, чым у парламента. Яны назначалі чыноўнікаў і суддзяў, склікалі і распускалі парламент, вызначалі знешнюю палітыку краіны. Апошнія правіцелі дынастыі Цюдораў — Генрых VIII і яго дачка Лізавета I — усведамлялі важнасць канструктыўнага ўзаемадзеяння з парламентам. Правіцелі ж новай дынастыі Сцюартаў — Якаў I і Карл I — верылі ў «боскае права каралёў» і нярэдка канфліктавалі з парламентам. Асабліва складанымі былі іх адносіны з ніжняй палатай парламента — палатай


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

абшчын. Большасць яе прадстаўнікоў складалі дваране-прадпрымальнікі, блізкія да буржуа, — *джэнтры*. Найбольш вострыя рознагалоссі паміж манархамі і парламентам узнікалі па фінансавых пытаннях.

Парламент рэзка крытыкаваў бяздарную знешнюю палітыку ўрада і выступаў супраць збору каралём незацверджаных падаткаў і практыкі прымусовых пазык. На працягу 1630-х гг. Карл I з-за сваёй палітыкі набыў шмат ворагаў. У Англіі ўсталяваўся рэжым тэрору.

Супрацьстаянне караля і парламента перарасло ў 1642 г. у востры канфлікт. Грамадзянская вайна ў Англіі працягвалася з 1642 па 1648 г. На баку караля выступілі пераважна дваране і сельскія жыхары (асабліва ў Паўночна-Заходняй Англіі). Прыхільнікаў караля называлі кавалерамі (ад слоў «конныя вершнікі», або «кавалерыя»).

Парламент набіраў войскі ў асноўным з прадстаўнікоў сярэдняга класа (асабліва з гарадоў Паўднёва-Усходняй Англіі). За парламент змагаліся многія пурытане. Прыхільнікаў парламента называлі «круглагаловымі», паколькі яны каротка стрыгліся, каб падкрэсліць сваё адрозненне ад арыстакратаў, якія насілі доўгія валасы.




Дзяржаўныя органы ўлады ў Англіі

*Параўнайце сістэмы дзяржаўнага кіравання ў Францыі і ў Англіі. Чым яны адрозніваліся?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Статуя О. Кромвеля, г. Кембрыдж, Вялікабрытанія

У 1645 г. ваенны і палітычны дзеяч ***Олівер Кромвель*** рэарганізаваў армію парламента ў так званую армію «новага ўзору». Пад яго энергічным кіраваннем яна ператварылася ў добра арганізаваную і магутную сілу. У некалькіх баях яна разбіла кавалераў і ў 1646 г. узяла ў палон самога караля.

У студзені 1649 г. суд прыгаварыў Карла I да смерці. Затым палата абшчын скасавала манархію і палату лордаў і абвясціла Англію рэспублікай. Такім чынам, грамадзянская вайна прывяла да рэвалюцыі ў сістэме ўладкавання англійскай дзяржавы.

Олівер Кромвель стаў на чале рэспублікі, вядомай пад назвай Садружнасць. О. Кромвель быў чалавекам высокіх маральных прынцыпаў. Ён падтрымліваў рэлігійную цярпімасць да ўсіх пратэстантаў, але не да католікаў. Ён спадзяваўся, што з дапамогай парламента зможа аднавіць мір.

Але грамадзянская вайна трагічным чынам раздзяліла Англію. Некаторыя рэфарматары хацелі працягу рэвалюцыі. Адна група — левелеры, узначаленыя Джонам Лілбернам, — патрабавала адмены дваранскіх тытулаў. Яны таксама лічылі, што права голасу на парламенцкіх выбарах павінны мець усе англійскія мужчыны. Але гэта была занадта смелая для таго часу ідэя (галасаваць магла толькі невялікая колькасць уласнікаў).

У 1652 г. Кромвель распусціў парламент. Затым ён прыняў тытул лорда-пратэктара і кіраваў Англіяй як дыктатар да сваёй смерці ў 1658 г. Як лорд-пратэктар Кромвель увёў у краіне ваенную дыктатуру.

Армейскія чыноўнікі ўсталявалі строгія пурытанскія парадкі. Яны зачынілі тэатры, забаранілі газеты і танцы, узмацнілі законы, якія былі накіраваныя на недапушчэнне дуэляў, забаранялі брыдкаслоўе, блюзнерства і такую «бескарысную і бязбожніцкую» дзейнасць, як прагулка ў дзень адпачынку.

Палітыка, што праводзілася О. Кромвелем, была надзвычай непапулярная ў Англіі. Народ жадаў аднаўлення манархіі. Пасля смерці Кромвеля зноў сабраўся Доўгі парламент. У 1660 г. ён запрасіў сына Карла I, які жыў у Францыі, вярнуцца ў Англію і каранавацца ў якасці Карла II.

Так была адноўлена манархія, але грамадзянская вайна і стварэнне Садружнасці мелі значныя наступствы. Новы кароль быў асцярожны ў сваіх адносінах з парламентам. А парламент прымаў меры, каб не дазволіць Карлу II і наступным правіцелям выкарыстоўваць уладу па ўласным жаданні. У 1679 г. быў прыняты важны закон — Хабеас корпус, які абараняў людзей ад самавольнага арышту па ініцыятыве каралеўскай улады.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Станаўленне нацыянальных дзяржаў, працяглыя войны, вострая патрэба ў грашах, геаграфічныя адкрыцці, а таксама канец магутнасці царквы — усе гэтыя фактары прадвызначылі з'яўленне абсалютных манархій. У выніку знаць і саслоўна-прадстаўнічыя органы паступова страчвалі свой уплыў. Рэлігія і грамадства апынуліся над непасрэдным кантролем манархаў. Іх апорай стаў разгалінаваны бюракратычны апарат.*

1. Назавіце прычыны канфліктаў другой паловы XVI — першай паловы XVII ст.
2. Як змянілася міжнародная палітыка пасля заключэння Вестфальскага міру?
3. Ахарактарызуйце палітычнае становішча Францыі, Прусіі, Аўстрыі, Вялікабрытаніі ў XVII ст.
4. Чаму на змену саслоўна-прадстаўнічай манархіі прыйшла абсалютная? Назавіце не менш чым тры прычыны.
5. Чаму фраза Людовіка XIV «Дзяржава — гэта я» выяўляе сутнасць абсалютызму?
6. Ці садзейнічала палітыка абсалютызму ўмацаванню асабістых правоў чалавека ў грамадстве?
7. Як склаўся і развіваўся абсалютызм у Англіі?
8. Параўнайце англійскі і французскі абсалютызм. Назавіце агульныя і адметныя рысы.

# § 26. Кантрасты XVIII ст.: эпоха Асветніцтва і рэвалюцый

*Як ідэі эпохі Асветніцтва змянілі светапогляд людзей?*

*Назавіце найважнейшыя навуковыя адкрыцці і тэхнічныя вынаходствы XVI–XVIII стст. Да якіх змен у еўрапейскім грамадстве прывялі развіццё капіталізму і Вялікія геаграфічныя адкрыцці, Адраджэнне і Рэфармацыя?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас; § 21–23 гэтага дапаможніка)



**Ідэалогія Асветніцтва.** Фарміраванне новага грамадства шмат у чым вызначалася ўзрастаннем веры еўрапейцаў у стваральную сілу чалавечага розуму. Мысліцелі ставілі пад сумненне грамадскі лад, традыцыі, вераванні. Не дзіва, што XVIII ст. увайшло ў гісторыю як ***век Розуму***, або ***Асветніцтва***.

***Асветніцтва*** — сацыяльны і культурны рух, які спарадзіў новы светапогляд на аснове веры ва ўсёмагутнасць чалавечага розуму і ў грамадскі прагрэс.

Першапачаткова ідэі Асветніцтва былі распаўсюджаны сярод вузкай групы вучоных, якія не ўхвалялі ломку існых грамадскіх і палітычных інстытутаў. Аднак з другой паловы XVIII ст. новыя погляды праз друк хутка ахапілі сярэднія слаі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

гарадскога еўрапейскага насельніцтва. З гэтага часу Асветніцтва прапанавала свету новыя мадэлі грамадскага ладу і больш актыўныя метады іх дасягнення.

У хуткім часе ідэі Асветніцтва ахапілі ўсю Еўропу. Свайго росквіту Асветніцтва дасягнула ў Францыі. У розных краінах Еўропы гэтая з'ява мела свае асаблівасці. У той жа час існавалі ідэі і паняцці, агульныя для новай эпохі.

У Францыі Асветніцтва пачало афармляцца сярод крытыкаў сацыяльна-палітычнай сістэмы, што існавала ў той час. У Шатландыі і германскіх дзяржавах яно расквітнела ва ўніверсітэтах. У Прусіі, Аўстрыі і Іспаніі распаўсюджваннем ідэй Асветніцтва займаліся манархі.

Выдатнымі прадстаўнікамі французскага Асветніцтва былі Шарль Луі дэ Мантэск'ё, Вальтэр і Жан Жак Русо. Вялікай папулярнасцю карысталіся таксама ідэі шатландскага эканаміста Адама Сміта і нямецкага філосафа Імануіла Канта.

**Вальтэр пра рэлігію**

Калі мы бачым цудоўную машыну, мы робім выснову аб разумным і адмысловым будаўніку яе. Ці ж пры сузіранні дзівоснага свету мы будзем працівіцца меркаванню аб мастаку-творцу? Зорная плынь, вярчэнне Зямлі вакол Сонца — усё ўладкавана згодна з найглыбейшымі матэматычнымі законамі… Строгі парадак і мэтазгоднасць сусвету ёсць разам з тым і сам станоўчы доказ быцця Бога. Нішто не пахісне ўва мне гэтага перакanання… Сапраўдная галоўная прычына, чаму вера ў Бога неабходная, заключаецца, на мой погляд, у тым перакананні, што дзеля агульнага дабра неабходны Бог, які ўзнагародзіць і пакарае.

Калі б Бога не было, то яго варта было б прыдумаць.

Вера ў Бога, які ўзнагароджвае за добрыя справы і карае за дрэнныя, а таксама даруе невялікія правіннасці, з'яўляецца для чалавечага роду самай карыснай верай.

Царква заўсёды хацела распаўсюдзіцца і карыстацца ўсякай магчымай зброяй, каб адабраць у нас наш здабытак і нашы жыцці… Гісторыя царквы — гэта бесперапынны ланцуг сварак, падману, прыгнёту, махлярства… Рэлігія чыніць толькі зло… Я лічу, што вельмі лёгка выкараніць паступова ўсе забабоны, якія ператварылі нас у скаціну…

*Ці лічыце вы стаўленне Вальтэра да рэлігіі супярэчлівым? Ці можна назваць Вальтэра атэістам? Свой адказ абгрунтуйце.*

Асветнікі не прымалі царкоўнага вучэння аб недасканаласці прыроды чалавека. Яны верылі ў творчыя сілы людзей, верылі ў прагрэс, у тое, што гісторыя рухаецца да лепшага, развіваецца ад несправядлівага ўладкавання грамадства да справядлівага. Многім здавалася, што Асветніцтва прывядзе чалавецтва да шчасця, што праз адукацыю можна перабудаваць грамадства на прынцыпах разумнасці і справядлівасці. Сваімі мэтамі асветнікі абвясцілі свабоду, дабрабыт і шчасце людзей, мір, ненасілле і верацярпімасць.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Асветнікі прапанавалі ідэю натуральнага права. Яны лічылі, што ўсе людзі ад прыроды маюць роўныя правы. Адрозненні ў грамадстве ўсталяваныя не Богам, а людзьмі. Значыць, людзі могуць змяніць тое, што яны самі стварылі. Гэта была сапраўды рэвалюцыйная ідэя. Невыпадкова ідэі Асветніцтва сталі ідэалагічнай платформай рэвалюцый другой паловы XVIII ст.

**Тэорыі абмежаванай манархіі, народнага суверэнітэту і прынцып падзелу ўлады.** У чыіх руках павінна быць сканцэнтравана вярхоўная ўлада? Гэтае пытанне непакоіла многіх дзеячаў Асветніцтва.

***Вальтэр*** *(Франсуа Мары Аруэ)* найлепшай формай кіравання лічыў асветную манархію. Яго ідэалам быў правіцель, які вывучаў навуку кіравання грамадствам і абараняў асноўныя правы людзей.



Статуя Ж. Ж. Русо,
г. Жэнева, Швейцарыя

Асаблівую ўвагу асветнікі надавалі ідэі народнага суверэнітэту, якая, на іх думку, атрымлівала найбольш поўнае ўвасабленне ў рэспубліканскім ладзе. Гэтую ідэю адстойваў французскі пісьменнік і філосаф ***Жан Жак Русо***. Народны суверэнітэт — вяршэнства правоў народа — абгрунтоўваўся асветнікам «натуральнымі» правамі. Русо лічыў, што ўсе людзі ад прыроды роўныя і што ўсе тытулы і рангі павінны быць адмененыя. «Чалавек народжаны свабодным, — пісаў вялікі асветнік, — а між тым ён у ланцугах».

У «Грамадскім дагаворы» (1762) Ж. Ж. Русо апісаў ідэальныя грамадскія адносіны. У ідэальным грамадстве, паводле яго ўяўленняў, людзі заключаюць дагавор адзін з адным, а не з правіцелем. Яны аддаюць частку сваіх натуральных свабод на карысць «агульнай справы» або дзеля дабра большасці, воля якой з'яўляецца законам для меншасці. Такім чынам, калі раней тэорыі дагавору зводзіліся да палітычнага пагаднення паміж людзьмі і правіцелем (Т. Гобс, Дж. Лок), то Ж. Ж. Русо прапанаваў ідэю сацыяльнага дагавору паміж усімі членамі грамадства. Пазней рэвалюцыянеры многіх краін кіраваліся ідэямі вялікага французскага мысліцеля.



Статуя Ш. Мантэск'ё ў Луўры,
г. Парыж, Францыя

Значную ролю ў абмежаванні ўлады манарха і руху грамадства да народнага суверэнітэту адыграла ідэя падзелу ўлады. Яна пачала афармляцца яшчэ ў XVII ст. Заснавальнікам вучэння аб падзеле ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую быў англійскі мысліцель Джон


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Лок. Невыпадкова менавіта Англія стала ўзорам дзяржаўнага ладу для філосафаў-асветнікаў XVIII ст.

У далейшым ідэі Дж. Лока развіў выхадзец з арыстакратычнай сям'і барон ***Шарль Луі дэ Мантэск'ё***. Ён лічыў, што функцыі кожнай галіны ўлады павінны быць дакладна вызначаны. У такім выпадку ніводная з галін не магла б уплываць на другую. Ідэі Ш. Мантэск'ё аб стрыманні і процівагах у арганізацыі ўлады, аб прынцыпе падзелу ўлады пазней будуць успрынятыя аўтарамі канстытуцыі ЗША і знойдуць у ёй непасрэднае адлюстраванне.

**Ш. Мантэск'ё. «Дух законаў»**

Усё загінула б, калі б у адной і той жа асобе або ўстанове, што складаецца з саноўнікаў, з дваран або простых людзей, былі аб'яднаны гэтыя тры ўлады: улада ствараць законы, улада выконваць пастановы агульнадзяржаўнага характару і ўлада судзіць злачынствы або спрэчкі прыватных асоб.

Калі ўлада заканадаўчая і выканаўчая будуць аб'яднаныя ў адной асобе або ўстанове, то свабоды не будзе, паколькі можна апасацца, што гэты манарх або сенат стане ствараць тыранічныя законы для таго, каб гэтак жа тыранічна прымяняць іх.

Не будзе свабоды і ў тым выпадку, калі судовая ўлада не аддзелена ад улады заканадаўчай і выканаўчай. Калі яна аб'яднана з заканадаўчай уладай, то жыццё і свабода грамадзян апынуцца ва ўладзе самавольства, паколькі суддзя будзе заканадаўцам. Калі судовая ўлада аб'яднана з выканаўчай, то суддзя атрымлівае магчымасць стаць прыгнятальнікам.

*Чаму, на думку Ш. Мантэск'ё, кожная ўлада павінна выконваць свае ўласныя функцыі?*

**Асветны абсалютызм.** Ідэі Асветніцтва падарылі грамадству надзею на роўнасць перад законам. Неабходнасць у палітычных рэформах станавілася ўсё больш відавочнай. За стагоддзе насельніцтва Еўропы вырасла на 58 %. У сельскай гаспадарцы адбывалася распаўсюджванне рацыянальных, навуковых вытворчых метадаў. Але самае галоўнае — ішоў актыўны пераход да машыннай, капіталістычнай вытворчасці. Рост галечы, разарэнне цэлых гарадоў з-за войнаў, хваробы сталі бедствам для гараджан.

Палітыка абсалютных манархій, у аснове якой былі ідэалы Асветніцтва, увайшла ў гісторыю пад назвай *асветны абсалютызм*. Асветны абсалютызм пачаў распаўсюджвацца ў Еўропе з другой паловы XVIII ст. Улада манарха пачала тлумачыцца не боскай воляй, а грамадскім дагаворам. Асветны правіцель, каб даказаць права на ўладу, павінен быў палепшыць жыццё сваіх грамадзян. Вальтэр лічыў, што асветная манархія з'яўляецца адзіна правільнай формай кіравання. Асветнікі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

спадзяваліся, што адукаваныя ў духу новых ідэй манархі змогуць правесці ў сваіх дзяржавах неабходныя рэформы.

Многія правіцелі, названыя гісторыкамі «асвечанымі дэспатамі», запрашалі да двара філосафаў і вучоных, каб тыя дапамаглі ім распрацаваць рэформы, накіраваныя на ўмацаванне дзяржавы. Так, у Прусію да двара Вільгельма II Вялікага з дынастыі Гогенцолернаў быў запрошаны сам Вальтэр. На працягу XVIII ст. Гогенцолерны ўсталявалі абсалютную манархію і пераатварылі Прусію з маленькага каралеўства ў вялікую еўрапейскую дзяржаву.

Палітыка асветнага абсалютызму не змагла ў поўнай меры трансфармаваць грамадства і палітычныя інстытуты пад патрабаванні часу. Нярэдка рэфармаванне грамадства праходзіла ў форме рэвалюцый, накіраваных перш за ўсё супраць абсалютызму.

**Палітыка асветнага абсалютызму**

| Правіцель (краіна) | Рэформы |
|---|---|
| Марыя Тэрэзія, Іосіф II (Аўстрыя) | Увядзенне цэнтралізаванай сістэмы падаткаабкладання, адмена падатковых прывілей для дваран і духавенства.<br>Вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці, надзяленне іх зямлёй.<br>Абмежаванне паншчыны трыма днямі на тыдзень замест пяці-шасці і яе замена грашовым зборам.<br>Эдыкт аб рэлігійнай цярпімасці, ураўнаванне ў правах пратэстантаў, праваслаўных і яўрэяў з католікамі. Увядзенне свабоды веравызнання.<br>Ліквідацыя аўтаноміі зямель і правінцый імперыі Габсбургаў.<br>Будаўніцтва бальніц, прытулкаў, стварэнне фонду дапамогі бедным.<br>Увядзенне абавязковага сямігадовага навучання ў народнай школе |
| Фрыдрых II (Прусія) | «Фрыдрыхаў кодэкс»: увядзенне аднолькавага для ўсіх суда, верацярпімасць, адмена катаванняў.<br>Забарона на продаж прыгонных сялян без зямлі.<br>Прызнанне спадчынных правоў дзяржаўных сялян на іх надзельныя землі |

*Прааналізуйце табліцу. Вызначце кірунак рэформаў асветных правіцеляў. Зрабіце высновы аб рэформах у кожнай з дзяржаў. Ці можна сказаць, што палітыка правіцеляў Прусіі і Аўстрыі была накіраваная на ажыццяўленне мэт і ідэалаў Асветніцтва?*

У XVIII ст. гісторыя заходняй цывілізацыі адзначана двума буйнейшымі рэвалюцыйнымі пераваротамі — Вайной за незалежнасць ЗША і Вялікай французскай рэвалюцыяй, якія мелі буржуазны характар. Абедзве рэвалюцыі прайшлі пад


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 26–1

§ 26–2

уплывам ідэалогіі Асветніцтва, іх наступствы шмат у чым прадвызначылі развіццё дэмакратыі як формы дзяржаўнага кіравання.

**Амерыканская рэвалюцыя ў Новым Свеце і Вялікая французская рэвалюцыя ў Еўропе.** Рэвалюцыя ў Англіі не аказала прыкметнага ўплыву на стан спраў у яе паўночнаамерыканскіх уладаннях. Тут працягвалі захоўвацца феадальна-абсалютысцкія парадкі, якія ў Англіі былі ўжо канчаткова ліквідаваныя. Насельніцтва калоній абкладалася падаткам і знаходзілася пад строгім кантролем англійскага ўрада.

Самавольства губернатараў, абмежаванне свабоды прадпрымальніцтва і ўвядзенне новых падаткаў — усё гэта выклікала пратэст каланістаў, якія паступова сталі ўсведамляць сябе амерыканцамі.

Справа ў тым, што ў XVIII ст. амерыканскае і брытанскае грамадствы ўжо значна адрозніваліся. Маёмасны цэнз, што дапускаў да ўдзелу ў выбарах людзей, якія мелі пэўны маёмасны мінімум, у Англіі і амерыканскіх калоніях быў




Асноўныя падзеі Вайны за незалежнасць ЗША

*Выкарыстоўваючы схему, раскажыце пра ход амерыканскай рэвалюцыі.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Утварэнне ЗША

аднолькавы. Аднак калі ў Англіі ў выбарах прымала ўдзел менш за 20 % насельніцтва, то ў Амерыцы дзякуючы вялікай колькасці свабодных фермераў — больш за 50 %. Акрамя таго, жыхары амерыканскіх калоній лічылі, што свае ўнутраныя справы яны павінны вырашаць самастойна, без умяшання караля і парламента. Не дзіва, што ўвядзенне Англіяй новага падатку (Паштовага акта) у 1765 г. выклікала масавае незадавальненне ў Амерыцы.

Нарастанне супярэчнасцяў паміж калоніямі і метраполіяй прывяло да першай *амерыканскай рэвалюцыі*, якая праходзіла ў форме *Вайны за незалежнасць*.

Галоўнымі ідэолагамі амерыканскай нацыі сталі Бенджамін Франклін, Томас Джэферсан і Джордж Вашынгтон. «Амерыканскі народ — гаспадар свайго лёсу», — гаварыў Т. Джэферсан. Прынятыя ў ходзе рэвалюцыі асноўныя дзяржаўныя дакументы ЗША — Дэкларацыя незалежнасці і Канстытуцыя — грунтаваліся на ідэях Асветніцтва.

Дэкларацыя незалежнасці ЗША абвяшчала *прынцып народнага суверэнітэту* і правы чалавека. У той жа час у маладой дзяржаве захоўвалася рабства. Гэта была ўступка багатым плантатарам. Канстытуцыя ЗША, прынятая ў ***1787 г.***, стала першай канстытуцыяй у свеце. Яна абвяшчала ЗША федэратыўнай дзяржавай і рэспублікай. У адпаведнасці з *тэорыяй падзелу ўлады* заканадаўчая ўлада належала *Кангрэсу*, а выканаўчая — *прэзідэнту*. Абвяшчалася незалежнасць судовай улады, дапускалася поўная верацярпімасць. Першыя 10 паправак у канстытуцыю, прынятыя ў ***1789 г.***, — ***«Біль аб правах»*** — заклалі асновы дэмакратыі ў ЗША: абвяшчаліся свабода слова, сходаў, друку, недатыкальнасць асобы і інш. Аднак сістэма рабаўладання ў Злучаных Штатах не была адменена.

Пасля перамогі амерыканскіх калоній у Вайне за незалежнасць і стварэння ЗША Вялікабрытанія страціла свой уплыў у Паўночнай Амерыцы, нягледзячы на захаванне ўладанняў на тэрыторыі Канады і шэрагу астравоў Вест-Індыі.

Французская рэвалюцыя канца XVIII ст., гэтаксама як і амерыканская, натхнялася ідэямі французскіх асветнікаў. Яна была спароджана пратэстам розных


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 26–3

слаёў насельніцтва супраць старога парадку, для якога былі характэрныя неабмежаваная ўлада феадальнай дзяржавы, прывілеі землеўладальніцкай арыстакратыі, эканамічная залежнасць большай часткі насельніцтва.

Тэмпы капіталістычнага развіцця Францыі ў многім запавольвала сістэма саслоўных прывілей. Першае (духавенства) і другое (дваранства) саслоўі былі прывілеяванымі. Галоўным іх прывілеем было права не плаціць падаткі. З 25-мільённага насельніцтва каля 99 % складала *трэцяе саслоўе*. Яно было сацыяльна неаднароднае. У яго склад уваходзілі буржуазія, сялянства, гарадскія рабочыя, рамеснікі, бедната. Але іх аб'ядноўвалі поўная адсутнасць палітычных правоў і жаданне змяніць існуючы лад.

*З дапамогай рэсурсаў сеткі інтэрнэт падбярыце карыкатуры, якія ілюструюць становішча трэцяга саслоўя ў Францыі. Растлумачце, чаму аўтары карыкатур так адлюстроўвалі саслоўі.*

Асабліва цяжкім было становішча 20 млн сялян, якія павінны былі выплачваць пазямельны падатак дзяржаве, феадальную рэнту — свайму гаспадару, адну дзясятую ўраджаю (дзесяціну) — царкве. Вельмі цяжкім быў і падатак на соль, уведзены ў 1780 г. Між тым грашовыя сродкі цяклі ў дзяржаўную казну. «На мой век хопіць! Пасля нас хоць патоп!» — гаварыў кароль Людовік XV, у час кіравання якога стаў заўважным заняпад французскага абсалютызму.

У канцы 1780-х гг. у Францыі адбыўся грамадска-палітычны крызіс. Манархіі пагражала фінансавае банкруцтва. Становішча ўскладніў *харчовы крызіс* з-за неўраджаю 1788 г. У краіне пачаўся голад.

Для выхаду з крызісу ўрад прыняў рашэнне абкласці падаткам прывілеяваныя саслоўі. Для яго зацвярджэння ў маі 1789 г. былі скліканыя Генеральныя штаты. Гэты саслоўна-прадстаўнічы орган не збіраўся з 1614 г. Трэцяе саслоўе спадзявалася на змены ў краіне. Але ўжо з першых дзён пасяджэнняў абвастрыліся рознагалоссі паміж прадстаўнікамі трэцяга саслоўя і дэпутатамі ад духавенства і дваранства.

Далей падзеі развіваліся імкліва і непрадказальна. Сход дэпутатаў трэцяга саслоўя запатрабаваў увядзення канстытуцыі. Дэпутаты абвясцілі сябе спачатку *Нацыянальным сходам*, а затым — *Устаноўчым сходам* для прыняцця канстытуцыі. Тым самым трэцяе саслоўе выступіла ад асобы ўсёй нацыі з ініцыятывай змяніць грамадскі лад Францыі. Вельмі цікава, што многія прадстаўнікі духавенства і дваранства амаль адразу далучыліся да новага парламента. Народ падтрымаў дзеянні сходу супраць караля.

***14 ліпеня 1789 г.*** сталіца Францыі апынулася ў руках народа, які паўстаў. Гэты дзень лічыцца пачаткам *Вялікай французскай рэвалюцыі* і адзначаецца ў Францыі як нацыянальнае свята.

Нацыянальны сход прыняў два дакументы: *Дэкларацыю правоў чалавека і грамадзяніна* і *Канстытуцыю 1791 г*. Дэкларацыя абвясціла роўнасць людзей у правах


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і свабоду асобы, свабоду слова, свабоду веравызнання, права на бяспеку і ўласнасць. Першая ў гісторы Францыі канстытуцыя абмяжоўвала каралеўскую ўладу і ўсталёўвала *канстытуцыйную манархію*. Спецыяльнымі дэкрэтамі былі знішчаны стары саслоўны падзел і, адпаведна, саслоўныя прывілеі, адменены ўсе тытулы дваранства і духавенства, феадальныя павіннасці.

Па меры разгортвання рэвалюцыі ў краіне паглыбляліся рэформы і пераўтварэнні. У ***1792 г.*** Францыя была абвешчана рэспублікай. Былі поўнасцю адменены ўсе феадальныя павіннасці сялян, сяляне ператварыліся ў свабодных уласнікаў. Людовік XVI быў пакараны смерцю, што выклікала пратэсты ў Еўропе. Аўстрыя, Прусія, Іспанія, Галандыя і Англія аб'ядналіся для сумеснай барацьбы з рэвалюцыйнай Францыяй. З аднаго боку, Францыі пагражала інтэрвенцыя еўрапейскіх манархій, з іншага — унутраная контррэвалюцыя: паўстанні раялістаў, прыхільнікаў караля, якія адбываліся ў розных частках краіны.

Цаной вялізных намаганняў і страт удалося вызваліць тэрыторыю краіны ад інтэрвентаў і падавіць мяцяжы. У гэты час на чале ўлады знаходзілася партыя *якабінцаў*, якая выказвала інтарэсы радыкальна настроенай буржуазіі. Лідар якабінцаў ***Максімільян Рабесп'ер*** звяртаўся да надзвычайных мер, уключаючы тэрор і насілле. У хуткім часе якабінцы былі адхілены ад улады ў выніку дзяржаўнага перавароту, які адбыўся 27 ліпеня 1794 г. (Тэрмідарыянскі пераварот).

Было праведзена нямала важных рэформаў. Усё мужчынскае насельніцтва Францыі атрымала права галасаваць. У французскіх калоніях быў адменены гандаль рабамі. Велізарныя маёнткі, што належалі дваранскай арыстакратыі, былі ліквідаваныя. Уся зямля была распрададзена сялянам па нізкіх цэнах, уведзена метрычная сістэма вагі і вымярэнняў.

У ***1799 г.*** малады генерал ***Напалеон Банапарт*** ажыццявіў пераварот і стаў аднаасобным правіцелем Францыі. Вялікая французская рэвалюцыя завяршылася.

*Ідэі Асветніцтва аказалі вырашальны ўплыў на ломку старых палітычных інстытутаў. На працягу некалькіх стагоддзяў еўрапейская сістэма дзяржаўнага кіравання эвалюцыянавала ад абсалютызму і асветных манархій да пачатку фарміравання буржуазнага дэмакратычнага грамадства, заснаванага на прынцыпах суверэнітэту народа, падзелу ўлады, грамадзянскіх правоў і свабод. Амерыканская і Вялікая французская рэвалюцыі XVIII ст. аказалі вялізны ўплыў на яго станаўленне.*

§ 26–4

1. Сфармулюйце азначэнне паняцця «Асветніцтва». Калі і дзе яно ўзнікла і атрымала шырокае распаўсюджанне? Чаму мы можам гаварыць пра XVIII ст. як пра эпоху Асветніцтва?
2. Складзіце схему (ментальную карту, гекс), прысвечаную Асветніцтву: прычыны Асветніцтва, асветнікі і іх ідэі, палітыка «асветнага абсалютызму», прыклады гэтай палітыкі ў краінах Заходняй Еўропы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Якім пытанням палітычнай тэорыі асветнікі надавалі асаблівую ўвагу?
**4.** Як вы думаеце, пазітыўную ці негатыўную ролю адыгралі ідэі Асветніцтва ў развіцці грамадства? Чаму?
**5.** Якія асаблівасці сістэмы поглядаў эпохі Асветніцтва маглі садзейнічаць развіццю рэвалюцыйных настрояў у грамадстве, а якія — наадварот?
**6.** Якія ідэі Асветніцтва пакладзены ў аснову галоўных дзяржаўных дакументаў ЗША?
**7.** Выкарыстоўваючы віртуальныя калекцыі музеяў, падбярыце ілюстрацыі да асноўных падзей эпохі Асветніцтва. Якія высновы можна зрабіць на падставе падабранай вамі «раскадроўкі»?

# Тэма 2. РАСІЯ І СЛАВЯНСКІЯ НАРОДЫ

## § 27. Расійская дзяржава на парозе Новага часу (XVI–XVII стст.)



*Якім чынам адбывалася фарміраванне самадзяржаўнай улады ў Расіі?*

*Якімі былі вынікі кіравання Івана III для Расійскай дзяржавы? Якія былі прычыны і наступствы Смутнага часу? Якім чынам у Расійскай дзяржаве запанавала дынастыя Раманавых?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Утварэнне адзінай Расійскай дзяржавы. Кіраванне Івана Грознага.** Да пачатку XVI ст. Маскоўскае княства змагло аб’яднаць многія рускія землі і скінуць татарскі прыгнёт. Нават вялікае Наўгародскае княства падпарадкавалася Маскве. Цяпер Масква стала безумоўным лідарам у рэгіёне. Вялікія князі Іван III і яго сын Васіль III дабіліся велізарных поспехаў не толькі ў аб’яднанні тэрыторый, але і ў з’яднанні насельніцтва.

**N.B.**

У 1472 г. вялікі князь Іван III узяў сабе за жонку пляменніцу апошняга імператара Візантыі Соф’ю Палеалог. Сама падзея на той момант не прынесла канкрэтнай палітычнай выгады, аднак яе значэнне стала зразумелым пазней, калі ў пачатку XVI ст. узмацненне Маскоўскай дзяржавы зрабілася рэальнасцю. Маскоўская дзяржава, імкнучыся павысіць свой міжнародны прэстыж, заявіла аб пераняцці велічы Візантыйскай імперыі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зрабіце параўнанне саслоўна-прадстаўнічай манархіі ў заходнееўрапейскіх краінах і ў Расіі. Што вы бачыце агульнага? Якія адрозненні можаце назваць?

Адным з вынікаў аб'яднання краіны і павышэння яе міжнароднага прэстыжу стала прыняцце правіцелем новага тытула (цар), які лічыўся вышэйшым за княжацкі. Упершыню тытул цара прыняў у 1547 г. маскоўскі гасудар Іван IV, якога пазней празвалі Грозным.

Менавіта пры ім адбыліся многія найважнейшыя падзеі, у ходзе якіх была пашырана тэрыторыя і ўмацавалася дзяржава. У XVI ст. пачалося фарміраванне адзінага рускага народа. Расія не толькі была аб'яднаная, але і ўпершыню пачала далучаць суседнія тэрыторыі. Працэсы цэнтралізацыі дзяржавы, пачатыя яшчэ папярэднікамі Івана Грознага, прыйшлі да завяршэння. Іван IV паслядоўна змагаўся з баярствам і яго ўплывам. Аднак поўнасцю зламаць землеўладальніцкае баярства пакуль было немагчыма.

Пры Іване IV пачалі збірацца *Земскія саборы*. Гэта былі з'езды прадстаўнікоў усіх зямель дзяржавы, якія праводзіліся для вырашэння самых важных пытанняў. На іх прысутнічалі прадстаўнікі не толькі ад баярства, але і ад дваран, гараджан, купцоў, у выключных выпадках нават ад залежных дзяржаўных сялян. Іван Грозны выкарыстоўваў Земскія саборы, каб прымаць рашэнні ў процівагу баярству. Такім чынам, Маскоўская дзяржава набыла рысы саслоўна-прадстаўнічай манархіі. Пры гэтым цар Іван паслядоўна адстойваў самадзяржаўны прынцып улады гасудара.

Узмацняючы асабістую самадзяржаўную ўладу ў барацьбе з баярствам, буйны́мі землеўладальнікамі, Іван IV стаў абапірацца на дваранства — людзей з «гасударавага двара». Дваране атрымлівалі зямельныя надзелы за сваю службу, найперш ваенную. З часам яны былі практычна ўраўнаваныя ў правах з баярамі, у тым ліку ў валоданні зямлёй і прыгоннымі сялянамі.



Царэвіч Іван Іванавіч на прагулцы.
Мастак *Міхаіл Авілаў*. 1913 г.

У ходзе ваеннай рэформы ўпершыню было створана пастаяннае, рэгулярнае войска — стралецкія палкі. Стральцамі першы час у асноўным былі дваране. Яны забяспечваліся адзеннем і агнястрэльнай зброяй за дзяржаўны кошт.

Шмат было зроблена для цэнтралізацыі краіны. З'явіўся абавязковы для ўсёй тэрыторыі дзяржавы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

новы Судзебнік, які адлюстраваў узмацненне ўлады цара, калі ўсе жыхары краіны разглядаліся як яго падданыя і іх судзілі па адзіных законах.

Прыгонныя адносіны набылі самыя жорсткія формы.

**Судзебнік 1550 г. аб сялянскіх пераходах**

А сялянам пераходзіць з воласці ў воласць, з вёскі ў вёску, адзін тэрмін на год, за тыдзень да дня Юр'я асенняга і тыдзень пасля дня Юр'я асенняга. Двары, што знаходзяцца ў палях, плацяць пажылое за двор рубель, а ў лясах паўрубля. А каторы хрысціянін пражыве на ім год, ды і пойдзе адсюль, і ён плаціць чвэрць двара, а два гады пажыве, ды і пойдзе адсюль, і ён паўдвара плаціць; а тры гады пажыве і пойдзе адсюль, і ён плаціць тры чвэрці двара; а чатыры гады пражыве, і ён увесь двор плаціць.

*Пра якую дзяржаўную палітыку адносна сялян сведчыць дакумент?*

Аформілася структура тэрытарыяльнага кіравання краінай. Былыя межы ўдзельных княстваў ліквідоўваліся. Тэрыторыя краіны дзялілася на воласці і паветы, якія сталі асноўнай адзінкай для збору падаткаў. Уся ўлада належала цяпер царскім намеснікам, якія спецыяльна накіроўваліся на пэўную тэрыторыю. Яны былі «на кармленні» — жылі за кошт кіраваных імі тэрыторый.

**Стварэнне дзяржаўнага апарату пры Іване Грозным.** Найважнейшым новаўвядзеннем з самага пачатку XVI ст. стала стварэнне пастаяннага апарату дзяржаўнага кіравання. Для ўплыву на розныя сферы жыцця краіны былі створаны цэнтральныя органы кіравання — *прыказы* (палаты, ізбы). Сярод іх былі Земскі, Пасольскі, Стралецкі, Пушкарскі, Разбойны і іншыя. Іх функцыі нярэдка перапляталіся. Прыказы падпарадкоўваліся цару, які разам з *Баярскай думай* каардынаваў іх работу.

Царкоўная рэформа была праведзена па выніках Стаглавага сабора. Сваю назву ён атрымаў ад выніковага дакумента са 100 глаў, які ўніфікаваў царкоўнае жыццё на ўсёй тэрыторыі краіны.

Калі мы гаворым пра рэформы Івана IV, трэба памятаць і пра тыя метады, якімі ён іх праводзіў. Для арганізацыі бяспекі цара і для правядзення рэформаў была ўведзена апрычніна. Быў створаны спецыяльны царскі ўдзел, яго землі аддаваліся апрычнікам, якія павінны былі змагацца з ворагамі цара. Бо цар нярэдка лічыў, што яго акружаюць адны здраднікі, хоць іх здрады ніколі не былі даказаны. Без суда, толькі на падставе падазрэнняў, былі забітыя дзясяткі тысяч чалавек. Сярод знішчаных было шмат прадстаўнікоў баярскіх, дваранскіх родаў, царкоўных іерархаў, багатых і ўплывовых людзей. Гэта не дзіўна — уся іх маёмасць і землі ішлі ў казну цара. Самай яркай праявай апрычніны стаў разгром Вялікага Ноўгарада ў 1570 г. Цар западозрыў гараджан у змове, у выніку без усякага суда і доказаў віны была знішчана значная частка насельніцтва. Аднак калі пад Масквой з'явілася


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

татарскае войска, апрычнікі разбегліся і не здолелі абараніць краіну. Стала зразумела, што апрычніна абараняла толькі самадзяржаўную ўладу цара. Так паступова было зламанае супраціўленне старой арыстакратыі — баярства. Самадзяржаўе цяпер нічым не абмяжоўвалася.

**Знешняя палітыка Івана Грознага.** Маскоўскае царства, якое аб'ядналася і ўмацавалася ў пачатку XVI ст., змагло пачаць вырашэнне важных знешнепалітычных задач. Залатая Арда распалася, але былі створаны шматлікія татарскія ханствы, сярод якіх найбольш прыкметную ролю адыгрывалі Казанскае і Крымскае. Традыцыйна правіцелі гэтых краін лічылі Маскву сваім сапернікам і часта здзяйснялі напады.




Рост тэрыторыі Расійскай дзяржавы ў XVI ст.

*Прасачыце па картасхеме асноўныя кірункі знешняй палітыкі Івана IV Грознага.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У 1552 г. руская армія ўзяла Казань, а праз некалькі гадоў было скорана Астраханскае ханства. Усе тэрыторыі па цячэнні Волгі ўвайшлі ў склад Маскоўскай дзяржавы. Гэта садзейнічала развіццю гандлю з усходнімі краінамі. Знікненне пагрозы татарскіх нападаў з усходу вырашыла найважнейшую задачу бяспекі і эканамічнага развіцця Маскоўскай дзяржавы.

У час кіравання Івана Грознага пачалося і пакарэнне Сібіры, хаця сам цар тады не выказаў да гэтага ніякай цікавасці. Да асваення паўночных зямель і выкарыстання іх прыродных багаццяў імкнуліся купцы Строганавы. Менавіта яны нанялі атрад казакоў, што складаўся прыблізна з 700 чалавек на чале з Ермаком Цімафеевічам, для нападу на Сібірскае ханства ва Усходняй Сібіры. У 1582 г. атрад Ермака ў жорсткіх баях разграміў сілы ханства. Тэрыторыя Усходняй Сібіры ўвайшла ў склад Маскоўскай дзяржавы.

З усіх татарскіх дзяржаў захавалася толькі Крымскае ханства, якое хутка стала васалам Асманскай імперыі і доўгі час пагражала Маскоўскай дзяржаве і краінам Усходняй Еўропы.

На заходніх межах Маскоўская дзяржава таксама распачала серыю няспынных войнаў. У 1558 г. Іван Грозны пачаў вайну з Лівоніяй. Мэтай Лівонскай вайны для Расіі было атрыманне выхаду да Балтыйскага мора. Лівонія апынулася хутка разгромленай, і тады ў барацьбу за так званую «лівонскую спадчыну» ўступіла Вялікае Княства Літоўскае пры падтрымцы Польшчы, Швецыі і Даніі. У адказ армія Івана Грознага захапіла Полацк і Падзвінне.

Доўгая вайна з Маскоўскай дзяржавай прывяла ў 1569 г. да стварэння Рэчы Паспалітай — федэратыўнай дзяржавы Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, што ўзмацніла іх ваенную магутнасць. У выніку Маскоўская дзяржава страціла ўсе перавагі, якія мела ў пачатку вайны, і ў 1583 г. вайна завяршылася. Такім чынам, доўгая і вельмі цяжкая Лівонская вайна практычна нічога не змяніла на заходніх межах Маскоўскай дзяржавы. Многія рэгіёны краіны былі даведзены да галечы самой палітыкай Івана Грознага. Вялізныя намаганні народа аказаліся марнымі.

**Англічанін Джэром Гарсей, які жыў у Маскве з 1572 г. і выконваў дыпламатычныя даручэнні Івана Грознага**

Лад і кіраванне Рускай дзяржавай так змяніліся супраць ранейшага, што можна было назваць гэтую дзяржаву зусім новай; усё атрымала новы выгляд, адваротны старому… [Цар] пакарыў Полацк… і шмат іншых гарадоў і ўмацаванняў… ва ўсходняй Лівоніі, заваяваў царствы Казанскае і Астраханскае, землі шматлікіх нагаяў, чаркескіх татараў і мноства іншых народаў, якія жылі на адлегласці дзвюх тысяч вёрстаў, па берагах славутай ракі Волгі, на поўдзень да самага Каспійскага мора.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**В. В. Ключэўскі, расійскі гісторык канца XIX — пачатку XX ст.**

Станоўчае значэнне цара Івана ў гісторыі … дзяржавы далёка не такое вялікае, як можна было б думаць, мяркуючы па яго задумах і пачынаннях, па шуму, які рабіла яго дзейнасць. Грозны цар больш задумваў, чым зрабіў, мацней падзейнічаў на думкі і нервы сваіх сучаснікаў, чым на сучасны яму дзяржаўны парадак. Жыццё Маскоўскай дзяржавы і без Івана ўладкавалася б гэтаксама, як яно будавалася да яго і пасля яго, але без яго гэтае ўладкаванне пайшло б лягчэй і раўней, чым яно ішло пры ім і пасля яго: найважнейшыя палітычныя пытанні былі б вырашаны без тых узрушэнняў, якія былі ім падрыхтаваныя…

*Якая з прыведзеных ацэнак дзейнасці Івана Грознага здаецца вам больш аб'ектыўнай? Аргументуйце свой пункт гледжання.*

**«Смутны час».** Пасля смерці Івана Грознага некаторы час кіраваў яго сын, які памёр бяздзетным. Яшчэ адзін малодшы сын Грознага — Дзмітрый — загінуў пры загадкавых абставінах. Перарвалася прамая лінія Рурыкавічаў.

У 1598 г. Земскі сабор выбраў царом Барыса Гадунова, швагра цара Фёдара Іванавіча. Гадуноў шмат зрабіў для правядзення рэформаў і нармалізацыі жыцця ў краіне. Але любові і даверу народа не атрымаў. Некалькі неўраджайных гадоў запар выклікалі рэзкае незадавальненне выбарным царом.

У гэтых умовах з'явіўся прэтэндэнт на прастол — Лжэдзмітрый I, які сцвярджаў, што ён — сын Івана Грознага, што цудам выжыў. Яго падтрымалі ў Рэчы Паспалітай. Невялікая спачатку армія Лжэдзмітрыя, уступіўшы ў межы Маскоўскай дзяржавы, хутка расла. У 1605 г. раптоўна памёр Барыс Гадуноў. Армія самазванца дасягнула Масквы, і хутка ён быў увянчаны царскай каронай.

Але прыезд каталіцкіх святароў і вялікай колькасці палякаў, якія атрымалі важныя пасады ў дзяржаве, хутка прывёў да страты Лжэдзмітрыем папулярнасці. Праз год ён быў звергнуты і забіты.



Дзмітрый Самазванец. Гравюра *Франца Снядзецкага*. Каля 1606 г.

Гэты перыяд безуладдзя і войнаў у гісторыі Расіі атрымаў назву «Смутны час». Чарада самазванцаў, якіх падтрымлівала Рэч Паспалітая, імкнулася захапіць уладу. У хуткім часе пачалася адкрытая вайна з Рэччу Паспалітай. Пасля разгрому рускай арміі пад Клушынам летам 1610 г. Масква засталася безабароннай. Члены Баярскай думы пагадзіліся прызнаць царом Уладзіслава, сына караля Рэчы Паспалітай, а ў Маскве размясціўся гарнізон арміі Рэчы Паспалітай. Швецыя ставіла сабе за мэту захапіць паўночныя землі, казацкія атрады спусташалі поўдзень.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Краіна была разрабаваная. У гэтых умовах патрыятычныя сілы пачалі арганізоўваць народнае апалчэнне. Сабранае ў Ніжнім Ноўгарадзе старастам Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім народнае апалчэнне рушыла на Маскву. Пасля цяжкіх баёў яно вызваліла сталіцу.

У 1613 г. адбыўся Земскі сабор для выбару цара, на якім прысутнічалі шматлікія прадстаўнікі ад усіх зямель Рускай дзяржавы. Царом быў выбраны Міхаіл Раманаў, стрыечны пляменнік апошняга рускага цара — Рурыкавіча.

У 1618 г. была адбіта апошняя спроба захопу Масквы арміяй Рэчы Паспалітай і падпісана Дэулінскае перамір'е. Паводле яго ўмоў значныя тэрыторыі адышлі да Рэчы Паспалітай, перш за ўсё Смаленск. Гэта дало магчымасць спыніць кровапралітную вайну і пачаць аднаўленне краіны.

**Асноўныя падзеі, звязаныя са спыненнем дынастыі Рурыкавічаў і прыходам да ўлады дынастыі Раманавых**

| | |
|---|---|
| 1533–1584 гг. | Праўленне цара (з 1547 г.) Івана IV Грознага. Умацаванне самадзяржаўнай улады |
| 1558–1583 гг. | Лівонская вайна |
| 1584–1598 гг. | Праўленне цара Фёдара Іванавіча |
| 1598–1605 гг. | Спыненне дынастыі Рурыкавічаў. Выбранне царом Барыса Гадунова.<br>Голад. Народныя хваляванні |
| 1605–1606 гг. | З'яўленне самазванца Лжэдзмітрыя I. Пачатак грамадзянскай вайны |
| 1606–1607 гг. | Цараванне Васіля Шуйскага. Паўстанне пад кіраўніцтвам Івана Балотнікава |
| 1608–1610 гг. | З'яўленне самазванца Лжэдзмітрыя II.<br>Ваеннае ўмяшанне Швецыі і Рэчы Паспалітай |
| 1610–1612 гг. | «Сямібаяршчына». Іншаземная інтэрвенцыя.<br>Стварэнне народных апалчэнняў. Вызваленне Масквы ад інтэрвентаў |
| 1613 г. | Выбранне на царства Міхаіла Раманава |

**Маскоўская дзяржава ў XVII ст.** Нягледзячы на маладосць Міхаіла Раманава, палітыка яго саветнікаў аказалася дальнабачнай і абапіралася на падтрымку Земскіх сабораў. Усімі сіламі ўлады імкнуліся садзейнічаць адраджэнню нармальнага жыцця дзяржавы. У Баярскай думе цяпер засядалі прыбліжаныя да цара дваране. Зноў умацавалася сістэма прыказаў. Пры цару Аляксею Міхайлавічу быў створаны Прыказ тайных спраў, які падпарадкоўваўся асабіста цару і наглядаў за дзейнасцю дзяржаўнага апарату. Пры першых Раманавых паслядоўна была адбудаваная, абноўленая і значна ўмацаваная сістэма самадзяржаўнага кіравання.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Жахлівым наступствам Смуты было знішчэнне насельніцтва ў ходзе войнаў. Некаторыя раёны проста абязлюдзелі. Плошчы ворных зямель скараціліся ў некалькі разоў.



Міхаіл Раманаў.
Фрагмент помніка «Тысячагоддзе Расіі»,
г. Вялікі Ноўгарад, Расія

Любымі шляхамі трэба было аднавіць землекарыстанне, каб пазбегнуць пастаяннай пагрозы голаду. Сяляне атрымлівалі шматлікія льготы, аднак у цэлым царскія ўлады дзейнічалі ў інтарэсах землеўладальнікаў — дваран і баяр. Служылыя дваране па-ранейшаму атрымлівалі ад цара землі, але цяпер пасля іх смерці дзяржава не адбірала дараванае — маёнткі сталі спадчыннымі. Паступова сціраліся адрозненні паміж баярствам і дваранствам. У хуткім часе ўлады пайшлі па шляху вяртання і рэзкага ўзмацнення прыгоннай залежнасці. Саборнае Улажэнне 1649 г. поўнасцю запрыгоніла сялян. Збеглых сялян цяпер можна было шукаць вечна, іх трэба было вяртаць уладальнікам-памешчыкам.

Адказам на ўзмацненне эксплуатацыі сталі шматлікія народныя выступленні. Сялянская вайна пад кіраўніцтвам Сцяпана Разіна, «саляны» і «медны» бунты, шматлікія іншыя паўстанні скаланалі Расію. З вялікай цяжкасцю царскім уладам удавалася падавіць народнае незадавальненне. У гэтай сітуацыі спынілася скліканне Земскіх сабораў. Самадзяржаўная ўлада маскоўскіх гасудароў больш не мела патрэбы ў падтрымцы саслоўяў.

Міхаіл Раманаў не вёў актыўнай знешняй палітыкі: краіна аднаўлялася і яшчэ памятала страшную Смуту. Затое практычна ў самым пачатку кіравання Аляксея Міхайлавіча сітуацыя на заходніх граніцах рэзка абвастрылася. У 1648 г. ва Украіне пачалася нацыянальна-вызваленчая вайна пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага супраць панавання Польшчы. Хмяльніцкі бачыў у Маскоўскай дзяржаве свайго саюзніка. У 1654 г. на Пераяслаўскай радзе казакі прысягнулі Маскве, якая прыняла іх у падданства. Адначасова Швецыя атакавала Рэч Паспалітую. У момант аслаблення Рэчы Паспалітай руская армія ў тым жа 1654 г. пачала наступленне на тэрыторыю ВКЛ. Былі ўзятыя Смаленск і многія іншыя гарады, а ў хуткім часе і Вільня. Аднак Рэч Паспалітая перайшла ў контрнаступленне і вярнула частку тэрыторый. У 1667 г. быў падпісаны Андросаўскі дагавор, паводле якога Смаленск і чарнігаўскія землі адышлі да Расіі. Фактычна Маскоўскай дзяржаве ўдалося вярнуць тэрыторыі, страчаныя ў час Смуты. Цяпер ва ўмовах аслаблення Рэчы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Падрыхтуйце вуснае паведамленне па рускай культуры XVI–XVII стст. Выступіце перад аднакласнікамі.*

Паспалітай з'явілася магчымасць актыўнай палітыкі на заходніх межах.

**Культура Расійскай дзяржавы ў XVI–XVII стст.** У культуры Маскоўскай дзяржавы ў разгляданы перыяд пачаў праяўляцца паступовы адыход ад строгіх канонаў візантыйскага царкоўнага мастацтва. Усё актыўней фарміраваліся ўласныя культурныя традыцыі. Упершыню можна гаварыць аб з'яўленні заходнееўрапейскіх уплываў. Але ў значнай ступені мастацтва мела яшчэ менавіта рэлігійны характар. Толькі пакрысе праяўляліся яго свецкія формы.

§ 29–1

У Маскве быў пабудаваны мураваны Крэмль з чырвонай цэглы. Галоўным саборам краіны стаў Успенскі сабор у Крамлі, дзе праходзілі каранацыі. Кіравалі будаўніцтвам італьянскія майстры. Велічны сабор Васіля Блажэннага на Краснай плошчы перад Крамлём стаў сімвалам перамогі над Казанскім ханствам.

Зараджаўся свецкі жывапіс, які быў прадстаўлены парсунамі (ад слова «персона») — партрэтамі цароў. Парсуны малявалі іканапісцы, і таму добра відаць, што менавіта абразы́ былі ўзорам для адлюстравання. У 1564 г. Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец выдалі першую друкаваную кнігу ў Маскоўскай дзяржаве — «Апостал».

*У XVI–XVII стст. завяршыўся працэс аб'яднання рускіх зямель пад уладай Масквы. Узнікненне саслоўна-прадстаўнічых устаноў умацавала краіну. Поспехі прывялі да прыняцця маскоўскімі гасударамі новага тытула — цар. Паступова было зламанае супраціўленне старой арыстакратыі — баярства. Улада цароў стала аднаасобнай — самадзяржаўнай. Была створана цэнтралізаваная дзяржава са стабільным дзяржаўным апаратам. У новай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай структуры намеснікі падпарадкоўваліся асабіста цару. Эканамічная арганізацыя самадзяржаўнай манархіі была як найцясней звязана з узмацненнем прыгоннага права. Аб'яднаўшы краіну, маскоўскія цары пачалі далучаць суседнія тэрыторыі. На заходніх межах цяжкі перыяд войнаў з Рэччу Паспалітай пакуль не прынёс перамогі ніводнаму з бакоў.*

1. Якое значэнне для Рускай дзяржавы мелі ўсталяванне роднасных сувязяў з візантыйскім імператарам і прыняцце Іванам Грозным тытула цара?
2. Самастойна складзіце схему або табліцу «Рэформы Івана IV». Як вы мяркуеце, у чыіх інтарэсах праводзілася рэфармаванне? Якія з гэтых рэформаў вы лічыце эфектыўнымі для дзяржавы? Растлумачце сваё меркаванне.
3. Даследчыкі даюць розную ацэнку апрычніне як унутранай палітыцы Івана Грознага: «ланцуг выпадковых, не звязаных адзінай палітычнай мэтай мерапрыемстваў» (В.В. Ключэўскі), «падрыў эканамічных і палітычных пазіцый баярства, царквы і іншых буйны́х вотчыннікаў» (С.М. Салаўёў), «паслядоўная барацьба


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з удзельным сепаратызмам, прывід якога мроіўся Грознаму ўсюды» (А. А. Зімін). Якое з гэтых азначэнняў бачыцца вам найбольш трапным? Чаму?

4. Ці можна пакарэнне Сібіры Маскоўскай дзяржавай разглядаць як каланізацыю? Патлумачце свой пункт гледжання.
5. З дапамогай тэксту параграфа, табліцы на с. 238 і дадатковых крыніц інфармацыі падрыхтуйце артыкул у фармаце Вікіпедыі «Смутны час у Расіі: прычыны і вынікі».
6. Як вы лічыце, якія вынікі праўлення цара Аляксея Міхайлавіча былі самымі важнымі для Расіі?
7. Запоўніце ў сшытку табліцу «Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі расійскіх правіцеляў у XVI–XVII стст.». Зрабіце выснову аб тым, якім чынам унутраная палітыка аказвае ўплыў на знешнюю.

| Напрамак знешнепалітычнай дзейнасці | Мэты | Дасягнутыя вынікі |
|---|---|---|
| | | |

8. Складзіце схему, якая характарызуе сістэму дзяржаўнага кіравання ў Расіі, што склалася ў XVII ст.

# § 28. Эпоха пераўтварэнняў у Расіі ў XVIII ст.



*Што ўяўляла сабой эпоха пераўтварэнняў у Расіі ў XVIII ст.? Якія вынікі былі дасягнуты?*

*Якія пераўтварэнні былі ажыццёўлены Пятром I у Расіі? Як пры Кацярыне II змянілася становішча дваранства і сялянства? Што такое асветны абсалютызм? Якія былі асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Пятра I і Кацярыны II?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Кіраванне Пятра I і рэформы ў Расіі.** У 1682 г. у 10-гадовым узросце царом стаў Пётр I, празваны пазней Вялікім. Да яго паўналеццяя вакол трона ішла барацьба за ўплыў паміж групоўкамі знаці, а асабліва небяспечныя былі бунты стралецкага войска. У выніку Пётр ніколі не давяраў старой арыстакратыі.

Затое ён заўсёды з вялікай цікавасцю адносіўся да заходнееўрапейскай культуры, навуковых і тэхнічных дасягненняў. Ён быў частым госцем у маскоўскай Нямецкай слабадзе, дзе жылі іншаземцы, што былі на службе ў цара, і гандляры.

У 1697 г. упершыню рускі цар адправіўся ў Вялікае Пасольства па краінах Еўропы. Пётр падарожнічаў інкогніта, пад чужым імем. З ім паехалі шмат маладых арыстакратаў, якія павінны былі вывучаць розныя дасягненні еўрапейцаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**N.B.**

Пад кіраўніцтвам вучонага-галандца Франца Тымермана Пётр з вялікай цікавасцю асвойваў у Нямецкай слабадзе навукі, якім у Крамлі яго не навучалі: геаметрыю, артылерыйскую і інжынерную справу. Тымерману ўдалося выхаваць у Пятра I любоў да мараплавання.

З дапамогай настаўніка Пётр адрамантаваў стары англійскі боцік (невялікі карабель) і пачаў на ім плаваць па азёрах. Пазней Пётр казаў, што гэты боцік стаў «дзядулем» рускага флоту. Тымерман спланаваў і Вялікае Пасольства Пятра ў Еўропу, перш за ўсё ў Галандыю.

Спробы ажыццяўлення рэформаў Аляксеем Міхайлавічам у XVII ст.

Адставанне Расіі ў сацыяльна-эканамічных і культурных адносінах ад краін Заходняй Еўропы

Замежнае падарожжа Пятра I у 1697–1698 гг. (Вялікае Пасольства)

↓

Усведамленне неабходнасці рэформаў з выкарыстаннем еўрапейскага вопыту

Перадумовы рэформаў Пятра I

Вярнуўшыся ў краіну, Пётр пачаў правядзенне рэформаў з мэтай пераадолець эканамічнае і культурнае адставанне ад Заходняй Еўропы. У Расіі быў уведзены юліянскі каляндар, святкаванне пачатку новага года пераносілася на 1 студзеня. Усім, акрамя духавенства і сялян, было загадана галіць бароды і насіць адзенне еўрапейскага ўзору. Дзяцей знаці пасылалі вучыцца ў Еўропу. З Еўропы запрашалі спецыялістаў у галіне розных навук. На думку Пятра, усё гэта павінна было зрабіць Расію еўрапейскай дзяржавай.



Юны Пётр на парсуне

Найважнейшай рэформай стала ваенная. Стралецкія палкі былі расфарміраваныя. Пачалося стварэнне палкоў паводле еўрапейскага ўзору. Была ўведзена сістэма воінскай павіннасці. Пабудавалі першыя рускія ваенныя вяслярныя судны.

Пётр бачыў найбольш важнай задачай забеспячэнне Расіі выхадаў да мораў. Ён лічыў, што гэта будзе спрыяць развіццю гандлю і росту палітычнай магутнасці краіны. У той перыяд усе моцныя еўрапейскія дзяржавы ўжо станавіліся марскімі — гэта садзейнічала каланіяльным захопам з іх боку і абагачэнню. А Расія на той момант


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

валодала толькі адным портам — Архангельскам, які размяшчаўся на моры, што замярзае, на далёкай поўначы.

**Ваенныя перамогі пятроўскай Расіі.** Першым цяжкім выпрабаваннем для новай арміі стаў пачатак у 1700 г. Паўночнай вайны супраць узмацнелай Швецыі, на чале якой стаяў кароль-палкаводзец Карл XII. У саюзе з Расіяй выступілі Рэч Паспалітая, Данія і Саксонія. Упершыню Расія ўвайшла ў ваенную кааліцыю еўрапейскіх краін і магла ўдзельнічаць у вырашэнні агульнаеўрапейскіх палітычных пытанняў.

Але войскі Карла XII хутка разграмілі паасобку арміі саюзнікаў. Армія Расіі пацярпела паражэнне ў бітве пад крэпасцю Нарва, настолькі цяжкае, што Карл XII палічыў яе знішчанай. Шведы рушылі на тэрыторыю Рэчы Паспалітай, якую Карл лічыў сваім галоўным сапернікам. Але Расія з вайны не выйшла, затое атрымала перадышку.

Цар Пётр прыклаў каласальныя намаганні для аднаўлення рускай арміі. Для вырабу новых гармат пераплаўляліся нават царкоўныя званы. Скарыстаўшыся адыходам асноўных войскаў Карла XII у межы Рэчы Паспалітай, руская армія пачала ў 1701 г. паспяховы паход да Балтыйскага мора праз практычна бязлюдныя лясы каля ракі Нявы. У 1703 г. пачалося будаўніцтва Петрапаўлаўскай крэпасці і горада Санкт-Пецярбурга, які павінен быў стаць галоўнай базай новага рускага флоту на Балтыйскім моры. А. С. Пушкін потым сказаў, што, заснаваўшы гэты горад, Пётр I «прасек акно ў Еўропу».

У гэты час Карл XII вёў доўгую вайну ў Польшчы і Беларусі. Армія Пятра I пачала здзяйсняць паходы на тэрыторыю Рэчы Паспалітай аж да Гродна, каб падтрымаць свайго саюзніка. Карл зразумеў, што Расія стала цяпер галоўным праціўнікам, і пачаў паход на ўсход. Але рух да Масквы быў звязаны з мноствам цяжкасцяў, і армія рушыла ва Украіну, дзе ўкраінскі гетман Іван Мазепа абяцаў падтрымку і харч. 27 чэрвеня 1709 г. шведская армія пацярпела знішчальнае паражэнне пад горадам Палтава. Карл XII уцёк у межы Асманскай імперыі. Менавіта гэтая перамога канчаткова паставіла Расію ў адзін шэраг з еўрапейскімі дзяржавамі. І хоць пасля гэтага паход Пятра I супраць Турцыі атрымаўся няўдалым (давялося вярнуць Азоў і падпісаць нявыгадны мір), для Швецыі гэта нічога не мяняла.



Узяцце Выбарга. Мастак *Валянцін Пячацін*. 1920 г.

*Якія падзеі папярэднічалі тым, што адлюстраваныя на карціне? Якія падзеі адбудуцца пасля?*

Швецыя прадаўжала супраціўляцца, спадзеючыся на моц свайго флоту, які панаваў на Балтыйскім моры. Але рускі флот, што хутка рос,


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Асноўныя падзеі Паўночнай вайны**

| Дата | Падзея | Вынік |
|---|---|---|
| 1700 г. | Бітва пад Нарвай | Паражэнне рускіх войскаў і страта ўсёй артылерыі |
| 1702 г. | Захоп крэпасці Шлісельбург | Усталяванне кантролю над ракой Нявой |
| 1703 г. | Будаўніцтва Петрапаўлаўскай крэпасці і закладка Санкт-Пецярбурга | Заснаванне новай сталіцы Расіі |
| 1708 г. | Бітва каля вёскі Лясная | Разгром корпуса шведскай арміі і захоп рускай арміяй шведскага абозу |
| 1709 г. | Бітва пад Палтавай | Знішчальнае паражэнне шведскай арміі |
| 1714 г. | Марская бітва каля мыса Гангут | Паражэнне шведскага ваеннага флоту |
| 1720 г. | Марская бітва каля мыса Грэнгам | Перамога рускага флоту |
| 1721 г. | Падпісанне Ніштацкага мірнага дагавора | Расія атрымала выхад да Балтыйскага мора |

*Прааналізуйце даныя табліцы. Якія этапы ў ходзе Паўночнай вайны можна выдзеліць? Дайце кароткую характарыстыку кожнаму этапу. Раскажыце пра падзеі Паўночнай вайны.*

неўзабаве нанёс некалькі цяжкіх паражэнняў шведам. Вайна завяршылася ў 1721 г. Частка тэрыторыі Прыбалтыкі адышла да Расіі. Адначасова паспяхова ішло асваенне Сібіры і рускія экспедыцыі дасягнулі берагоў Ціхага акіяна. 22 кастрычніка 1721 г. была абвешчана Расійская імперыя, якая стала адной з самых магутных дзяржаў Еўропы.

**Дзяржаўнае кіраванне.** Абвяшчэнне імперыі азначала не толькі ўзмацненне краіны на міжнароднай арэне, але і адмову ад старой сістэмы арганізацыі. Быў створаны дзяржаўны апарат на ўзор краін Заходняй Еўропы. Царква была падначалена дзяржаве і стала часткай урадавага апарату. Патрыяршаства скасоўвалася, а створаны царкоўны Сінод стаў звычайнай дзяржаўнай установай.

У 1721 г. Расія была абвешчана імперыяй. Новай сталіцай краіны стаў Санкт-Пецярбург. Імператар валодаў усёй паўнатой улады і мог сам назначаць пераемніка. Найбольш важныя рашэнні прымаліся ў Сенаце, у якім засядалі самыя давераныя паплечнікі Пятра. Сенат фарміраваўся не па радавітасці, а па заслугах перад краінай і імператарам.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Былі створаны 12 калегій з дакладна вызначанымі функцыямі: калегія іншаземных спраў, воінская калегія, адміралцейств-калегія, вотчынная калегія, юстыцкалегія, камерц-калегія, мануфактур-калегія і інш. Уся тэрыторыя краіны дзялілася на губерні на чале з назначанымі губернатарамі. Была зацверджана адзіная сістэма справаводства, афармлення дакументацыі.

«Табель аб рангах» рэгуляваў атрыманне дзяржаўных пасад. Закон прадугледжваў павышэнне пасады і становішча ў грамадстве за асабістыя заслугі нерадавітых служачых. Гэта стала пачаткам пераходу ад арыстакратычнай сістэмы ўлады да дзяржаўна-бюракратычнай. Дваранства павінна было знаходзіцца на дзяржаўнай службе, найперш у арміі. Яно не толькі захавала сваё прывілеяванае становішча ў грамадстве, але і ўмацавала яго. Напрыклад, у інтарэсах дваран улады ўзмацнялі заняволенне сялян. Упершыню пры Пятры быў праведзены падушны перапіс насельніцтва (рэвізія). Дзяржава імкнулася кантраляваць колькасць насельніцтва для правядзення падатковай палітыкі.

Створаная Пятром сістэма дзяржаўнай улады давала магчымасць кіраваць вялізарнай краінай. Імператары абапіраліся на разгалінаваны бюракратычны апарат і на дваранства. Такім чынам, вынікам пятроўскіх пераўтварэнняў стала прыняцце еўрапейскай сістэмы дзяржаўнага кіравання і еўрапейскай культуры. Аднак былі захаваныя феадальныя адносіны і прыгоннае права, што стварала супярэчнасці і тармазіла далейшае развіццё грамадства.




Асноўныя кірункі рэформаў Пятра I

*Дапоўніце схему інфармацыяй з параграфа.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**С. М. Салаўёў, расійскі гісторык XIX ст.**

Геній Пятра выказаўся ў добрым разуменні становішча свайго народа, ён усвядоміў, што яго абавязак — вывесці слабы, бедны, амаль невядомы народ з гэтага сумнага становішча пры дапамозе цывілізацыі.

**Б. Б. Кафенгаўз, Л. Р. Бяскроўны, савецкія гісторыкі**

Пётр быў прадстаўніком пануючага класа і выразнікам яго інтарэсаў, які разумеў неабходнасць рэформаў як адной з умоў паспяховага развіцця дваранскай Расіі. Ён настойліва дабіваўся перабудовы дзяржаўнага апарату ў мэтах прыстасавання яго да патрабаванняў часу.

*Якую ацэнку дзейнасці Пятра I вы лічыце больш аб'ектыўнай? Аргументуйце свой пункт гледжання. Як вы думаеце, з чым звязана супярэчлівасць ацэнак пятроўскай эпохі?*

**Асноўныя кірункі знешняй палітыкі пры пераемніках Пятра.** На працягу ўсяго XVIII ст. Расійская імперыя вяла актыўную знешнюю палітыку і пашырала тэрыторыю. Пераемнікі Пятра I прадоўжылі ўмацоўваць імперыю. Асаблівы ўклад у агульную справу ўнесла імператрыца Кацярына II. Расія стала важнай часткай агульнаеўрапейскай і сусветнай палітычнай сістэмы.

Кацярыне ўдалося сумесна з Аўстрыяй і Прусіяй дабіцца падзелу тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У выніку трох падзелаў гэтая дзяржава спыніла сваё існаванне. У склад Расійскай імперыі былі ўключаны Беларусь і Украіна. Расія стала ўдзельніцай шматлікіх ваенных канфліктаў у Еўропе. Руская армія змагалася супраць Прусіі, якая ўзмацнялася пры каралі Фрыдрыху II.

**Асноўныя кірункі знешняй палітыкі пры пераемніках Пятра I**

| Заходні | Паўднёвы | Усходні |
|---|---|---|
| • завяршэнне Сямігадовай вайны (1756–1763);<br>• падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) і ўключэнне ў склад Расіі Беларусі, Правабярэжнай Украіны і Літвы;<br>• узброены нейтралітэт у вайне ЗША за незалежнасць (1780);<br>• барацьба з рэвалюцыйнай Францыяй | • ліквідацыя Крымскага ханства (1783) і далучэнне Крыма, Прычарнамор'я і Прыазоўя;<br>• стварэнне Чарнаморскага флоту (1783);<br>• Георгіеўскі трактат аб пратэктараце Расіі над Грузіяй (1783);<br>• пачатак выцяснення Турцыі з Балкан і імкненне ўсталяваць кантроль над чарнаморскімі пралівамі | • адкрыццё Аляскі (1732) і яе даследаванне (1740);<br>• першыя паселішчы рускіх на Алясцы (1784);<br>• стварэнне гандлёвай Расійска-Амерыканскай кампаніі (1799) для асваення Аляскі |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Войны з Асманскай імперыяй былі пастаяннымі і працяглымі. У ходзе іх Расія няўхільна рушыла наперад да берагоў Чорнага мора. Паўночнае ўзбярэжжа Чорнага мора і паўвостраў Крым увайшлі ў склад Расійскай імперыі. Татарскае Крымскае ханства перастала існаваць. Хрысціянскія народы Каўказа — грузіны, армяне — актыўна дапамагалі ў барацьбе з мусульманскай Турцыяй. Паступова Каўказ і Закаўказзе ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. На граніцах рассяляліся казакі — асаблівае воінскае саслоўе са шматлікімі прывілеямі.

Вялікае значэнне для будучыні краіны мела асваенне Сібіры. Неабсяжная па тэрыторыі, населеная нешматлікімі народамі, поўная розных багаццяў Сібір была ідэальным месцам для каланізацыі. Атрады казакоў рухаліся па магутных сібірскіх рэках і засноўвалі астрогі — невялікія ўмацаваныя паселішчы. Мясцовыя народы плацілі даніну дарагім футрам і іншымі таварамі. Паступова астрогі змаглі кантраляваць усю тэрыторыю. Перасяленцы ў асноўным былі гандлярамі і служылымі казакамі. Затым тут пачалі асядаць сяляне, большасць з якіх уцякалі ад прыгону. Рускія землепраходцы высадзіліся таксама на поўначы Амерыкі — на Алясцы, якую пачалі асвойваць. У хуткім часе адбыўся рух рускіх пасяленцаў у казахскія стэпы.




Рост тэрыторыі Расійскай дзяржавы ў XVII–XVIII стст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Варта адзначыць, што ва ўмовах тэрытарыяльнага пашырэння і пастаянных войнаў армія стала адыгрываць важную, а часта вызначальную ролю нават у пытанні пераходу ў спадчыну прастола. Перыяд у сярэдзіне XVIII ст., які пачаўся са смерцю Пятра I у 1725 г. і завяршыўся ўступленнем на прастол Кацярыны Вялікай у 1762 г., гісторыкі называюць «часам палацавых пераваротаў» з-за шматлікіх пераваротаў, якія ажыццяўляліся гвардзейскімі палкамі. Менавіта ўмяшанне арміі давала магчымасць заняць трон таму ці іншаму прэтэндэнту.

**«Асветны абсалютызм» Кацярыны II.** Кацярына II стала імператрыцай у 1762 г., звергнуўшы пры падтрымцы арміі з прастола свайго мужа Пятра III. Яна была родам з Германіі і атрымала добрую еўрапейскую адукацыю. Кацярына вяла пастаянную перапіску з Вальтэрам. Стаўшы на чале вялікай краіны, яна магла ажыццявіць мару Вальтэра пра «асвечанага манарха», які служыць на карысць грамадству і пераўтварае грамадства ў адпаведнасці з сучаснымі дасягненнямі. З'яўленне ідэі «асветнага абсалютызму» было выклікана імкненнем змяніць сярэднявечную манархію, сумясціць манархічнае кіраванне з патрэбамі грамадства і правядзеннем сацыяльных рэформаў. Аднак на практыцы ўсё апынулася значна складаней, чым у тэорыі.

У перыяд кіравання Кацярыны адбыліся шматлікія рэформы, уключаючы судовую. Асаблівыя поспехі былі дасягнуты ў стварэнні сістэмы пачатковай адукацыі, у тым ліку для гараджан. Аднак Кацярына ніколі не крытыкавала самадзяржаўнае кіраванне ў Расіі, бо яна лічыла немагчымым кіраванне такой вялізнай краінай без моцнай рукі гасудара. Яна ніяк не абмежавала самадзяржаўны прынцып праўлення і правы дваран як пануючага саслоўя. Наадварот, дваране атрымлівалі ўсё новыя і новыя прывілеі.

**Даравальная грамата дваранству (1785 г.)**

**2.** Не толькі імперыі і прастолу карысна, але і справядліва ёсць, каб высакароднага дваранства шаноўны стан захоўваўся і ўмацоўваўся непахісна і непарушна…

**12.** Каб не судзіўся высакародны, акрамя як роўнымі сабе…

**15.** Цялеснае пакаранне хай не будзе ўжытае да высакароднага…

**17.** Пацвярджаем на вечны час у патомныя роды расійскаму высакароднаму дваранству вольнасць і свабоду…

**36.** Высакародны сам вызваляецца ад асабістых падаткаў.

**39.** Сходу дваранства ў намесніцтве дазваляецца выбіраць губернскага прадвадзіцеля той губерні…

*Якія правы даваў гэты дакумент дваранству? Ці можна сцвярджаць, што грамата выказвае ідэі «асветнага абсалютызму» Кацярыны II?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзейнічаючы ў інтарэсах дваран, Кацярына II значна ўзмацняла прыгонную эксплуатацыю сялян. Сярод яе прыбліжаных панавала перакананне, нібыта абагачэнне дваран і ёсць шлях да багацця і росквіту ўсёй краіны. Быў выдадзены закон, які забараняў сялянам скардзіцца на сваіх памешчыкаў. На многіх далучаных да Расійскай імперыі тэрыторыях таксама ўводзілася прыгоннае права. Кацярына даравала дваранам усё новыя дзяржаўныя землі з прыгоннымі сялянамі.

Таму сацыяльныя супярэчнасці толькі абвастрыліся. Паўстанні сялян успыхвалі ў розных раёнах краіны. Самым буйны́м выступленнем стала Сялянская вайна пад кіраўніцтвам Емяльяна Пугачова, якая разгарнулася ў 1773—1775 гг. Армія з цяжкасцю змагла падавіць гэтае выступленне сялян і казакоў. Кацярына, падтрымліваючы ідэі еўрапейскай Асветы, поўнасцю адмовілася ад іх рэалізацыі на практыцы ва ўмовах Расіі — наадварот, умацавала феадальныя адносіны. Такая палітыка ўзмацніла ў будучым адставанне краіны ад развітых дзяржаў Еўропы.

У выніку Расійская імперыя засталася самаўладнай дзяржавай з палітычна бяспраўным насельніцтвам, з жорсткім прыгонным правам, якое ўзмацнялася. «Асветны абсалютызм» пры ўсёй шчырасці намераў яго прыхільнікаў ва ўмовах феадальнай манархіі быў усяго толькі данінай модзе. Манарх і дваранства моцна трымалі ўладу, падаўляючы любыя спробы сацыяльных пераўтварэнняў.

§ 28–1

§ 29–2

**Культура Расійскай дзяржавы ў XVIII ст.** Аднымі з самых яркіх дасягненняў эпохі пераўтварэнняў былі дасягненні ў галіне культуры. Арыстакратыя поўнасцю пераарыентавалася на ўзоры заходнееўрапейскага мастацтва. Каноны візантыйскага царкоўнага мастацтва захаваліся ў праваслаўнай царкве.

Жывапіс, літаратура, архітэктура развіваліся поўнасцю пад уплывам агульнаеўрапейскіх тэндэнцый. Першапачаткова запрашаліся еўрапейскія майстры. Сімвалам новай культуры стала новая сталіца краіны — Санкт-Пецярбург.

Паводле праекта італьянскага архітэктара Барталамеа Растрэлі там быў пабудаваны імператарскі Зімовы палац. У архітэктуры з другой паловы XVIII ст. непадзельна панаваў класіцызм. Пётр I адкрыў першы ў гісторыі Расіі музей — Кунсткамеру, або «пакой мастацтва».

*Расійскае грамадства перыяду імперыі захавала саслоўную структуру. Прывілеяваным саслоўем з усімі правамі было дваранства, зацікаўленае ў захаванні прыгоннага права, узмацненне якога неаднаразова прыводзіла да сялянскіх выступленняў. Спробы правядзення рэформаў у духу «асветнага абсалютызму» былі ў выніку адхілены самой уладай, якая перайшла да палітыкі падаўлення сацыяльных выступленняў і кансервацыі палітычнага ладу — абсалютнай манархіі. Асноўнымі кірункамі знешняй палітыкі былі ўдзел у еўрапейскіх палітычных саюзах і войнах, барацьба за тэрыторыі з Асманскай імперыяй, каланізацыя Сібіры.*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Чым была выклікана неабходнасць рэформаў у Расіі? Якія з рэформаў Пятра I вы лічыце самымі важнымі?
2. Ці можна сцвярджаць, што ход Паўночнай вайны шмат у чым залежаў ад унутраных пераўтварэнняў у Расіі? Падмацуйце ваш пункт гледжання прыкладамі.
3. Прааналізуйце наступнае выказванне расійскага гісторыка В. В. Ключэўскага: «Рэформа, як яна была выканана Пятром, была яго асабістай справай, справай бяспрыкладна гвалтоўнай і, аднак, міжвольнай і неабходнай». Якую ацэнку, на ваш погляд, дае гісторык дзейнасці Пятра I — станоўчую ці адмоўную? Аргументуйце свой пункт гледжання.
4. Назавіце асноўныя кірункі знешняй палітыкі расійскіх правіцеляў у XVIII ст., мэты Расіі і вынікі іх дасягнення па кожным кірунку.
5. Як змяніліся правы і абавязкі дваранства ў час кіравання Кацярыны II? Што змянілася ў становішчы сялян?
6. У чым былі падабенствы і адрозненні працэсаў каланізацыі амерыканскіх зямель і Сібіры?
7. Напішыце эсэ на тэму «Эпоха пераўтварэнняў у Расіі ў XVIII ст.».
8. Выберыце тэму для вуснага паведамлення па рускай культуры XVIII ст. і падрыхтуйце прэзентацыю для выступлення.

## § 29. Славянскія народы ў XVI–XVIII стст.



*У чым былі асаблівасці развіцця паўднёвых і заходніх славян у Новы час?*

*У складзе якіх дзяржаў пражывалі заходнія і паўднёвыя славяне? У выніку якіх падзей гэтыя народы апынуліся ў складзе розных дзяржаў?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Утварэнне Рэчы Паспалітай.** Да пачатку XVI ст. у Польскім Каралеўстве склалася саслоўна-прадстаўнічая манархія. У суседнім Вялікім Княстве Літоўскім шляхта практычна не прымала ўдзелу ў кіраванні дзяржавай, а таму лічыла, што саюз з Польскім Каралеўствам можа змяніць такое становішча. Ідэя уніі дзвюх дзяржаў прываблівала і польскую шляхту, якая імкнулася пашырыць свой уплыў на новыя тэрыторыі.

Да саюзу дзве дзяржавы падштурхоўваў і знешні фактар — цяжкая Лівонская вайна і барацьба за ўсходняе ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Гэта была важная з эканамічнага пункту гледжання тэрыторыя, атрымаць якую імкнуліся многія краіны. У складаных ваенных умовах наступлення арміі Маскоўскага царства ВКЛ усё больш было зацікаўлена ў падтрымцы Польскага Каралеўства. Такім чынам, ідэя уніі атрымала новы сэнс.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Уваходжанне славян у склад дзяржаўных утварэнняў у XVI–XVIII стст.

Дагавор аб стварэнні Рэчы Паспалітай Двух Народаў быў падпісаны на Люблінскім сойме 1569 г. Гаворка ў ім ішла аб стварэнні адзінай дзяржавы пад уладай аднаго манарха ў складзе Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Польская шляхта лічыла, што ў выніку падпісання Люблінскай уніі адбылося далучэнне зямель ВКЛ. Аднак фактычна Рэч Паспалітая стала федэратыўнай дзяржавай, паколькі ВКЛ захавала многія атрыбуты дзяржаўнасці: уласную армію, казну, заканадаўства, суд і г. д., хаця ў далейшым, насуперак фактам, у польскай грамадскай свядомасці Рэч Паспалітая стала ўспрымацца як выключна польская дзяржава. Такое меркаванне захоўваецца і ў сучаснай Польшчы.

*Успомніце, якія формы самастойнасці захавала ВКЛ пасля Люблінскай уніі.*

**Крызіс і падзелы Рэчы Паспалітай.** Умацаванне Рэчы Паспалітай у другой палове XVI — пачатку XVII ст. прывяло да таго, што яна стала адной з найбуйнейшых дзяржаў Еўропы. Аднак у краіне пражывалі прадстаўнікі розных народнасцяў, якія адрозніваліся па ўзроўні эканамічнага, грамадскага і культурнага развіцця. Імкненне польскай шляхты пашырыць свой уплыў на ўсходнія і паўднёва-ўсходнія землі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ў межах ВКЛ немінуча прыводзіла да канфліктаў. Гэта стала адной з прычын унутранай нестабільнасці дзяржавы. Негатыўна на сітуацыю ў краіне паўплываў і перыяд бескаралеўя (1574—1576 гг.).

Войны, якія вяла Рэч Паспалітая на працягу XVI—XVIII стст. з Расіяй, Швецыяй, Асманскай імперыяй, падрывалі эканамічную, а як вынік, і палітычную сістэму краіны. У грамадстве нарастала незадавальненне, якое вылівалася ў змовы і паўстанні розных груп і слаёў насельніцтва. З сярэдзіны XVII ст. у Рэчы Паспалітай назіраўся крызіс дзяржаўнай улады. Ён быў выкліканы аслабленнем ролі караля, ростам уплыву пэўных магнацкіх груп, выкарыстаннем права ліберум вета ў рабоце сойма. Спробы каралёў рэфармаваць сістэму кіравання дзяржавай сустракалі процідзеянне розных груп шляхты і магнатаў.

Неспрыяльна складвалася і міжнародная сітуацыя. У XVIII ст. назіралася ўзмацненне суседніх Расіі і Прусіі. Карыстаючыся слабасцю Рэчы Паспалітай, яны сталі аказваць уплыў на ўнутрыпалітычнае становішча ў гэтай дзяржаве. У выніку ўнутраных супярэчнасцяў, што сілкаваліся моцнымі суседнімі краінамі, Рэч Паспалітая хутка слабела і стала прадметам міжнароднага ціску. У выніку трох падзелаў — 1772, 1793, 1795 гг. — гэтая дзяржава спыніла сваё існаванне.

**Становішча славянскіх народаў у складзе Асманскай імперыі.** З другой паловы XIV ст. улада Асманскай імперыі пашырылася на значную частку Балкан, дзе пражывалі балгары, сербы, чарнагорцы, баснійцы. Славянскія народы апынуліся пад жорсткім прыгнётам заваёўнікаў, якія імкнуліся не толькі падпарадкаваць іх, але і навязаць уласную веру — іслам. Пад пытаннем знаходзілася само існаванне славян сярод мноства народаў вялізнай Асманскай імперыі.

*Як вы думаеце, чаму мелі месца кансервацыя феадальных адносін і рэзкае зніжэнне эканамічных паказчыкаў?*

Уваходжанне славян у Асманскую імперыю прывяло да кансервацыі феадальных адносін і рэзкага спаду ўзроўню эканамічнага развіцця зямель. На захопленай тэрыторыі ўсталявалася новая сістэма феадальных парадкаў. Усе землі перайшлі ва ўласнасць дзяржавы, якая раздавала іх у часовае карыстанне ў якасці тымараў — платы за ваенную службу турэцкім вайскоўцам і чыноўнікам.

У палітыцы турэцкай адміністрацыі ўлічваліся рэгіянальныя асаблівасці захопленых тэрыторый. У першую чаргу гэта датычылася пагранічных раёнаў, дзе туркі стараліся максімальна падпарадкаваць сабе славянскае насельніцтва і забяспечыць ахову граніц. Сярод іншага гэта праяўлялася ў прасоўванні па ваеннай і адміністрацыйнай лесвіцы *патурчэнцаў* — прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва, якія прынялі іслам. У выніку да другой паловы XVI ст. дамінуючае становішча на гэтых славянскіх землях сталі займаць феадалы-мусульмане. На асноўных адміністрацыйных пасадах і на чале гарнізонаў знаходзіліся туркі або патурчэнцы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Высветліце, якія эканамічныя выгады прыносіў славянскаму насельніцтву пераход у іслам.*

Пераход у іслам прыносіў і значныя эканамічныя выгады. Такім чынам адбывалася ісламізацыя славянскага насельніцтва. Ёю былі ахоплены пераважна вышэйшыя слаі славянскай супольнасці, а таксама гараджане.

Праваслаўная царква была пазбаўлена самастойнасці. Яна перайшла ў падначаленне канстанцінопальскага патрыярха, а богаслужэнні перавялі на грэчаскую мову. Мясцовая адміністрацыя забараняла будаваць новыя храмы, а значная частка цэркваў была аддадзена пад мячэці. Само праваслаўнае насельніцтва адчувала дыскрымінацыю. Яно было абмежаванае ў правах, плаціла больш высокія падаткі, у тым ліку так званы падатак «крывёй» (хлопчыкаў з хрысціянскіх сем'яў набіралі і выхоўвалі для далейшага служэння султану ў якасці прафесійных воінаў), не магло займацца асобнымі відамі дзейнасці (гандаль, рамяство і інш.).

Ва ўмовах жорсткага кантролю славяне не мелі магчымасці арганізаваць масавы вызваленчы рух. Аднак кожны раз, калі еўрапейскія дзяржавы пачыналі вайну з Асманскай імперыяй, яны ўздымалі паўстанні супраць туркаў. З канца XVI ст. самым распаўсюджаным відам узброенай барацьбы стала гайдуцтва — дзейнасць невялікіх узброеных атрадаў, якія змагаліся з захопнікамі.

Падтрымка славянамі праціўнікаў Асманскай імперыі вяла да нарастання рэпрэсій. У гэтых умовах частка сербаў на чале з праваслаўным духавенствам у канцы XVII ст. ажыццявіла Вялікае перасяленне з поўдня на поўнач ва ўладанні Габсбургаў, дзе пражывалі ўжо славяне. Менавіта тут узнікла новая заселеная сербамі тэрыторыя з цэнтрам у Бялградзе. Сербы сумесна з арміяй Габсбургаў упарта змагаліся з туркамі, адваёўваючы пагранічныя тэрыторыі.

З сярэдзіны XVIII ст. асноўную барацьбу супраць Турцыі вяла Расія. Абапіраючыся на яе дыпламатычную і ваенную дапамогу, Чарнагорыя першая ў 1798 г. змагла выйсці з падпарадкавання Асманскай імперыі. Ваенныя дзеянні аказвалі разбуральны ўплыў на эканамічнае і культурнае жыццё паўднёвых славян.

**Славянскія землі ў складзе імперыі Габсбургаў.** Славянскія народы Цэнтральнай Еўропы ў пачатку XVI ст. сутыкнуліся з сур'ёзнай пагрозай з боку Асманскай імперыі. Пасля гібелі ў вайне з туркамі ў 1526 г. караля Чэхіі, Венгрыі і Харватыі Людовіка II Ягелона дынастыя спынілася. Трэба было выбраць новым каралём магчымага моцнага ваеннага саюзніка. Ва ўмовах нарастання турэцкай пагрозы харвацкія, венгерскія і чэшскія саслоўі абралі каралём прадстаўніка аўстрыйскай дынастыі Фердынанда I Габсбурга. Склалася новая магутная дзяржава — імперыя Габсбургаў, цэнтрам

*У складзе якіх дзяржаў знаходзіліся славяне ў канцы Сярэднявечча?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

якой стала Аўстрыя, сталіцай — Вена. У складзе імперыі Габсбургаў апынуліся многія славянскія народы.

У XVI ст. была праведзена рэарганізацыя абароннай сістэмы імперыі Габсбургаў, у ходзе якой на тэрыторыі пражывання паўднёвых славян была створана паласа ўмацаванняў. Яна атрымала назву Харвата-Славонская Кра́іна, або Ваенная граніца. Тут дзейнічала сістэма ўнутранага самакіравання, а мясцовыя жыхары атрымлівалі зямельныя надзелы і неслі ваенную службу. Менавіта на славянскае насельніцтва імперыі Габсбургаў, якое пражывала на граніцы, лёг асноўны цяжар барацьбы з асманскай агрэсіяй.

Працяглы час у Чэхіі ішла барацьба з нямецкім уплывам і за пашырэнне паўнамоцтваў мясцовых саслоўяў. Кульмінацыяй процістаяння на славянскіх землях стала паўстанне чэхаў у 1618—1620 гг. Пасля яго паражэння Чэшскае каралеўства фактычна страціла незалежнасць і амаль на 300 гадоў апынулася ў складзе імперыі Габсбургаў.

Аб'яднаўшы ў XVII ст. пад сваёй уладай значныя тэрыторыі, Габсбургі пачалі праводзіць палітыку, што мела на мэце цэнтралізацыю кіравання. Вынікам таго сталі звужэнне правоў асобных зямель, абмежаванне саслоўных прывілей і ўлады мясцовых феадалаў.

Тэрытарыяльныя страты імперыі Габсбургаў у сярэдзіне XVIII ст. прывялі да ўсведамлення неабходнасці правядзення рэформаў. У перыяд кіравання Марыі Тэрэзіі і Іосіфа II у краіне былі праведзены ваенная, зямельная, адміністрацыйная, рэлігійная і школьная рэформы. Яны абумовілі, з аднаго боку, інтэграцыю славянскіх зямель у агульнаімперскую сістэму, а з другога — рост цікавасці да ўласна славянскай гісторыі і традыцый.



Рыльскі манастыр, Балгарыя

**Культура паўднёвых і заходніх славян.** Паўднёвыя славяне, якія апынуліся пад уладай Асманскай імперыі, адчувалі дыскрымінацыю, якая выяўлялася ў знішчэнні славянскіх помнікаў пісьменства, забароне культурных традыцый, ісламізацыі насельніцтва. У балгарскіх землях цэнтрамі культуры сталі ацалелыя манастыры і цэрквы, сярод якіх асабліва вылучаўся Рыльскі манастыр. Ва ўмовах процістаяння туркам і патурчэнцам адбывалася распаўсюджванне ідэі агульнасці славян і неабходнасці сумеснага


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

процістаяння Асманскай імперыі з апорай на праваслаўную царкву.

Пачынаючы з XVI ст. культурным і літаратурным цэнтрам балгараў зрабілася Сафія. Гэта тлумачылася тым, што горад размяшчаўся на гандлёвых шляхах і быў адміністрацыйным цэнтрам. Літаратурныя творы Новага часу былі прысвечаны ў асноўным пытанням супрацьстаяння праваслаўя і ісламу. Галоўнымі жанрамі сталі жыціі і летапісы.

Асманскае заваяванне прывяло да заняпаду сербскай культуры. Яна не магла быць прадстаўлена афіцыйна і таму развівалася пераважна ў выглядзе вуснай народнай творчасці або ў эміграцыі. Турэцкае панаванне ўсё больш уплывала на знешні выгляд славянскіх зямель. Мастацкія асаблівасці ўсходняй архітэктуры станавіліся характэрнымі для славянскіх жылых дамоў.

Спрыяльныя ўмовы для развіцця сербскай культуры склаліся ў XVIII ст. ужо ў складзе імперыі Габсбургаў. Вялікі ўплыў на яе аказалі праваслаўныя традыцыі, а таксама заходнееўрапейскія тэндэнцыі. Для дзеячаў культуры былі характэрныя цікавасць да гістарычных падзей, а таксама выкарыстанне традыцый сербскага сярэднявечнага мастацтва.

У славян у перыяд іх знаходжання пад уладай Габсбургаў атрымалі распаўсюджанне ідэі Рэфармацыі, а затым і Контррэфармацыі. Дзейнасць пратэстантаў спрыяла павышэнню культурнага ўзроўню славянскага насельніцтва. Яны стваралі школы, выдавалі літаратуру на «сваёй» (славянскай) мове. Выдатнымі дзеячамі культуры, прадстаўнікамі пратэстантызму, былі славенец Прымож Трубар, чэх Ян Амос Каменскі і інш.

Контррэфармацыя ў славянскіх краінах датуецца XVII — сярэдзінай XVIII ст. У канцы 1620-х гг. быў выдадзены ўказ, у адпаведнасці з якім тыя з пратэстантаў, хто адмовіўся прыняць каталіцтва, былі абавязаны пакінуць тэрыторыю дзяржавы.

Сфера адукацыі і культуры перайшла да езуітаў. Яны, з аднаго боку, зачынялі пратэстанцкія школы,


Catechismus
In der Windischenn Sprach/ sambt einer kürzen Außlegung in gesang weiß. Item die Litanai vnd ein predig vom rechten Glauben/ gestelt/ durch Philopatridum Illiricum.
Ane kratku Podvuzhene skatirim vsaki zhlouik more vnebu pryti.

«Катэхізіс» (1550) — першае выданне на славенскай мове (выдаў П. Трубар пад псеўданімам «Ілірыйскі патрыёт»)


Ян Амос Каменскі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Палац Красіньскіх, г. Варшава, Польшча

знішчалі кнігі на славянскіх мовах, а з іншага — стварылі сваю сістэму адукацыі, друкарні, аказалі ўплыў на развіццё культуры ў цэлым.

Афіцыйнай лічылася мова, якой карысталіся пры двары правіцеля. З гэтай прычыны прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў у дзяржаве Габсбургаў у якасці паўсядзённай мовы выкарыстоўвалі нямецкую, італьянскую або лацінскую, а ў Рэчы Паспалітай — польскую. У гэтых умовах шэраг славянскіх дзеячаў культуры выступілі за захаванне роднай мовы. Аднак у асноўным яна заставалася мовай простага народу.

Культура славян, якія жылі ў імперыі Габсбургаў, развівалася ў рэчышчы заходнееўрапейскай. Моцны ўплыў на яе аказвалі нямецкае і італьянскае мастацтва, архітэктура, музыка.

Эпоха Асветніцтва азнаменавалася рэформамі ў сістэме адукацыі Рэчы Паспалітай і імперыі Габсбургаў. Так, у час кіравання Марыі Тэрэзіі была ўведзена абавязковая адукацыя для ўсіх дзяцей ва ўзросце ад 6 да 12 гадоў. Пры гэтым выкладанне ў школах вялося як на нямецкай, так і на мовах, якімі карысталася большасць мясцовага насельніцтва асобных рэгіёнаў.

Улады былі зацікаўлены ў пашырэнні адукаванасці насельніцтва краіны. Таму для простых людзей на зразумелай для іх мове пачалі выдаваць кірмашовыя кнігі, календары, у якіх змяшчалася карысная інфармацыя.

Пад уплывам ідэй Асветніцтва ў Рэчы Паспалітай была адчынена Рыцарская школа, а ва ўладаннях Габсбургаў — Тэрэзіянум, першая дваранская акадэмія. Асноўнай мэтай гэтых навучальных устаноў была падрыхтоўка дваран да службы ў арміі і працы ў дзяржаўным апараце, выхаванне ў духу адданасці Айчыне. Навучанне вялося на дзяржаўных мовах — польскай і нямецкай адпаведна.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

XVII — першая палова XVIII ст. азнаменаваліся росквітам барока. Вядомымі помнікамі гэтага стылю ў славянскіх землях сталі Каралеўскі замак і палац Красіньскіх у Варшаве (якая з канца XVI ст. зрабілася фактычнай сталіцай Рэчы Паспалітай), Вальдштэйнскі і Чарнінскі палацы, скульптуры святых на Карлавым мосце ў Празе, віла караля Яна III Сабескага ў Вілянаве пад Варшавай і інш.

*Успомніце асноўныя пастулаты ідэалогіі сарматызму. Якім чынам яна праяўлялася ў паўсядзённым жыцці шляхты?*

Разам з еўрапейскімі тэндэнцыямі на развіццё культуры Рэчы Паспалітай вялікі ўплыў аказвала ідэалогія сарматызму. У другой палове XVIII ст. на змену барока прыйшоў класіцызм. Рэформы другой паловы XVIII ст. садзейнічалі росту цікавасці славян да сваёй культуры, традыцый, вуснай народнай творчасці. У далейшым гэта стала асновай нацыянальнага адраджэння славянскіх народаў.

*Пад уплывам знешніх і ўнутраных фактараў у сярэдзіне XVI ст. Польскае Каралеўства і Вялікае Княства Літоўскае падпісалі Люблінскую унію, якая паклала пачатак існаванню новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. З'яўленне вялікіх імперый на межах рассялення славянскіх народаў прывяло да пагрозы іх падпарадкавання захопнікам. Узмацнелыя пруская і аўстрыйская дзяржавы прэтэндавалі на падпарадкаванне польскіх і чэшскіх зямель. Доўгія войны Рэчы Паспалітай прывялі да падзелу яе тэрыторый паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Чэхія захоўвала значную этнічную і рэлігійную самабытнасць у складзе імперыі Габсбургаў. Славянскія народы на Балканах былі падпарадкаваны Асманскай імперыі. Аднак з XVIII ст. еўрапейскія праціўнікі асманаў — Расійская імперыя, імперыя Габсбургаў, Рэч Паспалітая — не толькі спынілі іх рух па Еўропе, але і пачалі барацьбу за хрысціянскія землі. Значны ўнёсак у гэтую барацьбу зрабілі сербы, чарнагорцы, харваты, балгары.*

1. Назавіце прычыны крызісу Рэчы Паспалітай і яе падзелаў. Як вы думаеце, ці магла гэтая дзяржава пазбегнуць такога лёсу?
2. Растлумачце, чаму Рэч Паспалітая ўспрымалася палякамі як выключна польская дзяржава, нягледзячы на тое што ВКЛ захоўвала ў яе складзе значную самастойнасць.
3. Ахарактарызуйце палітыку Асманскай імперыі ў адносінах да славянскіх зямель, што ўвайшлі ў яе склад.
4. Чым адрознівалася становішча славянскіх народаў у складзе імперыі Габсбургаў ад становішча славян у складзе Асманскай імперыі?
5. Як вы лічыце, чаму ў эпоху Асветніцтва ў славянскіх народаў з'явілася цікавасць да свайго мінулага і традыцый? Якім чынам гэта адбілася на развіцці культуры?
6. Падрыхтуйце лэпбук для вучняў 7-га класа па пытанні вучэбнага матэрыялу на выбар.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Тэма 3. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ І АФРЫКІ ў XVI–XVIII стст.

## § 30. «Традыцыйнае грамадства» Усходу



*Як уплываў на развіццё краін Азіі і Афрыкі традыцыйны лад грамадства?*

*Што такое традыцыйнае грамадства? Якімі былі ўзаемаадносіны еўрапейскіх дзяржаў і краін Усходу ў Сярэднія вякі?* (Гісторыя Новага часу, 7 клас)

**Паняцце «традыцыйнае грамадства» і асаблівасці ўсходняга феадалізму.** Новы час для Еўропы і Паўночнай Амерыкі стаў перыядам складвання капіталістычных адносін. У краінах жа Азіі і Афрыкі працягвала існаваць *традыцыйнае грамадства*. Усходнія цывілізацыі радніла тое, што грамадства абапіралася на звычаі і традыцыі. Некаторыя вучоныя прыраўноўваюць уласцівыя гэтаму тыпу цывілізацый сацыяльныя адносіны да феадалізму.

У шэрагу цывілізацый Азіі склаліся своеасаблівыя сістэмы дзяржаўнага кіравання, зямельных адносін і грамадская іерархія, заснаваныя на панаванні-падпарадкаванні. Значную ролю ў традыцыйным грамадстве адыгрывала рэлігія.

Адным з галоўных адрозненняў заходнееўрапейскай і азіяцкіх цывілізацый перыяду Новага часу было існаванне ў апошніх дзяржаўнай уласнасці на зямлю. Галоўным уласнікам усіх зямель там зазвычай выступала дзяржава ў асобе вярхоўнага правіцеля. Таму найбольш распаўсюджанай формай зямельных адносін на Усходзе было ***ўмоўнае землеўладанне***. Правіцель надзяляў зямлёй сваіх васалаў на пэўных умовах — напрыклад, за нясенне ваеннай службы. Умоўнае землеўладанне прымала розныя формы.

На тэрыторыі Асманскай імперыі і ў дзяржаве Вялікіх Маголаў працягвала дзейнічаць распаўсюджаная ў мусульманскім свеце форма ўмоўнага землеўладання, вядомая як *ваенна-ленная сістэма*.

У Кітаі яшчэ з Ранняга Сярэднявечча замацавалася *дзяржаўная надзельная сістэма*. Усе сяляне былі надзелены прыкладна аднолькавымі зямельнымі ўчасткамі, якія часам пераразмяркоўваліся. За карыстанне зямлёй трэба было выконваць для дзяржавы павіннасці — аддаваць частку ўраджаю ў казну і працаваць пэўную колькасць дзён на дзяржаўных работах. Вялікія зямельныя надзелы з сялянамі атрымлівалі шматлікія чыноўнікі і знаць. Сяляне, якія працавалі на такіх землях, аддавалі частку ўраджаю не дзяржаве, а ўладальніку зямлі. Уладанні чыноўнікаў не былі іх уласнасцю, а даваліся


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




на час службы і лічыліся дзяржаўнымі. Буйны́я землеўладальнікі фактычна мелі не столькі права на зямлю, колькі права на атрыманне часткі даходу ад яе.

Аднак з цягам часу ўсё больш зямель пераходзіла ў прыватныя рукі. Гэтаму працэсу з рознай ступенню поспеху процідзейнічалі правіцелі. У Асманскай імперыі пераход зямлі ў прыватную ўласнасць прывёў у канцы XVI ст. да заняпаду ваенна-леннай сістэмы. У Кітаі ж, калі большая частка зямель перайшла ў рукі буйны́х землеўласнікаў, дзяржава ўзяла на сябе ролю галоўнага размеркавальніка даходаў. Імператарская ўлада абавязала сялян аддаваць частку свайго ўраджаю не толькі землеўладальніку, але і ў дзяржаўную казну.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Размеркаванне даходаў з зямлі ў Кітаі ў Новы час

*Якая сістэма размеркавання даходаў з зямлі, на ваш погляд, найбольш адпавядала патрэбам дзяржавы? Растлумачце сваё меркаванне.*

Унікальныя для Усходу пазямельныя адносіны склаліся ў Японіі, дзе з XII ст. працягвала дзейнічаць ***ваенна-феадальная сістэма сёгунату***. Палітычныя правіцелі — сёгуны — паходзілі з ліку князёў (даймё). Іх землі знаходзіліся ў спадчыннай уласнасці. Яны мелі шырокія правы, аж да забароны дзяржаўным чыноўнікам уступаць у іх уладанні. Князі не выплачвалі падатак у сёгунскую казну. Уладальнікі дробных маёнткаў станавіліся васаламі буйны́х землеўладальнікаў. Ваенна-служылыя людзі (самураі), якія атрымалі надзелы ад князёў, таксама станавіліся іх васаламі. Сёгуны Такугава, якім належала каля чвэрці ўсіх зямель, былі настолькі магутныя, што ніхто і не думаў аб выступленні супраць урада.

**Асноўныя палітычныя цэнтры на Усходзе: Асманская імперыя (Турцыя), Індыя, Кітай і Японія.** У Новы час на Усходзе склалася некалькі вялікіх імперый. У Асманскай дзяржаве і ў імперыі Вялікіх Маголаў панаваў іслам, суіснуючы з іншымі рэлігійнымі традыцыямі. Усходняя Азія традыцыйна знаходзілася пад уплывам кітайскай цывілізацыі з перавагай канфуцыянства і будызму.

Вялізную прастору паміж Усходнім Міжземнамор'ем і Паўднёва-Усходняй Азіяй займаў свет ісламу. Гэтая тэрыторыя ў Новы час стала месцам існавання трох вялікіх мусульманскіх дзяржаў: заходнюю частку займала Асманская імперыя, цэнтральную — персідская дзяржава дынастыі Сефевідаў, а на ўсходзе, у Індыі, афармілася дзяржава Вялікіх Маголаў.

Самай моцнай была Асманская імперыя. Яна ахоплівала тэрыторыю Паўднёва-Усходняй Еўропы, захаду Азіі і Паўночнай Афрыкі. Пры султане ***Селіму І*** (1512–


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1520), празваным ***Явузам (Грозным)***, імперыя пашырылася за кошт зямель Курдыстана, поўначы Ірака, Сірыі, Егіпта і Аравіі. Стаўшы захавальнікам свяшчэнных для мусульман Мекі і Медыны, султан зрабіў Асманскую дзяржаву халіфатам. Валоданне Егіптам азначала кантроль над міжземнаморскім гандлем прыправамі, тканінамі і ювелірнымі вырабамі. Асманскі флот ператварыўся ва ўладара ўсходняй часткі Міжземнага мора.

Найвышэйшай магутнасці Асманская імперыя дасягнула пры ***Сулеймане Заканадаўцы*** (1520—1566), празваным еўрапейцамі Пышным. Ён пашырыў свае ўладанні ў Еўропе за кошт зямель Габсбургаў. Заваяванне іракскіх зямель дало туркам доступ да Персідскага заліва. Такая палітыка прывяла іх да канфлікту з партугальцамі за гандлёвыя шляхі ў Чырвоным моры і Індыйскім акіяне.



Селім I Явуз

*Даведайцеся, чаму Селіма I празвалі Грозным.*




Рост Асманскай імперыі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Бабур. Фрагмент мініяцюры з Бабур-намэ. XVI ст.




Імперыя Вялікіх Маголаў

Рост насельніцтва і інфляцыя правакавалі частыя паўстанні і ваенныя мяцяжы, якія аслаблялі дзяржаву. Ніхто з васьмі султанаў, якія прыйшлі да ўлады пасля Селіма, да 1648 г. не мог паўтарыць яго поспехаў. Паражэнне Асманскай імперыі ў выніку няўдалай аблогі Вены ў 1683 г. і правал ваеннага наступлення ў Венгрыі значна падарвалі аўтарытэт дзяржавы.

Страта часткі зямель на карысць Расіі і Габсбургаў у Еўропе, беспаспяховыя войны з Персіяй і канец панавання асманскага флоту ў Чырвоным моры азнаменавалі згасанне магутнасці Асманскай дзяржавы. Турэцкія ўлады зразумелі, што для захавання моцнай дзяржавы краіна мае патрэбу ў правядзенні карэнных рэформаў. Першыя спробы такіх рэформаў былі зроблены ў XVIII ст. Аднак яны сутыкнуліся з актыўным супраціўленнем асманскай знаці і мусульманскага духавенства. Крызіс ваенна-леннай сістэмы, сепаратызм землеўладальнікаў, ваенна-тэхнічнае адставанне ад еўрапейскіх дзяржаў, пастаянныя войны прывялі ў XVIII ст. да страты Турцыяй самастойнасці ў міжнароднай палітыцы.

У XVI ст. на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Індыі і паўднёвага ўсходу Афганістана ўзнікла ***Імперыя Вялікіх Маголаў***. У ***1526 г.*** войскі дэлійскага султана былі разгромлены арміяй узбекскага правіцеля Бабура, які абвясціў сябе *падышахам*. Бабур быў прамым нашчадкам вялікіх заваёўнікаў мінулага — Чынгісхана і Цімура. Адсюль паходзіць назва кіруючай дынастыі і новай дзяржавы.

Да канца XVI ст. пагалоска пра магутнасць і славу Вялікіх Маголаў распаўсюдзілася па ўсёй Азіі і Еўропе. Але «залаты


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

век» Магольскай імперыі быў нядоўгім. Сепаратызм мясцовых феадалаў падрываў асновы дзяржавы. У другой палове XVII ст. па Паўночнай Індыі прайшлася хваля народных паўстанняў і антымагольскіх войнаў. У пачатку XVIII ст. імперыя развалілася і ў далейшым стала лёгкай здабычай англійскіх каланізатараў.

Цэнтральная, Паўднёва-Усходняя і Усходняя Азія ў большай ці меншай ступені знаходзілася пад цывілізацыйным уплывам Кітая. Асабліва цесныя сувязі ў Кітая былі з В'етнамам, Карэяй і Японіяй.

У XVI ст. у Кітаі працягвала кіраваць дынастыя ***Мін*** (1368–1644). З другой паловы XVI ст. пачалі праяўляцца сведчанні аслаблення дзяржавы. Карупцыя, растраты і залішняя бюракратызацыя прысутнічалі на ўсіх кіраўнічых узроўнях. Да канца XVI ст. армія павялічылася ў два разы. Аднак дрэнная аснашчанасць і няўмелае кіраванне зніжалі яе абараназдольнасць.

Найбольш відавочныя праявы заняпаду сталі бачныя ў эканоміцы і грамадстве. Рэзкі рост насельніцтва ў папярэднім стагоддзі прывёў да перанаселенасці гарадоў, асабліва на поўдні. Скарачэнне паступлення ў краіну серабра выклікала яго падаражэнне і абясцэньванне меднай манеты. Гэта значна ўскладніла для народа выплату падаткаў. Многія сяляне перабраліся ў гарады. Рэзкае пахаладанне на поўначы Кітая, што адбылося ў пачатку XVII ст., ускладніла сітуацыю яшчэ больш. Нярэдка адбываліся эпідэміі, частай з'явай стаў голад.

Негатыўным фактарам развіцця Кітая была палітыка самаізаляцыі краіны. Асабліва кітайскія ўлады апасаліся еўрапейцаў. Каб абмежаваць еўрапейскі ўплыў, у 1517 г. улады ўвялі забарону на гандаль для партугальскіх купцоў. Аднак ужо ў 1557 г. былі дазволены абмежаваныя гандлёвыя аперацыі праз порт Макаа.

Неўраджайныя гады і вайна з паўночнымі плямёнамі маньчжураў прывялі да сялянскага паўстання 1628–1647 гг. Гэтым скарысталіся маньчжуры. У чэрвені 1644 г. яны ўступілі ў Пекін і абвясцілі кіроўнай маньчжурскую дынастыю ***Цын***. Да 1683 г. яны ўзялі пад кантроль увесь Кітай. Такім чынам, шматгадовая ўнутраная смута прывяла да ўсталявання ў Кітаі чужаземнага панавання, якое доўжылася больш за два з паловай стагоддзі.

Дзякуючы *«сцяганоснай» арміі* маньчжурскі Кітай прыкметна пашырыў свой уплыў у Азіі. Ён пакарыў Тайвань, Манголію, усход Туркестана і Тыбет. Даннікамі Кітая былі Паўночны В'етнам, Бірма, карэйская дзяржава Часон.

*Як у ваеннай арганізацыі Кітая часоў кіравання дынастыі Цын праявілася прывілеяванае становішча маньчжураў?*

Да канца XVIII ст. у Кітаі ўсё больш сталі праяўляцца наспелыя праблемы. Дарагія ваенныя кампаніі моцна спустошылі казну. Растраты і карупцыя разбэшчвалі кіраўнічы апарат. Сялянскія паўстанні, сацыяльная нестабільнасць у перанаселеных гарадах поўдня Кітая падрывалі грамадскі парадак. Акрамя таго, палітыка самаізаляцыі, якая праводзілася краінай яшчэ з часоў дынастыі Мін,


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Кітай у сярэдзіне XVII — XVIII ст.

таксама садзейнічала павелічэнню разрыву ў ваенным і тэхнічным развіцці паміж Паднябеснай і Еўропай. Гэты факт і вызначыў далейшы лёс Кітая — ён апынуўся ў залежнасці ад дзяржаў Захаду ў XIX ст.

Не менш важныя працэсы адбываліся і ў Японіі. У пачатку XVII ст. тут завяршылася стварэнне цэнтралізаванай феадальнай дзяржавы. Барацьба за пераадоленне феадальнай раздробленасці ў Японіі не прывяла да ўмацавання існуючай імператарскай улады. У ходзе працяглай міжусобнай вайны феадальных груповак перамогу атрымаў княжацкі дом ***Такугава***, што ўсталяваў кантроль над усёй краінай.

У 1603 г. ***Такугава Іэясу***, які аб'яднаў краіну, прыняў спадчынны тытул *сёгуна* (вялікага палкаводца). З гэтага часу і да 1868 г. Японіяй кіравала дынастыя сёгунаў Такугава. Другая палова XVII – XVIII ст. сталі перыядам палітычнай стабільнасці і эканамічнага росквіту Японіі. Развіццё камерцыі і мануфактурнай вытворчасці зрабілі Эда, Осаку і Кіёта найважнейшымі гарадскімі цэнтрамі. Палітыка ж самаізаляцыі Японіі, пачатая ў 1630-я гг., садзейнічала захаванню міру і палітычнай стабільнасці. Негатыўным бокам самаізаляцыі стала ўсталяванне на доўгі час у краіне жорсткай феадальнай сістэмы і адсутнасць ведаў аб дасягненнях Еўропы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Сістэма дзяржаўнага кіравання і дзяржаўна-рэлігійная рэгламентацыя жыцця.** Сістэма дзяржаўнага кіраванння і сацыяльная структура ўсходніх грамадстваў мелі сваю спецыфіку.

Улада правіцеля на Усходзе была вельмі моцнай, але не абавязкова абсалютнай. Напрыклад, у Асманскай дзяржаве, якая аб'яднала многія народы і тэрыторыі, немагчыма было ўсталяваць абсалютную ўладу. Султан вымушаны быў абапірацца на мясцовых правіцеляў — *пашаў* і *беяў*, якія былі вышэйшымі ваенна-адміністрацыйнымі чыноўнікамі. Такія тэрыторыі, як Егіпет, кіраваліся ўскосна, праз намесніка. На чале дзяржаўнага апарату кіравання стаяў *візір* — галоўны міністр. Вышэйшыя чыноўнікі рэгулярна збіраліся на *дыван* — дарадчы савет пры султане.



Імператар Цяньлун у цырыманіяльных даспехах на кані. Мастак *Джузэпе Кастыльёне*. 1758 г.

Дзяржавы Усходняй Азіі былі асабліва цэнтралізаваныя. У Японіі ў перыяд сёгунату Такугава задачу па ўмацаванні дзяржаўнай улады ўзялі на сябе сёгуны як вярхоўныя палітычныя правіцелі. У Кітаі на чале дзяржавы стаяў імператар, які абапіраўся на *разгалінаваны бюракратычны апарат*. Праца ўсіх чыноўнікаў кантралявалася асобнай палатай інспектараў, якія падпарадкоўваліся толькі імператару.

Кітайская мадэль кіравання з усталяваннем маньчжурскага панавання зведала пэўныя змены. Маньчжуры ў цэлым захавалі традыцыйную для Кітая структуру кіравання, якая абапіралася на канфуцыянскіх вучоных чыноўнікаў — *шэньшы*. Але пры гэтым маньчжуры пазбягалі шлюбаў з кітайцамі. Тым самым яны захоўвалі статус найбольш прывілеяванай сацыяльнай групы.

Новаўвядзеннем стала маньчжурская ***сістэма васьмі сцягоў*** — апора Цынскай дынастыі ў XVII—XVIII стст. Кожны сцяг быў ваенна-адміністрацыйнай адзінкай. Гарнізоны васьмісцяжнай арміі былі раскіданыя па ўсёй тэрыторыі дзяржавы. У мірны час «сцяганосцы» вялі сваю гаспадарку, займаліся зборам падаткаў і іншымі адміністрацыйнымі функцыямі. Кітайцы таксама былі дапушчаны да гэтай сістэмы. У выпадку вайны кожны сцяг даваў пэўную колькасць байцоў. Элітныя падраздзяленні «сцягавай» арміі ахоўвалі Забаронены горад — імператарскі палацавы комплекс у Пекіне. Спачатку імператары дынастыі Цын кантралявалі толькі тры сцягі. Астатнія пяць сцягоў падпарадкоўваліся маньчжурскім прынцам. Аднак у 1722 г. імператар Юнчжэн (1722—1735), баючыся змоў з боку сваіх братоў, падпарадкаваў сабе ўсе восем сцягоў, тым самым умацаваўшы цэнтральную ўладу. Акрамя васьмісцяжнай арміі ў Кітаі дзейнічала


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| Структура арміі эпохі Цын | |
|---|---|
| **Забароненая армія васьмі сцягоў** | • асабістая ахова імператара; абараняла Забаронены горад;<br>• складалася ў асноўным з маньчжураў;<br>• падпарадкоўвалася непасрэдна імператару |
| **Тэрытарыяльная армія васьмі сцягоў** | • гарадскія гарнізоны для кантролю і запалохвання насельніцтва;<br>• складалася з маньчжураў, манголаў і часткова кітайцаў;<br>• падпарадкоўвалася імператару і маньчжурскім прынцам (да 1722 г.) |
| **Армія зялёнага штандара** | • войскі для падаўлення паўстанняў;<br>• сфарміравана з кітайскай імперскай арміі;<br>• акрамя свайго камандавання падпарадкоўвалася вышэйшым афіцэрам арміі васьмі сцягоў |

створаная з кітайцаў Армія зялёнага штандара, якая займалася падаўленнем народных паўстанняў.

У Японіі перыяду сёгунату Такугава быў створаны разгалінаваны паліцэйска-бюракратычны апарат. Вялікі ўплыў на жыццё ў краіне мелі *спецыяльныя чыноўнікі* (пасада якіх перакладаецца з японскай мовы як «прымацаванае вока»), што сачылі за ўсімі службовымі асобамі. *Асаблівы ўрадавы чыноўнік* знаходзіўся ў Кіёта для нагляду за імператарскім домам. Паўсядзённае жыццё гарадскога і сельскага насельніцтва кантралявалі з дапамогай *сістэмы кругавой парукі*. Людзі павінны былі сачыць адзін за адным, паколькі кожны адказваў за паводзіны свайго суседа. У выпадку нявыплаты падатку адным селянінам нядоімкі размяркоўваліся сярод яго суседзяў. Саслоўны лад умацоўваў рэжым Такугава.

Сацыяльная структура ўсходняга грамадства была, як правіла, вельмі строгай. Большай гнуткасцю яна характарызавалася ў Асманскай імперыі, дзе высокія пасады маглі займаць людзі нязнатнага паходжання і нават іншаземцы. У Індыі ж захоўваўся падзел на *касты*. Прыналежнасць да той ці іншай касты была спадчыннай, яна вызначала род заняткаў чалавека, яго месца ў грамадстве. Пераходзіць з адной касты ў другую было забаронена. Каставая сістэма, што выразна вызначала правы і заняткі людзей, рабіла непатрэбным існаванне грувасткага дзяржаўнага апарату, як, напрыклад, у Кітаі, дзе дзяржава кантралявала жыццё насельніцтва ва ўсіх сферах і на ўсіх узроўнях. У Японіі грамадскія сувязі таксама строга рэгламентаваліся. Насельніцтва падзялялася на *чатыры саслоўі: самураяў, сялян, рамеснікаў і купцоў*. Дзяржава вызначала правілы жыцця кожнага саслоўя і строга карала за іх парушэнне.

*У той час як у Еўропе ішло пашырэнне свецкага навуковага светапогляду і актыўна развіваліся капіталістычныя адносіны, у дзяржавах Усходу захоўваліся рэлігійнае мысленне і традыцыйныя сацыяльныя структуры. Апора на традыцыі,*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*жорсткая сацыяльная іерархія, перавага аграрнага ўкладу, а таксама дамінаванне дзяржаўных і калектыўных інтарэсаў над індывідуальнымі былі неад'емнымі рысамі традыцыйнага грамадства Усходу. Але паступова сюды сталі пранікаць еўрапейскія ідэалы і каштоўнасці. Яны паклалі пачатак ломцы традыцыйных адносін і ініцыявалі працэс мадэрнізацыі грамадства.*

**1.** Ахарактарызуйце традыцыйнае грамадства Усходу. Аформіце свой адказ у выглядзе сінквейна.
**2.** Назавіце формы ўмоўнага землеўладання ў краінах Усходу ў ранні Новы час. У чым іх асаблівасці? Адказ аформіце ў выглядзе табліцы.
**3.** Вызначце асаблівасці пазямельных адносін, што склаліся ў Японіі.
**4.** Выкарыстоўваючы тэкст пункта «Асноўныя палітычныя цэнтры на Усходзе: Асманская імперыя (Турцыя), Індыя, Кітай і Японія», назавіце асаблівасці ўсходняга феадалізму. Чым ён адрозніваўся ад заходнееўрапейскага феадалізму? Аформіце свой адказ у выглядзе схемы (ментальнай карты, гекса).
**5.** Як змянілася кітайская мадэль кіравання з усталяваннем маньчжурскага панавання?
**6.** Назавіце не менш чым два станоўчыя аспекты палітыкі самаізаляцыі Кітая і Японіі. Вызначце адмоўныя бакі гэтага працэсу. Растлумачце свой адказ.
**7.** Выкарыстоўваючы храналагічную табліцу ў пачатку раздзела, назавіце па тры галоўныя падзеі гісторыі Індыі, Кітая, Японіі і Асманскай імперыі ў XVI–XVIII стст. Пры дапамозе калекцый віртуальных музеяў і іншых рэсурсаў сеткі інтэрнэт падбярыце да іх ілюстрацыі. Вызначце, як гэтыя падзеі паўплывалі на ход гісторыі.

# § 31. Каланіялізм у Азіі і Афрыцы



*Каланіялізм — гэта «цывілізатарская» місія або падпарадкаванне і разрабаванне скораных краін?*

*Дзе з'явіліся першыя калоніі? Каланіяльныя ўладанні якіх дзяржаў былі самымі вялікімі ў Новы час? Якімі сродкамі ўлады Кітая і Японіі спрабавалі прадухіліць экспансію еўрапейцаў?* (Гісторыя Старажытнага свету, 5 клас; гісторыя Новага часу, 7 клас; § 23 гэтага дапаможніка)

**Сутнасць паняцця «каланіялізм».** У пачатку XVI ст. такія падарожнікі, як Калумб, наўрад ці ўсведамлялі, што яны паклалі пачатак новай эры ў гісторыі Еўропы і ўсяго свету. Дзякуючы Вялікім геаграфічным адкрыццям еўрапейцы пачалі даследаваць новыя землі, завязваць гандлёвыя адносіны з аддаленымі куткамі зямлі. Яны засноўвалі паселішчы, пашыралі ўплыў еўрапейскай культуры, знаёмілі іншыя народы са сваімі навуковымі ведамі і тэхналагічнымі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дасягненнямі. Паступова жыхары Еўропы ўцягвалі ў арбіту свайго ўплыву ўвесь свет. Аднак не заўсёды гэты працэс меў мірны характар. Перад ваеннай магутнасцю еўрапейцаў традыцыйныя грамадствы Азіі, Афрыкі і Амерыкі ўстаяць не маглі.

Для карэннага насельніцтва Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі прыход еўрапейцаў абярнуўся частковым знішчэннем. Вялікія цывілізацыі майя, ацтэкаў і інкаў былі поўнасцю скораны іспанскімі заваёўнікамі, якія пачалі ствараць новыя палітычныя і сацыяльныя інстытуты на еўрапейскі ўзор. У Азіі і Афрыцы, дзе мясцовыя дзяржавы маглі аказаць прышэльцам дастойнае супраціўленне, еўрапейцы сталі ўмешвацца ў палітычнае і эканамічнае жыццё гэтых грамадстваў, паступова ўзмацняючы свой уплыў.

У пагоні за рэсурсамі і новымі рынкамі збыту сваіх тавараў еўрапейцы навязвалі іншым народам выгадныя для сябе гандлёвыя адносіны. Яны імкнуліся ўзяць пад кантроль мясцовыя палітычныя эліты, а нярэдка звярталіся і да зброі. Усталяванне гандлёвай манаполіі і палітычнае дамінаванне, разрабаванне рэсурсаў скораных народаў і стварэнне каланіяльнага апарату кіравання для абслугоўвання еўрапейскіх інтарэсаў сталі адметнымі рысамі еўрапейскай палітыкі, вядомай як ***палітыка каланіялізму***.

У якасці прычын каланіяльнай экспансіі могуць быць названыя зразумелае жаданне еўрапейцаў даследаваць свет, спазнаваць невядомае, імкненне дзяржаў Еўропы да абагачэння, усталявання больш хуткіх і танных гандлёвых шляхоў, імпарту рэдкіх заморскіх тавараў, да славы, у тым ліку ваеннай славы заваёўнікаў, а таксама нацыянальны гонар еўрапейцаў, іх жаданне распаўсюдзіць на іншыя кантыненты сваю веру і свой лад жыцця.

**Гандлёвая экспансія еўрапейскіх дзяржаў.** Прыкладна да сярэдзіны XV ст. гандаль еўрапейцаў з Усходам знаходзіўся ў руках генуэзскіх і венецыянскіх купцоў. Канцавымі яго пунктамі былі парты Крыма, Канстанцінопаль у Еўропе, Антыёхія і Бейрут на Блізкім Усходзе, Александрыя і Трыпалі ў Афрыцы. Там купцы абменьвалі еўрапейскія тавары на прыправы (гваздзіку, карыцу, мускатны арэх) і прадметы раскошы. У эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў партугальцы даведаліся пра золата, якое паступала на азіяцкія рынкі з Цэнтральнай Афрыкі з караванным гандлем цераз Сахару. Не дзіва, што партугальскі прынц Энрыке Мараплавец актыўна спансіраваў экспедыцыі ў Афрыку. Так Партугалія пачала скарацць заходняе ўзбярэжжа гэтага кантынента і актыўна ўключылася ў гандаль рабамі. Адкрыццё мыса Добрай Надзеі паклала пачатак пранікненню партугальцаў у краіны Азіі цераз Індыйскі акіян.

Пасля першага плавання Васка да Гамы ў Індыю партугальцы рэгулярна выпраўлялі туды марскія экспедыцыі. Паступова гандлёвая імперыя Партугаліі ўключыла ў сябе шэраг азіяцкіх тэрыторый. На працягу ўсяго XVI ст. у гэтай дзяржавы практычна не было еўрапейскіх сапернікаў у Азіі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Усюды, дзе партугальскія гандляры засноўвалі факторыі, іх суправаджалі хрысціянскія місіянеры. Апошнія не толькі прапаведавалі вучэнне Хрыста мясцовым жыхарам, але таксама займаліся вывучэннем мясцовых моў і культур. Аднак галоўнай мэтай каланізацыі заставаўся гандаль. Партугальцы былі зацікаўлены галоўным чынам у прыправах, якія еўрапейцы выкарыстоўвалі для захоўвання мясных прадуктаў. Партугальскія судны дастаўлялі перац з Індыі, карыцу з Кітая, гваздзіку і мускатны арэх з Інданезійскага архіпелага.

*Як вы думаеце, чаму галоўнай мэтай каланізацыі заставаўся гандаль?*

**Пачатак тэрытарыяльных захопаў і ўтварэнне калоній.** Партугалія вельмі хутка перайшла ад гандлёвай экспансіі да сілавой палітыкі і ўтварэння каланіяльных уладанняў у Азіі.

У 1508 г. віцэ-каралём партугальскіх уладанняў у Індыі быў назначаны адмірал Афонса д'Альбукерке. На працягу шасці гадоў ён бязлітасна выбудоўваў партугальскую гандлёвую імперыю. Вядома, яму не заўсёды шанцавала. Напрыклад, ён не змог поўнасцю перакрыць венецыянскі гандаль з Егіптам па Чырвоным моры. Гэта тлумачылася тым, што партугальцы пацярпелі паражэнне пры ўзяцці порта Адэн, размешчанага каля ўваходу ў Чырвонае мора. Аднак д'Альбукерке завалодаў крэпасцю Гоа (заходняе ўзбярэжжа Індыі) і іранскім портам Армуз каля ўваходу ў Персідскі заліў. Што яшчэ больш важна, д'Альбукерке ўзяў Малаку — багаты гандлёвы горад у Малакскім праліве, што запірае ўваход у Індыйскі акіян з усходу. Кантралюючы Малакскі праліў, партугальцы разлічвалі не дапусціць пранікнення іншых еўрапейскіх краін на Інданезійскі архіпелаг.

У Малацы ж партугальскія мараплаўцы і гандляры ўпершыню сустрэліся з кітайцамі. Прывабленыя кітайскім шоўкам, атласам і фарфорам, партугальцы накіраваліся далей на ўсход. Дынастыя Мін, што правіла ў той час у Кітаі, імкнулася ізалявацца ад знешняга свету і абмяжоўвала гандаль. Таму да сярэдзіны XVI ст. партугальцы маглі гандляваць толькі ў Макаа, астатнія еўрапейцы — толькі ў горадзе Гуанчжоу.

У 1542 г. у час шторму партугальскі карабель збіўся з курсу і знайшоў паратунак на востраве Танэгасіма (Японскія астравы). У 1580 г. у Японію прыбылі і іспанцы. Так еўрапейцы пачалі гандляваць з Японіяй.

Аднак акрамя агнястрэльнай зброі ў еўрапейцаў было мала тавараў, якія маглі б зацікавіць кітайцаў і японцаў. Апроч таго, мясцовыя ўлады насцярожана ставіліся да чужаземцаў. Бо ім было вядома аб партугальскіх і галандскіх захопах на Інданезійскім архіпелагу і ў Індыі.

Адносіны сталі нацягнутымі таксама з-за дзейнасці хрысціянскіх місіянераў, якія з'явіліся разам з еўрапейскімі купцамі. Спачатку кітайцы і японцы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ставіліся да іх цярпіма. Пры двары вядомага аб'яднальніка Японіі Таётомі Хідэёсі ўжо былі хрысціяне. У Кітаі італьянскі місіянер-езуіт Матэа Рычы быў нават дапушчаны ў імператарскі палац. Эрудыцыя і веды знакамітага італьянца прыцягнулі ўвагу Сюй Гуанцы, праслаўленага вучонага і чыноўніка дынастыі Мін. У 1603 г. Матэа Рычы пераканаў яго хрысціцца. Дзякуючы гэтаму саюзу Рычы змог паказаць сувязь паміж хрысціянствам і навукай, якую выкарыстоўваў у якасці доказу высокага ўзроўню развіцця еўрапейскай цывілізацыі.

Вядомы нямецкі езуіцкі місіянер і астраном Адам Шаль фон Бель правёў большую частку свайго жыцця ў Кітаі. Пры дынастыі Мін ён прыняў удзел у рэформе кітайскага календара і нават стаў саветнікам другога імператара дынастыі Цын.

Аднак пазней мясцовыя правіцелі западозрылі, што місіянеры выступаюць саюзнікамі замежных гандляроў, якія захопліваюць чужыя землі сілай зброі. У 1636—1639 гг. былі агучаны ўказы сёгуна, якія забаранілі еўрапейцам наведваць Японію. Толькі галандцы маглі пасылаць адзін карабель у год для абмежаванага гандлю ў порце Нагасакі.

У пачатку XVII ст. пачалося ўзвышэнне Галандыі, якая ў хуткім часе захапіла большую частку партугальскага Усходу. У 1602 г. была заснаваная галандская Ост-Індская кампанія. Ад імя галандскіх улад яна атрымала права назначаць губернатараў, будаваць форты, заключаць дагаворы з мясцовымі правіцелямі. Штаб-кватэра галандскай Ост-Індскай кампаніі з 1607 г. размяшчалася на востраве Ява, які стаў цэнтрам галандскага гандлю з Усходам. На Яве пачалі вырошчваць каву. Галандцы вывозілі яе ў свае амерыканскія ўладанні. Адсюль жа яны гандлявалі з Кітаем, Японіяй, Індыяй і Персіяй.

Галандцы здолелі выцесніць з Паўднёва-Усходняй Азіі канкурэнтаў — партугальцаў і англічан. Пасля гэтага англічане засяродзілі ўвагу на Індыі.



Айцец Адам Шаль фон Бель, немец, мандарын першага рангу. Ілюстрацыя з кнігі Афанасія Кірхера. 1667 г.

*Якія дэталі партрэта паказваюць на зацікаўленні Адама Шаль фон Беля? Як мастак адлюстраваў змяшэнне еўрапейскай і кітайскай культур?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Яшчэ адным важным гандлёвым пунктам галандцаў на Усходзе ў XVII ст. быў Кейптаун — горад на самым поўдні афрыканскага кантынента, заснаваны ў 1652 г. Нягледзячы на тое што ў 1806 г. гэтая калонія стала брытанскай, нашчадкі галандскіх перасяленцаў і французскіх бежанцаў-гугенотаў жывуць там дагэтуль.

*Пры дапамозе карты «Вялікія геаграфічныя адкрыцці» вызначце, якія рэгіёны да канца XVII ст. былі захоплены еўрапейскімі дзяржавамі і ператвораны ў калоніі.*

Сапраўды паспяховай у XVII—XVIII стст. на Усходзе стала палітыка Вялікабрытаніі. У 1600 г. лонданскія купцы стварылі англійскую Ост-Індскую кампанію (перайменаваная ў Брытанскую ў пачатку XVIII ст.), якая засяродзіла асноўную ўвагу на Індыі. Яны набылі вялікія парты: у 1639 г. — Мадрас (сучасны Чэнаі), а ў 1661 г. — Бамбей (сучасны Мумбаі).

Аднак Індыя прываблівала не толькі англічан, але і французаў. Пасля аслаблення дзяржавы Вялікіх Маголаў у Індыі паміж брытанскай і французскай Ост-Індскімі кампаніямі пачаліся ўзброеныя сутыкненні за гандлёвы ўплыў у рэгіёне. Спачатку французам спадарожнічаў поспех, аднак у выніку Сямігадовай вайны (1756—1763 гг.) уладаркай Індыі стала Англія.

**З дагавора англічан з правіцелем Бенгаліі Джафар Алі-ханам (1757 г.)**

Арт. 2. Ворагі англічан — мае ворагі, незалежна ад таго, індыйцы яны ці еўрапейцы.

Арт. 3. Уся маёмасць і факторыі французаў у правінцыях Бенгаліі — «Раі народаў», Біхары і Арысе застануцца ў валоданні англічан, і я ніколі больш не дазволю французам сяліцца ў якой-небудзь з гэтых трох правінцый.

Арт. 4. У выглядзе кампенсацыі за страты, панесеныя англійскай [Ост-Індскай] Кампаніяй у час захопу і разрабавання Калькуты навабам [ранейшым правіцелем], і выдаткаў, выкліканых утрыманнем войскаў, я даю ёй 10 млн рупій. <…>

Арт. 9. Усе землі на поўдзень ад Калькуты і да Кальпі будуць належаць англійскай Кампаніі; усе службовыя асобы гэтых тэрыторый будуць знаходзіцца ў яе юрысдыкцыі…

Арт. 10. Заўсёды, калі я буду патрабаваць дапамогі ад англічан, я буду несці расходы па забеспячэнні прадастаўленых мне сіл.

*У чым былі абавязацельствы правіцеля Бенгаліі і англійскай Ост-Індскай кампаніі? Чыіх абавязацельстваў было больш і чаму? Што сведчыць аб саперніцтве еўрапейскіх дзяржаў у Індыі?*

Проціборства дзвюх дзяржаў таксама мела месца і на Афрыканскім кантыненце. І тут Англію чакаў поспех: у XVIII ст. яна заняла вядучыя пазіцыі ў афрыканскім гандлі на поўдзень ад Сахары. Ужо з другой паловы XVI ст. англічане пачалі гандляваць афрыканскімі рабамі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Гандаль рабамі.** Гандаль рабамі не з'яўляўся чымсьці новым для краін Азіі і Афрыкі. Ён быў распаўсюджаны там яшчэ са старажытных часоў. З XIV ст. пастаянны паток афрыканскіх рабоў папаўняў рынкі Блізкага Усходу. Там іх выкарыстоўвалі як дамашніх слуг. Афрыканскіх рабоў можна было сустрэць нават у Еўропе. Аднак у Новы час гандаль рабамі набыў зусім іншыя маштабы. Асабліва моцнае ўздзеянне ён аказаў на жыхароў Афрыканскага кантынента.

Еўрапейскія экспедыцыі ў Афрыку практычна не ўплывалі на лад жыцця афрыканцаў, якія жылі ва ўнутраных рэгіёнах кантынента. Іншыя ўмовы склаліся на заходнеафрыканскім узбярэжжы.

Характар афрыканскага гандлю рабамі стаў мяняцца з прыходам на кантынент партугальцаў. На працягу другой паловы XV ст. партугальцы вывезлі тысячы афрыканцаў з заходнеафрыканскага ўзбярэжжа для багатых еўрапейскіх сем'яў.

Асабліва радыкальныя змены адбыліся з адкрыццём Амерыкі. З распаўсюджаннем плантацый цукровага трыснягу ў Паўднёвай Амерыцы і на Карыбскіх астравах асноўны паток афрыканскіх рабоў быў накіраваны ў Новы Свет. Спачатку еўрапейцы падключыліся да мясцовага афрыканскага гандлю рабамі, купляючы іх у абмен на золата, зброю, тканіны, медныя і жалезныя інструменты. Аднак з павелічэннем попыту на рабскую працу еўрапейцы сталі рухацца ўглыб кантынента.

Яшчэ адносна нядаўна гісторыкі лічылі, што ўвесь гандаль афрыканскімі рабамі знаходзіўся ў руках еўрапейцаў. Аднак высветлілася, што гэта не так. Актыўнымі пасрэднікамі ў еўрапейскім гандлі рабамі станавіліся мясцовыя правіцелі і купцы. Часта менавіта яны вызначалі цэны на рабоў і іх колькасць. Большасць афрыканскіх правіцеляў бачылі ў гандлі рабамі толькі сродак павелічэння сваіх даходаў.

Гандаль рабамі ў Афрыцы меў некалькі наступстваў. Ён разбураў жыццё сем'яў. Многія афрыканскія тэрыторыі абязлюдзелі. Афрыканскія супольнасці гублялі самых моцных і дужых людзей. Пастаяннае ўзрастанне попыту на рабоў прывяло да ўзмацнення ўнутраных ваенных сутыкненняў паміж афрыканцамі. Рэйды ўзброеных людзей на суседнія тэрыторыі ў мэтах захопу насельніцтва сталі звычайнай справай. Паступленне танных тэкстыльных тавараў з Еўропы прыводзіла да заняпаду мясцовай вытворчасці тканін і збяднення людзей.

**А. Ф. Мілер, савецкі гісторык-усходазнавец**

...Для любой каланіяльнай і залежнай краіны прычынамі страты незалежнасці з'яўляліся, па-першае, яе ўласная адсталасць і, па-другое, знешняя агрэсія, якая выкарыстоўвала гэтую адсталасць. Такім чынам, барацьба за пераадоленне сацыяльна-эканамічнай адсталасці з'яўляецца найважнейшай умовай аднаўлення сапраўднай незалежнасці любой заняволенай краіны.

*Што, на думку вучонага, з'яўляецца найважнейшай умовай аднаўлення незалежнасці? Ці можаце вы назваць іншыя неабходныя ўмовы?*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Еўрапейскі каланіялізм у Азіі і Афрыцы меў аддаленыя наступствы. З аднаго боку, ён шмат у чым палегчыў еўрапейцам стварэнне матэрыяльнай базы для развіцця капіталістычных адносін. З каланіяльнай палітыкай ва ўсходнія грамадствы сталі пранікаць новыя ідэі, сацыяльныя і палітычныя інстытуты, адбываўся культурны абмен. Пачала фарміравацца адзіная сусветная цывілізацыя. З іншага боку, палітыка каланіялізму нярэдка суправаджалася знішчэннем мясцовага насельніцтва, пашырэннем гандлю рабамі, стратай самастойнасці дзяржаў Усходу.*

1. Ахарактарызуйце палітыку каланіялізму ў форме сінквейна.
2. Вызначце прычыны, якія падштурхнулі партугальцаў да экспансіі на Усход. Ахарактарызуйце каланіяльную палітыку Партугаліі.
3. Растлумачце, чаму менавіта Брытанія змагла ў далейшым стварыць самую вялікую каланіяльную імперыю на Усходзе.
4. Выдзеліце не менш чым тры наступствы гандлю рабамі ў Афрыцы.
5. Ахарактарызуйце каланіяльную палітыку еўрапейскіх дзяржаў на Усходзе з дапамогай ментальнай карты, схемы або гекса. Якія з'явы і падзеі вы дадалі ў схему? Чаму?
6. Прывядзіце прыклады ўплыву еўрапейскай каланізацыі на краіны і народы Азіі і Афрыкі.

§ 31–1

§ 31-2

§ 31-3

# § 32. Духоўнае жыццё і культура цывілізацый Усходу

*Чаму Усход называюць светам кантрастаў?*

*Якія рысы японскага нацыянальнага характару адлюстраваны ў японскім мастацтве? Як кітайцы ўяўлялі сабе ўладкаванне Сусвету? Успомніце прычыны заняпаду жывапісу і архітэктуры Індыі ў Новы час.* (Сусветная гісторыя, 7 клас)



**Адносіны жыхароў Азіі і Афрыкі да еўрапейцаў.** У Еўропе ў Новы час пачала распаўсюджвацца навуковая карціна свету, а свецкае светаўспрыманне адсунула рэлігійнае. На традыцыйным Усходзе і ў Афрыцы рэлігія працягвала панаваць у свядомасці людзей. Яна не толькі аказвала вялізны ўплыў на сацыяльнае жыццё грамадстваў, але таксама вызначала іх духоўную і матэрыяльную культуру.

Пранікненне ў Азію і Афрыку еўрапейцаў у цэлым не змяніла рэлігійных уяўленняў мясцовага насельніцтва аб навакольным свеце. Тут еўрапейскі ўплыў


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

не быў заўважны аж да XIX ст. У Асманскай імперыі традыцыйна любыя пераймaнні ў «няверных» лічыліся ерэтычнымі. Палітыка абмежавання знешніх сувязяў, што праводзілася яшчэ з XV ст. Кітаем, з XVII ст. — Японіяй, таксама стрымлівала распаўсюджанне еўрапейскага культурнага ўплыву ва Усходняй Азіі.

Толькі са станаўленнем каланіяльнага апарату кіравання еўрапейскія звычаі і традыцыі пачалі паступова пранікаць у жыццё мясцовага насельніцтва, найперш у жыццё кіруючых колаў.

**Рэлігійныя сістэмы.** У XVI—XVIII стст. рэлігія працягвала вызначаць межы распаўсюджання цывілізацый Усходу і Афрыкі.

Дзякуючы ісламу мусульманская культура дамінавала не толькі на Блізкім Усходзе, у Сярэдняй і часткова Паўднёвай Азіі. Ісламскі ўплыў адчуваўся таксама ў Паўднёва-Усходняй Азіі і Афрыцы на поўдзень ад Сахары. Ён жа садзейнічаў распаўсюджванню пісьменнасці сярод мясцовага насельніцтва, бо веданне Карана было абавязковым для кожнага мусульманіна.


Абу-л Фазл падносіць падышаху Акбару кнігу «Акбар-намэ». Мініяцюра. 1596–1597 гг.

*Іслам* склаў рэлігійную аснову Асманскай імперыі і дзяржавы дынастыі Сефевідаў у Персіі. Дзяржаўнай рэлігіяй іслам быў і ў імперыі Вялікіх Маголаў. Аднак большая частка мясцовага насельніцтва Індыі вызнавала індуізм, і толькі каля чвэрці жыхароў былі паслядоўнікамі ісламу. Гэтую акалічнасць былі вымушаны ўлічваць мусульманскія правіцелі Індыі. У асноўным яны праяўлялі цярпімасць да індусаў, стараліся паважаць іх рэлігійныя звычаі.

Магольскі правіцель ***Акбар*** (1542—1605), які лічыў, што ў кожнай рэлігіі ёсць нешта сапраўднае, спрабаваў ажыццявіць рэлігійную рэформу. Ён стаў распаўсюджваць пры двары новую рэлігію, названую ім *дзін-і-ілахі* («боская вера»). Яе ўвядзенне мела на мэце прымірыць розныя рэлігійныя абшчыны Індыі, якія варагавалі паміж сабой, і цэнтралізаваць дзяржаву. Дзін-і-ілахі спалучала элементы індуізму, ісламу, зораастрызму. Гэтая рэлігія была своеасаблівай этычнай сістэмай. Яна асуджала такія чалавечыя якасці, як ганарлівасць і пажадлівасць, падтрымлівала дабрыню, разважнасць і ўстрыманне, забараняла ўмярцвенне жывёл. Аб'ектам боскага пакланення, як у зораастрызме, было святло — сонца і агонь. Дзін-і-ілахі, што ўкараня-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лася зверху, не атрымала шырокага распаўсюджання. Пасля смерці Акбара яна спыніла сваё існаванне.

З прыходам у Індыю англійскіх каланізатараў рэлігійнае супрацьстаянне індусаў і мусульман абвастрылася. На працягу ўсяго перыяду панавання англічан не раз адбываліся крывавыя індуска-мусульманскія сутыкненні. Іслам страціў статус дзяржаўнай рэлігіі, і многія тэрыторыі зноў сталі вяртацца да індуізму. Таму станоўчы вопыт Акбара дагэтуль згадваюць у Індыі з вялікай павагай.

Ва Усходняй Азіі значную ролю ў грамадстве і культуры адыгрывалі такія рэлігіі, як канфуцыянства і будызм.

*Канфуцыянства* было культурнай і сацыяльнай асновай Кітая перыяду дынастый Мін і Цын, Японіі перыяду сёгунату Такугава, карэйскай дзяржавы Часон. Яно прапаведавала пачцівасць і пакорлівасць, шанаванне старэйшых, падтрымлівала паслухмянасць, цаніла ўмеранасць і эканомію, высока ставіла школу і вучобу, патрабавала своечасовай і поўнай выплаты падаткаў. Але самае галоўнае было ў тым, што канфуцыянства дзяржаўныя інтарэсы ставіла вышэй за асабістыя. Такія ўстаноўкі цалкам задавальнялі ўладу.

*Будызм* таксама працягваў заставацца ўплывовай рэлігіяй Усходняй і часткова Паўднёва-Усходняй Азіі. Аднак ён не адпавядаў патрэбам кіруючых колаў. Будызм прапаведаваў тленнасць чалавечага жыцця, што магло мець вынікам нядбайнае стаўленне падданых да сваіх абавязкаў. Існавалі і іншыя прычыны, абумоўленыя асаблівасцямі ўнутрыпалітычнай сітуацыі.

Напрыклад, у Японіі сёгуны былі вельмі зацікаўленыя ў аслабленні эканамічнай і ваеннай моцы будыйскіх манастыроў. Спрадвечная японская рэлігія *сінтаізм*, што сцвярджала боскае паходжанне імператара, таксама не адпавядала мэтам і ідэалам сёгунаў Такугава, якія адхілілі імператарскі дом ад рэальнай улады. Таму Такугава ўпершыню ў гісторыі Японіі зрабілі канфуцыянства афіцыйнай ідэалогіяй, якая асвячала існуючы грамадскі парадак.

**Адукацыя і школа.** Іслам, канфуцыянства і будызм з'яўляліся асновай традыцыйнай сістэмы адукацыі ў дзяржавах Усходу.

У Асманскай імперыі сістэму адукацыі, што склалася ў XV—XVI стст., вызначаў іслам. Адукацыя знаходзілася ў веданні не дзяржавы, а рэлігійнай абшчыны *(умы)* і ісламскіх аўтарытэтаў *(улемаў)*. У пачатковых школах навучаліся пісьменству. Вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія існавалі пры мячэцях, рыхтавалі будучых чыноўнікаў і спецыялістаў для розных галін. У XVIII ст., калі стала прыкметным ваенна-тэхнічнае адставанне імперыі, у краіну пачалі запрашацца спецыялісты з Еўропы. Адкрыццё ў XVIII ст. новых артылерыйскай, ваенна-марской і ваенна-інжынернай школ стала пачаткам змен у адукацыйнай сістэме турэцкай дзяржавы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ва Усходняй Азіі ўся адукацыя была прасякнута духам канфуцыянства. У Кітаі яшчэ са старажытных часоў дзейнічала сістэма дзяржаўных экзаменаў. Тыя, хто іх здаў, мелі права на дзяржаўную пасаду ў мясцовым або цэнтральным апараце кіравання. Падрыхтоўка да іх праводзілася ў імперскіх акадэміях, дзе за плату праходзілі навучанне дзеці, як правіла, са знатных і заможных сем'яў. Акрамя іх у дзяржаве існавалі прыватныя правінцыйныя акадэміі. Яны не займаліся падрыхтоўкай да здачы экзаменаў. Навучанне ў іх было бясплатным, а здольным студэнтам нават выдавалася стыпендыя. Выкладчыкі такіх школ рэдка чыталі лекцыі. Іх галоўнай задачай было дапамагчы студэнтам самастойна вывучыць класічныя тэксты і канфуцыянскую літаратуру.

**N.B.**

У перыяд дынастый Мін і Цын працэдура здачы імперскага экзамену была наступнай. Прэтэндэнт браў на экзамен толькі некалькі прадметаў: збан, начны гаршчок, пасцельныя рэчы, ежу (прыгатаваную ім самім), інструменты для пісання і пэндзлі. Ахова пацвярджала асобу экзаменаванага і праводзіла вобыск на прадмет наяўнасці друкаваных тэкстаў. Кандыдата адводзілі ў маленькі пакой з ложкам, пісьмовым сталом і лаўкай. На працягу трох дзён без перапынкаў і кантактаў экзаменаваны пісаў складанае сачыненне. Пасля завяршэння экзамену сачыненні кандыдатаў перапісваліся, каб экзаменатар не мог распазнаць почырк. Менавіта гэтыя копіі праходзілі ацэнку.

У Японіі ў эпоху сёгунату Такугава адбыліся вялікія змены ў адукацыі. Калі ў пачатку кіравання Такугава насельніцтва было пераважна непісьменным, то да яго завяршэння пісьменнасць распаўсюдзілася па ўсёй краіне.

Найвышэйшае становішча ў сістэме адукацыі ў Японіі з XVII ст. занялі школы для самураяў. Іх прататыпам стала Канфуцыянская акадэмія для падрыхтоўкі чыноўнікаў, што кіравалася непасрэдна сёгунамі. Дзяржаўныя школы забяспечвалі заснаваную на канфуцыянскіх прынцыпах маральную падрыхтоўку вышэйшага саслоўя самураяў. У іх вывучалі канфуцыянскія трактаты на кітайскай мове, каліграфію і арыфметыку. Для дзяцей самураяў таксама былі створаны пачатковыя школы, дзе навучалі азам чытання і пісьма. З другой паловы XVIII ст. такія школы пачалі ствараецца і для дзяцей простых людзей. Ва ўладаннях буйных князёў-феадалаў для ўнутраных патрэб дзейнічалі прыватныя навучальныя ўстановы. З афармленнем уплывовага купецкага класа ў XVII ст. з'явіўся новы тып прыватных школ для нязнатных людзей. У іх навучалі чытанню, пісьму і арыфметыцы. Ад пачатку гэтыя школы дзейнічалі пры будыйскіх храмах. З цягам часу яны пачалі размяшчацца ў дамах прыватных асоб.

**Літаратура і мастацтва.** У мастацтве Усходу таксама прасочваўся рэлігійны ўплыў. Ён шмат у чым вызначаў літаратурныя і мастацкія формы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У Асманскай імперыі і дзяржаве Вялікіх Маголаў пражывала шмат розных народаў, якія вызнавалі розныя рэлігіі. Тым не менш пад уплывам мусульманскай эліты ў гэтых дзяржавах пры двары склаліся пэўныя культурныя стылі. Прыдворная культура Асманскай імперыі адчувала моцны персідскі і арабскі ўплыў. У Індыі ж адбыўся сінтэз персідскіх і мясцовых элементаў.

Змяшэнне ісламскага і персідскага элементаў атрымала нагляднае адлюстраванне ў архітэктуры храмавага комплексу Тадж-Махал. Распаўсюджанне ў XIV ст. у Індыі паперы з Сярэдняй Азіі і Персіі садзейнічала развіццю жывапісу, асабліва мініяцюры. Магольскі падышах ***Хумаюн***, знаходзячыся ў Персіі ў перыяд свайго выгнання, захапіўся хараством мясцовай мініяцюры. Пасля вяртання на індыйскі прастол у 1556 г. ён запрасіў да сябе двух персідскіх майстроў, каб прадставіць новую тэхніку жывапісу. Яго сын Акбар так палюбіў новую манеру, што загадаў мясцовым мастакам яе капіраваць. Так нарадзіўся «акбарскі» жывапісны стыль. У адрозненне ад персідскай мініяцюры ў новым стылі нярэдка сустракаліся выявы людзей у руху. Акрамя таго, Акбар заахвочваў мастакоў выкарыстоўваць элементы еўрапейскага мастацтва, у прыватнасці перспектыву, і ствараць рэалістычныя выявы людзей.

Імкненне да рэалізму прысутнічала і ў літаратуры. Шырокае распаўсюджанне атрымала гістарычнае апавяданне. Прыкладам яго з’яўляецца ілюстраваная «Кніга Акбара», у якой змешчана апісанне ваенных дасягненняў правіцеля і яго дзейнасці. Аднак распаўсюджанне літаратуры ў дзяржаве Вялікіх Маголаў стрымлівалася адсутнасцю кнігадрукавання. Кнігі пісаліся ад рукі.

Іншая сітуацыя склалася ў друкарскай справе ў Асманскай імперыі. Упершыню друкарскі станок прывезлі ў Турцыю яўрэі, якія ўцякалі ў канцы XV ст. ад пераследу іспанскай інквізіцыі. У 1494 г. яны выдалі першую ў Турцыі друкаваную кнігу — «Пяцікніжжа» Майсея. Затым кнігадрукаванне пачало развівацца ў турэцкіх армян, а ў пачатку XVII ст. сваю першую друкарню заснавалі грэчаскія падданыя.

Аднак усе кнігі, якія тады выдаваліся, не прызначаліся для мусульманскага насельніцтва імперыі. Кнігадрукаванне на арабскай і турэцкай мовах у яе межах забаранялася. Забарона была прадыктавана адмоўным стаўленнем мусульманскага духавенства да еўрапейскіх навацый. Першая турэцкая друкарня ўзнікла толькі ў 1727 г.

*Выяўленчае мастацтва* ў Турцыі, як і ў іншых краінах мусульманскага свету, амаль не развівалася, паколькі ісламская рэлігія строга забараняла выяўляць людзей. Адсутнасць выяўленчага мастацтва кампенсавалася высокім узроўнем развіцця *архітэктуры* і *арнаментальнага мастацтва*, асабліва ў перыяд найвышэйшага росквіту імперыі. Выдатныя дасягненні турэцкай архітэктуры XVI ст. звязаны з імем геніяльнага архітэктара ***Сінана***. За сваё доўгае жыццё ён пабудаваў больш за трыста мячэцяў, маўзалеяў, палацаў, мастоў


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Мячэць Сяліміе,
г. Эдырнэ, Турцыя

і іншых збудаванняў. Самым дасканалым творам Сінана многія называюць *мячэць Сяліміе*, узведзеную ў Эдырнэ ў гонар сына і спадкаемцы Сулеймана Бліскучага. Да гэтага часу не разгаданы сакрэт чатырох яе мінарэтаў, якія здалёк успрымаюцца як два, але па меры набліжэння нечакана раздвойваюцца. Асманскія архітэктары былі такімі адмысловымі майстрамі, што іх запрашалі ў іншыя краіны.

У адрозненне ад ісламскага свету ва Усходняй Азіі выяўленчае мастацтва цанілася высока. Яно развівалася ў традыцыйных формах і знаходзілася пад апекай правіцеляў. Жывапіс Кітая, Японіі і Карэі меў шмат агульнага.



Адзінокая фігура птушкі.
Мастак *Чжу Да*. 1688–1689 гг.

У кітайскім выяўленчым мастацтве ў Новы час працягвалася традыцыя пейзажнага кірунку, выдатным прадстаўніком якога быў ***Дун Цічан***. Многія мастакі не імкнуліся ствараць новыя кампазіцыі, а капіравалі ранейшыя тэмы. Ва ўмовах маньчжурскага панавання гэта дало магчымасць захаваць старую традыцыйную школу жывапісу. Аднак некаторыя майстры пэндзля заняліся пераасэнсаваннем традыцыйнага жывапісу. Сярод іх праславіўся жывапісец, паэт і каліграф ***Чжу Да***. Гэты майстар пейзажу, жывапісу кветак і птушак віртуозна валодаў пэндзлем. Ён паходзіў з імператарскай сям'і дынастыі Мін. Пасля захопу Кітая маньчжурамі Чжу Да вымушаны быў хавацца і нават стаў будыйскім манахам.

З ростам гарадскога насельніцтва ў XVII ст. у якасці альтэрнатывы элітарнаму традыцыйнаму мастацтву сталі развівацца новыя жанры —


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ксілаграфія ў стылі *укіё-э* («карціны зменлівага свету») у Японіі і *мінхва* («народны жывапіс») у карэйскай дзяржаве Часон. Укіё-э адлюстроўвала штодзённае жыццё людзей. Выдатным прадстаўніком гэтага стылю быў ***Кітагава Утамара***. Мінхва быў сапраўды народным жывапісам без аўтарства. Для яго характэрны зварот да міфалагічных сюжэтаў і легенд. Асабліва папулярнымі былі выявы жывёл. Гэтыя карціны ўпрыгожвалі дамы простых людзей, а таксама служылі ахоўнымі амулетамі супраць злых духаў.



Тры знакамітыя прыгажуні. Мастак *Кітагава Утамара.* Каля 1793 г.

Палітыка ізаляцыі, што праводзілася ўладамі ва Усходняй Азіі, садзейнічала развіццю мясцовых формаў літаратуры. Напрыклад, у Японіі вядучым паэтычным жанрам перыяду Такугава стаў *хайку*. Гумар і кпіны, характэрныя для гэтага жанру, часта замянялі паэтычную глыбіню. Аднак знакаміты японскі паэт ***Мацуа Басё*** зрабіў хайку сапраўды высокамастацкай паэзіяй. Апісанне моманту з указаннем на пару года або час сутак было характэрным для такой паэзіі.

*Восень на сыходзе,*
*Ды верыць у лепшыя дні*
*Зялёны мандарын.*

*Басё*

У перыяд кіравання дынастыі Цын таксама працягвала развівацца традыцыйная літаратура, якая пераймала старажытных і сярэднявечных аўтараў. Тыповым прыкладам такой прозы з’яўляецца знакаміты твор ***Пу Сунліна*** «Апісанне цудоўнага з кабінета Ляа» (1679 г.). Ён уяўляе сабой зборнік з 431 навелы, які змяшчае гісторыі аб звышнатуральных істотах. Знакаміты ў Кітаі жахлівы казачны персанаж — ліса-пярэварацень, што прымае знешні выгляд прыгожай жанчыны, — стаў у Пу Сунліна прывабным і сімпатычным.

Вялікую папулярнасць у Кітаі ў канцы XVIII ст. атрымаў твор ***Цаа Сюэціня*** «Сон у чырвоным цераме». З-за смерці аўтара апошнія 40 глаў са 120 былі дапісаны выдаўцом. У кнізе, якую многія лічаць найлепшым раманам у свеце, апісваецца гісторыя падзення набліжанай да імператара сям’і. Раман напісаны народнай мовай. Гэта быў першы кітайскі твор з трагічным канцом.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 32, п. 5

XVIII ст. стала складаным часам для многіх пісьменнікаў Кітая. У гэты час улады знішчылі вельмі шмат кніг, палічыўшы, што яны падаграваюць антымань-чжурскія настроі, а іх аўтары былі кінутыя ў турмы.

Вялізнае значэнне для развіцця літаратуры ва Усходняй Азіі мела кнігадрукаванне. Напрыклад, у Японіі да Новага часу друк выкарыстоўваўся выключна для будыйскіх тэкстаў. Толькі з канца XVI ст. (1591 г.) пачалося выданне друкаванай нерэлігійнай літаратуры. Пасля японскага ўварвання ў Карэю ў канцы XVI ст. да японскага імператарскага двара быў адпраўлены ў якасці падарунка друкарскі станок з рухомым шрыфтам. Адначасова пачалося распаўсюджванне друкаваных тэкстаў партугальскімі місіянерамі. У хуткім часе друкаванне кніг малымі тыражамі стала ў Японіі хобі заможных людзей. З 1609 г. кнігі пачалі выдавацца вялікімі тыражамі: чытанне станавілася модным заняткам.

*Культура Усходу Новага часу ў цэлым працягвала развівацца ў традыцыйных формах і абапіралася на рэлігійныя нормы. Асабліва гэта было заўважна ў свеце ісламу. Тым не менш у мастацтве і літаратуры назіраліся і новыя з’явы: імкненне да рэалізму, пераход ад элітарнага мастацтва да народнага, распрацоўка нацыянальных формаў і жанраў у жывапісе і літаратуры. Вялікую ролю ў распаўсюджванні новых ідэй у дзяржавах Усходу, станаўленні новых літаратурных формаў адыграла кнігадрукаванне.*

1. Назавіце прычыны правядзення рэлігійнай рэформы ў Індыі.
2. Складзіце табліцу, якая характарызуе рэлігіі краін Усходу ў Новы час, паводле плана: а) назва, б) час зараджэння, в) тэрыторыя распаўсюджання, г) асноўная ідэя. Пры неабходнасці выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі. Ці былі агульныя ідэі ў гэтых рэлігіях?
3. Параўнайце сістэмы адукацыі ў розных краінах Усходу. У чым заключаліся адрозненні? Чым яны былі выкліканыя?
4. Назавіце адрозненні ў стаўленні да выяўленчага мастацтва ў Асманскай імперыі і іншых краінах Азіі. З чым яны звязаны?
5. Якія змены адбыліся ў мастацтве Усходняй Азіі ў Новы час?
6. Ахарактарызуйце развіццё літаратуры Японіі і Кітая ў Новы час.
7. Якое значэнне для развіцця літаратуры ва Усходняй Азіі мела кнігадрукаванне?
8. Напішыце верш у жанры хайку пра любую пару года.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела III

**1.** Назавіце храналагічныя рамкі Новага часу.

**2.** Выкарыстоўваючы тэрміны «рэвалюцыя цэн», «Вялікія геаграфічныя адкрыцці», «мануфактурны капіталізм», «сусветны рынак», «буржуазія», «традыцыйнае грамадства», «індустрыяльнае грамадства», «накапленне капіталу», «мануфактура», «Рэфармацыя», «прамысловы пераварот», «мадэрнізацыя», выбудуйце лагічны ланцужок (або гекс), каб паказаць прычынна-выніковыя сувязі гістарычных падзей першага перыяду Новага часу.

**3.** Выкарыстоўваючы картасхемы вучэбнага дапаможніка і карты атласа, сфармулюйце выснову аб тэрытарыяльных зменах, што адбыліся ў Новы час.

**4.** Назавіце імёны людзей, якія адыгралі значную ролю ў гісторыі Новага часу. Растлумачце свой выбар. Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) аб адным з іх.

**5.** Назавіце перадавыя ідэі Новага часу. Чаму іх можна лічыць перадавымі для таго часу?

**6.** Выкарыстоўваючы храналагічную табліцу ў пачатку раздзела, назавіце ключавыя і найбольш значныя, на вашу думку, падзеі вывучанага гістарычнага перыяду. Растлумачце ваш пункт гледжання.

**7.** Якія рысы сучаснай цывілізацыі склаліся ў Новы час?

**8.** Вялікія геаграфічныя адкрыцці ліквідавалі ізаляванасць цывілізацый, але за кошт знішчэння старажытных культур і фізічнага вынішчэння індзейцаў. Ці варта лічыць Вялікія геаграфічныя адкрыцці прагрэсіўнай з’явай у гісторыі чалавецтва? Правядзіце дыскусію па гэтым пытанні.

**9.** Прачытайце фрагменты з трактата М. Лютэра «Пра свабоду хрысціяніна». Адкажыце на пытанні да дакумента.

*...Ты спытаеш, аднак: якое ж гэта Слова, што дае такую вялікую міласць, і як мне трэба ім карыстацца? Адказваю: гэта не што іншае, як пропаведзь аб Хрысце, як яе змяшчае Евангелле. Калі ты сапраўды верыш і разумееш, наколькі вінаваты, то адчаешся... <...> Каб, аднак, вызваліць цябе ад цябе самога, інакш кажучы, ад тваёй пагібелі, Ён ставіць перад табой свайго ўлюбёнага Сына Ісуса Хрыста і сваім жывым, суцяшальным Словам гаворыць табе: аддай сябе моцнай веры ў Яго, у якой нястомна знаходзься, і дзеля гэтае самае веры ўсе твае грахі даруюцца табе. <...>*

*Таму адзінай годнай справай і заняткам усіх хрысціян было б імкнуцца да таго, каб увасобіць у сабе Слова і Хрыста, пастаянна практыкуючы і ўмацоўваючы такую веру, паколькі ніякая іншая справа не здолее зрабіць*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*хрысціяніна. Як сказана (Мк 16): «Хто будзе вераваць і хрысціцца, уратаваны будзе; а хто не будзе вераваць, асуджаны будзе». <...> Вера, у якой дакладна ёсць выкананне ўсіх запаведзяў, спаўна апраўдае ўсіх, хто мае яе, так што ні ў чым яны больш не маюць патрэбы, каб быць праведнымі і набожнымі. Тут трэба адзначыць і сур'ёзна запомніць, што адна вера робіць праведным, без якіх-небудзь спраў, як убачым далей. <...>*

*Адсюль лёгка заўважыць, чаму вера можа так шмат і што ніякія добрыя справы не могуць параўнацца з ёю. Паколькі ніякая добрая справа не ўтрымаецца за Боскае Слова так, як вера.*

1. Як бачыць М. Лютэр становішча чалавека ў свеце? Як вера дапамагае хрысціяніну справіцца са сваім становішчам? 2. Чым адрозніваецца вучэнне М. Лютэра ад традыцыйнага каталіцкага погляду на веру?

**10.** У чым праявіліся асаблівасці Рэфармацыі і Контррэфармацыі ў заходніх славян, якія пражывалі ў складзе імперыі Габсбургаў і Рэчы Паспалітай? З чым гэтыя асаблівасці былі звязаны?

**11.** Прачытайце фрагмент з твора «Новы Арганон» Ф. Бэкана.

*...Не трэба дапускаць, каб розум пераскокваў ад прыватнасцяў да аддаленых і амаль самых агульных аксіём (г. зн. ісцін)... і па іх непахіснай ісціннасці... усталёўваў сярэднія аксіёмы. Так было дагэтуль... Для навук жа варта чакаць дабра толькі тады, калі мы будзем узыходзіць ... ад прыватнасцяў да меншых аксіём і затым да сярэдніх, адна вышэй за другую, і, нарэшце, да самых агульных... Таму чалавечаму розуму трэба надаць не крылы, а хутчэй свінец і цяжар, каб яны стрымлівалі ўсякі скачок і палёт.*

1. Як называецца метад навуковага пазнання, распрацаваны Ф. Бэканам? 2. Якія перавагі ён даў вучоным?

**12.** Якія ідэі еўрапейскага Асветніцтва распаўсюдзіліся ў заходніх і паўднёвых славян і ў Расійскай імперыі? Якія асаблівасці яны мелі? З чым гэтыя асаблівасці былі звязаны?

**13.** Назавіце вядучыя ідэі і прынцыпы, пакладзеныя ў аснову барока і класіцызму. Як іх адрозненне адлюстравалася ў творах, што адносіліся да гэтых мастацкіх стыляў? Прывядзіце прыклады.

**14.** Ахарактарызуйце асноўныя змены, што адбыліся ў краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі і ў Расіі, паслядоўна разглядаючы наступныя сферы жыцця грамадства: а) эканамічную, б) палітычную, в) прававую), г) сацыяльную, д) духоўную.

**15.** Вызначце, як узаемазвязаны эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя змены, што адбыліся ў Новы час, і змены ў культуры, навуцы і тэхніцы. Афарміце свой адказ у выглядзе: а) схемы (ментальнай карты, гексаў), б) разгорнутага плана.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**16.** Ахарактарызуйце мастацтва Высокага Адраджэння, выкарыстоўваючы схему.




**17.** Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце партрэт аднаго з прадстаўнікоў культуры XVI–XVIII стст. (на выбар). Вынік можна прадставіць у выглядзе біяграфічнай даведкі, артыкула для размяшчэння ў Вікіпедыі, прэзентацыі, буклета, рэзюмэ, старонкі ў сацыяльных сетках.

**18.** Уявіце, што вам трэба будзе зняць фільм пра аднаго з гістарычных дзеячаў вывучанага перыяду. Вызначце, каго вы выбераце ў якасці галоўнага героя, і складзіце кароткі сцэнарый: адбярыце герояў фільма, факты, пракаменціруйце іх. Растлумачце сваё стаўленне да выбранай гістарычнай асобы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Як працаваць з гістарычным дакументам

1. Уважліва прачытайце дакумент. Высветліце яго паходжанне: калі ён быў напісаны і кім, да якога віду крыніц адносіцца (афіцыйны дакумент, пісьмо, дзённік, літаратурны твор).
2. Высветліце, пра якую гістарычную падзею, з'яву або працэс ідзе гаворка ў дакуменце.
3. Вызначце пазіцыю аўтара дакумента: ён з'яўляецца афіцыйнай асобай і прадстаўляе дзяржаву ці гэта асабістыя ўражанні ўдзельніка або сведкі падзеі.
4. Назавіце прычыну і храналагічныя рамкі вывучаемай падзеі, з'явы або працэсу.
5. Падумайце, якія гістарычныя ўмовы садзейнічалі падзеі, што апісваецца, узнікненню з'явы, зараджэнню новых ідэй, пачынанняў, правядзенню рэформаў.
6. Дайце характарыстыку дзяржаўным і палітычным дзеячам; падрыхтуйце паведамленне па першакрыніцы.
7. Выкажыце меркаванне аб тым, якім чынам вывучаны дакумент (група дакументаў) дапамог зразумець грамадскія з'явы вывучаемага гістарычнага перыяду.

## Як напісаць эсэ на гістарычную тэматыку

1. Вывучыце ўсе неабходныя матэрыялы па тэме.
2. Акрэсліце кола фактаў, з'яў, падзей, што адносяцца да тэмы, выявіце найбольш важныя з іх.
3. Успомніце гістарычных асоб, дзейнасць якіх звязана з тэмай, вызначце іх ролю ў гістарычных падзеях.
4. Выявіце прычыны, вынікі і наступствы гістарычных падзей, з'яў або працэсаў.
5. Падбярыце тэрміны і паняцці, якія адносяцца да тэмы.
6. Даведайцеся меркаванні розных гісторыкаў аб падзеі, з'яве або працэсе, што вывучаецца.
7. Упарадкуйце і сістэматызуйце інфармацыю.
8. Напішыце эсэ, папярэдне склаўшы яго план. Эсэ абавязкова павінна змяшчаць уводзіны (кароткае апісанне сутнасці падзеі, з'явы або працэсу), асноўную частку, заключэнне (ацэнку значнасці падзеі, з'явы або працэсу).

## Як стварыць ментальную карту

1. Пачніце пабудову ментальнай карты з вызначэння асноўнай тэмы (ідэі), якая размяшчаецца ў цэнтры. Галоўны элемент карты ўтрымлівае вобраз усёй праблемы або цэнтральнае пытанне, таму ён павінен вылучацца на фоне іншых. Размяшчайце астатнія элементы карты пачынаючы з правага верхняга вугла, рухаючыся па стрэлцы гадзінніка.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Вызначце тэмы (ключавыя словы) першага ўзроўню. Яны павінны мець кароткія назвы, паколькі гэта катэгорыі, якія дапамагаюць выбудаваць думкі. Часам, калі яны залішне абстрактныя, да іх можна прымацоўваць выявы.
3. Другі ўзровень тэм — зона, дзе пачынаюць фарміравацца ідэі. Вы можаце выбраць канкрэтызуючае заключэнне, якое завяршае тэму першага ўзроўню, або асобную ідэю, што адносіцца да яе. Назвы тэм другога ўзроўню таксама павінны быць кароткія і складацца з аднаго-двух слоў.
4. Трэці і наступныя ўзроўні — гэта канкрэтызацыя ідэй. Не пераходзьце да іх, пакуль не завершаны і не ўпарадкаваны другі ўзровень. Пры неабходнасці на гэтым узроўні можна звяртацца да апісальных фраз.
5. Выхад на чацвёрты ўзровень непажаданы, паколькі гэта ўскладняе чытанне карты. Калі патрабуецца далейшая канкрэтызацыя або дэталёвае апісанне, то можна выкарыстоўваць нататкі, якія прымацоўваюцца да інфармацыі трэцяга ўзроўню (у электронных картах). У маляванай карце гэтую інфармацыю можна аформіць пры дапамозе «стыкера».
6. Змяшчайце ключавыя словы не ў прамавугольніках, а ў своеасаблівых «бурбалках», размешчаных на галінах, што ідуць ад асноўнай ідэі.
7. Словы павінны быць выразнымі, лёгкімі для прачытання.
8. Выкарыстоўвайце розныя колеры. Кожная галіна можа мець свой колер.
9. Прастора карты павінна быць запоўнена, але не дапускайце перагружанасці.
10. Калі галіны празмерна «разрасліся», іх можна аб'яднаць агульным контурам, каб яны не змешваліся з суседнімі галінамі, што маюць адносіны да іншага сэнсавага блока.

## Як працаваць з гістарычнай карцінай

1. Разгледзьце карціну, прачытайце подпіс да яе. Вызначце, якія гістарычныя падзеі, з'явы або працэсы на ёй прадстаўлены. Суаднясіце час, калі яны адбываліся, і час стварэння карціны.
2. Калі на карціне паказаныя людзі, звярніце ўвагу на выразы іх твараў, іх паставы, навакольную абстаноўку, ландшафт.
3. Падумайце, якімі гукамі мог быць напоўнены эпізод, прадстаўлены на карціне. «Паслухайце» гэтыя гукі.
4. Раскажыце пра прадстаўлены эпізод ад асобы аднаго з персанажаў, паказаных на карціне. Для расказу выкарыстайце ўсё, што вы ўбачылі і «пачулі».
5. Падумайце, ці будуць расказы розных «відавочцаў» падзеі аднолькавымі. Чым яны могуць адрозніваццa?
6. Абмяркуйце ў класе, ці можа мастацкі твор аб'ектыўна прадстаўляць гістарычную падзею.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Змест

Як працаваць з вучэбным дапаможнікам....3
§ 1. Уводзіны....6

**Раздзел I. Цывілізацыі Старажытнага свету**....11

§ 2. Першабытная гісторыя чалавецтва....14
§ 3. Эканоміка і палітычная карта Старажытнага Усходу....24
§ 4. Грамадства і дзяржава ў краінах Старажытнага Усходу....35
§ 5. Старажытная Грэцыя....43
§ 6. Старажытны Рым....52
§ 7. Культурная спадчына старажытных цывілізацый....62
Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела I....74

**Раздзел II. Цывілізацыі Сярэднявечча**....77

Тэма 1. ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА І ВІЗАНТЫЯ....80
§ 8. Палітычная карта сярэднявечнай Еўропы....80
§ 9. Еўропа феадальная....89
§ 10. Еўропа хрысціянская....96
§ 11. Культура заходнееўрапейскага Сярэднявечча....102
§ 12. Візантыя ў Сярэднявеччы....108
Тэма 2. СЛАВЯНСКІЯ НАРОДЫ Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ....116
§ 13. Палітычнае развіццё славянскага свету ў Сярэднявеччы....116
§ 14. Эканоміка і грамадства славян у перыяд Сярэднявечча....124
§ 15. Культура ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян....129
Тэма 3. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ....139
§ 16. Гаспадарчае жыццё і палітычная карта Азіі ў Сярэднявеччы....139
§ 17. Сацыяльныя адносіны ў сярэднявечных цывілізацыях Азіі....147
§ 18. Амерыка і Афрыка ў Сярэднявеччы....155
Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела II....162

**Раздзел III. Ля вытокаў індустрыяльнай цывілізацыі**....165

Тэма 1. ЗАХОДНІ СВЕТ У XVI–XVIII стст.....168
§ 19. Новы час як асаблівы перыяд сусветнай гісторыі....168
§ 20. Зараджэнне капіталізму....175
§ 21. Гуманізм і Адраджэнне....184
§ 22. Пачатак еўрапейскай каланіяльнай экспансіі....192
§ 23. Рэфармацыя і рэлігійныя войны....198
§ 24. Еўрапейская навука і культура канца XVI – XVII ст.....206


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 25. Еўрапейскі абсалютызм ........ 215
§ 26. Кантрасты XVIII ст.: эпоха Асветніцтва і рэвалюцый ........ 223
Тэма 2. РАСІЯ І СЛАВЯНСКІЯ НАРОДЫ ........ 232
§ 27. Расійская дзяржава на парозе Новага часу (XVI–XVII стст.) ........ 232
§ 28. Эпоха пераўтварэнняў у Расіі ў XVIII ст. ........ 241
§ 29. Славянскія народы ў XVI–XVIII стст. ........ 250
Тэма 3. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ І АФРЫКІ ў XVI–XVIII стст. ........ 258
§ 30. «Традыцыйнае грамадства» Усходу ........ 258
§ 31. Каланіялізм у Азіі і Афрыцы ........ 267
§ 32. Духоўнае жыццё і культура цывілізацый Усходу ........ 273
Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела III ........ 281

Як працаваць з гістарычным дакументам ........ 284
Як напісаць эсэ на гістарычную тэматыку ........ 284
Як стварыць ментальную карту ........ 284
Як працаваць з гістарычнай карцінай ........ 285


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Клас | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |
| 20 / 20 | | | | |

Вучэбнае выданне

**Прохараў** Андрэй Аркадзьевіч
**Кудраўцава** Святлана Анатольеўна
**Давідоўская** Галіна Эдуардаўна і інш.

**СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ**
**СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАНЦА XVIII СТ.**

Вучэбны дапаможнік
для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Рэдактар *Н. Б. Кучмель*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Картасхемы *У. М. Храмава*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *А. Б. Грышына*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, І. С. Балабановіч, І. В. Летуновіч*

Падпісана ў друк 15.01.2020. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 21,06. + 0,29 форз. Ул.-выд. арк. 14,60+0,40 форз. Тыраж 11 244 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ ў канцы XVIII ст.




**Граніцы ў 1789 г.**

- дзяржаў
- Свяшчэннай Рымскай імперыі
- калоній
- афрыканскіх княстваў

**Уладанні дзяржаў у канцы XV**

- Вялікабрытаніі
- Даніі
- Іспаніі
- Нідэрландаў
- Парту
- Расіі
- Фран




**…VIII ст.**

…угаліі

…цыі

Васалы Кітайскай імперыі

Спрэчная тэрыторыя паміж Расіяй і Кітаем

**Пазначэнне дзяржаўнай прыналежнасці тэрыторый**

(Брыт.) Вялікабрытаніі
(Ісп.) Іспаніі
(Парт.) Партугаліі
(Рас.) Расіі
(Фр.) Францыі